

# Ад лідскіх муроў

Літаратурна-мастацкі зборнік
2022 - 2025 гг.

**№ 11**

***Кніга 1***

**г. Ліда**
**“Пружмень”**
**2025**

pawet.net

**Ад лідскіх муроў**. Літаратурна - мастацкі зборнік № 11. Кніга 1. 2022-2025 гг. На беларускай мове. Ліда. 2025. 296 с.

Выдаецца ў адпаведнасці з п. 7.4 артыкула 13 ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "Аб сродках масавай інфармацыі" ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З.

Выдавец: Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства "Пружмень".

Укладальнікі: Станіслаў Суднік, Леанід Лаўрэш, Валера Мацулевіч.

Галоўны рэдактар: Станіслаў Суднік.

Рэдактар раздзела паэзіі: Валера Мацулевіч.

Карэктар: Алесь Хітрун.

У зборнік уключаны выняткі з творчага даробку лідскіх літаратараў за 2022-2025 гг. У зборнік трапілі матэрыялы, якія былі апублікаваны ў гэтыя гады або падрыхтаваны да друку. У зборнік увайшлі і іншыя матэрыялы, датычныя літаратурнага жыцця Лідчыны.

*На першай старонцы вокладкі - партрэты лідскіх пісьменнікаў* ***Тэадора Остык Нарбута, Камілы Юрэвіч з Нарбутаў, Ірыны Багдановіч, Марыі Завалы..***

© ПУП "Пружмень", 2025

# Што наша моц змагла...

Так сёлета склалася, што чарговы выпуск зборніка “Ад лідскіх муроў” адбываецца ў год, калі ў Лідзе будзе адзначацца Усебеларускае свята - XXXII Дзень беларускага пісьменства.

З 2022 па 2025 год лідскія пісьменнікі і паэты не спалі, і ў выніку атрымаўся значны плён. Твораў сабралася больш, чым на 700 старонак, таму давялося дзяліць зборнік на дзве кнігі. У першую ўвайшлі раздзелы “Спадчына”, “Паэзія” і “Пераклады”. У другую ўвойдуць раздзелы “Проза”, “Літаратурнае краязнаўства”, “Літаратурнае жыццё”, “Кнігапіс”, “Мемарыял”.

У раздзел “Спадчына” ўвайшлі ўнікальныя творы: вершы Тэадора Нарбута, якога ўсе лічаць выключна гісторыкам, а ён напісаў значную колькасць уласных вершаў, пародый, зрабіў шмат перакладаў антычных аўтараў. Рукапісы паэзіі Тэадора Нарбута зберагла яго дачка Тэадора Манчунская, а сканы здабыў Леанід Лаўрэш з дапамогай свайго сына. Рукапісы ёсць рукапісы, чытаюцца цяжка, таму вершаў Тэадора Нарбута пераклалі не шмат, але ўсе яны за выключэннем аднаго, друкуюцца ўпершыню. Акрамя паэзіі антычных аўтараў Тэадор Нарбут пераклаў на польскую мову раман Сервантэса “Дон Кіхот”. Таму імя Тэадора Нарбута зусім законна і абгрунтавана знаходзіцца ў спісе лідскіх літаратараў, прычым, у самым пачатку гэтага спісу.

Другая асоба ў раздзеле “Спадчына” Каміла Юрэвіч з Нарбутаў. Яе кніжка “Калядкі Камілы Нарбут для кузынак і сяброўак на 1852 год” засвяцілася ў Лідзе на святкаванні 700-годдзя Ліды. Потым Леанід Лаўрэш здабыў сканы. За два гады амаль усю кнігу пераклалі. Ёсць у Камілы і іншыя кнігі, але іх пакуль не здабылі. Лідская мастачка Алена Несцерава стварыла партрэт Камілы Юрэвіч. За аснову быў узяты партрэт яе цёткі Канстанцыі Нарбут.

Сучасная паэзія прадстаўлена не ў поўным аб’ёме, але ў тым, які змог сабраць Валера Мацулевіч пасля смерці брата Алеся Мацулевіча. Ніхто не быў адкінуты. Усе аўтары, якія даслалі свае творы, трапілі на старонкі выдання. А хто не захацеў - той не захацеў.

Усяго прадстаўлена 26 лідскіх паэтаў.

“Ад лідскіх муроў” - перыядычнае выданне. Хто не надрукаваўся сёлета, той зможа надрукавацца ў наступным нумары.

***Станіслаў Суднік.***

# С П А Д Ч Ы НА



# *Тэадор Остык Нарбут*

*Тэадор Нарбут (8 лістапада 1784, маёнтак Шаўры Лідскага павета - 26 лістапада 1864, Вільня) - гісторык, археолаг, інжынер.*

*Пачаў навучанне ў Лідзе. Скончыў Віленскі ўніверсітэт (1803). Вучыўся ў Пецярбургскім кадэцкім корпусе. Удзельнічаў у расійска-пруска-французскай (1806-1807) і расійска-шведскай (1808-1809) войнах; капітан, вайсковы інжынер. Удзельнічаў у праектаванні і будаўніцтве Бабруйскай фартэцы. З 1812 г. у адстаўцы. Жыў у сваім маёнтку, даследаваў гісторыю ВКЛ, праводзіў археалагічныя раскопкі. Найбольш значны яго твор - "Гісторыя літоўскага народа" (т. 1-9, 1835-1841), дзе, разам з іншым, апісаны народныя абрады беларусаў Лідчыны. Друкаваўся ў газеце "Kurier Wilenski". Між іншым пісаў вершы, якія не друкаваліся. Пераклаў на польскую мову раман "Дон Кіхот" (не быў апублікаваны па фінансавых прычынах).*

*Арыштаваны ў сувязі з падзеямі паўстання 1863-1864 гадоў. Пахаваны каля касцёла ў Начы.*

*Тэадор Нарбут першы на Беларусі даў вызначэнне курганам як месцам старажытных пахаванняў. Вёў раскопкі ў Падняпроўі, пазней - на радзіме. У 1820 адкрыў ямнае пахаванне непадалёку ад в. Шаўры Лідскага пав. Апісаў руіны цвердзі на Нёмане каля в. Лыскава Гарадзенскага пав. Даследаваў Лідскі замак. Збіраў і вывучаў помнікі археаграфіі. Увёў у навуковы ўжытак "Хроніку Быхаўца" (1846). Меў багатую калекцыю археалагічных матэрыялаў. Апублікаваў шэраг артыкулаў пра Ліду, Наваградак, Індуру і інш. Займаўся пытаннямі старажытнай міфалогіі, этнаграфіі, фалькларыстыкі...*

# Пра верш Тэадора Нарбута "Казіно ў Лідзе ў 1823 г."

Асаблівае месца сярод прадстаўнікоў вядомага на Лідчыне роду Нарбутаў займае наш славуты зямляк, гісторык, археолаг, вайсковы інжынер Тэадор Нарбут (1784-1864). Ён вучыўся ў Лідскай піярскай школе, потым, у 1803 г., скончыў Віленскі ўніверсітэт, стаў афіцэрам расійскай арміі, удзельнічаў у расійска-пруска-французскай (1806-1807) і расійска-шведскай (1808-1809) войнах, падчас апошняй атрымаў моцную кантузію. Тэадор Нарбут удзельнічаў у праектаванні і будаўніцтве Бабруйскай фартэцы, дзе моцна захварэў, цудам выжыў, але страціў слых, і з 1812 г. капітан Тэадор Нарбут пайшоў у адстаўку. Практычна да канца жыцця жыў у сваім радавым маёнтку Шаўры, займаўся гісторыяй і, безумоўна, належаў да вяршкоў тагачаснай інтэлектуальнай эліты нашага краю. Горад Ліда, у якім Тэадор вучыўся, дзе жылі яго сваякі, у якім род Нарбутаў фундаваў Кармеліцкі кляштар, гісторык лічыў сваім родным горадам.

Нядаўна я атрымаў сканы нявыкарыстанага да гэтага часу ў беларускай гістарыяграфіі архіва дачкі гісторыка Тэадоры Манчунскай[1], якія аплаціў мой сын, за што яму вялікі дзякуй. Архіў Тэадоры Манчунскай складаецца са 142 сканаў здвоеных старонак, якія, на жаль, не ёсць паслядоўным, наратыўным тэкстам яе ўспамінаў. Галоўным зместам архіва з'яўляюцца вершы яе бацькі, розныя яго ненадрукаваныя ў прэсе артыкулы, метэаралагічныя заўвагі, а таксама ўрыўкавыя ўспаміны самой Манчунскай пра яе сям'ю, раней не надрукаваны тэкст самога Тэадора пра яго род і г. д. Архіў Манчунскай, сярод іншых крыніц, стаў асновай майго вялікага артыкула пра Тэадора Нарбута[2] і, спадзяюся, хутка я закончу пісаць кнігу пра нашага славутага земляка. Як для мяне, Тэадор Нарбут - два разы калега - ён таксама інжынер і асоба, якая сур'ёзна займалася гісторыяй нашага краю (устрымаюся ад таго, каб сам назваць сябе гісторыкам).

---

[1] [MONCZUNSKA Z NARBUTTOW, Teodora]. Zapiski corki s. p. Teodora Narbutta z papierow, [apie 1880 m.] Lietuvos valstybes istorijos archyvas (LVIA), f. 1135, ap. 11, b. 19, lap. 1r-137v. Далей - ДГАЛ (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы). Ф. 1135. Воп. 11. Спр. 19.

[2] Гл: Лаўрэш Леанід. Тэадор Нарбут: жыццяпіс без прэтэнзіі на паўнату. Да 240-годдзя з дня смерці гісторыка // Лідскі Летапісец. 2024. № 1-2 (105-16). С. 31-74.

Рукапіс верша Тэадора Нарбута "Казіно ў Лідзе ў 1823 г." адразу прыцягнуў маю ўвагу па дзвюх прычынах. Па-першае, ён мае несумнеўную краязнаўчую вартасць для нашага горада, па-другое, ён у нейкім сэнсе з'яўляецца перафразам верша знакамітага паэта Антонія Адынца пра віленскае казіно, які асобнай брашурай быў надрукаваны ў Вільні ў 1823 г.[3] Зразумела, што па сваіх мастацкіх якасцях, верш Нарбута немагчыма параўнаць з вершам Адынца, што добра разумеў і сам гісторык, для якога вершапісанне было толькі адпачынкам ад навуковай працы. Яго дачка пісала: *"Мой бацька нарадзіўся яшчэ пры падзелах, а яго лютня нарадзілася ў 1798 г. ва ўзросце 14 гадоў, хоць яе і немагчыма параўнаць з лютняй Адама [Міцкевіча] ..."*[4], - верагодна свой першы верш Нарбут напісаў у 14 гадоў.

З верша Нарбута даведваемся, што сярод іншых танцаў у лідскім казіно танчылі і паланэз. Верагодна, у той час ужо немалады і глухі гісторык не надта цікавіўся танцамі, але Тэадора Манчунская падае ў сваім рукапісе яго вершаваны тэкст на матыў паланэза[5], які Нарбут усё ж танчыў сам і любіў больш за ўсе іншыя танцы: *"Любімай музыкай майго цалкам пазбаўленага слыху таты быў паланэз. З-за слыху ён цалкам перастаў чуць музыку, хоць раней сам граў на скрыпцы. У яго памяці засталіся толькі такты паланэза, і ён часта яго спяваў, пры гэтым пытаўся ў нас, ці не фальшывіць? Паказваў нам, як раней танчылі, як раней здымалі шапку перад дамай, прыкленчваючы пры гэтым і абапіраючыся на карабелю*[6]*, і ні адны імяніны ў нас ці збор гасцей не абыходзіліся без таго, каб наш бацька не загадваў граць паланэз. Ён не чуў музыку, але вёў даму ў першай пары праз усе пакоі і ў апошнім паварочваў"* [7].

Невядома, калі Тэадор Нарбут напісаў свой верш пра казіно. Магчыма яго натхніў Адынец, і тады верш напісаны недзе ў 1823 ці ў 1824 г. Але, магчыма, гэты вершы нарадзіўся ў выніку рэфлексій гісторыка пра свае маладыя гады.

Ну, а зараз трошкі пра тагачаснае казіно і іншыя месцы

---

[3] Odyniec, Antoni Edward. Kasino: wiersz na dochod Towarzystwa Dobroczynnosci wydrukowany. Wilno, 1823.

[4] ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 11. Спр. 19. Арк. 21. Арк. 10.

[5] Там жа. Арк. 21.

[6] Карабеля - крывая шабля, прыналежнасць параднага ўбору шляхціца, насілася на поясе пры жупане або кунтушы.

[7] ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 11. Спр. 19. Арк. 21. Арк. 21 адв.

адпачынку. З успамінаў віленскага доктара медыцыны Станіслава Мараўскага даведваемся, што галоўнымі і любімымі месцамі адпачынку не толькі тагачаснай эліты, але і звычайных гараджан былі маскарады, якія мы з большага можам сабе ўявіць (падрабязней, чытайце ў Мараўскага), потым - так званыя рэдуты[8], на якія збіралася публіка без масак, каб за невялікія грошы патанчыць, рэдка калі бываў тут нехта з лепшай публікі, бо больш багатыя асобы з вышэйшага свету бавілі свой час на прыстойных і нават шыкоўных вечарах у казіно. Каб стаць сталым наведвальнікам віленскага казіно, трэба было ўнесці першапачатковы капітал і пасля гэтага, і толькі выбраным асобам, выдаваліся разавыя білеты коштам два рублі срэбрам. У 1822 г. наведвальнікам віленскага казіно быў будучы цар Мікалай I і яго брат, вялікі князь Міхаіл[9].

У віленскае казіно прыходзілі толькі прыстойныя людзі і тут ніколі не было ні боек, ні сварак. 4 (16) сакавіка 1823 г. Ян Чачот пісаў Адаму Міцкевічу: *"Забаўляюцца цяпер у нас, як ніколі. Чаму? Ці таму, што голыя, ці каб забыцца, што голыя, не ведаю. З вечара на вечар, з казіно на рэдуты і гэтак далей ходзяць і ходзяць. Адна з прычын - гэта тое, што сабраліся такія дамы, якім ёсць за што даваць вечары; другая - што іншыя, хоць голыя, не хочуць падаваць у гэтым выгляду. І хоць бедны мужык пухне недзе ад голаду, яны тут, як ты кажаш, валяючыся ў золаце, шумяць. Сёння вялікі маскарад; кажуць, што гэтыя "касцюмы", якія blішчалі на балі ў Лапацінскіх, будуць паказаны і для простага люду. Будзе там, кажуць, маска для высмейвання паноў, што балююць якраз у той час, калі на Русі іх падданыя паміраюць з голаду. У чацвер быў вялікі пікнік. 400 залатых асвятляла залу, налівала келіхі шампанскім, стаўляла вячэру і, кажуць (і, пэўне ж, слушна), наспраўляла новых фракаў і капелюшоў тым, хто займаўся арганізацыяй пікніка. Ды ад голых і пустых нічога лепшага і не трэба было чакаць. Вельмі добра, што ніхто з пачцівых у тых забаўках не ўдзельнічаў. Нават Ходзька, антрэпрэнёр, такі аматар да гэтакіх забаў, не быў давольны пікнікам. І многа было незадаволеных. Расказваюць пра тое, што Тышкевічыха мелася зрабіць добры ўчынак - хацела ўласным коштам даць вечар і каб сабраныя на пікнік грошы былі аддадзены на выкуп беднага бацькі (у яго ж такая вялікая сям'я), якога ўзялі ў турму за неаплачаны доўг. Пустапарожнія гулякі,*

[8] Рэдута - ранейшая разнавіднасць публічнага балю-маскараду з уваходам па білетах. - *Л. Л.*

[9] Morawski Stanislaw. Kilka lat mlodosci mojej w Wilnie (1818-1825). Warszawa, 1924. S. 362-363.

*што арганізоўвалі пікнік, не дапусцілі гэтага. Я тады назваў бы Тышкевічыху сапраўднай гераіняй, калі б тыя прызначаныя на свой вечар 400 залатых сціпла аддала альбо свайму няшчаснаму бацьку, альбо на дапамогу бедным. Бывай здароў і абавязкова хутчэй адпісвай"* [10].

Станіслаў Мараўскі пісаў, што *"ў нашых малых мястэчках без боек і сварак не было і не магло быць рэдуты ці іншай падобнай установы. Згубілася б уся соль, увесь смак весялосці, бо менавіта так уяўляла сабе адпачынак правінцыяльная моладзь"* [11]. Але, як бачым з верша Нарбута, казіно ў Лідзе адпавядала віленскаму і праходзіла на па-сапраўднаму, высокім узроўні. Верш пачынаецца са згадвання Лідскага замка і рэчкі Лідзеі, гукі музыкі з казіно адбіваліся ў байніцах і мурах замка, з чаго робім выснову, што памяшканне казіно было недзе недалёка. У вершы маецца шмат іншых цікавых для аматара нашай гісторыі момантаў, але я не буду іх пералічваць, бо лепш, калі чытач сам прачытае верш нашага славутага гісторыка ў перакладзе Станіслава Судніка, які дасканала перадаў памер верша, думкі і эмоцыі аўтара. За што яму вялікі дзякуй.

***Леанід Лаўрэш.***

---

[10] Чачот Ян. Выбраныя творы. Мінск, 1996. С. 297-298.

[11] Morawski Stanislaw. Kilka lat mlodosci mojej w Wilnie (1818-1825). S. 362.

## Студэнцкі гімн

Неразлучныя сябры, смялей
Пойдзем на пакуты без трывогі,
Двум і ў вязніцы будзе весялей,
Двум пекла не страшны парогі.

Божа мой! У смяртэльнай гадзіне,
Будзе вельмі цяжкое расстанне,
Дружба са смерцю не згіне
І аплача маё скананне.

Знаю, што некалі лягу ў магілу,
Сябар слязу затаіць не зможа,
Згадае мяне вельмі міла
І на магілу кветкі паложыць.
*1805 г.* *Пераклад Станіслава Судніка.*

**Паланэз**

Усё з часам з зямлі знікае:
Прыгажосць, каханне і пяшчота,
А покуль час намззяе пазалотай,
Мы іх упарта даганяем.

Бо, як вада плыве-сцякае,
Як паланэза тон упаў,
Час для гульняў і забаў
Імкліва так сплывае.

Моладзі ўкора, моладзі ўказ,
Майце карысць пры забаве,
Плыньце ў жыцця ціхай наве,
Збірайце цноты, покуль ёсць час.

Шчаслівы, хто ў кожную пору
Ў цнотах сталенне цвічыць
І з тым хвілі прабеглыя лічыць,
І з тым мае ў жыцці апору.
*1823 г.* *Пераклад Станіслава Судніка.*

**Казіно ў Лідзе ў 1823 г.**

Там, дзе кружыць Лідзея, крутой плынню бяжыць,
Ёсць горад, пры ім замак у руінах ляжыць.
Сведка смутнай, праблісклай той краіны славы,

Абаронца колісь горада, якога забавы
Апісаць паспрабую, хоць у частцы малой
У кампаніі кузыны, прыгожай і маладой.

Як толькі месяц рогам неба кранаўся,
Ішоў я ў тое месца, дзе быць кожны стараўся.
Мой Божа, які від мне тут думкі чаруе,
Падтрымай мяне, Божа, пакуль забавы ўсе адмалюю.
Ля ўваходу здзіўлялі выбарам буфеты,
Сталы так застаўлены, аж гнуцца ад страваў пры гэтым,
Багатыя на канфецюры, бутэлькі і дэсерты.
Далей гучныя фаготы, валторны і кларнеты,
Габоі, барытоны, дом аж трасецца ў шале,
А байніцы ў замка мурах водгук той паўтаралі.
У зале танцаў убачыш столькі цудаў разам,
А кожны з іх найдзіўным здаецца абразам.
Там Дося, што ножкі найпрыгажэйшыя мае,
Балінча цуд прыгажосці пры Лоры Фларэці ўяўляе.
Філіс з анёльскім тварам каля боскай Хлоі красуе
Чый пагляд даражэй за свет цэлы каштуе.
О, нябранкі, у што ж ваша ператворыцца ўвага
Ў параўнанні тых цудаў рэдкай адвагі,
А ты, дэндзю трох багінь, падобны Парысу,
Чым, каб, як каралевіч, прыхільнасць знайшоў пры Клярысу,
Лепш бы, каб не бачыць мілы пагляд і галаву Дафны,
Альбо ўклад Лікорыс - Лауры ўбор трафны.
Што ні мода - твор мастацтва, што ні досціп - талент ззяе,
Што жаданне падабацца або сціпласць святая.
Што неахвота да весялосці, што далі майстэрства сілы,
Усё там ўборы жанчын умясцілі.
Папраўляюць, дзе хібу прырода зрабіла,
Да маральных прадметаў пер'е далучыла.
Бо свет цяпер больш густоўны, тымі лішкамі пагарджае,
Што забавы з маралі асновамі злучае.
Гляньце, той і гэтая пачынаюць ход малы,
Плыве вольны паланэз, нібы ўзнятыя валы,

Якія на шумным моры рознага ўзвышэння,
Зніжаюцца, змяншаюцца аж да знікнення.
У гарманічных паваротах ісці прымушае
І згадаць пра продкаў намаўляе.
Цяпер хутка ў два рады пары паўставалі,
І кантраданс найпрыгажэйшы кларнеты зайгралі.
У ім тая пара спора рабіць замену
І паўз цэлы рад праходзіць сцэну.
У канцы розных фігур у такт робіць набор
Неспасціжны стварае для вока ўзор.
І зноў народны танец наступае,
Гукі мазуркі, што грудзі ўздымаюць.
У іх цёплыя згадкі, у іх мілыя забавы,
У іх шляхетнасці найвысшыя праявы.
Альбо жвавы кракавяк у паваротах крутых
Накрэсліць нам круг сапраўды маладых.
Нявіннае прыціскане, нявінныя залёты,
Так гожа і так тонка, як патрабуе век цноты.
Далей кадрыль наступае, тактычныя скокі,
Хоць бавіць праз павароты і фігур спрыт высокі,
Не дасягае ні мазуркі, ні кракавяка,
Не можа ўстаць над танцам свойскім для паляка.
У той час, калі багі жылі на нашай зямлі,
Самі тамтэйшым насельнікам танцы перадалі.
Хоць у суровых дубравах або ў святыні цені
Навучалі іх цноце ў сціплым уміленні.
Адтуль ахвота да забаў, дасканаласць танцаў мілых,
Хаця цноту пасля трохі падзабылі.
Аднак жа танцаў польскіх не знікла мода,
Дальбог жа, хто яшчэ такія бачыў карагоды?
Тое колка ў адным рытме, тое ног выгінанне,
У тым вальсе манатонным плаўнае хістанне.
Рухі, шкодныя здароўю, для вачэй не мілыя,
Лепей бы для казака захавалі сілы,
Або з вясёлым звонам бразгаць астрогамі,
Бо час танцаў з рознымі для нас народамі

Сёння прамінуў, таму пільнуйма, што ў спадкі засталося,
Хоць і танцаў, што ад прадзедаў зберагчы ўдалося.
А стан наш сённяшні, на лепшае ўздымем,
Таму і танцуем. Я скончу. Паклон табе, кузына,
За нашу добрую пацеху з той мілай забавы,
Што для мяне ў Лідзе ўчыніла. Лідзе ж - памяць і слава.

*Пераклад Станіслава Судніка.*

## Пародыя на песню Яна Каханоўскага

Вёска нэндзы і пакуты,
Хто ж пакажа ўціск твой люты?
Над тваёй сягоння доляй
Лес галосіць, плача поле.
Селянін табе аддany,
Чалавекам не названы,
Ён свайго не мае й пядзі
У няволі, у заняпадзе.
Каб жыць іншым без трывогі,
Ёсць зямельныя разлогі:
Стуль шыкоўнае адзенне
І бяседы, і ўзвышэнне.
Хто не робіць анічога,
Толькі вёсак мае многа,
Той жыве, каб нажывацца,
Есць і п'е з чужое працы.
Селянін жа каля плуга -
Вось і ўся яго выслуга.
Ён сям'ю сваю ў няволі
Не накорміць нат ніколі.
Не яму цвітуць гароды
І прыносяць пчолы мёды,
І авечка дорыць воўну,
І арэ вол поле роўна.
Косіць ён у полі, лузе -

З таго пан карысць здабудзе.
А па севе, у час зімовы
Жаль яго прыцісне новы.
Чутны сумныя тут гімны,
Дзе куток заўсёды дымны.
Рэдка смех там і гулянні,
Дзе сваволяць пакаранні.
Дзе ўсё ж чулы тут народзе,
Хоць яго лёс ведзьмы зводзяць.
Ён не ведае свабоды,
А шчыруе тут заўсёды.
Венцер у яго гатовы,
Каб у рэчцы браць уловы.
Ён за шчаснай сочыць пташкай,
Бы не мае працы цяжкай.
Хоць сваты і небагаты,
Весяляцца яны ў святы,
Бы сатыры тыя скачуць,
І над песняй сваёй плачуць.
Гаспадыня ж, вось нябога,
Пра вячэру дбае з тога,
Што паслаў Бог - не іначай,
Ксёндз пакінуў, пан не ўбачыў.
Мужу служыць, дагаджае,
Пры жыцці яго трымае,
Дзеліць нэндзу, клопат Боскі,
Нараджае вязняў вёскі.
Падрастуць яны калісьці -
Жабракі ж ужо ў калысцы.
Прывыкаюць да цярпення,
Да жыццёвага сумнення.
Хвалец веку залатога
Вёску я не ўслаўлю многа,
Бо калі б яе ты ўбачыў,
Песню б сам сваю зыначыў.

*Пераклад Уладзіміра Мархеля.*

## Здрада

Дзіўныя вочкі Вашыя - чары,
Што мой спакой атруцілі,
Да ўсіх і няшчасцяў, і караў
Вы нячулым мяне зрабілі.

Здрада, падступства, зайздрасць злая,
Усе злосці людское звады,
На нявіннасць дзіка сягаюць,
Усімі трубамі сыплюць яды.

І калі ў астатку так падгадалі,
Што ліха процьму я з Вас спазнаў,
На мяне беды ніадкуль напалі,
Якіх зусім ніколі не чакаў.

Ці жыцця хочаце - вазьміце яго,
Памру спакойна ў надзеі,
Што тыя вочкі, вочкі шчасця майго
Міла па мне сумам павеюць.

Іх позірк слізгане па магіле,
Каб той горычы не піць чары,
Вочкі дзіўныя, вам здрадлівым,
Няшчаснаю стаў я ахвярай.

О, калі сэрца хочаш ад бяды
Ты для спакою ўратаваць,
Збоч ад пенкных вочак тады,
Бо сродак маюць зачараваць.

*Пераклад Станіслава Судніка.*



# *Каміла Юрэвіч з Нарбутаў*

*Вядома, што бацька Камілы, Юстын Нарбут - выхаванец вышэйшай школы Вялікага Княства Літоўскага (ўніверсітэта). Жанаты быў з Петранелай Сабаньскай. Ажаніўшыся, Нарбут стала жыў у Лідскім павеце, у маёнтку Юршышкі (зараз вёска Юршышкес у Літве, каля Эйшышкаў), у 1820 г. быў членам межавога суда Лідскага павета.*

*У Юстына і Петранелі Нарбутаў нарадзіліся сын Рамуальд (1800 - каля 1871) і дачка Каміла. Маскоўскі даследчык радаслоўнай свайго роду А. Н. Нарбут падае год нараджэння Камілы - каля 1802, але Каміла сама пісала пра свайго брата: "Нас было двое. Мы не выхоўваліся разам. Першым з нас быў старэйшы за мяне мой брат". Таму я лічу цалкам дакладнай інфармацыю летувіскіх даследчыкаў, якія падаюць наступныя гады жыцця Камілы Нарбут: (~1805 ці 1814/1815 - 1881) .*

*Біяграфія дачкі Юстына Нарбута - Камілы Нарбут у нас яшчэ не даследавалася, але ў суседзяў ўжо выйшла кніга пра яе. Вядома, што Каміла была пісьменніцай і супрацоўнічала з "Дзённікам Віленскім". У 1835 г. выдала аповесць "Мечыслаў і Стэфанія" і "Маральныя лісты" ("Pisma moralne"). Пасля смерці бацькі, яна стала ўладальніцай маёнтка Юршышкі. Каміла выйшла замуж за нейкага Юрэвіча і пад гэтым прозвішчам выдала яшчэ дзве кнігі: у 1852 г. "Калядкі Камілы Нарбут ..." і ў 1862 г. "Літоўскія замалёўкі" .*

*У 1873 г. Каміла Юрэвіч з Нарбутаў надрукавала нарыс пра Араны, Мерач і Друскенікі, у якім акрамя апісанняў Аранаў, Мерачы і Друскенікаў, яна адносна падрабязна падала гісторыю лякарні водамі ў Друскеніках.*

Каміла пісала, што тутэйшая вада па сваіх лекавых якасцях стаіць у адным шэрагу з лепшымі водамі Еўропы З тэкстаў Камілы Нарбут бачна, што яна неаднаразова сустракалася з Тэадорам Нарбутам і слухала яго расказы пра нашу гісторыю. У гістарычным архіве Летувы захоўваецца рукапіс успамінаў Камілы Нарбут пра Тэадора Нарбута, якія надрукаваны ў маім вялікім артыкуле пра нашага славутага гісторыка з Шаўроў.


KOLĘDA
KAMILLI NARBUTT
DLA
KUZYNEK I PRZYJACIÓŁEK
na Rok 1852.

WILNO.
Drukiem Józefa Zawadzkiego.
1852.

Першай публікацыяй Камілы Юрэвіч з Нарбутаў на беларускай мове стаў пераклад яе апавядання "Пустэльнік з Ражанкі" , якое ў XIX ст. было апублікавана ў зборніку "Калядкі Камілы Нарбут ...", а ў 2023 г. у "Лідскім летапісцы" (Лаўрэш Леанід. Мястэчка Ражанка і касцёл у ім // Лідскі летапісец. 2023. № 3 (103). С. 54-55). А цяпер мы маем і пераклады 25 вершаў, і аповесці "Вандроўка ў Беларусь".

***Леанід Лаўрэш.***

*Ілюстрацыйны партрэт Камілы Юрэвіч з Нарбутаў. Мастак Алена Несцерава.*

*Каміла Нарбут*

# Вершыкі

### Гімн да Бога

*Дзядзьку майму, ксендзу*
*Станіславу Нарбуту,*
*каноніку Берасцейскаму*
*прысвячаю.*

Сонца ўсходзіць,
Поле родзіць,
Дождж палівае,
Вецер павявае.
Гром перуновы,
Бляск суровы,
Зорак бясконца,
Кожная - сонца.

Божа магутны,
ксёндз мой мілы,
Довады ясныя пра тваю сілу.

Ранняя зора,
Плёскат мора,
Рэчак стужкі,
Спевы птушкі.
Пушчы і гаі,
Звярыныя зграі,
Горы, каменні,
Рыбы ў струменях.

Божа магутны,
ксёндз мой мілы,
Довады ясныя пра тваю сілу.

З розумам людзі
Ў думках блудзяць,
Крупка гліны,
Духу махіна.
Цар з нараджэння,
Сын аб'яўлення,
Дзедзіч усёга,
Створаны з нічога.

Божа магутны,
ксёндз мой мілы,
Довады ясныя пра тваю сілу.

### Думка

*Тарэсе Нарбут*
*прысвячаю*

Слаба апіша пёрка слабое
Сутнасць думкі людское,
Што хутчэй за птушку лятае,
Хвіляй свету краёў дасягае,
Што паміж ночак глыбокіх
Узлятае да зор высокіх,
Рвецца смела без меры
Ў мільённыя свету сферы,
То ў моры глыбокім тоне,
Лічыць стварэнні ў яго лоне,
То прабягае гаі і нівы,
І як прагледзіць
зямныя дзівы,
Зноў ляціць у горнія высі,

Творцу цудаў каб пакланіцца.
Ды як няшчасця
брэмя прыгнеціць,
Думка не ззяе
ў прыгожым свеце,

А як смерці цяжкая сіла,
Вырве сэрцу прадмет мілы,
Думка тады - горкая чара,
Мука жыцця,
пра магілу мара.

## Думкі ў Верках

*Клемянтыне Нарбут прысвячаю*

Тут не раз хлопец марыў пра золата горы,
Мастак тут дзівіўся прывабам прастораў,
Палітык прадумваў былыя падзеі,
Скуль выводзіў на прышласць надзеі,
Філосаф ствараў тут свету сістэму,
Паэт тут складаў чулы вершык да Эмы.
І я прыцягнулася з болем пакуты,
З агідай да долі, магілай прыгнутай,
Страціла ўсіх, што свет мой складалі,
Любіла каго, і любоў што мне слалі,
Таму тут больш дбаць ні пра што не імкнуся,
Толькі хвілю чакаю, як з імі злучуся.

## Да бярозы ў маім садзе

*Тарэсе Нарбут прысвячаю*

Сівая бяроза, ты вякі прастаяла,
З бурай, як волат, не раз ваявала.
Марна ўпіраўся Барэй тут нястомны,
Марна круціў Ураган неўгамонны.
Часта і людзі спагады не зналі,
Вострым жалезам з цябе кроў здабывалі*.
Ты ж стаяла заўсёды скалой несхілёнай,
Як даўні рыцар у кароне зялёнай.

Ты прадзедаў нашых гадочкі лічыла,
Прыход і сыход іх са свету сачыла,
Ды як усё, што красуе пад сонцам.
Мае пачатак і век не бясконцы.
І ты, адвечная, падлегла знішчэнню -
І галіны сухія не даюць болей ценю,
Многія з іх вятры пазрывалі
Плямы смерці ўжо на табе зазіялі.

** Нашыя сяляне ў траўні месяцы надсякаюць сякерай бярозы. Сок, які з іх цячэ, ужываюць як напой.*

## Скарб

*Клемянтыне Нарбут прысвячаю*

Хціведц  думаў, што скарб - гэта стос злотых,
Мудрэц - што вера, людкасць і цнота,
Першы пакінуў на зямлі назусім,
Другі перад Богам стаў са сваім.
Творца ўчынкі абодвух разглядаў
І паводле заслуг кожнаму надаў.
Хцівец на вечную нэндзу сказаны,
Мудрэц дзедзічам неба прызнаны.
І людзі па рознаму іх судзілі:
Смяяліся з хціўца, мудраца любілі.
У жыцці пачуццяў скарб - стос злотых,
У жыцці духоўным - вера і цнота.

## Мая ноч

*Антаніне з Малаховічаў Карловіч прысвячаю*

Ноч глыбокая без броду,
Людзі спяць, і спіць прырода.
Мне ж павекі сон не клеіць,

Я трываю без надзеі.
Ніхто смерць не пераверне,
Ніхто маці мне не верне.
Ніхто жаль не зменшыць мне,
Бо мае ўжо ўсе ў труне.
Я горыч толькі п’ю,
Толькі болесць я жую.
Я адна на той зямлі,
Мо б з сабой мяне ўзялі.

.............................................

Што ёсць свет? - зямнога шара схілы:
З яго жыццё, з яго магіла.
Што ёсць жыццё? Дух з-пад хмараў,
Пустыя рэчы, пустыя мары.
Што ёсць магіла? Ціхі куток,
Без сварак і без згрызот.
Што ёсць вечнасць? Іншае жыццё,
Нязменнае, нявіннае быццё.

## Адрыўкі з паэмы “Марыя”, яшчэ не надрукаванай

Мілага спатканне -
Найчульшае спрыянне:
Два толькі пагляды,
Два мігі спагады.
Па кроплі слодычы
І кубак горычы...
Што шчасця пазбаўляе
І жыццё атручае,
Што сэрца раздзірае
І магілу адчыняе.

...............................................

Пасля цела спарахнення
І душы ўзнясення,
З нявінным сумленнем,
З мілага ўспамненнем,
Калі стану перад Збаўцам,
І пачуццяў маіх знаўца,
Бог добры, пацешыць,
І смерць яго прыспешыць,
Дзве душы разам з'яднае
І жаль мой раскідае.

.............................................

Снягі ўжо раcraлі, палопала шкло лёду,
Сагрэтыя сонцам зашумелі воды,
Бусел клякоча, жаўранкі спяваюць,
Пастушыныя флейты дзень вясенні вітаюць.
О, як жа прыгожа лугі зелянеюць,
Тут лопаюць пупышкі, там кветкі чырванеюць.
Калі ўсё ў прыродзе смяецца
І песня шчасця над краем нясецца,
Мне адной паміж цэлай прыроды
Цісне боль сэрца і смутак нягоды.

.............................................

Я ўсю маладосць у слязах утапіла,
Гады і гадзіны ў пакутах лічыла,
Найнявіннейшай маёй душы хаценні,
Не мелі нідзе добрага спаўнення,
Была я непазбежным адкідам прыроды,
Збіраліся хмары нада мною заўсёды.
Нада мною віхры заўжды вар'яцелі,
Пада мною гадзюкі заўсёды шыпелі.
Кожную расліну, што я пасадзіла,
Ці бурай зламала, ці градам пабіла.

Кожную жыўнасць, што я даглядала,
Смерць без пары пільнавала,
Бяда і людзям, якіх я любіла,
Бо нават і іх я няшчасцем пакрыла...
Калі не памёр той, мною абраны,
То цяжкім лёсам быў пакараны.
Бойцеся, брацці, майго вы пагляду,
Нашу я ў сабе праклён грэхападу,
Бойцеся ўчуццяў, налітых атрутай,
Кірункаў маіх - у пекла маршрутаў.

## Дзяўчына на магіле

Грымелі аблокі, маланкі стралялі,
Ясна на небе зігзагі блішчалі,
Дажджу не было, а вятры толькі вылі,
І чорныя хмары строп неба пакрылі.
Падчас такой буры над свежай магілай
Дзяўчына стаяла з галоўкай пахілай.
- Марыя, бяжым, - крэўная ёй закрычала,
Выцяў пярун, і зямля задрыжала.
- Ідзі ты дадому, - дзяўчо адказала, -
Месяца бляску мне пакуль мала.
З часу, як маці мяне нарадзіла,
Хмара няшчасцяў нада мною хадзіла,
Многа ўдараў сэрца прымала,
І хвілі пагоднай ніколі не знала.
Той не баіцца з бурай спаткання,
Хто чуе яе што хвіліну дыханне,
Тога і смерць аніяк не пужае,
Бо ад пакутаў яна вызваляе

Сціхлі вятры, і грымоты знямелі,
Згаслі на небе маланак прастрэлы.
Прыбегла сваячка, як поўня заззяла,
Мёртвым дзяўчо на магіле ляжала.

## Шчасце

*Юльяну Машынскаму, доктару медыцыны,*
*чальцу Лекарскага і дабрачыннага таварыства*
*ў Вільні прысвячаю*

Багацце і пыха -
Не шчасце, а ліха.
А шчасця істота -
Нявіннасць і цнота.

Высокі чыноўнік,
Строгі саноўнік,
Магнат непатрэбны
З прагай ганебнай.
Уладнік няправы,
Дзяўчына злой славы,
Да золата хцівы
Не будзе шчаслівы.

Багацце і пыха -
Не шчасце, а ліха.
А шчасця істота -
Нявіннасць і цнота.

З дому забраны,
Закуты ў кайданы,
Хваробай збалелы
Жабрак згаладнелы
Не лічыць ноч злою,
Бо чысты душою,
Не траціць надзеяў,
Не губіць спадзеву.

Багацце і пыха -
Не шчасце, а ліха.
А шчасця істота -
Нявіннасць і цнота.

## Мары пра вайну

*Брату майму Рамуальду Нарбуту прысвячаю*

Гарматы рычаць,
Гранаты шыпяць,
Агні блішчаць,
Кулі ляцяць.

Шабель звон,
Раненых стогн,
Людское крыві,
Хоць сам плыві.

Разня і бітва,
Смелых ганітва,
Вырак крывавы:
- Смерць або слава.

Ад славы да слёз -
Вайсковы лёс.
Блісне, праз хвілю
Гасне ў магіле.

Воін прад Богам
Судзіцца строга,
У вечнасці згіне,
Слядоў не пакіне.

## Мой сон

*Вераніцы Падбярэскай прысвячаю*

На доле ў капліцы яснеў алтар цноты,
На гары сярод церняў блішчэў балван пазалотай.
У капліцы быў мудрэц, пакрыты сівізной,
Быў рыцар, што за Айчыну хадзіў на бой,
Быў маладзён, што працай сям'ю ўсю трымаў,
Быў і каплан, што слёзы нядолі тут выціраў.
Тлум людзей, пакінуўшы той алтар цноты,
Дзёрся на гару, дзе балван з пазалотай.
Кожны рваўся быць першым, брат брата таптаў.
- На золаце, - крычалі, - свет вечна стаяў.
Ды зямля задрыжала і гару разарвала,
І хцівых з балванам ноч пекла забрала.
А ў капліцу цноты голас з неба ласкавы
Шле яе адведнікам вянок вечнай славы.

## Думка
## пасля атрымання весткі пра смерць Цэцыліі С.

*Антаніне Карловіч прысвячаю*

Вецер з поўначы сцюжай вее,
І прырода ўжо мярцвее,
Травы вянуць, ліст спадае,
І зіму ўжо ўсё чакае.
Зіма пройдзе, вясна зноўку
Апранецца ўся ў абноўку.
Травы, дрэвы ажывуць,

Кветкі зноўку расцвітуць.
Толькі Цэсі не падняцца,
На магілу не ўзабрацца.
Хто нам страту ўзнагародзіць,
Хто нам жаль той падсалодзіць?
Вера толькі ўцешыць можа,
Больш нішто не дапаможа.
Вера толькі супакоіць,
Душы, сэрцы нам загоіць.
Вера ў смерці з намі будзе,
Страх знікнення нам адпудзіць,
Шлях да неба пракладае
І там шчасце абяцае.

**Адам**

“Адзін з маіх продкаў быў гетманам слаўным,
Другі падпісаў замірэнне з султанам,
Тры ваяводы, чацвёра кашталянаў,
Магу я лічыць, што паходжу з васпанаў”, -
Так кажа Адам з гонару асалодай,
Цёмны нашчадак светлага роду.

Ніхто не дыхае чужымі грудзямі,
Ніхто не смяецца чужымі губамі,
Ніхто не слаўны з чужое славы,
Нішто слаўных продкаў ордэны і булавы.
З тых слаўных людзей кожны ў небе ўжо госць,
Скажы нам, Адам, а хто сам ты тут ёсць?

**Смерць**

Паміраў магнат у пазалочанай палаце,
Паміраў слуга ў сваёй беднай хаце.
Пры першым сядзеў доктар з лекамі новымі,
Пры другім - каплан з Хрыстуса словамі.

Багач золатам смерць задобрыць спрабаваў,
Слуга з пакорай крыж Збаўцы цалаваў.
Ён прайшоў працу і нягодаў многа
І надзею сваю пакладаў на Бога.
Над ім відны святасці прамені,
Над пыхлівым панам - чорнай ночы цені.

## Могілкі ксяндзоў-місіянераў у Вільні

Колькі слынных паноў тут стала пылам,
Колькі бажкоў з гліны вярнулася ў гліну
Колькі тут тытулаў на мармуры бітых
Ля магілаў, пяском пакрытых.
Ці і тут ёсць розніца станаў зноў,
Клас ніжэйшы і клас паноў,
Хоць іх косці спарахнелі аднака,
І розніцы ў праху няма ўжо ніякай.

## Крык збалелага сэрца

*Тарэсе Нарбут прысвячаю*

Бачыла бацьку ў хваробе пакутнай,
Голас маці канаўшай быў ледзьве чутны.
У горкай жалобе з апошняе сілы
Сваім я бацькам засыпала магілы.
Як толькі сэрца не лопнула з болю,
Як і мяне не забралі з сабою?
Як тыя слёзы, што я пралівала,
Новага руху іх мошчам не далі?
Ніхто тут на свеце смерць не абыдзе,
Ніводзін памёрлы назад к нам не прыдзе.
Дык навошта ж зямля доўга так існуе,
Хай гром яе трэсне, вада хай залье.
Хай з пылам на часткі яна разлятае,
Дзень ясны адразу над намі заззяе.

З крэўнымі, з любымі зноў я злучуся,
Думкай пачуццем навекі сальюся.
Будзем любіць мы Найвышшу Істоту,
Што шчасцем трывалым аддзячыць нам цноту.

## Чатыры ўсмешкі

*Клемянтыне Нарбут прысвячаю*

Бачыла ўсмешку я цноты дзявочай,
Тварык румяны і ясныя вочы.
Бачыла ўсмешку істоты нягоднай,
Што з веры збівае люд наш прыродны.
Усмешку какеткі з прывабным абліччам,
Што закаханых на тузіны лічыць,
І ўсмешку, што сэрца раздзірае,
З якой не адзін няшчасны памірае,
Выраз знямоглай пакутнай душы,
Выраз пякельны ў жалобнай цішы.

## Ляося на балі
## Сапраўднае здарэнне

Радасць яснела на твары Ляосі,
Што прызналі яе прыгажэйшай ад Зосі.
Ян кідаў на яе погляд чуллівы,
Генрык раз-пораз выдыхваў маўкліва.
Прот пяць разоў з ёй мазурку танцаваў,
Вінцэнт нязменна ёй крэсла пільнаваў.
Вось зайшла Розя, з нікім не знаёмая,
З вёскі дзяўчына, у сталіцы невядомая.
Шум паўстаў у зале: “Адкуль пенкнасць новая?”
Зграбная станам, тварам бела-ружовая.
Ян на Розю ўжо пагляд кідае,
Генрык да Розі ўздых пасылае,
Прот на мазурку шэсць раз запрасіў,

Вінцэнт нават крэсла за ёю насіў.
Хай вас не цешаць ветраныя людзі,
Бо кожная новая каханне ў іх будзіць.

## Тры аблічча Закрэта*

*Тэадору Нарбуту прысвячаю*

Закрэт быў некалі духоўнаю далінай,
Сур’ёзнай думкі, вечнасці ўспамінам,
Дзе шэпт малітвы, шум водаў вешніх,
Пабожныя ўздыханні, звонкіх птушак песні
Зліваліся разам, як гімны тварэння,
З зямлі адляталі ў нябёсаў скляпенні.
Пазней меў Закрэт шыкарную залу
Для пышных прыёмаў і гучных баляў.
Грымелі аркестры, тосты гучалі,
Не раз тут у танцах світанне спаткалі.
Бляскі золата і дарагіх каменняў,
Ніхто там не верыў у трагічнае крушэнне,
Ніхто там не верыў, што памерці трэба
І што пасля п’янкі не латва да неба.
Сёння Закрэт у друзе, сведка марнасці тых
Раскошаў зямных і вышыняў зямных.

* *Закрэт размешчаны над Віліяй у адной з найпрыгажэйшых ваколіц Вільні, паводле мясцовых паданняў быў некалі кляштарам ксяндзоў - езуітаў, а пазней спадчыннай уласнасцю графа Бенігсона.*

## Сон двух братоў

*Мікалаю Маракоўскаму прысвячаю*

Вінцэнт сніў, што ў далёкай краіне
Ёсць нейкі ручай з золата плынню.

Ян сніў талісман, на медзі адбіты,
Якім ад нягодаў быў ён прыкрыты.
Пабеглі браты па мамону тады,
Ды ледзь прайшлі тры-чатыры гады,
Пад камні магілаў абодва сышлі,
І свет забыўся, што тыя людзі жылі.

## Грабавыя прысады

*Вераніцы Падбярэскай прысвячаю*

Гэтыя грабы - сведкі майго нараджэння,
У думках узнаўляюць тысячы імгненняў,
Тут мяне насілі слабенькім немаўляткам,
Тут я вольна гуляла маленькім дзіцяткам.
Тут мне ў сэрца з вялікай ахвотай
Уклалі страх перад Богам і любоў да цноты.
Тут доўга жыла ў прыдуманым свеце,
Існым толькі для мяне на ўсёй планеце,
Дзе з бліжнім чалавек дзяліў цяжкасці дарогі,
Дзе багаты беднаму аказваў дапамогу.
Ніхто не ганарыўся колькасцю грошай,
Ніхто не аддзяляў беднасць ад раскошы,
Дзе справядлівасць усе паважалі,
Не заганы, а цноту ўсе шанавалі.
Дзе ўжо дзяцінства сышлі захапленні,
Дзе горкіх думак хаваліся цені.
Тут і пацехай ірдзелі падзеі
Ў постацях веры, сяброўства, надзеі.

## Выезд у Вільню

Бывайце гаі з лугамі квяцістымі,
Плыні крутыя, крыніцы празрыстыя,
Бывай, альтанка, дзе было мне так міла,
Збягалі рання і вечара хвілі,

І жаўранкі, і шчыглы з салаўямі,
І нарцысы, геацынты, гваздзікі, расстаюся з вамі.
Еду ў горад, дзе муры несвабоды,
Дзе штучнасць нішчыць прывабнасць прыроды.
Там пыха, пустэча, няшчырасць жывуць,
Сэрца маё ніхто не схоча пачуць.

## Да P. S.
## Імправізацыя

Пакідаю крэўных і хворую матку,
Пакідаю ціхую, родную хатку.
Спяшаюся ў горад, дзе свет яснее,
Дзе поспеху бачыцца надзея.
Можа, і дойдзеш да большага значэння
З ахвярай цноты, з крывым сумленнем.
Будзеш тады ўжо пылам бліскучым,
Ды толькі пылам, чуць праблісьнуўшым.
Туман там ахіне, вецер некуды кіне,
І з вечнай смерці Бог не падніме,
Ён справядлівы, кліча: “Людзі,
Нікога з няпраўдай на небе не будзе”.

## Антось

- Хто багаты, той шчаслівы, -
Пеў Антось да грошай хцівы, -
Не хачу Юзі, што ўсё рабіць умее,
Не хачу Чэсі, што над кніжкамі карпее.
Нішто мне розум, нішто мне цнота,
Трэба срэбра, трэба злотых.
Без кахання вазьму жону,
Хоць бы дзікую варону,
Абы толькі пасаг мела, -
І ішоў да мэты смела.

І займеў за жонку Зоську,
І вялікую ўзяў вёску.
Шчасце ў іх не прынялося,
З варонай-жонкай не жылося.
Крычыць варона без прычыны,
Ганіць мужавы ўсе чыны.
Дзеці ў крыку тым растуць,
З маці прыклады бяруць.
Ні ў чым веры, ні ў чым згоды,
Горка ўсё без падсалоды
- Лепш Юзя, што ўсё ўмее рабіць,
Лепш Чэся, што над кнігамі карпіць,
Лепш розум, лепш цнота
І ад срэбра, і ад злотых. -
Спяваў Атось у абрыдзе,
Да багацця і жонкі ў агідзе.

## Чалавек*

Чалавек - гэта такі разумны твор,
У высокасці сваёй прэцца аж да зор.
Пан зямлі, кароль тварэння,
Ды вялікі адно ва ўяўленні.
Тронам яго ёсць цярпенне,
Багацце яго - слёз струмені.
За горыччу смерць падыдзе,
І нікога яна не абыдзе.
У будучыні што яго чакае?
Таго розум не дасягае.

** Гэты вершык я напісала ў чатырнаццаць гадоў майго жыцця, і каб ён быў хоць дзе надрукаваны, змяшчаю яго тут як памяць пра дзіцячыя гады.*

*Каміла Нарбут*

# Вандроўка ў Беларусь[1]

*Вам, мае любімыя кузынкі і сяброўкі, прысвячаю гэты ліст, вам, жанчыны, бо я не надзелена магутным розумам і таму не магу пісаць для мужчын. У сваіх успамінах пра паездку ў Беларусь я напісала некалькі замалёвак з сучаснага нам жыцця.*

*У лісце да Аляксандры М. я зрабіла некалькі заўваг наконт жаночага полу ў надзеі, што хто-небудзь з нашых геніяльных аўтарак, абуджаных гэтай светлай замалёўкай, захоча зрабіць для жанчыны больш, выступіць супраць многіх і многіх забабонаў, якія жывуць у думках шырокай грамадскасці.*

*Вы можаце, любыя Пані, вельмі строга меркаваць аб маіх разумовых здольнасцях, але прыміце да ўвагі добрае сэрца, якое ахвярую вам праз гэтую невялікую працу, што не павінна падвяргацца сумневу і выклікаць папроку з вашага боку.*

## Мая маці, мой тата і некалькі ўспамінаў з гэтага падарожжа

Неяк пасля ранішняй малітвы мая маці[2] села за сваё любімае рукадзелле і спытала, што мы будзем сёння чытаць? Спытала, бо мы ўжо скончылі чытаць гісторыю Напалеона.

- Было б добра паўтарыць раздзел з твора Шатабрыяна "Геній хрысціянства або прыгажосць хрысціянскай рэлігіі" [3], але пакінем гэта

---

[1] Jurewiczowa Kamilla. Koleda Kamilli Narbut dla kuzynek i przyjaciolek na rok 1852. Wilno, 1852.

Пераклад і каментаванне аповесці Леаніда Лаўрэша.

[2] Жонка Юстына Нарбута і маці Камілы - Петранела з Сабаньскіх. - *Л.Л.*

[3] Геній хрысціянства або прыгажосць хрысціянскай рэлігіі (фр. : Le Genie du christianisme, ou Beautes de la religion chretienne ) - твор французскага пісьменніка Франсуа Рэнэ дэ Шатабрыяна, напісаны падчас яго выгнання ў Англію ў 1790-я гг. для абароны каталіцкай веры падчас Французскай рэвалюцыі. Упершыню быў апублікаваны ў Францыі ў 1802 г. пасля таго, як

на потым. Зараз я павінна пагаварыць з табой пра адну важную для нас рэч. Твой бацька праз два тыдні едзе ў Беларусь, каб залатвіць сямейныя справы і бярэ цябе з сабой.

- Я мушу ад'ехаць за сто міль ад хворай мамы?

- Гэтыя тры месяцы са мной будзе кузынка Барбара.

- Ніхто не заменіць дачку! - плачучы сказала я.

- Супакойся, Камілка, у гэтым годзе я паздаравела і ўсё лета, з Божай дапамогай, абыдуся без цябе. Ты не ведаеш свайго дзядзьку, цётак, нікога з маёй сям'і: яны добрыя, дабрадзейныя, яны любяць мяне і будуць любіць маю дачку. Калі б ты засталася сіратой, што ёсць звычайным лёсам на нашай зямлі, дык яны былі б табе сябрамі, апекунамі і дарадцамі. Мой гучны плач расчуліў маму: яна абняла мяне і выцерла слёзы, я цалавала яе калені і прасіла так надоўга не аддаляць мяне ад сябе.

- Ты яшчэ дзіця, - сказала яна з пяшчотай, але з і годнасцю, якой яна заўсёды адрознівалася, і дадала камандным тонам:

- Гэтага мы, бацькі, жадаем. А добрая дачка павінна быць паслухмянай.

Прывучаная з дзяцінства да пакорлівасці, я не адважылася сказаць ніводнага слова супраць гэтай святой для мяне волі і нават перастала плакаць.

Мая маці, страта якой стала потым самым балючым пачуццём і шмат гадоў раздзірала маё сэрца, была дабрадзейнай і разумнай жанчынай. Бог даў ёй далікатную душу, востры розум і добрае выхаванне - акрамя валодання трыма замежнымі мовамі: французскай, нямецкай і італьянскай, яна добра ведала геаграфію, гісторыю сваёй краіны, усеагульную гісторыю і літаратуру, але мала ведала нашу класіку. Сачыненні пані Гофман[4], акрамя яе аповесці "Караліна", яна лічыла вельмі карыснымі. Пераклады Адынцом англійскіх паэтаў яна прымушала мяне чытаць услых па некалькі разоў, усё для таго, каб атрымлівалася ўсё

---

Шатабрыян вярнуўся ў Францыю пасля агульнай амністыі Напалеона для эмігрантаў, якія ўцяклі ад рэвалюцыі. Напалеон, які нядаўна падпісаў Канкардат з папам, першапачаткова выкарыстаў кнігу Шатабрыяна ў якасці прапаганды, каб заваяваць падтрымку сярод французскіх католікаў. Праз пяць гадоў ён пасварыцца з аўтарам і адправіць яго ў ссылку. У "Геніі хрысціянства" Шатабрыян абараняе мудрасць і прыгажосць хрысціянства ад нападаў з боку французскіх філосафаў эпохі Асветніцтва і рэвалюцыйных палітыкаў. Кніга аказала велізарны ўплыў на культуру дзевятнаццатага стагоддзя. - *Л. Л.*

[4] Клемянтына Гофман-Танская (Klementyna Hoffmanowa z domu Tanska, 1798-1845) - празаік, перакладчыца, рэдактар, адна з першых польскіх дзіцячых пісьменніц. Жонка пісьменніка і гісторыка Караля Гофмана. - *Л. Л.*

лепей і лепей - адным словам, яна любіла і паэзію і прозу і мела добры густ у літаратуры.

Мая маці мела самае добрае сэрца, высакародную натуру і строга, свята і аддана выконвала свае абавязкі. Калі хто з сям'і хварэў, яна дзень і ноч пільнавала хворага, забываючы пра ўласнае слабое здароўе, пра ежу і адпачынак. Строгая да сябе, яна не магла быць паблажлівай да сваіх дзяцей. Нас было двое. Мы не выхоўваліся разам. Першым з нас быў старэйшы за мяне мой брат. Нядаўна пачула ад яго, што ў сваім выхаванні ён больш абавязаны нашай маці, чым нашаму бацьку, бо ніводзін яго крок не пазбег яе хвалы ці вымовы. Ён не скардзіўся на строгасць маці, бо строгасць была неабходнай для выхавання маладога і жвавага чалавека, брат з удзячнасцю ўспамінаў сваю добрую маці, якая паказала яму шлях да прыстойнага жыцця. Была яна па-сапраўднаму набожнай і дабрадзейнай, але часам яе шчырасць адштурхоўвала і непрыемная праўда, якая проста кідалася ёю ў вочы, адварочвала ад яе кузынак і старых сяброў.

Яна ніколі не выракалася ўласнага меркавання, але нічога не рабіла без парады мужа і пяшчотна кахала яго да самай смерці.

Яна мела выразны, рымскім твар з прыгожымі, вялікімі і блакітнымі вачамі, у іх адбіваўся кожны рух і пачуццё яе душы.

Маці сама займалася маім выхаваннем і толькі хвароба перашкаджала ёй у гэтым. Яна з дзяцінства прымушала мяне над усім задумвацца. Любую з'яву ці маё пытанне яна паглыблена разбірала і тлумачыла, чаму гэта так.

Заахвочаная маці, я на чатырнаццатым годзе жыцця пісала вершы і апавяданні, якія яна выпраўляла, і часам нехта з нашых сяброў перадаваў іх у друк.

Любіла мяне больш за ўсіх на зямлі, але ніколі не дазваляла не выканаць нават самы малы абавязак. Настаўленні яе часам былі занадта жорсткімі, але заўсёды зыходзілі са стараннага клопату пра маё дабро.

Усмешка задавальнення, пяшчотныя абдымкі былі мне ўзнагародай за стараннасць у вучобе ці за кожную разумную думку, выкладзеную на паперы. О! Якой жа мілай для мяне была гэтая ўзнагарода! Не памяняла б яе на лаўровы вянок з Капітолія.

І вось з такой маці, я, змучаная трывогай з-за яе слабога здароўя, расставалася на тры месяцы.

Дзень ад'езду яшчэ раз падарыў пяшчоту ўсёй сям'і. Мая маці, са слязамі на вачах, ад усёй душы, даручыла дагляд за мной шляхетнай панне П., якая ехала з намі:

- Беражыце яе, дарагая Ружа, яна няўважлівая, рассеяная і з-за няшчаснага выпадку лёгка можна патрапіць у бяду. Калі будзе халоднае паветра, накрыйце яе, асабліва беражыце грудзі і горла, бо бедная Камілка, мае схільнасць да запаленчых захворванняў.

- Ты, Юстыне (звярнулася да мужа), дай мне слова, што не будзеш шмат курыць тытуню. Чаму кашляеш і ўстаеш раненька? Бо табе гэта шкодзіць. Калі будзеце ў Вільні, закажы імшу ў Вострай браме і дай міласціну бедным.

Выкліканы ў пакой фурман атрымаў загад, і яму былі абяцаны ўзнагароды, калі ехаць будзе асцярожна і пільна і не будзе піць па дарозе гарэлкі. А я ў сваю чаргу яшчэ раз заклікала кузынку Барбару сачыць за здароўем маёй маці і расказала ёй пра розныя спосабы палегчыць яе нярвовыя пакуты. Разам з маім бацькам я прасіла Барбару ў выпадку пагаршэнне хваробы, неадкладна выклікаць лекара.

Каб упакаваць рэчы, карэты пад'ехалі пад самы ганак. Праз паўгадзіны свіст бізуна абвясціў, што абодва кані ўжо запрэжаны. Я кінулася на рукі да маці, мы абедзве сумна плакалі, але нарэшце я павінна была ўступіць месца тату. Ледзь не страціўшы прытомнасць, я выбегла з хаты і села ў карэту.

Толькі калі мы праехалі некалькі вёрст, я заўважыла, што мой бацька вельмі расчулены. Таму праз сілу супакоілася і пачала з ім размову, а каб ён забыўся пра цяжкія думкі, я патроху пераводзіла гаворку на яго любімыя ўспаміны пра былая часы, пра яго маладыя гады, пра гісторыю нашай сям'і.

Мой тата быў прыгожы ў маладосці, бо і ў сталым узросце ён меў прыгожую і высакародную постаць. Меў мяккі характар, яго здаровы розум быў адшліфаваны адукацыяй, быў добрым грамадзянінам, суседам, паблажлівым панам для служкаў і сялян, яго любілі тыя, хто ведаў блізка. У добрай кампаніі бацька жартаваў і мог лёгка выказваць свае самыя складаныя думкі. Ён любіў літаратуру і сам любіў пісаць. Нават выдаў два невялікія гістарычныя творы[5], а пераклад з французскай гісторыі пра Генрыха IV пакінуў у рукапісе.

---

[5] У 1818 г. у Гародні выйшла з друку першая кніга Юстына Нарбута *"Нарыс першавытокаў ліцвінскага народа" ("Rys pierwiastkow narodu litewskiego, z roznych dawnych autorow zebrany"),* якая змяшчае звесткі пра прагісторыю і міфалогію. Гэта невялікая кніга мае 56 старонак, аўтар пазначаны крыптонімам "J. M." Невялікі наклад кнігі хутка разышоўся, і ў 1820 г. выйшла яе другое выданне, якое мела тую самую назву, але на гэты раз імя аўтара кнігі было пададзена.

Сын дыгнітарыя, мой бацька нарадзіўся і вырас у дастатку, але калі потым страціў багацце, дык абыякава прыняў зменлівы лёс і ніколі не марыў пра новыя ласкі няўстойлівай фартуны.

Ветлівы да ўсіх, ён умеў цаніць асабістыя якасці кожнага чалавека але меў адну загану - часам выхваляўся перад сябрамі старажытнасцю свайго роду, які выводзіў з адной крыніцы з Радзівіламі, ад паганскага архісвятара Ліздзейкі[6].

Гутарка наша неўзабаве стала ажыўленай. Бацька з-за свайго добрага сэрца і, каб пацешыць мяне, падрабязна распавёў пра самыя важныя падзеі свайго жыцця і пра розныя перыпетыі, праз якія прайшла наша сям'я. Ён казаў гэта і раней, і таму я чула гэткі аповед у мінулым не раз: бацька яшчэ ў калысцы атрымаў мачаху, бо мой дзед, калі быў дэпутатам на сойме ў Варшаве, зноў ажаніўся на шасцідзесятым годзе жыцця. Маладая жонка мела гарэзлівы шарм і сапсаванае сэрца, яна хутка наставіла яму рогі і хутка растраціла багацце. Няшчасны сірата ад першага шлюбу, пасля заканчэння школы, быў адпраўлены да генерала Касцюшкі, які 17-ці гадоваму юнаку надаў годнасць афіцэра, а праз тры месяцы тату прысвоілі званне капітана.

Неўзабаве скончылася вайна: змяніўся палітычны лад. Бацьку вызвалілі ад службы, і некаторы час ён жыў у Варшаве. Адбываў некалькі дзяржаўных службаў у Літве. Нарэшце ўбачыў цалкам спустошаны нягоднай мачахай маёнтак і з'ехаў да аднаго са сваякоў у Беларусь, дзе яму здарылася добра ажаніцца.

З гэтымі прыемнымі і непрыемнымі ўспамінамі мы праехалі дзевяць міль. Сонца ўжо зайшло, і шэрыя прыцемкі абрамлялі гарызонт, калі картавыя галасы яўрэяў, якія праязджалі каля нас, далі нам зразумець, што мы знаходзімся каля брамы Вільні.

Мы правялі ў горадзе толькі адзін дзень, паслухалі святую Імшу перад цудатворным абразам Божай Маці Збавіцеля і набылі некалькі

---

У 1842 г. у Вільні выйшла другая кніга Юстына Нарбута "*Унутраная гісторыя літоўскага народа з часоў Яна Сабескага і Аўгуста II...*" ("*Dzieje wewnotrzne narodu litewskiego z czasow Jana Sobieskiego i Augusta II, krolow panujacych w Polsce; wyciag z roznych notacy0w i manuskryptow.*" Т. 1-2, 1842 г., 2-е выд. 1843 г.). - *Л. Л.*

[6] Нарбуты - шляхецкі род герба "Трубы". Вядуць род ад баярына Нарыбута (Нарбута) Яталтавіча. Паводле родавага падання, былі сваякамі магнацкага роду Остыкаў, таму пісаліся часам Остык-Нарбутамі. Па легендзе, галоўны паганскі святар Літвы Ліздзейка, быў продкам Остыкаў і Радзівілаў і параіў князю Нарымонту пабудаваць сваю сталіцу Вільню, адсюль: **Радзі-віл** - той, хто радзіць Вільню. Сустракалася форма Радзівіл-Остык. - *Л. Л.*

рэчаў, неабходных для маіх строяў.

Першае, што мяне зацікавіла пасля ад'езду з Вільні, была вёска Рукойні[7], якая належала рыма-каталіцкай Капітуле. Усе хаты мелі каменныя падмуркі, вялікія вокны і коміны над дахам. О, як дабраславіла я высакародных капланаў, якія сваёй праўдзівай бацькоўскай апекай вызвалілі ад сырасці і дыму хоць гэтую малую частку літоўскага народа.

Вечарам мы ўбачылі брудныя Ашмяны, дзе моцная залева спыніла нас на начлег. Мы занялі два пакоі ў яўрэя, які гандляваў трункамі. З суседняй хаты даносіліся крыкі і смех. Там спыніліся лакеі чыноўнікаў, бо ніхто іншы не пайшоў бы куляць шклянку за яўрэйскім сталом.

Добра, што з намі ехаў свой кухар, бо ў гэтым гаротным месцы меўся толькі адзін тракцір, у якім ніколі не гатавалі вячэру. Ела я, папраўдзе, мала: мучылі мяне смутныя ўспаміны пра родны дом, і спала мала, бо сон быў, як у гарачцы.

У Смаргоні наш экіпаж акружылі маладыя дзяўчаты з вязанкамі дробных абаранкаў у руках[8]. Кожная хваліла свае, штурхала і лаяла чужыя.

- Ці не ходзяць гэтыя дзяўчаты жаць? - спытаў бацька ў яўрэя.

- Не жнуць, не прадуць, - адказаў ён, - цэлы дзень сядзяць на сонцы, чакаюць падарожных.

- Ну, вось, ужо маем папрашаек у нашай краіне, - сказаў мне бацька. Як бы здзівіўся працавіты прусак ці разумны саксонец, убачыўшы столькі адданых гультайству здаровых і дужых жанчын.

- А папрашайкі-немкі, яны што, іншыя?

- Таму яны і іншыя аферысты і едуць у гасцінную Літву, бо на сваёй бацькаўшчыне іхняй доляй былі б беднасць і пагарда.

Пасля Лебедзева, якое знакамітае сваімі цудамі, з'явіўшыміся ў вадзе, мы прыехалі ў Менск.

Жадаючы свяціць, хоць і чужым святлом, паўтару тут пачутае з вуснаў шаноўнага гісторыка Літвы Тэадора Нарбута.

*"Пра час заснавання Менска ў летапісах амаль не згадваецца. Адкуль вынікае, што заснаваны ён ў дагістарычныя часы. Найбольш старажытны ўспамін пра горад адносіцца да 1067 года пасля*

---

[7] Сёння - Рукайняй (літ.: Rukainiai, традыцыйная беларуская назва - Рукойні) - вёска ў Віленскім раёне Віленскага павета Літвы. - *Л. Л.*

[8] Смаргонь здаўна славілася сваімі абаранкамі. Для іх выпечкі рабілі спецыяльныя печы, у якіх жанчыны-абараначніцы пяклі вялікія і маленькія абаранкі, з макам і без яго. Прадаваліся смаргонскія абаранкі не толькі на мясцовых рынках, але па ўсім ВКЛ. - *Л. Л.*

*Хрыста. […]".*

Пасля дэманстрацыі запазычанай эрудыцыі, самы час вярнуцца да апісання нашай вандроўкі. Пагодны вечар падштурхоўваў нас да прагулкі. Ідучы на шпацыр у сад, мы наведалі невялікі бульвар з таполямі і некалькі купецкіх крам. У кожнай з крам галоўнай рэкламай былі словы: *"Пан Ракіцкі гэта купіў - пан Ракіцкі гэта пахваліў".*

- А хто такі гэты пан? - спыталася я ў яўрэя.

- Вы, мусіць, паненка з далёкай краіны, калі не чулі пра яго. Ён - граф! Ён - багаты пан! Колькі разоў ён ні прыедзе ў Менск, дык заўсёды ўсім купцам дасць прыбытак![9]

Сад досыць добры, жывы з-за рэчкі Свіслач, якая працякае праз яго, і напоўнены шматлікай публікай. У малых мястэчках усе ведаюць адзін аднаго. Таму прыезд чужынцаў выклікаў ўсеагульную цікаўнасць. Наш лакей, які стаяў каля брамы саду, стаміўся ад пытанняў пра нас, таму яму ў галаву прыйшла дзіўная ідэя надаць нам нейкае мудрагелістае прозвішча і схлусіць, што мы едзем з Варшавы ў Смаленск. Гэтая ілжывая навіны дайшла да вушэй дзяржаўных чыноўнікаў, і ў нас запатрабавалі пашпарт.

Менск - старажытны горад: ён перажыў некалькі страшных пажараў, якія пакінулі свае знакі. Мне спадабаўся рынак з крытай галерэяй для гандлю садавінай і гароднінай, я бачыла яго, калі праязджалі побач. Касцёлаў не наведалі, бо на другі дзень, на раніцы, мы ўжо выехалі з горада.

Ад Менска пачынаецца вялікая пушча, якая належыць князям Радзівілам. Чула, што цягнецца яна на трыццаць вёрст і злучаецца з лясамі іншых гаспадароў. Мне падабаюцца векавыя дрэвы: від іх вяртае думкі ў далёкую мінуўшчыну. Каб агледзець тоўстыя і высокія сосны, мы некалькі разоў выходзілі з карэты. Нехта сказаў мне, што ў нізінах растуць вялізныя дубы, якія памятаюць яшчэ паганскія стагоддзі - час, калі яны самі былі часткай рэлігійнага культу. Мянялася вера, не раз мянялася ўлада, змяніліся пакаленні людзей, а іх жыццё працягваецца і дагэтуль.

На Бярэзіне, пад Барысавам, агледзелі прыгожы мост на каменных аркадах, які цягнецца амаль што на вярсту. “Ах! Колькі трэба было назбіраць камянёў”, - падумала я пра сябе, перш чым гэтая вялікая праца была выканана!

---

[9] Верагодна, Людвік Ракіцкі (1774 - пасля 1828), грамадскі дзеяч, буйны землеўласнік, у 1811-1814 гг. - менскі губернскі маршалак. - *Л. Л.*

- Тут некалькі дзесяткаў гадоў таму, - сказаў мне бацька, - была сутычка паміж рускімі і французамі. Тады воды Беразіны прынялі шмат людзей і шмат нарабаванага золата.

Фантазія адразу падказала мне жудасную сцэну. Я ўявіла, як сярод грукату зброі чую стогны паміраючых, бачу, як салдаты, пакрытыя ранамі, зрываюцца з моста і цяжкія фурманкі падаюць на іх, на іх таксама падае жоўты метал, які яшчэ зусім нядаўна быў для іх аб'ектам самай гарачай пажадлівасці.

Чалавечыя целы зжэрлі рыбы. Золата апусцілася на дно ў брудны іл, а рака, чыстая, як крышталь, цячэ і цячэ.

Барысаў - старажытны горад: паводле Стрыйкоўскага і Каяловіча, яго заснаваў у другой палове XII стагоддзя полацкі князь Барыс Гінвілавіч. Пра гэта я даведалася з працы шаноўнага Яўстаха графа Тышкевіча, апублікаванай у 1847 годзе пад загалоўкам "Апісанне Барысаўскага павета". Пра Барысаў шляхетны граф напісаў: *"Гэты горад на памежжы дзвюх краін, якое ніколі не мела асобнага існавання або асобнага жыцця. Яно служыла па чарзе толькі для абароны аднай супраць другой"*. [...]

Недалёка ад Барысава бачныя валы: ад аднаго добрага гараджаніна я даведалася, што іх насыпалі французы, гэта быў нейкі праект пабудовы занядбанай сёння цвердзі.

Кучы прамысловага дрэва і велізарныя склады солі на берагах ракі сведчаць аб тым, што па ёй плаваюць шматлікія віціны[10] і плыты.

Граф Яўстах Тышкевіч таксама падае нам звесткі пра гандаль па Бярэзіне. [...]

Дзесьці праз паўтара дня дарогі ад Барысава, не памятаю, у Менскай ці ўжо ў Магілёўскай губерні, тата загадаў мне лепш апрануцца, бо мы будзем начаваць у нашай кузынкі пані К.

Адразу пасля поўдня я ўбачыла двор, абсаджаны прыгожымі таполямі. Мы спыніліся перад мураваным палацам. Шматлікія слугі сустрэлі нас на ганку. Камердынер правёў у багата ўпрыгожаны салон, дзе праз венецыянскія вокны ліліся плыні святла. Яны адбіваліся ў шматлікіх люстэрках, карцінах, статуях, фарфоравых вазах з натуральнымі і штучнымі кветкамі, але ў салоне нікога не было. Праз некалькі хвілін гаспадыня, жанчына больш чым паўвекавога ўзросту, выйшла з бакавога кабінета. Апранутая гаспадыня была ў выцвілы шаўковы

[10] Віціна - рачная пласкадонная лодка з падоўжаным корпусам. - *Л.Л.*

шлафрок і паношаную турэцкую шаль.

- Ах, пан Юстын! - ускрыкнула яна і з пяшчотай абняла бацьку.

- Ты не змяніўся, кузын! Хоць гадоў з 20 я цябе не бачыла. А гэта, мусіць, твая Камілка, пра якую ты мне пісаў. Як жыве твая шаноўная жонка і сын Рамуальд?

Пасля таго, як мы селі на канапу, бацька адказаў на гэтыя ветлівыя пытанні. Тады дарагая кузына ўважліва прыгледзелася да мяне, і, блытаючы французскія словы з польскімі, знайшла маё падабенства з рознымі асобамі з нашага роду, яна пахваліла мае вочы, лоб і тон маёй гаворкі, што дало мне першае ўяўленне пра тактоўнасць салонных ветэранаў гэтага краю. Размова нарэшце набыла больш сур'ёзны адценне. Расказ бацькі пра змены, якія адбыліся за апошні дзясятак-другі год у Вільні захапіў увагу гаспадыні. А мне захацелася крыху прайсціся па салоне. Раптам, адчыніліся бакавыя дзверы з саду, і перада мной з'явіўся чалавек-нябожчык. Вочы яго былі шэрыя і патухлыя, твар блакітна-жоўты, шыя тонкая і доўгая, магільнай мёртвасцю веяла ад усёй яго фігуры.

- Гэта мой сын, Эдвард, - сказала пані К. - Ты не ведаеш, мой дарагі Эдвард, кузына Н. і яго дачку Камілу. Мярцвяк пакланіўся.

- Мой сын увесь час пакутуе, - працягвала яна, - бядак наведаў Карлсбад, Бадэн і нідзе, нідзе не знайшоў сабе здароўя.

- Можа, мясцовыя воды будуць больш эфектыўнымі? - сарамліва сказала я.

- Ні адзін доктар мне іх ніколі не рэкамендаваў, - хрыплым голасам адказаў пан Эдвард. - Мінеральныя крыніцы на поўначы занадта слабыя.

- Гісторыя павінна была прыстасаваць іх да нашых патрэб, - перабіў яго бацька, - і для дзяцей поўначы, самымі здаровымі павінны быць воды роднай зямлі[11].

Дзверы з бакавога кабінета зноў адчыніліся, і хуткімі крокамі ўвайшла прыстойная бландзінка, якую пані К. прадставіла нам як блізкую сваячку памерлага мужа. У панны Эміліі быў звычайны твар, але яе круглыя, белыя і румяныя шчокі дыхалі здароўем, а маленькія, блакітныя вочы глядзелі хутка і смела. Жвавыя, вясёлыя, яна шмат гаварыла, гучна смяялася і было бачна, што гадавалася яна свабодным чалавекам.

---

[11] Каміла Юрэвіч з Нарбутаў як і яе далёкі сваяк Тэадор Нарбут садзейнічалі развіццю курорта з мінеральнымі водамі ў Друскеніках (зараз - Друскенінкай). У 1873 г. Каміла надрукавала нарыс пра Друскенікі з апісаннем гэтага курорта. Гл. *Kamilla z Narbutow Jurewiczowa. Z Druskienik. Orany, Merecz, Druskieniki // Kronika Rodzinna: pismo dwutygodniowe. № 17, 1 wrzesnia 1873. S. 260-261.*

Падалі абед. У сталовай мы ўбачылі некалькі мужчын: гэта былі службоўцы маёнтка, якія занялі шэры канец стала. Сямейны доктар, родны брат Эміліі, сеў побач з панам Эдвардам. Мой бацька ведаў яго ў Вільні, калі ён скончыў курс медыцынскіх навук, і любіў з-за шляхетнага сэрца і адукаванага розуму.

Размаўлялі пра сёлетні ўраджай, пра законы, пра еўрапейскую палітыку - пра вялікія і малыя рэчы - дакладней, размаўляў мой бацька з лекарам, бо Эдвард размаўляў мала.

- Ці не думаеш, Уладзіслаў, - спытала пані К. у доктара, - што наш Эдвард сёння выглядае горш, чым заўсёды?

- Трэба яму пракаціцца і падыхаць духмяным паветрам лугоў і лясоў.

- Немагчыма з'ехаць з дому, калі ў цябе такія мілыя і жаданыя госці, - сказала пані К.

- Хворыя маюць свае прывілеі, - сказаў мой тата, - калі ласка, не рабіце нічога такога дзеля нас.

- Ці жадае пан Эдвард паехаць да суседа Асмалоўскага? - прапанаваў доктар, - гэта наш шляхетны сусед

- Часцей ён бывае у мяне, чым я ў яго.

- Можа, у Асмалоўскага ёсць нейкая карацейшая дарога, якую не ведаюць вашы фурманы?

Эдвард, не звяртаючы ўвагі на жарт, апусціў галаву, заплюшчыў вочы і здавалася, што ўвайшоў у той апатычны стан без пачуццяў і думак, якому часам падуладныя аслабленыя людзі.

Праз хвіліну ён выпрастаўся і ўтаропіўся на мяне. Мне зрабілася прыкра, і я захацела, каб абед як найхутчэй скончыўся. Калі ўжо ўсе ўставалі з-за стала, я пачула, як ён шапнуў доктару: "У Камілкі прыгожыя вочы".

Калі ўсе вярнуліся ў гасціную, Эдвард сеў побач са мной. Некалькі кілішкаў мадэры і шампанскага, якія ён выпіў падчас абеду, значна яго падбадзёрылі, і пачалася размова. Са здзіўленнем слухала я меркаванні кузына, якія цалкам супярэчылі прынцыпам, закладзеным у мяне з дзяцінства. Ён сказаў, што ніколі не чытае нашых кніг, бо добры густ ёсць толькі ў французскай літаратуры. Калі я сказала яму пра багацці нашай сучаснай літаратуры, ён спачатку ўсміхнуўся, а потым пачаў пазяхаць. Са страху, што з ім здарацца спазмы, я перапыніла літаратурную размову пытаннем, дзе ён збіраецца жыць зімой?

- Як толькі здароўе паправіцца, з'язджаю на некалькі гадоў у Францыю. Не падабаюцца мне аднастайныя забавы ў гарадах паўночных краін.

Найбольш характэрнымі былі гэтыя словы Эдварда: "Il faut jouir du present" [12] - бо будучыня - рэч цёмная і няпэўная. Чалавек павінен атрымліваць асалоду ад усіх, ад усяго прыемнага і не турбавацца пра што-небудзь ці каго-небудзь.

- Мяне заўсёды ўражвала, што кожны хрысціянін абавязаны цікавіцца дабром сваіх блізкіх, і дабром наогул, і толькі так ён можна зрабіць сучаснасць больш прыемнай, а будучыню больш светлай.

- Гэта катэхізіс, якога я не разумею, - адказаў ён і падышоў да стала, каб узяць сігару. Скарыстаўшы прапанову пані Эміліі, я паспяшалася ў сад.

Сад быў прасторны і агароджаны мурам. Стрыжаныя шпалеры ліп, піраміды з елак, як у старажытныя часы, рамантычны гай з крывымі сцежкамі, з шумлівым ручаём, які цёк на луг - ўсё гэта паказвала добры густ гаспадароў.

Панна Эмілія на працягу гадзіны пазнаёмілася са мной, і выказала мне поўны давер, бо назвала імёны трох кавалераў, якія змагаліся за яе руку, дадаўшы пры гэтым, што ні адзін з іх не змог атрымаць яе сэрца.

- А ты, Камілка, ці шмат у цябе кавалераў? - спытала яна.

- Пакуль ніводнага.

- Не веру! Я нават ведаю пра аднаго чалавека ў Вільні, які перапісваецца з маім братам і часам згадвае пра цябе з вялікай пахвалой.

- Хваліць можна і з павагі, і з сяброўства, і з ветлівасці.

У глыбіні шпалераў паказаўся пан Уладзіслаў, калі мы падышлі бліжэй да яго, Эмілія сказала:

- Паслухай, Уладзіслаў, Камілка такая скрытная, кажа мне, што ніхто аб ёй не стараецца і не стараўся!

- Такая скрытнасць вельмі пахвальная, - адказаў Уладзіслаў, - панна з добрым сэрцам не абвяшчае спісы сваіх прыхільнікаў: не ганарыцца тым, што адрынула чыю-небудзь дабрыню, бо калі і немагчыма раздзяляць пяшчотныя пачуцці, належыць быць удзячным чалавеку, які палюбіў цябе і хацеў быць тваім спадарожнікам праз усё жыццё.

Моцны румянец пакрыў твар Эміліі, яна мусіла прызнаць памылку, але ўсю раніцу яна была вельмі гаваркой і вясёлай.

Калі я вярнулася ў свой пакой, які месціўся паміж бацькавым і пакоем пані К., я пазбягала размовы з эпікурэйцам Эдвардам, і потым, на працягу нашай трохдзённай гасціны, паводзіла сябе з ім асцярожна. Эдвард і сапраўды быў такім, якім падаўся мне ў самы першы момант, калі я ўбачыла яго. Гэта быў нябожчык, але з ліку тых нябожчыкаў, у

[12] Фр.: "Вы павінны атрымліваць асалоду ад жыцця". - *Л. Л.*

якіх кроў яшчэ цячэ па венах і пульс яшчэ б'ецца - адным словам, у целе яшчэ ёсць іскра жыцця побач з цалкам мёртвым духам.

- Што разбурыла здароўе Эдварда? - спытаў мой тата у доктара - што за загана? Ці справа ў спадчыннасці? Можа разумовая праца?

- Ні тое, ні другое: ён нарадзіўся здаровым; яго навучанне было абмежавана толькі французскай і нямецкай мовамі. Хвароба Эдварда - вынік ласкі, празмернасцяў і залежнасцяў. Маці любіла яго, яна прадчувала ўсе яго жаданні, яна дагаджала ўсім яго капрызам, ён быў сыты з калыскі, ён меў усё. Але пасля выхаду з-пад апекі, ён адхіліў сваю маці ад маёмасці і не пакінуў ёй ніякага даходу, бо лічыў, што старыя людзі не маюць патрэбы ў грашах. Чытанне скандальных кніг канчаткова сапсавала маладога чалавека і так выхаванага без якіх-небудзь рэлігійных або маральных прынцыпаў. Канец яго будзе заўчасны і сумны. Калі не сухоты, дык вадзянка, напэўна яго не абміне[13].

Я з пачуццём жалю глядзела на бедную пані К., якая не сумела стаць добрай маці, а стала прычынай згубы свайго адзінага, любімага дзіцяці.

---

[13] Пра падобны тып маладых людзей пісаў віленскі мемуарыст СтаніслаўМараўскі: *"...дастаткова рабіць адваротнае таму, што рабілі ў старыя часы - знішчыць сваё здароўе свавольнымі выбрыкамі, у дзевятнаццаць гадоў стаць бледным і сухім, як мумія і такім чынам спаралізаваць кветку маладосці яшчэ ў першацвеце, як заўгодна сваволіць па цёмных кутах і змучыўшы сябе распустай і бяссонніцай, уваходзіць у салон штурхаючы жанчын у бакі, усім наступаючы на ногі, з цыгарным смуродам стаяць у канцы залы, маўчаць, уздыхаць, сумаваць, пазяхаць, прыхінуўшыся пры гэтым да сцяны, дзвярэй ці акна - раней так рабілі толькі ў шынках, ці разваліцца ў фатэлі і скрыжаваць ногі. Словам, цалкам ісці за імпульсамі прыроды і пачуццём камфорту і праз гэта выглядаць незвычайна выхаваным чалавекам, каб кожны бачыў, што той, хто гэтак можа сябе паводзіць, хто пагарджае дробязямі, з якіх складаецца гжэчнасць, ёсць чалавек вышэйшых сфер, вышэйшых жарсцяў і пачуццяў. Што вулкан яго сэрца, агонь яго душы, вогненная лава яго памкненняў, вытруцілі, знішчылі і высушылі яго цела. Ён сёння - герой салона. Такога сёння шукаюць жанчыны. Ён можа быць дурным, як стол - тым лепей! Хто скажа, дурны ён ці мудры, калі ён увесь час маўчыць? А ўздыхаць кожны можа і навучыцца гэтаму не доўга. І толькі тады, калі такімі манерамі заваявана сэрца маладой жанчыны і яна набліжае такі ідэал да сябе, толькі тады выяўляецца страшэнны вакуум! Знікае падманлівая знешнасць, і ва ўсёй аголенай праўдзе, перад ёй стаіць малады чалавек са знішчаным целам і духам - нябожчык фізічна і маральна, а, можа, яшчэ і больш страшны за нябожчыка, бо пярэварацень ці прывід! Поўнае расчараванне"*. - цыт па: Morawski Stanislaw. Kilka lat mlodosci mojej w Wilnie (1818-1825) . Warszawa, 1924. S. 136.

Напярэдадні нашага ад'езду, падчас вячэры мой бацька спытаў:

- Як далёка ад пана Эдварда жыве падкаморы[14] М.

- Прыкладна тры мілі адсюль, недалёка ад паштовага тракту, - адказала адразу некалькі галасоў.

- Мне трэба яго наведаць. Калі я некалькі гадоў жыў у Беларусі, ён быў маім самым любімым таварышам, мінулай зімой я сустрэў пана М. у Вільні і даў слова, што наведаю яго.

- А я паеду да яго заўтра ці паслязаўтра, - сказаў Эдвард, - каб толькі пазнаёміцца з дачкой падкаморага, славутай прыгажуняй Адэляй, якая сёлета вярнулася з Пецярбурга.

Доўга гаварылі пра падкаморага: пані К. хваліла яго як добрага бацьку - ён даўно стаў удаўцом, але не навязаў дзецям мачаху. У рэшцерэшт, пані К. назвала яго сумленным і заможным шляхціцам.

- Ён вельмі ганарыцца, - сказаў доктар, - што паходзіць са старажытнага шляхецкага роду і мае значны маёнтак. Сваю ветлівасць да тых, хто часам бывае ў яго доме, ён прыстасоўвае да даўжыні іх генеалагічнай лініі альбо да штогадовага даходу.

- Улічваючы ўсё гэта, пан М. заўсёды лічыўся добрым чалавекам, сказаў мой бацька.

- Кажуць, што ён быў даволі добрасумленным чыноўнікам, - адказаў Уладзіслаў, - я не чуў, каб крыўдзіў бліжняга ці пацягнуўся да чужой маёмасці. Але разам з тым ён - халодны сябелюбец і з-за сваёй залішняй звычкі да дароў фартуны, ніколі не падае міласціну жабракам, кажучы, што менавіта ў гэтым і ёсць абавязак клапатлівага бацькі пра лёс сваіх дзяцей. Не, я не ведаю, ці заслугоўвае імя праведніка той, хто любіць толькі сябе і сваіх дзяцей.

- Наш Уладзіслаў, - сказала з усмешкай пані К., - змог дасканала вывучыць характар падкаморага, бо тры гады наведваў яго па некалькі разоў на тыдзень.

- Ён, відаць, закахаўся ў яго дачку.

- Гэтая зорка толькі нядаўна заззяла на нашым небасхіле. Панна Адэля гадавалася ў Пецярбургу ў блізкай сваячкі сваёй маці, багатай удавы нейкага генерала, пасля якой яна, як прыёмная дачка, павінна была атрымаць у спадчыну ўсю маёмасць. Але мінулай зімой удаве генерала спадабаўся капітан гвардыі, і яна выйшла за яго замуж. Пазбаўленая надзеі, пляменніца вярнулася на радзіму.

- Тады, можа, ты быў закаханы ў пані Сакольскую, сястру

---

[14] Падкаморы - у ВКЛ суддзя па спрэчках аб межах маёнткаў у падкаморскіх судах. У Расійскай імперыі стала сінонімам пасады камергера ці азначала сімвалічнае, спадчыннае званне, як памяць пра былыя часы. - *Л. Л.*

падкаморага, па якой і я ў маладосці трошкі ўздыхаў?

Усе засмяяліся.

- Вы не надта памыліліся, - адказала пані К., - бо характар Сакалоўскай адрадзіўся ў яе дачцэ Караліне ... і яна (як я думаю) усё яшчэ ёсць гаспадыняй думак шаноўнага Уладзіслава.

- Які дзіўны густ, - сказаў Эдвард, - яна самая пачварная жанчына ва ўсёй нашай парафіі, я бачыў яе нядаўна ў касцёле.

- Караліна - цалкам прыстойная дзяўчына, - запярэчыла пані К.

- Заўсёды было вядома, што аб густах не спрачаюцца, - дадаў Уладзіслаў, - і, нарэшце, маё ўяўленне пра прыгажосць зусім іншае - я не шукаю яе ў формах цела. Я шукаю тое, што фармуе цела.

- І дзе вы гэта думаеце знайсці? - спытаў Эдвард.

- Для мяне прыгажосць духу - сапраўдная і адзіная каштоўнасць, якая надае чароўнасць і самым непрыгожым рысам твару.

Эдвард, які ў гэты момант апаражніў свой кубак з вінам, захлынуўся ад смеху і адразу пасінеў ад кашлю. Пасля вячэры Уладзіслаў пайшоў, а Эмілія сказала мне, што ў свой час ён быў абражаны стаўленнем да яго падкаморага і хацеў забыцца на Караліну. З такім намерам выехаў разам з Эдвардам за мяжу. Але ні трохгадовая адсутнасць, ні ладныя немкі, ні вытанчанае какецтва дасціпных француажанак не здолелі знішчыць пачуццяў, якія абудзіла ў яго сэрцы сціплая літоўская панна.

- Гэта словы з ліста майго брата, - сказала Эмілія, - напісанага мне некалькі месяцаў таму. Як жа ён узрадаваўся, - дадала яна, - калі даведаўся, што Караліна не выйшла замуж і ён падабаецца ёй, як і раней. Цяпер брату стала лягчэй, пра што яшчэ не ведае пані К., і праз шэсць тыдняў я буду мець братавую, з якой мы будзем разам жыць у горадзе, дзе Уладзіслаў атрымае дзяржаўную службу.

Пасля развітання, перад якім быў багаты сняданак, мы пакінулі дом пані К. Некалькі дзён адпачынку надалі коням хуткасці, і наша падарожжа не доўжылася і трох гадзін. Падкаморы ласкава сустрэў старога сябра. Гэты быў шасцідзесяцігадовы чалавек моцнага целаскладу, румяны, свежы, са смелым і гордым тварам - дасканалы тып ранейшага шляхціца. У яго салоне знаходзіліся дзве жанчыны: здаўна знаёмая майму бацьку пані Сакольская і яе дачка. З аблічча першай жанчыны час ужо сцёр жаночыя чары, якія ззялі калісьці, і пакінуў толькі адбітак шляхетнасці і дабрыні, якіх нішто не зможа знішчыць. Караліна мела бледны колер твару, злёгку нахілены падбародак і шырокі нос. Я знайшла яе непрыгожай, але, калі заўважыла яе позірк, у якім адлюстроўвалася пяшчотная і ўдумлівая душа, калі мае вушы пачулі прыемны гук яе голасу, я зразумела выбар пана Уладзіслава.

Літаральна за паўгадзіны да нас сюды прыехала дачка гаспадара: элегантная і акуратная панна Адэля. Яна была ўвасобленым ідэалам незямной прыгажосці: так малююць грацый, так жыхары ўсходу ўяўляюць сабе гурый. Перад яе дасканалымі рысамі тавару бляклі лілеі і ружы. Чорныя вочы зіхацелі, як дзве зоркі, а такую стройную, высокую і лёгкую фігуру паэты прыпісвалі міфічным німфам. Я глядзела на красуню, як на прыгожую кветку, як на нейкую казачную багіню. Але ўсю маю ўвагу заняла размова бацькі з падкаморым і яго сястрой.

Мой бацька нагадаў пані Сакольскай, што ён калісьці яе кахаў, і з жартам заўважыў, што не атрымаў ад яе ўзаемнасці. Сакольская адмаўляла гэта, сцвярджаючы, што каханне такога прыемнага кавалера абавязкова абудзіла б яе, але прыгожы пан Юстын быў тады занадта ветранай асобай.

- Гэта праўда, - пацвердзіў падкаморы, - памятаеш, як ты спрабаваў адначасова спадабацца маёй сястры і старасціне[15] В., і для той, і для другой складаў вершы, якія я табе зараз прачытаю.

Я папрасіла прадыктаваць мне вершы майго бацькі, але ў яго памяці засталіся толькі дзве страфы. Гэта былі вершы ў класічным стылі мінулай эпохі: каханак скардзіўся на купідона, які нанёс яму балючую рану і клікаў на дапамогу музу, каб ухваліць сваіх мучыцеляў.

- Васпан Антоне, чаму мяне папракнеш у легкадумнасці, - сказаў тата, хіба ты забыўся пра свае заляцанні на Хаславіцкім[16] кірмашы да паненак з двух народаў? Тады ты яшчэ не меў гэтых белых вусоў і такой тлустасці, пан Антоні тады яшчэ быў стройны і спрытны, ён не толькі на словах, але і ананасамі, апельсінамі і цукеркамі аддаваў даніну мясцовым і расійскім прыгажуням. Гэта адбывалася ў 1806 годзе.

- Мусіш расказаць гэтую гісторыю, пан Юстын, бо, здаецца, я заўсёды быў занадта цяжкі для гэткіх прыгод.

- І таму хацеў адбіць у мяне маю будучую жонку, калі я да яе заляцаўся?

- Панна С. была ў маім гусце і я пашкадаваў, што сустрэў яе занадта позна.

- Як быццам гэта было сёння, памятаю, - сказаў мой бацька, звяртаючыся да Адэлі і Караліны, - у Халобліне[17] я гуляў у віст і пачуў з іншага пакоя спевы пана Антонія пад гукі іспанскай гітары:

*Скажы мне, Разіна, пра што думаеш у гэты час?*

---

[15] Старасціна - жонка старасты. - *Л. Л.*

[16] Зараз Хіславічы - пасёлак гарадскога тыпу ў Расіі, на рацэ Сож. Адміністрацыйны цэнтр Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці. - *Л. Л.*

[17] Халоблін, каля Крычава, маёнтак Галынскіх. - *Л. Л.*

…..

Мы якраз тады былі ў пана старасты Свянткоўскага і я адчуў нейкі неспакой. Папрасіў пана Міхала Гальнскага сесці на маё месца, а сам стаў каля дзвярэй. Пан Антоні спяваў гэтую пяшчотную песню каля ног маёй абранніцы і вельмі разгубіўся, калі ўбачыў мяне, закашляўся, перастаў спяваць і адсунуўся ад яе.

- Усяроўна, дружа, ты мне тады ўсё дараваў.

- Я дараваў табе, бо тваё заляцанні не мелі выніку. Інакш не абышлося б без дуэлі і нехта з нас пайшоў бы ва ўлонне Абрагамава. Падкаморы і яго рываль засмяяліся і абнялі адзін аднаго.

Калі прабіла 12-я гадзіна, падалі гарэлку і розныя салёныя і салодкія прысмакі на двух падносах. Моцны галаўны боль не дазволіў мне скарыстацца гэтымі багаццямі, і я папрасіла гарбаты. Добрая Караліна паклапацілася пра гарбату, і мы разам пайшлі на балкон, з якога быў бачны фруктовы сад, упрыгожаны markdown рознымі клумбамі ў форме зорак, паўмесяцаў, трохкутнікаў і квадратаў, засаджаных чаромхай і засеяных летнімі кветкамі. У канцы алеі стаяла альтанка з зялёным дахам і двума вялікімі вокнамі.

Прайшоўшы некалькі пакояў, я заўважыла, што ўся мэбля ў доме новая і модная, і зрабіла выснову, што гэта з-за прыезду з Пецярбурга дачкі дзедзіча.

Вытанчана размаўляючы па-французску, хутка ўвайшла Адэля, яна хвалілася весела праведзеным часам і этыкетам у сталіцы:

- Quelle charmante![18] - паўтарыла яна некалькі разоў. Пра іншыя рэчы і нават пра двух братоў, якія знаходзіліся там на ваеннай службе, расказвала з ахвотай. З-за добрага святла на балконе, я ўбачыла на яе прыгожым твары нейкую тугу, можа быць, з-за былой весялосці ў сталіцы.

Прынеслі гарбату, прыйшла і Караліна. О, колькі было жыцця! Колькі пачуццяў у яе размове! Якая мілая прастата была ў яе словах і рухах, і згаслі ў маіх вачах чары Адэлі. У соты раз я зразумела перавагу моцнага духу, які вышэй за прыгажосць і стройнае цела.

Што да падкаморага, дык меркаванне доктара Уладзіслава ў першыя хвіліны здалося мне занадта рэзкім, але хутка я пераканалася ў яго праваце.

Мы ўжо збіраліся абедаць, калі лакей абвясціў аб прыездзе пані капітанавай[19] Люблінскай.

[18] Фр: "Як чароўна". - *Л. Л.*

[19] Капітанава - жонка капітана. - *Л. Л.*

- Чаго яна ад мяне хоча?

- Кажа, што мае да вас справу.

- У мяне да яе справы няма, няхай пачакае ў гардэробе.

- Можа, брат дазволіць, - адазвалася пані Сакольская, каб гэтая бедная жанчына з намі паабедала?

- А пасля абеду яна папросіць у мяне бочку жыта, бо гэтак заўсёды бывае, - дадаў падкаморы з іранічнай усмешкай.

- Якая гэта Люблінская? - спытаў бацька.

- Удава Гаўдэнцыя, - адказала Сакольская, - за мілю адсюль ён меў прыгожы фальварак. Але марнатраўца і карцёжнік, ён страціў усё і пакінуў жонку і дзяцей у галечы.

- За Гаўдэнцыем Люблінскім, як я памятаю, была кузынка маёй жонкі. Хай Камілка пойдзе і з ёй павітаецца.

- Яна і наша сваячка праз мужа, - сказала ціха Сакольская.

- Запрасіце сюды пані Люблінскаю, - сказаў падкаморы лакею, - і так зморшчыўся, што здаецца пастарэў на гадоў з дзесяць.

Увайшла бедна апранутая жанчына, да яе падышоў мой бацька і прадставіў мяне як дачку яе сваячкі. Зняважаная доўгай пакутай, пажылая жанчына нахілілася, каб пацалаваць руку сваёй маладой кузынкі, я ледзь яе стрымала і сама са слязьмі абняла, потым пасадзіла яе побач з пані Сакольскай на сваё месца за сталом і села каля яе.

Падкаморы яшчэ трымаў сур'ёзны выгляд і гаварыў з маім бацькам пра літоўскую гаспадарку.

Пасля абеду пані Сакольская і Караліна падаравалі Люблінскай сукенкі, Адэля прапанавала нейкі пяшчотна-ружовы пецярбургскі капялюш, а я дала ўдаве грошы. Абышлося без бочкі жыта, якое, напэўна, падкаморы не даў бы, тлумачачы, што ў яго трое дзяцей і вялікія расходы.

Пад вечар прыехалі двое мужчын: адзін, малады сусед - добры, сціплы і адукаваны, другі асэсар цывільнай палаты з губернскага горада - прыгожы, але фанабэрысты бахвал. Я чула, як падкаморы казаў майму бацьку:

- Ён прыстойны хлопец з добрай сям'і. Ён будзе мець 400 душ, гэты юнак паходзіць з дробнай шляхты, бацька яго тытулярны радца, мае невялікі фундуш, адзінага сына выхаваў па-панску, аддаў яго спачатку ў віленскія школы, а потым у Дэрпцкі ўніверсітэт, і цяпер ён разлічвае патрапіць у канцылярыю павятовага суда, каб атрымаць чын. Думаю, што абодва маюць планы на Адэльку, і ў абодвух нічога не атрымаецца. І я нават здзіўлены са смеласці сына тытулярнага радцы.

- І я дзіўлюся, - сказаў мой бацька, - што твая прыгожая дачка не зрабіла сабе добрай партыі ў сталіцы.

- У яе было шмат паклоннікаў, але яна вагалася ў сваім выбары,

бо мела з чаго выбіраць. Але яе шасцідзесяцігадовая цётка выйшла замуж за маладога афіцэра і вярнула яе мне. Я ўпэўнены, аднак, што, можа, нават і не адзін гвардзейскі генерал ці сенатар, прыедзе за ёй следам.

- Але, ці сталічныя халасцякі ўмеюць быць паслядоўнымі ў сваіх густах? - спытаў мой бацька.

- Дзе ж яны знойдуць такую іншую німфу?

- Па міфалогіі, мой пане Антоне, ва ўсіх рэках маюцца свае німфы, таму і ў Няве яны павінны быць.

- Паглядзім, як Бог гэтым распарадзіцца, - адказаў яму падкаморы, ужо не рады з гэтай размовы.

Прысутнасць двух маладых кавалераў падняла ў Адэлі настрой, я заўважыла ў ёй какецтва і незвычайнае мастацтва па захаванні надзеі ў абодвух паклоннікаў. Яна належала да тых жанчын, якія імкнуцца заваяваць сэрцы мужчын не маючы да іх ніякай сімпатыі і нават без ніякай мэты - толькі, каб не было сумна.

Сусед ад'ехаў пасля вячэры, а асэсар цывільнай палаты на раніцы другога дня.

Каля сямі гадзін вечара пачуўся трэск бізуна, і пад ганак уляцела шасціконная карэта з прыгожай англійскай вупражжу.

- Нейкі незнаёмы экіпаж, - сказаў падкаморы і пачаў расстаўляць крэслы. Адэля падбегла да люстэрка, Караліна - да акна.

- Гэта сенатар з Пецярбурга, - пажартаваў мой бацька.

Пані Сакольская зняла акуляры і паспешліва склала рукадзелле. І я таксама ўжо нешта папраўляла ў сваім убранні, калі падвойныя дзверы адчыніліся і ўвайшоў Эдвард К. з доктарам Уладзіславам. Прыезд дзедзіча сямі вялікіх вёсак, які пасля вяртання з-за мяжы яшчэ не гасцяваў у суседзяў, не надта ўзрадаваў падкаморага. Ён распачаў доўгі камплімент, якога "замежны" фанфарон не даслухаў да канца і пацінуў руку майму бацьку, пасля чаго прывітаў дам лёгкім паклонам.

Нічога так не захоплівае звычайнага, матэрыяльнага мужчыны, як прыгожая постаць жанчыны. Здзіўлены Эдвард стаяў аслупянеўшы ад чар дачкі гаспадара і толькі пасля двухразовай прапановы, сеў насупраць ладнай дзяўчыны. Уладзіслаў жа не звярнуў увагі на каралеву салона і сеў у крэсла каля сваёй нарачонай.

Размова пачалася з пытанняў, якія задавалі Эдварду пра яго вандроўкі ў замежжа, ён адказваў коратка і неахвотна.

Ляск карэты абвясціў аб прыбыцці новага госця. Са старамоднага экіпажа выйшлі дзве жанчыны - гэта былі суседкі, пані суддзёва[20] з

---

[20] Суддзёва - жонка суддзі. - *Л. Л.*

дачкой. Эдвард, скарыстаўся рухам падчас прывітання і падсунуўся бліжэй да Адэлі. Яны размаўлялі адно з адным па-французску. Каб да канца ўразіць Эдварда, Адэля выкарыстала ўсю стратэгію какеткі. Я бачыла выраз задаволенасці на твары яе бацькі і ў той момант зразумела яго думкі і надзеі.

Суддзёва сядзела побач з пані Сакольскай і гагатала як гуска, увесь час папраўляючы на сябе шалік, каўнер ці чапец. Яе дачка была белая, свежая і жорсткая, як дрот.

Праз некаторы час суддзёва падміргнула дачцэ, і яны абедзве пайшлі ў сад з залы праз шкляныя дзверы. Пані Сакольская загадала Караліне ісці за імі, і я, жадаючы падыхаць свежым паветрам, таксама выйшла ў сад. Нам уручылі парасоны. Суддзёва з судзянкай[21] ужо стаялі ў альтанцы. Ідучы да альтанкі, мы праз акно заўважылі, як маці папраўляла локаны дачцэ, і яе словы патрапілі ў нашы вушы:

- Ты сёння выглядаеш як кухарка. Я казала табе апрануць новы валняны муслін, а ты хаваеш яго для фэсту Маці Божай Шкаплернай. А зараз тут сядзіць такі вялікі пан, які адзін важыць больш, чым увесь шляхецкі сход у ксяндза-пробашча. Не жадаючы турбаваць суддзёву, мы селі на лаву звонку і прыхінуліся да сцяны альтанкі.

- Калі ты дрэнна апранутая, дык не маеш ніякага шанцу, - працягвала яна. - Чаму не адказала падкамаранцы[22] па-французску?

- Бо баялася, - адказала дачка, - гэты пан граф, напэўна, вельмі разумны, ён так доўга сядзеў у Парыжы.

- Што ж, трэба было яму паказаць, што ў цябе светлая галава, можа б, ты яму спадабалася. Шмат хто з магнатаў ажаніўся са шляхцянкай, калі яна запала яму ў сэрца. Калі не граф, дык добрым для цябе быў бы і доктар - яны крэўныя паміж сабой.

- У мінулую нядзелю нехта казаў, што гэты доктар стараецца аб Караліне.

- Казкі! Караліна непрыгожая, ён не ажэніцца з ёй.

- Ах! Мама мая, не падабаецца мне гэтая паненка з Літвы, сядзіць яна з высока ўзнятай галавой - мабыць, з-за вялікага гонару.

- Яна, можа і не ганарлівая, але бясспрэчна дурнаватая, бо маўчыць і на ўсіх глядзіць, быццам людзей ніколі не бачыла[23].

Не могучы схаваць смех, мы ўцяклі да паркану, якім быў агароджаны сад. Неўзабаве нас паклікалі на гарбату, і пані суддзёва з суддзянкай вярнуліся ў салон.

---

[21] Суддзянка - дачка суддзі. - *Л. Л.*

[22] Падкамарнака - дачка падкаморага. - *Л. Л.*

[23] Словы суддзёвай падаю літаральна.

Мы знайшлі Адэльку за піяніна. Развучвала яна нейкую п'есу Шапэна, і ў тым, як яна гэта рабіла, адчуваўся незвычайны музычны талент. Эдвард, стоячы за крэслам, перагортваў для яе старонкі, яго згаслыя вочы блішчэлі, і ўся постаць рухалася пад музыку - чары Адэлі яго ажывілі і вярнулі да жыцця.

Калі падалі гарбату, панна падкамаранка прысела да Уладзіслава. Магчыма, што зачараваўшы Эдварда, яна пажадала тое самае зрабіць і з доктарам і гэтак узмацніць уздзеянне на Эдварда. Але пачуўшы кароткія і халодныя адказы доктара, Адэля вярнулася да піяніна.

Тым часам бедны доктар Уладзіслаў мусіў вытрымаць атаку суддзёвай.

- Прагну звярнуцца па параду да пана кансультанта[24], - сказала яна, тузаючы завязкі ад чапца.

- З задавальненнем удзялю вам увагу.

- Гэта не я хворая, Анетка, хадзі сюды. І, каб надаць сабе большай павагі, пасля таго, як пакланілася ў розныя бакі, яна пайшла з дачкой у кабінет, куды разам з імі пайшоў і Уладзіслаў. Седзячы каля дзвярэй, я чула ўсю размову.

- У дачкі вельмі далікатнае здароўе, яна часта скардзіцца на галаўныя болі.

- Ваша дачка цалкам здаровая, і я толькі параіў бы ёй больш шпацыраваць і піць халодную ваду.

- Добра, што пан кансультант не абцяжарвае нас лекамі, іншыя дактары адразу выпісваюць парашкі.

- Толькі тады, калі яны патрэбныя.

- Анетка можа і хварэе таму, што надта стараецца вучыцца - напачатку тры гады з гувернанткай і нават цяпер увесь час над кнігамі сядзіць. Творы Поля Кока[25] па-французску дзень і ноч чытае.

- Шкода часу і шкода здароўя. Лепш не чытаць кніг, ад якіх баліць галава. Галаўны боль спыніцца, калі шмат рухацца і піць ваду.

- Дзякуй, пане, і ты, Анетка, падзякуй, - паненка зрабіла рэверанс.

- Калі ласка завітваць да нас, - дадала яна, - мы жывём у Кірклішках, у нашым уласным маёнтку, за вярсту адсюль. Муж трымае пецярбургскія газеты - ён вялікі палітык.

- Калі будзе час, - адказаў доктар і паспяшаўся ў салон.

---

[24] Сярэдні клас у Беларусі называе лекараў кансультантамі. - *Л. Л.*

[25] Шарль Поль дэ Кок (фр. Charles Paul de Kock, 21 траўня 1793-1871) - французскі пісьменнік XIX ст., чыё імя доўгі час служыла намінальным абазначэннем фрывольнага аўтара, які заўсёды выбіраў брудныя сюжэты эратычнага зместу. - *Л. Л.*

Эдвард падышоў бліжэй да мяне ціха сказаў:

- Je suis, enchante, ma, cousine[26].

- Адэля і насамрэч прыгожая і цудоўная, і ёсць надзея, што хутка ў вашай маці з'явіцца нявестка!

- Cela est possible[27], - сказаў ён, потым узяў капялюш, і разам з Уладзіславам яны развіталіся з намі.

Пасля іх ад'езду падкаморы пахваліў пана К.:

- Багаты, разумны, са знатнай сям'і, Бог даў яму ўсё.

- Акрамя здароўя, - дадала Сакольская, - колер твару ў яго вельмі бледны, гэта азначае хваробы.

- Вялікія паны заўсёды маюць такі колер твару, нават калі яны здаровыя, - сказала суддзёва, - бо яны гадуюцца на варэнні.

- Напэўна, на смажаных лімонах, - сказаў мой бацька, бо твар у Эдварда вельмі жоўты.

- Лепш быць жоўтым, чым чырвоным: не люблю гэту местачковую чырвань твараў, - сказала мне Адэля.

- Хацела б мець местачковае здароўе, - адказала я.

Суддзёва ўстала, і я атрымала ад яе на развітанне пацалунак з просьбай любіць яе. Увесь вечар Адэля, як і належыць кузынцы, была вясёлай і надзвычай ветлівай са мной, але ахвотна размаўляла і з Эдвардам. Яна мела марную надзею на гэтага небараку: нямоглы стан Эдварда не дазваляў яму доўгі часу думаць пра што-небудзь ці аб кім-небудзь і рабіць нейкія рашучыя крокі.

Пасля вячэры ў другім пакоі мужчыны курылі тытунь і ўспаміналі былыя часы. А між намі завязалася размова пра чалавечы характар: Адэля выкрывала зайздроснікаў і паклёпнікаў, я нешта казала пра сквапнасць, Сакольская ганіла ганарыстасць і пыху.

- Вы забываеце, дамы, што какецтва, таксама з'яўляецца адной з самых вялікіх заган - сказала Караліна, - часам какетнічаюць і мужчыны, але, часцей, асобы нашага полу. Какетлівая жанчына імкнецца атрымаць самую вялікую ахвяру, якую чалавек можа зрабіць чалавеку - ахвяру сэрца, каб потым адкінуць яе і прычыніць боль істоце, якая хацела ахвяраваць сабой дзеля яе.

Напэўна, Адэлі не спадабаліся словы Караліны.

- Ужо першая гадзіна, пара спаць, сказала яна, і, пажадаўшы спакойнай ночы, пайшла.

У сем гадзін раніцы бацька разбудзіў мяне, і мы паехалі далей.

---

[26] Фр.: "Кузына, я ў захапленні". - *Л. Л.*

[27] Фр.: "Гэта магчыма". - *Л. Л.*

Два дні нас страшэнна паліла сонца. Нягледзячы на працяглы адпачынак, мы, як кажуць, дыхалі агнём, бо спёка трымалася заўсёды да ночы. Каля Быхава на нас насунулася чорная хмара, паветра астыла, і разам з громам мы ўляцелі ў першую ж карчму на нашым шляху.

Я села на ганку: змяілася бліскавіца, грымеў пярун, стагнаў і свістаў вецер - усе гэта рабіла на мяне надта моцнае ўражанне. Я часам забывалася пра адкрытыя навукай законы і дзіўныя прычыны гэтых прыродных з'яў, мне падабалася даваць волю сваім марам. У маіх марах я чула голас раз'юшанага супраць роду людскога Бога або вобраз канца свету, дзе не хапала толькі трубы анёла і ўваскрэсення мёртвых. У той вечар, не думаючы ні пра што, я прагна хапала адкрытым ротам прахалоднае паветра, пакуль моцны дождж не прымусіў мяне шукаць прытулку ў пакоі.

Раніца выдалася светлай і яснай, яшчэ не запрэглі коней, і я пайшла па вуліцах мястэчка. Быхаў - сталіца павета, мае вялікую, акружаную дрэвамі, плошчу, на ёй расце пустазелле. Мае мураваны палац і валы з руінамі, якія нагадваюць, што тут калісьці быў замак, які не раз супрацьстаяў нападам мяцежных казакоў.

Бацька казаў мне, што дарэмна Хмяльніцкі спрабаваў заваяваць замак, Быхаўская цвердзь з моцным гарнізонам падканцлера ВКЛ Казіміра Леана Сапегі, была цвёрдай, як скала, аб якую разбіваўся васьмігадовы патоп ракашан[28]. За што на Варшаўскім сойме 1655 г. Рэч Паспалітая вызваліла быхаўцаў ад падаткаў на 20 гадоў, а гарнізону, які за свой кошт трымаў Сапега, было выдадзена жалаванне з дзяржаўнага скарбу. Быхаўскае графства спакон вякоў належала яго дзедзічам - князям Сапегам. [...]

Мой бацька, ведаючы айчынную гісторыю, працягваў свой аповед пра падканцлера Сапегу, які трымаў уласнае войска на ўласныя грошы. [...]

Мы ўжо скончылі размову пра Казіміра Леана Сапегу, калі я ўбачыла ваду.

- Гэта Днепр! - закрычала я, - дазволь, тата, я спушчуся і павітаюся з роднай ракой маёй мамы.

- Спусціся, але не на доўга.

Прастаяла я над берагам з чвэрць гадзіны, і думка мая ўляцела далёка! Не маючы, каму адкрыцца, бо я была адна, спытала ў ракі, што некалі рабілі з ёй свавольныя запарожцы? Ці памятае яна іх баявыя крыкі? Няўжо і сапраўды, новаабранаму правадыру высыпалі на галаву кош смецця? Прыклала вуха: можа зашуміць вада? Не! Ціха цячэ. Так,

[28] "Ракашан" - у дадзеным выпадку ў сэнсе "паўстанцаў". - *Л. Л.*

ціха, як цячэ цяпер жыццё ў нашчадкаў гэтых казакаў.

У той дзень мы прыбылі ў Яўсташын, маёмасць маршалка Л., жонка якога з'яўлялася кузынай майго бацькі па яго маці і прыемна правялі там больш за тыдзень. Пан Л. - добры стары, ветлівы і прыемны. Яго жонка - разважлівая і лагодная. З імі жылі некалькі бедных сваякоў, бо панства Л. не мела ўласных дзяцей. Усе былі задаволены сваім лёсам.

Больш за ўсё мяне зацікавіла мая цётка, старасціна П., васьмідзесяцігадовая старая, родная сястра пані Л. У такім узросце яна мела моцны розум, добрую памяць і чуласць сэрца, як у маладзёна. Увесь час знаходжання ў Яўсташыне я любавалася яе анёльскім сэрцам, якое сваёй любоўю ахоплівала ўвесь род чалавечы. Я цешылася з яе дабрадзейнай малітвы пра нас, кожны высакародны ўчынак кранаў яе да слёз, а няшчасці бліжніх прычынялі ёй пакуты.

Яна часта ўспамінала свайго мужа, высакароднага чалавека, з якім у поўнай еднасці пражыла пяцьдзесят гадоў і які толькі адзін раз страшэнна яе пакрыўдзіў - не чым іншым, як уласнай смерцю.

Яна любіла расказваць пра мінулае і нават пра дробныя падзеі, якія раней здараліся з ёй.

- Чаму, ты, Камілка, сёння ў кепскім настроі? Раскажу табе дзве смешныя і праўдзівая гісторыі:

*“Калі я жыла ў Быхаве, пажыццёвым старостве майго мужа, прыехала аднойчы да мяне шляхцянка з суседняй ваколіцы, каб папрасіць дрэва на паліва. Жанчына паўвекавога ўзросту, смелая, гаваркая, бачна па ёй, што калісьці служыла пры двары. Размаўляю і бачу ў першым пакоі мужчыну, які стаіць там у шэрым капоце з шапкай пад пахай.*

- *Гэты Ягамосць з паняй прыехаў?*

- *Са мной, Мосць Дабрадзейка.*

- *А хто ён такі?*

- *Ён быў маім мужам, Мосць Дабрадзейка, але цяпер збяднеў на маёнтку, мае шмат даўгоў, а мінулай вясной пала яго быдла”.*

Другая гісторыя, такая:

*“Бывалі ў нас афіцэры з нейкага палка, які кватараваў у Быхаве. Адзін з іх, чалавек ветлівы, спытаў у свайго лакея, якога ў нас узяў да сябе на службу:*

- *Калі імяніны ў пана і пані?*

- *Не ведаю, бо я малы быў у гэтым двары.*

- *А як жа іх завуць?*

- *Пана завуць - Анёл, а пані - Коцік.*

- *Ты трызніш, такіх імёнаў не бывае.*

*- Я не трызню, бо на свае вушы чуў, як пані мужа называе Анёлам, а ён яе - Коцікам".*

Пані Л. - добрая гаспадыня і добрая кабета, аднак шмат часу аддавала сваёй старэйшай сястры. Маршалак Л. меў чулую душу і адукаваным розум, ён не паглыбляўся ў філасофскія вучэнні, але добра ведаў навуку Хрыста, старажытную і сучасную гісторыю, геаграфію, права і звычаі многіх народаў. Купляў некалькі часопісаў, якія выходзілі на роднай мове, цешыўся імі, як сваімі дзецьмі, чытаў штодзённыя газеты і часам рабіў з іх свае ўласныя палітычныя высновы, у якіх больш выяўлялася яго дабрыня да людзей чым канцэпцыі еўрапейскай дыпламатыі. Паважаны і любімы сваімі суседзямі, ён амаль што кожны дзень меў гасцей. Суседзі чакалі яго парадаў і выбіралі суддзёй у спрэчках паміж сабой. Сіроты і ўдовы шукалі ў яго дапамогі і абароны, у якой ён ніколі не адмаўляў.

- Ці быў дзядзька шчаслівы ў жыцці так, як ён шчаслівы сёння?

- Маладая ты, Камілка, таму і верыш у шчасце, пажывеш болей - страціш гэтую мілую веру. У цябе ўжо развілася пачуццё, ужо і тваё сэрца не аднойчы трымцела з-за пакут бліжніх. Уяві сабе, колькі пакут павінен перанесці чалавек, які гэтак доўга жыў на гэтай зямлі, які бачыў столькі рознага ў чалавечых лёсах, які аплакваў смерць бацькоў і родных, які падзяляў клопаты сяброў. Не, мая, Камілка, не быў і не ёсць ён шчаслівы, і ніхто са смяротных людзей з чуллівай душой не можа быць шчаслівым.

Дом пана Л. быў prасторны: жырандолі са шкляных пацерак, люстэркі са сточанымі кантамі, крэслы і канапы пад чорным саф'янам, сталы з мясцовага дрэва і дзве прыгожыя карціны фламандскай школы побач з некалькімі сямейнымі партрэтамі, усё гэта напаўняла два салоны. Сталовая не мела ніякіх аздоб, у бакавых пакоі месціліся спальні гаспадароў, сваякоў і гасцей, а таксама невялікі кабінет пана Л., які называў яго канцылярыяй. Добры парадак у гэтых пакояў рабіў гонар гаспадыні.

У першыя дні нашага прыезду ў Яўсташын я пазнаёмілася з суседзямі, акрамя прэзідэнта Р., які жыў трошкі далей. Мае цёткі расказвалі пра яго незвычайныя і смешныя гісторыі: паводле іх аповедаў Р. - добры чалавек высакароднага мыслення, меў аднак шмат дзівацтваў, якія рабілі яго непрыемным у кампаніі.

Усю зіму ён захоўваў глыбокае маўчанне, на пытанні жонкі і дзяцей адказваў толькі аднаскладова ці толькі мігамі. А з першага красавіка да канца кастрычніка ён мучыў усіх незвычайнай гаварліва-

сцю - у гэты час спрачаўся з усімі, абы толькі спрачацца і не аднойчы прыносіў уласныя перакананні ў ахвяру гэтай няшчаснай звычцы. Бывала, што ў дрэнным настроі ці ў сарказме, не шкадаваў нікога, асабліва жанчын, якіх, за выключэннем жонкі і дачкі, ён увогуле не любіў. Меў звычку задаваць маладым людзям пытанні са старажытнай гісторыі, а калі хто з іх не мог, не хацеў ці не умеў адказаць, кпіў з такога невуцтва. Але, пан Р. меў такі характар, што на сустрэчныя крыўды тых, каго сам пакрыўдзіў, ніколі не злаваўся і, калі яны былі дасціпнымі, нават хваліў.

Я хацела убачыць гэтага арыгінальнага чалавека і цікаўнасць мая была задаволена.

За два дні да нашага ад'езду з Яўсташына, з'явіўся пан Р. - стары ўжо чалавек, з тварам, які ззяў чырванню. Ён меў прыгожыя, вялікія вочы, быў сярэдняга росту, хадзіў з узнятай галавой, на якой меўся пецярбургскі парык са старанна і з густам укладзенымі валасамі.

Павітаўшыся і пазнаёміўшыся з сур'ёзным госцем і, растлумачыўшы яму, хто я (бо мой бацька пайшоў спаць пасля абеду), гаспадар указаў яму на крэсла побач са мной.

- Мне было прыемна чытаць маральныя аповесці, выдадзеныя пад вашым імем, - сказаў пан Р.

Не ведаючы, што яму адказаць, я прамаўчала.

- Нічога дзіўнага ў іх няма, аднак думаю, што іх стваральнікам ёсць ваш тата?

- Мужчыны займаюцца больш сур'ёзнымі справамі. Аповесці, якія вы чыталі, я напісала сама, з парадамі і падказкамі маёй маці.

- Я меў гонар ведаць вашу маці, калі яна яшчэ была не замужам. Я бачыў яе пазней, замужам, але яна ў той час нічога не пісала.

- Яна не піша і зараз, мама толькі выпраўляе мае памылкі.

- Цяжка паверыць, што маладая дзяўчына, амаль дзіця, аддае сябе літаратурнай творчасці.

- Працы там мала, вы самі бачылі, што нічога дзіўнага ў гэтых аповесцях няма.

- Аднак, такая праца заўсёды занадта сур'ёзная для жанчын, асаблівы ў маладыя гады весялосці і гуляў.

- Ёсць людзі, якія сталеюць раней, - адазваўся пан Л. - Я чытаў у нейкім перыёдыку, што адна англічанка, прозвішча якой не памятаю, на пятнаццатым годзе жыцця ўжо пісала артыкулы ў галіне дакладных навук, якія задавальнялі знаўцаў. А гэта значна цяжэйшая справа, чым складаць аповесці з дапамогай разумнай маці.

- Я б ніколі не дазволіў сваёй дачцэ займацца справай, неадпаведнай яе полу, бо трымаюся думкі імператара Напалеона, выказанай

ім мадам дэ Сталь[29].

- Напалеон, - перабіў пан Л., - быў выдатным ваяром і дасканалым стратэгам, але яго думкі, якія не мелі дачынення да мастацтва вайны, заўсёды патыхалі казарменным вандалізмам і не варта іх лічыць разумнымі. Маю перакананне, што жанчына, калі яна нават маці і гаспадыня, можа не адмаўляючыся ад выканання сваіх абавязкаў, быць і пісьменніцай - калі яна ўмее планаваць свой час і калі ў яе да гэтага ёсць схільнасць.

- Дзякуй табе, родны дзядзечка, што не падзяляеш заплеснелых уяўленняў пра жаночы пол.

- Заплеснелыя уяўленні! - усхвалявана паўтарыў пан Р. - Я бачу, што гэтая паненка можа творы пісаць і пра эмансіпацыю дачок Евы.

- У мяне няма ні жадання, ні магчымасці рабіць падобныя рэчы, але я не магу пагадзіцца з прыніжальнымі для жанчын думкамі.

- Мушу прызнацца, пані, што цяжка іх ўзвысіць, цяжка падняць слабы пол на адзін ўзровень з моцным. Бо Бог стварыў мужчыну перш, чым жанчыну і даў яму першынства ва ўсім.

- Шукай больш важкіх доказаў, пан прэзідэнт, - адказаў пан Л., - бо тое, што ты зараз сказаў, не ёсць пераканаўчым. Згодна з паданнямі, Бог пачаў вялікую справу стварэння свету і зямлі з усім, што жыве на ёй ў глыбінях і на паверхні. Дзікія львы, жорсткія тыгры, злосныя змеі і няшчасныя інсэкты, з'явіліся першымі па волі ўладара прыроды, але згаданая панам першаснасць не надае пяршынства. Успамінаю нават словы аднаго старажытнага аўтара, Карнелія Агрыпы (калі я не памыляюся, дадаў пан Л., падміргнуўшы мне), што Бог, ствараючы жанчыну ў самым канцы, хацеў такім чынам ушанаваць сваю вялікую працу, бо ў кожнай працы, канец - гэта самая жаданая і галоўная мэта, да якой толькі пры канцы наблізіўся. Той жа пісьменнік кажа, што чалавек быў створаны з пяску ці з гліны, таксама як і іншыя жывёлы, а жанчына

[29] Дачка міністра фінансаў Жака Нэкера, гаспадыня літаратурнага салона, Ганна-Луіза Жэрмена дэ Сталь -пісьменніца, уладарка дум і мыслярка. Яна мела шмат каханкаў, але была вельмі непрыгожай жанчынай, прычым сама аддавала перавагу мужчынам прыгажэйшым за яе, балазе, яны адказвалі ёй узаемнасцю. Калі яшчэ малады генерал Напалеон быў запрошаны ў салон мадам дэ Сталь, тая распачала гарачую палітычную размову. Напалеон сядзеў ціха і … заснуў. Тады, гаспадыня салона звярнулася да генерала:

- А вы, генерал, згодны са мною?

Напалеон страпянуўся і сказаў спрасонку:

- Мадам, я не слухаў...

А потым у няёмкай цішыні дадаў:

- Я наогул не люблю, калі жанчыны ўмешваюцца ў палітыку... - *Л. Л.*

была створаны з ужо ачышчанай, жывой матэрыі, якая ўжо мела іскру розуму і мела душу.

- Што я чую! Жанчына - шэдэўр Тварца! Жанчына больш вартая, чым мужчына! - закрычаў, смеючыся, пан Р., - ах, мой пан маршалак, ты ўжо ababіўся. Думаю, хутка ўбачу цябе за кудзеляй, ці шыццём сукенкі для сваёй маршалковай.

- А вы, мой любы прэзідэнт, - адказаў пан Л., - вы выкапалі словы пра жанчын з тых часоў, калі муж, на вачах жанчын, якія праходзілі праз пакой да яго жонкі, страляў з пісталета у котку.

Увайшоў мой бацька. Пан Р. пачаў нагадваць, як яны раней пазнаёміліся, і я з задаволеннем пайшла ў іншы пакой. Падчас вячэры бесперапынна грымеў голас пана Р. Напэўна, у яго галаве вельмі хутка нараджаліся думкі, бо калі ён не спрачаўся, дык раптоўна мяняў прадметы размовы. Самым смелым быў яго скачок ад паравых бровараў да свяшчэнных войнаў. Я хацела сказаць што-небудзь пра гэта сваёй цётцы, калі пан Р. нечакана павярнуўся да мяне і спытаў:

- Хай пані будзе такой добрай і нагадае мне, старому, у якім стагоддзі быў першы Крыжовы паход?

- На пачатку адзінаццатага.

- Брава! Брава!.. Правільна, хоць, можа, і выпадкова ўгадала.

- Як гэта некультурна, - сказаў пан Л., - прыпісваць па-сапраўднаму добрую памяць выпадковасці.

- Не ўсе старыя могуць быць такімі ветлівымі да жанчын, як пан маршалак.

Пасля гэтых слоў ён зрабіў заўвагі пра папу Урбана II і Пятрапустэльніка.

І сярод усхвалення хрысціянскай пакоры Годфрыда дэ Буліёна[30], які не хацеў насіць каралеўскую карону на зямлі, дзе Збаўца свету насіў цярновы вянец, ён нечакана пераскочыў у Амерыку і расказаў усім, хто жадаў яго слухаць і тым, хто не жадаў, што ў Мексіцы, у глыбіні лясоў правінцыі Юкатан, знойдзены астанкі вялікага горада Кохукан з рэшткамі храмаў, пірамід і дамоў. Там былі знойдзены нават розныя музычныя інструменты, статуі і барэльефы, і на адным з гэтых барэльефаў маецца выява лацінскага крыжа.

Мы чакалі вучоных высноў пана Р. наконт гэтага адкрыцця сярод

---

[30] Готфрыд Бульёнскі (каля 1060-1100) - адзін з кіраўнікоў першага крыжовага паходу (1096-1099). Герцаг Ніжняй Латарынгіі (з 1087 г.). Пасля захопу Іерусаліма ў 1099 г. стаў першым кіраўніком Іерусалімскага каралеўства, але адмовіўся пры гэтым каранавацца ў горадзе, дзе быў каранаваны Ісус, і прыняўшы толькі тытул барона і "Абаронцы Труны Божай". - *Л. Л.*

народа, які лічыцца дзікім, і якое паказала сляды нейкай страчанай адукаванасці. Але наш эрудыт быў уражаны новай ідэяй і сказаў з страхам:

- Папярэджваю вас, панове, што трэба рыхтавацца да смерці, бо хутка будзе канец свету.

- Адкуль гэта прароцтва?- спытала старасціна.

- Не прароцтва, а ўжо стары астранамічны разлік Ньютана пра тое, што сонца павінна хутка згаснуць.

- Не, я нідзе пра гэта не чытаў, - запярэчыў пан Л.

- Гэта на самай справе ёсць у Ньютана, - сказаў мой бацька, - ён пісаў, здаецца, што ў 2225 годзе мае праходзіць самая вялікая з дваццаці дзевяці дагэтуль вядомых камет, якая так моцна ўдарыць па сонцы, што можа яго знішчыць.

- Калі мы адхілім святыя прароцтвы пра канец свету людзей, натхнёных праз Бога, і паверым высновам астранома, дык гэтая катастрофа адбудзецца не раней, чым праз трыста шэсцьдзесят гадоў.

- Мой швагер-ліцвін больш вучоны за вас, - сказаў пан Л.

Пан Р. здзекліва ўсміхнуўся, і мы закончылі вячэраць. Тыя, хто добра яго ведаў, запэўнілі нас, што на самой справе пан Р. меў толькі невялікі запас ведаў, набытых ў езуіцкай школе, але ўмеў імі па-мастацку жангліраваць і таму сярод лагодных людзей, якія не цікавіліся прагрэсам і не ведалі новых навуковых ідэй, лічыўся адукаваным.

Перад ад'ездам, на наступны дзень, пан прэзідэнт Р. запрасіў усіх нас на абед. Мужчыны, занятыя паляваннем, адмовіліся, а пані Л. ад свайго і майго імя прыняла ветлівае запрашэнне.

У сваім уласным доме пан прэзідэнт Р. паводзіў сябе вельмі ветліва, у яго была разумная і мілая жонка. Дастатак у спалучэнні з элегантнасцю робіць жыццё ўпарадкаваным і дазваляе гаспадарам выявіць добры густ.

Набліжаўся момант нашага ад'езду ад пана Л. Са шчырым смуткам я развітвалася з гэтай шляхетнай сям'ёй.

- Як сумна на зямлі! - сказала я бацьку - трэба плакаць і плакаць. З разбітым сэрцам раней расставалася я з мамай, з жалем развітваюся зараз з роднымі, якіх, неўзабаве і магчыма назаўсёды пакіну са слязамі шкадавання. Нас будзе раздзяляць прастора большая за сто міль. Нашто патрэбны цяжар цела? Каб б чалавек быў толькі духам, ён мог бы так жа хутка, як думка, перакрочваць прасторы і кожны дзень бачыць сваіх любімых.

- Разам з тугой раставання, знікла б і чароўнасць радасных сустрэч, - сказаў бацька. А ты, Камілка, - дадаў ён з усмешкай, - увесь

час была б у паветры і праз частыя візіты знудзіла б сваіх родных.

З Яўсташына мы паехалі проста да мястэчка Карма, дзедзічам якога з'яўляецца пляменнік маёй маці Міхал Б. Я чула пра яго раней толькі прыемнае і ўбачыла, што ён заслугоўвае гэтых добрых меркаванняў. Былы афіцэр гвардыі, сёння муж, бацька і дзедзіч, ён строга выконваў узятыя на сябе абавязкі.

Карма нарадзіла ў душы майго бацькі прыемныя ўспаміны - тут ён пазнаёміўся і ажаніўся з маёй маці. Ведаючы, дзе адбыўся гэты акт, ці па-іншаму сакрамант, я хацела наведаць і ўбачыць касцёл, дзе Бог прыняў клятву, якой я абавязана сваім жыццём. Але новы касцёл, з новай архітэктурай, схаваў нават сляды старога.

Ад нашага мілага кузына Міхала Б. мы паехалі ў Магілёў. На другі дзень нашага падарожжа, павольны ход карэты, якая коўзалася па пяску, прымусіў мяне на некалькі гадзін заснуць. Калі я расплюшчыла вочы:

- Мы ўжо ля брамы горада, - сказаў мой бацька.

Глядзела ў акно: зноў Днепр, і валы над ім нагадвалі пра крывавыя бітвы з казакамі і татарамі.

Сонца спускалася на захад і стварала цудоўны від над вадой. Бацька нагадаў мне, як у маім дзяцінстве, калі падчас заходу сонца мы неяк праязджалі міма вялікага става, я малая, з жахам закрычала: "Ах, мама! Сонца патанула".

Зноў згадваюцца мне словы вучонага Тэадора Нарбута пра пачатак гісторыі Магілёва. [...]

Два дні мы бавіліся ў Магілёве. Я не была ў Азіі, таму не ведаю чаму мне ўяўлялася, што гэты горад мае азіяцкі характар. Але яшчэ раней бацька сказаў, што гэта не так, і я з ім потым больш не размаўляла на гэтую тэму.

Больш за ўсё ўразіла царква якая мае назву Іосіфаўская, яе краевугольны камень заклала расійская імператрыца Кацярына ІІ з аўстрыйскім імператарам Іосіфам ІІ падчас падарожжа на з'езд у Канева[31] . Гэтая царква, пабудаваная ў класічным стылі, магла б стаяць пасярод сталіцы. Яе інтэр'ер упрыгожваюць абразы пэндзля Смуглевіча.

Магілёў стаіць на ўзгорку, горад ажыўляе вялікая колькасць садоў, і таму ён мае здаровае паветра, тут растуць шмат яблыняў, груш і іншых пладовых дрэваў. Усе тыя, каму Бог даў магчымасць бачыць далёкія прадметы (бо я маю дрэнны зрок), дзівяцца краявіду з таго месца, дзе стаіць Шклоўская брама - тут Днепр шырока разлівае сваю крыштальную ваду.

Мне спадабаўся бульвар, з адной паловы засаджаны дзвюмя лініямі дрэў, а з другой кустамі, тут жа маюцца звілістыя дарожкі для прагулак.

Дамы ў Магілёве мураваныя і драўляныя, даволі акуратныя і нават ладныя. Ніякіх грамадскіх забаў у горадзе няма, але тэатральныя прадстаўленні часам прывозяць вандроўныя акцёрскія трупы.

Пра кнігарню і друкарню нічога не чула. Чытальня адна і вельмі бедная, яе трымае яўрэй. Насельніцтва нешматлікае, бо ў гэтай правінцыі жывуць больш заможныя людзі, якія зімуюць у Пецярбургу, а лета праводзяць у сельскай мясцовасці. Аднак яны прыязджаюць на соймікі і раз у тры гады Магілёў упрыгожваецца, па вуліцах плывуць новыя і раскошныя чатырохконныя карэты, напоўненыя прыгожымі жанчынамі. У дамах магнатаў граюць аркестры. Каля брам чутны розныя дыялекты - гэта ў жоўтых ліўрэях чакаюць шматлікія служкі. З усёй гастранамічнай пышнасцю часта ладзяцца балі і вячэры.

Калі мы вярталіся з бульвара, дык нават я з маім дрэнным зрокам, была ў захапленні ад незвычайнага відарысу. Адно з прадмесцяў Магілёва, пабудаванае на другім беразе Дняпра, ляжыць на некалькі дзесяткаў сажняў ніжэй за горад. З месца, на якім мы спыніліся, хаты, жывёлы і людзі здаваліся нам напалову меншымі, чым былі на самой справе. Праз вузкую вуліцу ехалі гружаныя вазы, праляталі вершнікі, праходзілі пешаходы.

- Мне здаецца, я бачу марыянетак, - сказала я свайму бацьку, - і іх жыццё, як пародыя на чалавечыя патрэбы і намаганні.

- Ты заўсёды робіш нейкія дзіўныя параўнанні - лялечны механізм не можа дакладна перадаць сапраўднага жыцця. Я ўспомніў пігмеяў, пра якіх расказваў табе, пасля таго як прачытаў Герадота.

Мы доўга стаялі. Пачало змяркацца: амаль што ў адну хвіліну ўспыхнулі агні ва ўсіх вокнах дамоў прадмесця, і іх ззянне адбівалася ў Дняпры. Ой, як гэта было прыгожа! Я б не прамяняла гэта відовішча на

[31] 30 траўня 1780 г. у гонар сустрэчы двух імператараў у Магілёве адбылася закладка царквы св. Іосіфа. Існуе паданне, што падчас закладкі каменя ў падмурак у Кацярыны II парвалася нітка перлаў. Прыдворныя кінуліся збіраць караліі, якія рассыпаліся, але імператрыца забараніла гэта рабіць, сказаўшы: "Няхай храм будзе цудоўны, як гэтыя перлы". Для ўпрыгожвання царквы мастак Уладзімір Баравікоўскі напісаў некалькі абразоў, на іх у выглядзе святых і анёлаў адлюстраваў фаварытаў Кацярыны і саму імператрыцу. Іосіфаўская царква была скончана ў 1798 г., статус сабора набыла ў 1802 г. Гэта быў першы беларускі помнік, створаны ў стылі класіцызму. Сабор дзейнічаў да 1929 г. і быў узарваны ў 1938 г. На яго месцы пабудавалі гасцініцу "Днепр". - *Л.Л.*

самую дарагую ілюмінацыю.

На трэці дзень пасля выезду з Магілёва мы дасягнулі самай галоўнай і сапраўднай мэты нашага падарожжа - маёнтка Дамамерычы майго роднага дзядзькі.

Я не магу выказаць, якой шчаслівай я была, калі ўбачыла яго, бо дзядзька быў вельмі падобны на маю маці. Праз нейкі час я пераканалася, што і характары ў іх нічым не адрозніваюцца. Мне не трэба шмат расказваць пра свайго дзядзьку, бо характар маёй маці, апісаны вышэй, ёсць і характарам майго дзядзькі. З той толькі малой розніцай, што дзядзька меў больш павярхоўнай ветлівасці і ніколі не парушаў законаў этыкету. Ён прывык да гэтага, бо большую частку свайго жыцця правёў у сталіцах.

У дарагіх майму сэрцу яго дочках і сыне я не магла бачыць нічога акрамя самых высакародных якасцей. Дзядзька даўно ўжо пахаваў жонку і таму быў і бацькам, і маці для сваіх дзяцей.

Жыццё майго дзядзькі зараз цякло спакойна, бо ў маладосці ён перанасыціўся весялосцю вялікага свету і зараз палюбіў адзіноту. Найбольш вольнага часу ён прысвячаў французскай літаратуры, аднак верыў, што і на яго роднай мове ёсць добрыя творы і часам чытаў іх, але, як і многія людзі, якія нарадзіліся ў мінулую эпоху, не мог адвучыцца, ад французчыны і нават рэдка размаўляў на іншай мове.

У Дамамерычах я таксама сустрэлася з успамінамі пра вайну. Паводле мясцовага падання, на тым месцы, дзе сёння ёсць сад, палац і іншыя будынкі, у часы Яна Казіміра адбылася сутычка ліцвінаў з татарамі. Вялікая колькасць курганоў за агароджай сядзібы, сведчаць, што тут некалі пралівалася чалавечая кроў. У садзе я бачыла высокі і даволі ладны насып, пра які дзядзька мне сказаў, што тут пахаваны адзін з камандзіраў татарскага войска. На гэтым кургане маецца клумба з дробных кветак.

- Вандроўны дух татарскага князя, - сказала я дзядзьку, - мусіць, абураецца гэтымі малымі кветкамі: тут трэба пасадзіць некалькі пірамідальных таполяў, каб ушанаваць астанкі адважнага палкаводца.

- Больш падыдуць крымскія ружы, - сказаў мой бацька.

- Занадта вы чуллівыя да захопніка і разбойніка, - са смехам адказаў дзядзька.

- Яго парэшткі даўно зніклі, - адазвалася малодшая з маіх кузынак.

- А куды ж яны падзеліся? - запытаў бацька, - яны тут, у зямлі, у траве, у кветках. Можа, калісьці і на маёй галаве нешта вырасце. У прыродзе нічога не памірае, а толькі пераўтвараецца рознымі спосабамі ў іншае.

- Гэта праўда, так і павінна быць, - адказала Цацылька, - але я

дагэтуль ніколі не думала пра гэта.

Прыкладна за дзесяць вёрст ад Дамамерычаў, каля мястэчка Крычаў, што на рацэ Сож, я пабывала на гары, якую ў простым народзе называюць Галусавая гара. Тут, паводле падання, стагоддзі таму жыў нейкі знакаміты доктар Галус. Нічога больш пра гэтага доктара не вядома. Карпіньскі ў сваім геаграфічным слоўніку згадвае, і многія іншыя таксама пішуць, што ў Крычаве нарадзіўся Эскулап.

Напрыканцы восені я з сумам развіталася з дзядзькам і адчувала, што больш я яго не ўбачу. Так і адбылося. Праз тры гады сваякі, сябры і падданыя аплаквалі раннюю смерць лепшага з людзей.

Вяртаючыся ў Літву, мы праязджалі праз Мсціслаў. Набліжаючыся да гэтай былой сталіцы ўдзельнага княства, а сёння цэнтра павета, мой бацька паказаў мне поле, дзе Вітаўт у 1386 г. перамог войска князя Святаслава Смаленскага. Расказаў таксама пра Лунгвена, брата Уладзіслава Ягайлы, які, будучы валадаром Мсціслава, стаў небяспечным для суседніх князёў.

Спешка ў дарозе не дазволіла нам убачыць возера каля Мсціслава са старажытнымі мурамі на яго берагах. Паводле падання, на гэтым месцы калісьці стаяў вялікі і багаты горад, у якім жылі людзі нягоднага жыцця. Горад гэты па загаду неба паглынула вада. Калі вятры свішчуць над возерам, людзі якія вераць у забабоны, чуюць стогны праклятых з глыбіні возера. Такая паганская вера можа існаваць толькі пры адсутнасці больш высокіх паняццяў.

Праязджаючы праз Копыські павет, мы некалькі дзён ехалі праз землі маёнтка Апчуга, які таксама належаў крэўным маёй маці. І тут таксама ёсць старажытны помнік - доўгая грэбля, насыпаная на вялікім балоце, якая да нашага часу носіць імя "Маста Вітаўта". Паважаны гісторык Тэадор Нарбут лічыць, што гэтай дарогай Вітаўт ішоў у Расію, і падчас паходу загадаў сваім людзям насыпаць грэблю, бо меў штурмавыя машыны і гарматы з порахам і каменнымі кулямі калібру ў 9-10 цаляў - гэтая гармата магла страляць адзін раз у чатыры гадзіны. Цягнулі яе 24 кані, і гэта былі першыя пушкі, якіх убачыла Задняпроўе.

На Беларусі вельмі шмат людзей дабрадзейных, разумных, з высакароднымі думкамі, але больш шырокі погляд на грамадства гэтай правінцыі дае адчуванне нейкай дзіўнай разнастайнасць.

Багаты клас захоўвае этыкет і пецярбургскія звычаі, ён размаўляе па-французску, бо не ведае роднай мовы і выхоўвае сваіх дзяцей панямецку. У некаторых дамах я сама бачыла выхаваселяў з Рыгі і чула, што гэтую моду пераняла ўся тамтэйшая арыстакратыя.

Бедная шляхта не вызначаецца асветай, часам гаворыць кепскай пальшчызнай, а часцей за ўсё на мясцовай гаворцы (па-беларуску - *Л.Л.*). Веру мае розную.

Просты народ больш цёмны, больш забабонны, чым у нас - у ім вера ў праведнага Бога спалучаецца з забабонамі політэізму. У кожнай вёсцы ёсць свае чарадзеі - кожны каваль павінен ім быць. Купалле спраўляецца урачыста, у задушныя дні яны нясуць ежу на магілы памерлых. Расказваюць, што калі-нікалі тут можа бегчы па вёсцы раскудлачаныя русалка.

Я бачыла ў Магілёўскай губерні не шмат забудаваных па прамой лініі вёсак. Малыя хацінкі раскіданыя без парадку, па некалькі ў адным двары, часам у цені дрэў, а пасярэдзіне стаіць высокая царква - усё гэта разам складае маляўнічае, але супярэчлівае цэлае.

Вясковая гаспадарка знаходзіцца на больш нізкім узроўні, чым у Віленскай губерні. Гаспадары зямлі трымаюцца за адвечную руціну і лічаць новыя агранамічныя вынаходніцтвы толькі прыгожымі тэорыямі, якія не адважваюцца ператварыць у практыку. Аруць зямлю коньмі: зямля лёгкая і ў шмат якіх паветах на полі няма камення. Сяляне мала сеюць бульбы і, магчыма, з гэтай прычыны да іх часта прыходзіць голад. Ва ўрадлівыя гады ўся прадукцыя каштуе вельмі танна, і ў малых мястэчках цяжка яе прадаюць.

Больш багатыя людзі і шпекулянты ладзяць гандаль з Крамянчугом і Адэсай. Кожную вясну туды па Дняпры, на плытах і віцінах, вязуць таварнае дрэва, match рознае збожжа, гарэлку, дзёгаць і пяньку. Вырошчванне канопляў у гэтай правінцыі, на працягу доўгага часу ёсць важным эканамічным чыннікам. Таму і сёння ў сярэднім класе жыве старая прымаўка: "Спіць, быццам пяньку прадаў".

У некалькіх мястэчках штогод адбываюцца кірмашы, самы шматлікі і вядомы ў Хаславічах, ён пачынаецца 24 ліпеня і доўжыцца чатыры тыдні. З розных краёў прыязджаюць купцы: беларусы і украінцы. Забавы на кірмашы: тэатр, наездніцтва на конях і цырк. Часта бывае, што тут нараджаецца пяшчотнае каханне паміж маладымі сэрцамі і душамі, праз гэта ствараюцца сем'і. Граф Салтыкоў, дзедзіч Хаславічаў, дае вялікія абеды, а часам і балі - нічога дзіўнага, што ён рады гасцям - гэты кірмаш прыносіць яму даходу пятнаццаць тысяч рублёў срэбрам.

У Беларусі свята захоўваецца закон гасціннасці: дом і сэрцы гаспадароў заўсёды адкрыты для сяброў і знаёмых. Норавы асвечанага класа самыя лепшыя. Згода ў сямейных парах, пільны клопат аб добрым выхаванні дзяцей, падпарадкаванне іх бацькам - гэта спадчынныя цноты жыхароў Магілёўскай губерні. Кабета-какетка ці безразважны мужчына - гэта тыя вырадкі, якія тут амаль што не сустракаюцца.

# П А Э З І Я



# *Ірына Багдановіч*

*Ірына Багдановіч - беларуская паэтэса, перакладчыца, літаратуразнаўца.*

*Нарадзілася 30 красавіка 1956 г. у горадзе Лідзе Гарадзенскай вобласці ў сям'і інжынераў. Выхоўвалася ў сям'і бабулі і дзеда, настаўнікаў, у Гомелі. Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1978) і аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі Навук БССР (1983). Працавала малодшым і старшым навуковым супрацоўнікам гэтага Інстытута (1983-2001); дацэнтам кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1996-2021). Цяпер працуе старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Кандыдат філалагічных навук (1985).*

*Аўтар зборнікаў вершаў "Чаравікі маленства" (1985), "Фрэскі" (1989), "Вялікдзень" (1993), "Альбом першакласніцы" (для дзяцей, 2003), "Сармацкі Альбом" (2004), "Прыватныя рымляне" (2006), "Душа Лістападу" (2012), кнігі "Залатая Горка: вершы, пераклады, артыкулы" (2016), манаграфій "Янка Купала і рамантызм" (1989), "Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння" (2001).*

*Даследуе беларускую літаратуру XIX - першай трэці XX стагоддзяў, беларуска-польскія міжлітаратурныя сувязі, творчасць Адама Міцкевіча, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, паэтаў "Маладняка" і "Узвышша", літаратурную спадчыну пісьменнікаў-святароў.*

*Перакладае з польскай мовы. Асаблівую ўвагу надае перакладам літаратурнай спадчыны пісьменнікаў XIX стагоддзя, творчасць якіх ёсць агульным*

*здабыткам сучасных народаў Беларусі, Літвы і Польшчы, - Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі, Габрыэлі Пузыні, Зоф'і Манькоўскай і іншых. Яе пераклады змешчаны ў анталогіях "Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай" (1998), "Літаратура Беларусі XIX стагоддзя" (2013), "Літаратура другой паловы XIX стагоддзя" (2013, серыя "Залатая калекцыя беларускай літаратуры"), а таксама ў кнігах: Адам Міцкевіч "Санеты=Sonety" (1998), "Крымскія санеты=Sonety Krymskie" (2004), "Выбраныя вершы" (2018, серыя "Паэты планеты"); Зоф'я Манькоўская "Цяпер і назаўсёды=Dzisiaj i na wieki" (2004); Уладзіслаў Сыракомля "Выбраныя творы" (2011, серыя "Беларускі кнігазбор"); Габрыэля Пузыня "Струмень любові = Strumien milosci" (2018).*

*Жыве ў Менску.*

## У Белагрудзе…

***Памяці пробашча касцёла ў Белагрудзе ксяндза Рышарда Пэрчака, спачылага 25 верасня AD 2024, прысвячаю***

У Белагрудзе велічна прыгожай,
Асвечанай з вышыняў ласкай Божай,
Святло струменіцца ад алтара -
Ад Гостыі ў далонях святара,
Прыходзіць Хрыстус Збаўца кожны раз
У цудзе Эўхарыстыі да нас,
Святар - як Alter Chrystus - творыць цуд:
Усё і ўсіх любоўю поўніць тут!
Любоўю! Невычэрпную крыніцу
Яе ён мае ў сэрцы… Таямніцу
Хрыстовага збаўлення адкрывае
Усім, хто яе просіць і чакае:
У споведзі святой прытуліць душы,
Камень няверы ў недавярку зрушыць,
Сужэнствы ў шлюбе з Богам паяднае,
Дасць хлеба ўсім, хто прагне, а не мае,

Каб Хлеб нябесны - Ты ва ўсіх быў, Езу!
Сваім жыццём тварыў ён катэхезу,
У Праўдзе Божай жыў і ў праўдзе людскай
Ён пад апекай Маці Божай Белагрудскай,
Праз яго рукі, словы, абавязкі
Сплывалі тут на ўсіх патокі ласкі
І міласэрнасць Божая… Аб цудзе
Тым сведчыць усё чыста ў Белагрудзе:
І велічнай святыні сцены, вежы,
І брама, і цвінтар стары з крыжамі,
І гэты надмагільны насып свежы,
Дзе наш святар спачыў… І мы ўсе ў жалі
Укленчылі… З малітвай просім: Божа!
Яго айцоўскім сэрцам быў з нас кожны
Сагрэты ў сваёй злыбядзе й патрэбе,
Дай яму шчасце вечнасці прыгожай!
Дай быць яму пры Тваім троне ў небе!
З апосталамі ўсімі ў Небастане
Дай вечны адпачынак яму, Пане…

*1-2 кастрычніка 2024 г.*

## Трэці Адам

***Светлай памяці Адама Мальдзіса***
***ў гонар 90-годдзя з дня яго нараджэння***
***прысвячаю***

Адам - прабацька ўсіх жывых на свеце,
Як з Бібліі ўсім нам даўно вядома,
Зрабіў памылку ў Старым Запавеце
І страціў Рай, застаўшыся без Дома…

Бяздомнасць тую ўслед за ім спазналі
Усе нашчадкі з плямай першароднай,
Шукалі выйсця, Збаўцу ўсе чакалі,
Каб выбрацца з бяздомнасці гаротнай.

Сустрэлі холад, голад і нястачы
Дзяцей няшчасных Першага Адама,
Палон ліхі зусім народ спартачыў -
Народ забраны, ці… народ абраны?..

І наш народ ва ўсім гэтым парадку
Таксама гараваў, шукаў і страчваў,
Палацы памяняліся на хатку,
І радавод змарнеўся і злядачыў.

Як той народ біблейскі, што выходзіў
З палону ў абяцаны край мядовы,
Так рушыў наш народ… У той прыгодзе
Пан Бог нам даў на шлях Адамаў новых.

Другі Адам уславіў край Гражыны,
І Нёман са шляхетным радаводам,
Русалак свіцязянскіх і сцяжыны,
Што з Конрадам сам зведаў Валенродам.

Ён са здароўем параўнаў Айчыну:
Яна ці ёсць, ці ты бадзяга ў свеце…
А час ішоў… І Бог, каб памагчы нам,
Адараваў наш край Адамам Трэцім,

Бо скрушна так глядзеў на нашы ўпадкі,
На скарбы, што даваў нам поўняй Духу,
Глядзеў, якія дзеці распарадкі
Ўчынілі з гэтым дарам: пацяруху…

Але народ не збыў жывыя сілы,
Хоць гэтулькі трываў ён пад прымусам,
І Бог дыхнуў з Нябёс: "Адаме мілы,
Ты вернеш беларусам - беларусаў!

Табе даю дарэчныя прылады:
Рыдлёўка - для архіўнага капання,

Пяро - над словам-думкаю для ўлады
І прозвішча - для моцнага трывання

У лучнасці са Мною, бо малітва
З табой ад нараджэння і да скону,
Ідзі, бо ты жаўнер прыгожай бітвы!
Malda - малітва выведзе з прыгону -

З прыгону занядбання скарбаў родных,
З прыгону ўсіх бязлітасных паразаў…"
І стаў Адамаў лёс здзяйсненнем годным
Ўсіх гэтых Божых велічных наказаў,

Стаў мудрым і разважлівым вяртаннем
З бяздомнасці… І, згодна Божай мэце,
Йшла Беларусь углыб самапазнання
З апосталам сваім - Адамам Трэцім…

*13 верасня 2022 г.*

## Сустрэча на Залатой Горцы
## ў Нядзелю Добрага Пастыра
## каля скульптуры Святога Айца Яна Паўла II

***Пані Эльжбеце Смулковай -***
***прафесару і дыпламату***

Залатагорская прыгода -
Нядзеля, травень, Божы цуд…
Чаромхавы ліецца водар
На ўсё, што Бога славіць тут:

На Крыж місійны, кожны помнік,
Схаваны ў дыване травы,
Касцёл, што ў неба мклівіць промні
Малітваў мёртвых і жывых.

Пры лавачцы Айца Святога,
Дзе ён з ружанчыкам сядзіць,
Як Добры Пастыр, каб ад злога
Нас захінуць, абараніць,

Грамадка па Імшы стаяла -
Пан Амбасадар, Пробашч і
Пані Эльжбета!.. Я пазнала!..
І смутак у душы аціх,

І мілатою невымоўнай
Мяне сустрэча абняла,
Нібы зазіхацеў цудоўны
Прамень Фаворскага святла!

Залатагорская святыня -
Трон Бога! Скарбніца надзей!
А Пастыр Добры не з вышыняў
Ласкава так на нас глядзеў!

Ласкава так!.. Сядзеў на лаўцы
І позіркам усіх туліў,
Дабраслаўляў і вёў да Збаўцы
Праз церні і крыжы зямлі.

Знікала гарката, пустэча,
Дух вызваляўся й вырастаў…
Залатагорская сустрэча -
Як Божы план, дзе ўсё дарэчы,
Як цуд прысутнасці Хрыста…

*8 траўня 2022 г.*

## Сонца ўстае…

Па-над зямлёй, дзе віхура гуляе,
Дзе нам цяпла і святла не стае,

Ранак, нарэшце, спагадна нам ззяе…
Ціха… Марозна… І сонца ўстае…

Сонца, як сімвал надзей запаветных,
Сонца, што цемру звяло на нішто,
Сонца, як сябра з усмешкай прыветнай,
Сонца… Сын Божы з'явіўся… Раство!*

*7 студзеня 2024 г.*

** У "Слоўніку баларускай мовы" І. І. Насовіча зафіксаваны формы 'Рожество' і 'Рожтво' ў значэнні 'Свята Божага Нараджэння'; у сучаснай гутарковай беларускай мове захоўваецца форма 'Раство', тоесная форме 'Рожтво', хоць сучасныя нарматыўныя слоўнікі і не фіксуюць такое ўжыванне (заўвага аўтара).*

## Пячатка Бога

…Бог пакінуў на кожным стварэнні пячатку дабрыні і прыгажосці, аднак з цягам часу чалавек стаў сапсутым, здольным распаўсюджваць зло і смерць у свеце.

*З Катэхезы Папы Францішка*
*2 снежня 2020 г. у Ватыкане*

Зямля была цямрэчай і пустэльняй.
Прамовіў Бог: "Хай станецца святло!.."
Больш цемра не здавалася суцэльнай,
Стаў дзень і ноч, далей тварэнне йшло:

Узніклі воды, ўсякія расліны,
Плады, насенне, каб працэс не згас;
Бог зоркі запаліў цудоўным чынам
На небасхіле й падарыў нам Час;

Папрацаваў над рыбамі марскімі,
Над птушкамі паднебнымі й звярмі,
Так насяліў істотамі жывымі
Зямлю. Быў рад, што добра ўсё зрабіў.

Тады задумаў Бог і чалавека
Увесці ў той зямны прыгожы дом:
"Хай над зямлёй пануе ён давеку -
Над птушкай, зверам, рыбкай, паўзуном…"

І прыгажосцю гэтага тварэння
Зачараваны, Бог затым спачыў:
"Як добра ўсё! Ах, як жа харашэнна!" -
І створанае ўсё дабраславіў.

Так на тварэнні ўсім сваім прыгожым
Пакінуў Бог пячатку дабрыні,
Ніякі сцерці грэх яе не зможа,
Ніякія спакусы ўшчэнт, ані!

Бо сэрцаў глыбіня належыць Богу,
Хоць камянеюць сэрцы ад грахоў,
Бог дабраслаўляе ўсіх на перамогу
Сваёй пячаткай з надпісам "Любоў".

Яе ні з чым не параўнаць, не зблытаць,
Яна ратуе свет спрадвеку дзён,
Цудоўных пераменаў нам, малым, даць
Яна адна і можа! - Не праклён,

Не насыланне на злачынцаў кары,
Не прага помсты… Вер, што будзе цуд:
Бог аднавіць сваю пячатку марыць
У кожным з нас: заўжды, цяпер і тут!

Я, мы, ты, кожны ў сэрца сваё глянем,
Ці ёсць жа ў ім пячаткі Бога след?..

Ці я яе захламіў і запляміў,
А сам кажу: "Які ж сапсуты свет!.."

Адкінуць страх, няўпэўненасць, трывогу:
Для роспачы брак часу і прычын;
Свяціцца - ўсім - сваёй пячаткай Бога!
І цемру тым святлом перамагчы…

*2-5 снежня 2020 г.*

### Прадчуванне снегу

Калі здаецца, толькі ноч і ноч,
І светлы дзень ніколі не настане,
Што толькі дождж у неба па праграме,
Ты ў роспач безнадзейную не збоч!

Хоць сэрца напаўняе смутак, шэрань,
А за дажджом ізноў шарэе дождж,
Прыслухайся…хтось стукаецца ў дзверы,
І чутна, хтось праходжваецца ўздоўж,

Уздоўж тваёй няверы, смутку, жалю,
Каб сэрца мілатою наталіць,
Каб акунуць цябе ў любові хвалю,
А ты баішся дзверы адчыніць…

А ты баішся, можа там злачынцы,
Бо свет няпэўны, жорсткі і глухі,
Або ліхія зноў прыйшлі чужынцы
Па твой астатні скарб найдарагі…

А можа, там анёл, пасланнік Бога,
А з ім - надзея, вера і любоў?
Ды страх працяў: а раптам там… ні-ко-га,
А толькі цемра, толькі дождж ізноў?..

Дзень так і не настаў… Спусціўся вечар
Чарговы на змакрэлыя двары;
Віхруе вецця з ветрам калатнеча,
Ні ліхтара, ні зоркі ў тым віры…

І раптам: белым-белая сняжынка
На шыбу легла радасцю вітаць!
Анёльская, бялюткая, скажы-ка,
Ці доўга яшчэ цемры панаваць?

Бялее зіхатлівая, не тае,
Нібы да шкла хтось твар свой прыхіліў…
І раптам з высяў - з краю і да краю -
Ўрачыста снег, як цуда, паваліў!

Снег як прышэсце, як трыумф надзеі,
Як абяцанне, што не вечны змрок,
Снег як прароцтва будучых падзеяў
Збаўлення, што рыхтуе нам Пан Бог…

*31 снежня 2020 г.*

**Адкуль узяліся канваліі…**

*Букецік для Хрысціны Лялько*
*ў дзень яе нараджэння*

Змрок з маразамі над бел-светам сноўдаў,
Спалі анёлы пад снежнаю коўдрай,
Спалі, бо ўсё было лёдам скавана,
Ў скрыню няволі зімовай схавана,
Ключ жа згубіўся ў аблоках, у хмарах,
Што тут заседзеліся ў гаспадарах…

Але ж урэшце знайшоўся той ключык -
У промню сонца ласкава-пякучым,
Што з-пад тых хмараў заззяў, залучыніў,
Паадчыняўшы лядовыя скрыні,

Сонных анёлаў растурхаў, адкрылі
Вочкі яны, натапырылі крылы,
Імі патрэслі, на промню прыселі
І да гасподы нябёс адляцелі…

Ды, як ляцелі, патрэслі крылінкі
Па-над гародчыкам бабы Валінкі*,
Ўсюды ад крылцаў пылок панасеялі:
Папрарастаў той пылок - канвалеямі!

Склалі красы тае чыстай пярліны
Гэты букецік для пані Крыстыны.

**Баба Валінка - персанаж апавядання Хрысціны Лялько "Канваліі".*

*28-30.03.2021 г.*



# *Уладзімір Васько*

*Уладзімір Васько нарадзіўся ў вёсцы Ліпічанка Шчучынскага раёна. Скончыў Гарадзенскі педінстытут імя Янкі Купалы. Працаваў у рэдакцыях шчучынскай (1959-1960), дзятлаўскай (1967-1972) і лідскай (1972-2000) раённых газет. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2007 па 2021 год. Жыве ў Лідзе. Друкуецца ў рэспубліканскім, абласным і раённым друку. Выдаў кнігі "Прасветленасць" (1981), "На схілах берагоў" (1997), "Кругазварот жыцця" (2011), "Лясная рапсодыя" (2013), "Зігзагі лёсу" (2017), "Энергія душы" (2018), "На перавалах часу" (2021), "Неабдымнае" (2023), “Салаўіная радасць” (2024). Лаўрэат прэміі імя Анатоля Іверса 2022 года.*

## Вершы

### Залетуценіцца

Зноў прабудзілася натхненне
і бачу ўсё за дымкай дня:
і белых воблакаў успенне,
і цень крылатага каня.
Малюю на экране неба
пейзажы восені глухой.
Чакае ціха снегу глеба,
Чакаем мы зімы з табой.
Карціць на лыжах,
лёгкіх, гнуткіх,
прабегчыся па цаліку,
дзе вецер спавівае ў скруткі
абрускі поля на скаку.
Залетуценіцца, запеніцца
і лес, і дол, і далячынь.
Хачу я ўбачаным пацешыцца
з узгоркаў - дарагіх вышынь.

*25.08.2023 г.*

### Калейдаскоп

І я спагадлівы, і ты.
Ці добра гэта ці ганебна
ў стане жорсткіх і крутых,
Дзе прагнуць еўрыкаў
празмерна?
Да ведаў цяга - на нулі.
І думкі сталі, як шкілеты.

Якія буры замялі
пяском пустыні інтэлекты?
Як цукар смокчам нікацін.
Татуіроўкі брудзяць целы.
Дурман экранаў, бруд карцін.
Чый геній будзе ўцалелым?
А тут яшчэ забойстваў жах
і смертаносны шторм гарэлкі.
І скача па Зямельцы страх,
бы конь, што
выпусцілі з клеткі.
Такі вось, глянь, калейдаскоп-
сядзі, варочай - забаўляйся.
І дзе гарох, і дзе тут боб -
да цёмнай ночы разбірайся.
*08.08.2023 г.*

**Памаўчы**

Непаэты пішуць вершы -
і чытаць няма чаго.
Галавы, браток, не вешай.
Толькі б горай не было.
Во як рынуцца ў кнігарні
графаманы-рыфмачы -
ты тады вазьмі і гаркні,
а пакуль што памаўчы.
*27.10.2023 г.*

**Пуга**

Свішчы, паэтычная пуга,
на вуліцах і ў дварах,
палохай скапленні нядугаў,
наводзь на мярзотнікаў страх.
Сячы па плячах і па локцях,
каб выраслі пульхіры.
Прывыклі таптацца ў балоце,
гарэлку жлактаць ды курыць.
А хто будзе рэйкі варочаць,
у будучыню зазіраць,
не слухаць, што
Вангі прарочаць,
а смела ў космас лятаць?
Краіна не любіць панылых,
уцякаючых ад атак.
Чаму нам не браць
прыклад з Ніла?
З Гілевіча? Так, так, так.
Свішчы, неаслабная пуга,
у шапку не спі ані дня.
Уцёк ад жыцця нехта Пуга -
самазабойцаў спыняй.
*12.11.2023 г.*

**Пры сустрэчах**

Ах, людзі, людзі, вы - нібы мурашкі,
у вечных клопатах, у нейкай мітусні.
То цягне вас да працы, то да пляшкі,
то да таго, што і Ньютон не сніў.
На вуліцах, у крамах пры спатканнях пытаемся:

- Ну як яно жыццё-быццё?
- Ды нешта во смыліць ужо ў суставах.
- А ў мяне дрыжака-калаццё.
І мала хто пахваліцца:
- Выдатна!
Цягаю штангу, ем усё падрад.
Заглядваюся на жанчынак здатных
і не заводжу з лекарамі блат.
Во малайчына гэты дзядзька дужы.
Ён аптыміст, не скардзіцца, не п'е,
смяецца ва ўвесь рот, зусім не тужыць,
як прасціну, хвароб не цягне на сябе.
І я такі напорысты, як Прыпяць.
Магу каня альбо быка падняць.
Не трэба пры сустрэчах хныкаць-мыкаць
і толькі пра хваробы размаўляць.

*30.10.2023 г.*

## У непагадзь

Застой … І глухое бязтэм'е …
Будні шэрыя, як сава.
Ціхіх воблакаў бабіна зрэб'е.
Парыжэла пад старасць трава.
Не намацаць бліскучых эпітэтаў,
а намацаю - не ідуць.
Ці навяжа зіма белых світэраў,
ці ўсталюецца каламуць?
Мо, як летась, прабудзе бясснежжа,
і метафара - носам у гразь.
Ліпічанскі гушчар, Белавежжа
зарыкаюць зубрына ў адказ.
Ды сінічак гуллівыя рыфмы
не схавае ў тумане зіма.
Мой радок не ўрэжацца ў рыфы:
іх у Нёмане нашым няма.

Цьфу застой! Адкасніся нарэшце!
Я і ў непагадзь зоркам спяю:
новых слоў мне, як сечкі, нарэжце
і насыпце ў торбу маю.

*10.11.2023 г.*

## Прыхільнасць

Мала людзей прыхільных,
менш, чым бяздомных катоў.
Зробіцца лёс твой палынным -
не адгукнецца ніхто.
Той спіну над зваркаю горбіць,
шукаючы дзіркі ў трубе,
а гэты нічога не робіць,
ды граблямі грошы грабе.
А нехта ў ботах гумовых
варочае ў смецці нулі:
ніхто за яго не замовіць,
каб на работу ўзялі.
Чакае пакутліва лета,
бо хочацца шчаўя набраць,
схуднелая ў дошку кабета,
багатым на ўсё напляваць.
На звалку пайшло спачуванне,
прыхільнасць украў нейкі зброд,
а мы ўсё бубнім пра каханне,
пра чорныя бровы ўразлёт.

*11.11.2023 г.*

## Варажба

Хто прыйдзе да нас у паўмзроку?
Мучыцель? Мысліцель?
Хто бервяно знойдзе ў прарока ў воку?
Душыцель? Казніцель?

Хто цвёрдасць прыдасць майму кроку?
Ганіцель? Натхніцель?
Хто пераважыць на вагах планету?
Падпальшчык? Тушыцель?
Прышэльцы з касмічных прастораў
нас падманулі, надулі -
і робім снарады, бы скручваем дулі.
Будзем змагацца бясконца
ці жыць памяркоўна і ў згодзе?
Падумай, народзе.
Хто прыйдзе да нас
Праз стагоддзе?
Падумай, народзе.

*17.11.2023 г.*

* * *

Не пішацца штосьці, хоць пазногці грызі.
А што за прычына - не ў сілах уцяміць.
Як быццам іду басанож па гразі,
а ў небе бяскрылыя коні лятаюць.
Нахапаў уражанняў - хоць адбаўляй,
ды ў вершы яны не імкнуцца, не лезуць.
Падкінь мне натхнення, бярозавы гай,
пашлі на спатканне дзяўчыну-гарэзу.
Яна можа ўзрушыць, дарогу праб'е
да светлых, прасторных паветраных замкаў,
альбо разам з мною і тое прап'е,
што не ўкрала старая цыганка.

*18.11.2023 г.*

**Ля акна**

Трапяткія, гнуткія галінкі
праганяюць лёгкі ўсплеск тугі.

Праз акно гляджу і штохвілінкі
ўспамінаю воблік дарагі.
Там, на гэтым гладкім тратуары
прыгажуню летась я сустрэў.
На яе ружовым светлым твары
нараджаўся радасны напеў.
Трэба ж так запасці ў сэрца, трэба,
што не мог вачэй я адарваць.
Хто яе паслаў насустрач з неба,
каб імгненна так зачараваць?
Больш яе не бачыў я ніколі.
Во які няўдачлівы Адам!
Можа прычакаю лепшай долі
і сустрэну зноў дзяўчыну там.

*23.11.2023 г.*

## Самапародыя

Няхай мяне цунамі абміне:
іду праз акіян паэзіі ўброд.
Хоць прозвішча кашачае ў мяне,
ды і мурлыкаю, як Васька-кот.

## Так многае вабіць

Хаджу пры ўзлеску, па полі,
вачыма лаўлю прыгажосць.
Чакаю, калі ў прыполе
хмара прынясе цёплы дождж.
Так многае вабіць і кліча!..
Мне хочацца бачыць і чуць
той слуп, што стаіць, нібы клічнік,
пра што правады з ім гудуць.
Прастрэльваю позіркам далі,
не ведаю стомы і сну,

збіваю магнітныя хвалі,
цалую, як дзеўку, вясну.
Жыццё яшчэ не пражыта,
і я маладзенькі такі:
рукою прычэсваю жыта,
вышукваю ў ім васількі.
Працую настырна, у поце,
частую прасторамі ўсіх,
пакуль не ўвязну ў плоце
абмежаванняў ліхіх.
*23.11.2023 г.*

**Наранку**

Схамянуўся? Дзе я, хто я?
Ява ўжо прыйшла, а сон не знік.
За акном шуміць старая хвоя,
і далёка грукае цягнік.
Я на дачы. Лес цераз дарогу.
Белыя аблокі ў вышыні.
Памалюся ціха, сціпла Богу,
пагартаю пройдзеныя дні.
Светлыя і вабяць, і уздымаюць.
Змрочныя не буду ўспамінаць.
Салаўі пра добры час спяваюць.
Эх, каб я ўмеў так спяваць!
Плямы ночы растаюць, знікаюць.
Весялей становіцца і мне.
Раніцу на ганку сустракаю,
як дзяўчыну, што кахаў раней.
Свежы ветрык прагне цалавацца
са шпакамі, яблынямі, мной.
Здатна летам у паднябеснай хаце.
Будзе здатна некалі й зімой.
*18.03.2024 г.*

***

Праз цемру іду на святло,
шукаю ў смецці золата,
каб вымахаць з часам у волата.
Ах, смеласць! Эх, было - не было!
Пярэгарадзь мной не ўспрымаецца,
хоць без яе не пражыць.
А слава здаля ўсміхаецца,
гарэзай насустрач бяжыць.
Аблезлыя фарбы снежня я
збіраю, бы ў лесе грыбы.
Сустрэнецца дзеўка смешная -
за век яе не забыць.
Чупырыцца гурба снежная,
і лёд ляжыць на вадзе.
Душа мая цёмная, грэшная,
куды ты мяне завядзеш?

*06.04.2024 г.*

## Схільнасць ракавая

Люты звер дабрэй за чалавека:
іншы раз і абміне здалёк.
А ў мундзіры чорным недарэка
прама ў вас націсне на курок.
І пры гэтым усміхнецца едка,
быццам ты пад месяцам ніхто.
Во па кім стагоддзі плача клетка.
Для яго, бы смецце вальс-бастон.
Да забойстваў схільнасць ракавая,
як ад пекла важкія ключы:
- Ах ты свалата такая-рассякая!
Атрымоўвай кулю і маўчы.
Падалі сыны і Беларусі,
і Расіі, і другіх краін.

Да забойцаў я ўсё ж дабяруся,
абуджу іх карніцкі ўспамін.
Кроў пралітая адпомсціць просіць.
Голас ёсць і ў сэрца, і ў крыві.
Чую, у Хатыні час галосіць:
- Генацыдчыкаў усіх пералаві.
*21.10.2023 г.*

**Азарэнне**

Азарэнне прыходзіць само,
(сілай волі яго не прыцягнеш),
разганяе душэўны твой смог -
усё па-іншаму ўспрымаеш.
Позняй восенню дзень быў благі:
дождж цадзіўся, падкрадваўся смутак,
і хмара, як аблога тугі,
не знікала ўжо некалькі сутак.
Ды сустрэлася ты на прычале Надзей
і ўсмешкай сваёй азарыла
і самотныя ліпы, і твары людзей,
і дамы, і мяне прасвятліла.
Быццам хтосьці скамандаваў: "Стой!
Доўга стой, упівайся ўсмешкай".
І хмара адплыла над табой, пад табой
з цёмнай хваляй анежскай.
*22.10.2023 г.*

**Не туды ідзе**

Войны пакурожылі планету.
Як спыніць іх? Як у час паспець?
Нездарма ж прыдумалі ракету,
што разносіць безадказна смерць.
Менш і менш куточкаў чыстых, ціхіх.
Перарые іх ушчэнт ваенны крот.

Будзем есці не свежы мёд з грачыхі.
А атруту запіхаць у рот.
Мабыць перабольшваю? Магчыма.
Але бачу свет наш не туды ідзе.
Лыпае Зямля трывожнымі вачыма,
паратунку просіць у людзей.

*26.10.2023 г.*

# Байкі

## Львы і буйвалы

Паганец-леў на буйвала напаў,
хацеў спатоліць голад масай мяса.
Ды той яго паставіў на-папа
і галаву драпежніку расквасіў.
Падбіты леў знядужана зароў,
суродзічаў паклікаў ён, нягеглы, -
і тыя закрычалі: "Кроў за кроў!"
І на падмогу беднаму прыбеглі.
Прыбеглі, як фанаты на футбол,
не пазычаючы звярынай хваткі,
і павалілі буйвала на дол,
і рвалі яго тушу на кавалкі.
А статак буйвалаў стаяў, маўчаў,
не кінуўся на паратунак брата,
драпежнікаў калечыць не пачаў, -
шукай цяпер, хто ў смерці вінаваты.

*07.11.2023 г.*

## Караед

Някідкі, непрыгожы караед
на тоўстай хвоі распачаў абед.
Ды тут аднекульдзяцел прыляцеў
і задзяўбці нягодніка хацеў.

- Панок, - заплакаў караед, -
не еш мяне, я даўні твой сусед.
Ты лепш - на мыш унізе нападзі,
яна тлусцейшая, чым я. Глядзі!
- Ты не задурвай мне, падонак, галавы.
Мыш - страва вунь для той савы.
А ты - наедак добры для мяне.
Ты ведаеш, за што цябе народ кляне?
За тое, што кару ціхмя грызеш,
і з-за цябе хварэе, сохне лес.
- Панок, - мацней узмаліўся караед, -
то ж, радыяцыя прынесла процьму бед,
і дрэвы засыхаюць ад яе.
А я кары аніякой не ем.
- Хітруеш, братка, - дзяцел тон прыўзняў
і караеда дзюбай прыпадняў. -
Вось зараз праглыкну за твой падман
і змоўкнеш, як прырэзаны баран.
- Вялікасць Ваша, - мовіў караед, -
я хворы пандэміяй, я амаль шкілет.
І скула ў мяне гнаіцца на гарбе,
баюся заразіць, паночак, і цябе.
- Цьфу, ты паршывец, - дзяцел аж збялеў
і караеда выплюнуў на мурашыны хлеў.
І там мурашкі з'елі хітраца.
Так і дадыбаў ён да горкага канца.

---

Да ўсякіх шкоднікаў прыходзіць пакаранне,
не гледзячы ні на пасаду, ні на званне.

*26.11.2023 г.*

## Камар-паклёпнік

Камар паклёп наводзіў на пчалу,
што злосная яна і колецца іголкай,

на твар вам можа пасадзіць скулу
і ўкусіць мінака праз порткі.
Мёд хоць збірае, дык сама і есць,
а пчаляру дае адны аб'едкі.
І муж яе, і мужаў тлусты цесць
зачаста прыпадаюць да гарэлкі.
Пчала не папракае іх, маўчыць.
Яшчэ і мёд прыносіць на закуску
і ад кладоўкі аддае ключы
за паўкілішка згары ці за бusьку.
Дачуўся пра паклёп пчаліны муж
і камара наводмаш моцна ўдарыў:
- Ты што наводзіш плёткі, чортаў вуж?!
Я і не нюхаю ні піва і ні згары.
- Я? Я не я, - заёрзаўся камар. -
Мо гэта чмель ці божая кароўка…
Ды тут жа атрымаў другі ўдар -
і стаў паклёпнік месцам мокрым.

---

Калі ў цябе завузкаваты лоб
і сам ты закажэнены і вялы,
дык не наводзь ад зайздрасці паклёп
на чэсных, працавітых і ўдалых.

*02.12.2023. г.*

**Чалавек і малпа**

У Афрыцы пад пальмаю сядзеў
прыезджы з Беларусі нехта Цішка.
Ён нешта ў адзіночку піў і еў,
і да яго прыдыбала мартышка.
- Ты наш патомак, - мовіла яна. -
Праз працу спрыту, розуму набраўся
і прыахвоціўся патроху да віна,
і спакваля да Месяца дабраўся.

- Ну некалі Чарльз Дарвін так казаў:
што чалавек пайшоў усё ж ад малпы,
а ад каровы і быка - каза,
а дуб нібыта ад прыгожай пальмы.
Ды я не веру гэтаму ані.
І ты падстаў і доказаў не маеш.
Цябе вось тут хоць качаргой забі -
ды чалавекам ўсё-такі не станеш.
Не, ты не маеш рацыі, мартышка.
І не працягвай лапу да кілішка.

*02.12.2023 г.*

## Прымак

Казёл пайшоў у прымы да казы.
Яна яму спачатку дагаджала:
і дапускала да свае казны,
і ўволю есці й спаць давала.
Пасля патроху пачала бурчаць,
што ён занадта многа курыць,
пры людзях пачынае моцна чхаць,
што аж палохаюцца куры.
Сабаку злоснага аднекуль прывалок,
які ўсю ноч на месяц вые.
І сам, бы круглы абібок,
ёй ні спадніцаў, ні панчох не мые.
Разневаўся абураны прымак
і зноў вярнуўся ў сваю хаціну,
садзіў цыбулю, украдкай сеяў мак,
трымаў курэй, рагатую скаціну.
А ў казы ўсё пайшло не так:
ні дроў няма каму калоць, ні рэзаць сечку,
ні на кавалкі раздрабніць бурак,
ні ад свіней адгарадзіць авечку.
Прыйшла каза да прымака сама:
- Вяртайся, галубок, у мой закутак.

Я буду смажыць акуня, сама
і ваксаваць твой кірзавы абутак.
Але казёл той ганарлівы быў
і забляяў надрывіста і строга:
- Рабы, нахабніца, не мы, мы не рабы.
Шуруй, пакуль я добры, ад парога.

*08.12.2023 г.*

**Ваяўнічы хрушч**

Хрушч неяк з клёна папракнуў Жука:
- Чаго ты капашышся ў конскім гноі?
Такога ад цябе я не чакаў…
Я думаў: ты - сапраўдны воін.
Цябе ў атаку, пэўна, не падняць…
Туляешся ў ацэпленых акопах,
а каларадскія жукі даўно сядзяць
на бульбе міліённым скопам.
Ты мог бы іх усіх перадушыць
і вызваліў бы бульбу ад навалы.
Не разумею, як так можны жыць
паблізу ад няўзброенай аблавы.
Я дык лятаю, як навейшы дрон,
і тых, хто ўнізе, болей не баюся.
Я - маршал Жукаў, я - Напалеон!
Ля сённяшніх герояў бокам труся.
- Ну й разышоўся ты, таварыш Хрушч.
Да палкаводцаў трэба быць спаважным.
Запудраныя вочы больш расплюшч.
Недастаткова ў бітвах быць адважным.
Так, смеласці ў цябе - хоць адбаўляй,
а розуму - я не скажу, што процьма.
Ты там на клёне дурня не валяй,
а лепей да майго туліся локця.
- Не, Жук Жуковіч, ты - хоць мой сваяк,
ды не магу я цешыцца табою,

бо я прывык да штурмаў і атак,
а ты ў нару хаваешся ад бою.
- А … Кожнаму сваё, - прамовіў Жук. -
Я буду чым далей ад ўсякай бойні,
а ты, як самы ваяўнічы зух,
змагайся з машкарой на гэтым клёне.

*09.12.2023 г.*

## Махлярка

Варона каркала на дрэве пра бяду,
як быццам хто яе сціскаў за горла.
А голуб варкаваў ля лаўкі на хаду,
казаў, што ўсё ў нас пойдзе вельмі добра.
Яго любілі ў двары ўсе:
хто кіне крошак, хто пшаніцы сыпне.
Ён падрастаў, мажнеў тут пакрысе
і быў удзячны людзям за гасціннасць.
Сцвярджаў, што на Зямлі наступіць мір,
і будзем жыць па светлых Божых планах,
не ўздрыгнуць ні Карпаты, ні Памір,
і на душы ў народаў стане файна.
А гэтая адлюдніца ўгары
бясконца каркала пра войны і пажары.
Казала: свет наш у агні згарыць
альбо загіне ад атрутнай згары.
Варону праганялі мы з двара.
"Акыш! - крычалі. - Вон адсюль, пляткарка!
Табе здыхаць даўно ўжо пара,
а ты не сціхаеш гэтак каркаць."
Ну, а яна ўсё пра сваё ды пра сваё,
нібы не можа жыць без ашуканства:
"Вам не пазбегнуць стратаў і баёў,
канфліктаў, землятрусаў, хуліганства."
"Не, ты дурная! - крыкнуў галубок. -
Не блытайся ў падманлівых прагнозах,

Бо нехта скруціць галаву набок -
і не заплача па табе твая бяроза."
Варона ўздрыгнула і паляцела прэч,
А галубок застаўся каля лаўкі.
Лепш пазбягаць з пляткаркамі сустрэч
і не ўспрымаць, што каркаюць махляркі.

*10.12.2023 г.*

## Гісторыя з шашком

У дзядзькі прозвішча было Шашок,
і да яго ў двор панадзіўся шашок.
Найбольш ён нападаў на куранят.
Ой, спрытны ж быў і хітры гэты гад.
Задушыць куранё і валачэ за хлеў,
дзе ён пад жэрдкамі сваю кватэру меў.
А дзядзька не лічыў тых куранят.
Агледзеўся, калі іх стала ўжо няшмат.
Спярша падумаў ён пра каршуна,
ды не была даказана яго віна.
Стаіўшыся Шашок стаў пад хлявом,
каб абязвечыць злодзея калом.
Ды той быў з розумам - не пень, не пень:
з-пад жэрдкаў не вылазіў цэлы дзень.
Ход пад падмуркам пракапаў шашок
і ноччу прабіраўся ў хлявушок.
Ды неяк певень на яго напаў,
задзёўбаў, уцячы назад не даў.
Наранку дзядзька дзверцы адчыніў -
ляжыць шашок, навек ён тут спачыў.

---

Хоць красці чужое часам удаецца,
на нечым злодзей ўсё-ткі пападзецца.

*12.12.2023 г.*

## Баравік і мухамор

У лесе мухамор і баравік раслі
і між сабою спрэчкі завялі.
- Ды я, ды мы! - выкрыкваў мухамор. -
Мяне шануе й паважае бор.
А на цябе й асіна не глядзіць.
Ты не ўмееш людзям дагадзіць.
Я ростам вымахаў - глядзі які!
А ты плюгавы нейкі і брыдкі.
І шапка ў кропачкі прыгожая на мне.
Жыву я ў роскашы, купаюся ў віне.
А ты на лоб напяліў капялюш,
не бачыш, як паўзе паблізу вуж.
Ды і нага ў цябе, як не нага,
а нейкая рабая булава.
Мяне не абмінаюць вепрукі,
і песні пра мяне пяюць гракі.
- А можа каркаюць, - заўважыў баравік
і перайшоў ужо амаль на крык. -
Ты карканне дастойны - і не больш,
найболей здатны трапіць пад галёш.
Ды што ты акалесіцу тут прэш?!
Атруту ты ў сабе нясеш.
Цябе футболяць у лесе грыбнікі,
ласі, казулі, вепрукі.
Паганец ты, зануда-мухамор,
пра гэта нам пяе сасновы хор.
Нікчэмнасць ты, смярдзючы мухамор.
Так, ад цябе ўпадаюць мухі ў мор.
Мне сорамна з табой вось тут стаяць,
яшчэ й пра нешта ўголас размаўляць.
Абходзьце мухамора лепш здаля:
ён не каштуе дохлага нуля.

Мо й між людзей дзе мухаморы ёсць,
якія ў свядомасці, бы ў горле косць.
*16.12.2023 г.*

## Карась

Мацёры, пазалочаны карась
зашыўся каля берага ў гразь.
Над ім насілася гуллівая платва,
прастрэльвалі вадзіцу шчупакі.
І ўбачыла паўсонная Дзітва:
ідуць сюды з аглядкай рыбакі.
- Тут некалі, я помню, быў кар'ер, -
прамовіў барадаты браканьер. -
Яго злучылі трактары з ракой,
і рыбы тут - хоць ты хапай рукой.
Давай закінем невад, можа, тут
і рыбу возьмем у густы хамут.
- Я згодзен, - адказаў другі рыбак, -
а як яго закінуць? - А вот так:
на беразе расцягнем невад нахаду
і кінем грузікамі ў ваду.
Так і зрабілі. І за вераўкі
свой невад выцягнулі рыбакі з ракі.
Было ў ім многа плоткаў, шчупакоў.
Ды рыбнагляд набег з усіх бакоў.
Аштрафавалі рыбакоў, забралі снасць…
… На іх данёс па рацыі карась…
*08.01.2024 г.*

## Парады

Дабралася да шапкі з норкі моль -
і дзядзька (не германскі канцлер) Коль
не ведаў, як і што тут з ёй рабіць,
і стаў парады ў людзей прасіць.

Вінцук сказаў:
- Насып на поўсць паўжмені тытуню.
Яна яго баіцца, як агню.
Коль пенсіі не шкадаваў
і цыгарэтаў многа накупляў.
Расцёр іх, і тытунь на поўсць паклаў:
- Тут будзе, моль, табе другі анклаў.
Ды моль не здохла - стала яе больш,
і нават завялася ў поўсці вош.
Фадзей параіў:
- Дзядзька Коль,
пасып па шапцы густа-густа соль.
Праз тыдзень паздыхае моль твая -
і шапка стане зноў, як новая.
Засыпаў шапку соллю дзядзька Коль -
і, праўда, паздыхала тая моль.
Але чаго заплакаў бедны Коль?
Раз'ела поўсць і нават шкуру соль.

*09.01.2024 г.*

## Воўк-прадпрымальнік

Адкрыў буфет у лесе шэры воўк,
навешаў шарыкаў на дзверы і акно,
каб павялічваўся звяроў прыток,
пілі гарэлку, каньячок, віно.
Пераступіў парог найпершым рысь:
- Па чым сто грамаў?
- Я прашу пятак.
- А ёсць хоць чым гарачанькім загрызць?
- Ёсць піражкі, падсмажаны шчупак.
Паскробся па кішэнях хітры рысь -
а там пустэча:
- Грошыкаў няма.
- А ну адсюль хутчэй, галота, брысь!
Не дам табе я выпіць задарма.

Рысь выскачыў і плюнуў на сцяну,
і зноў палез на тоўстую сасну.
Наступным ўвайшоў вялікі лось,
павёў вачыма пільнымі наўскось:
- Па чым каньяк вунь той "Напалеон"?
- Па сто  рублёў каштуе сёння ён.
Лось ад здзіўлення гучна так зароў,
што ў ваўка ажно застыла кроў.
Сахаты развярнуўся, выйшаў вон:
- Гарыць ён гарам твой "Напалеон"!
Праз паўгадзіны завітаў мядзведзь:
- Чым тут нутро мне з холаду пагрэць?
- Ёсць "Першачок", "Бульбаш" ну і "Сваяк",
ёсць адмысловы, шасцізоркавы каньяк.
- Налі чатыры шклянкі "Бульбаша",
але пра мой візіт у лесе ні ша-ша,
і сам за дружбу трошкі хлебані,
аднак пра мой візіт нікому ані-ні.
Пілі мядзведзь з ваўком пакуль маглі…
Пасля раптоўна біцца пачалі.
Мядзведзь ваўка за хвост да  бэлькі прывязаў,
а сам яго буфет абрабаваў.
Прыйшла ваўчыца:
- Ты чаго вісіш,
як Мусаліні, галавою ўніз?
- Валтузіўся з мядзведзем доўга я,
і ён мяне да столі прыпадняў,
а сам буфет дачыста абакраў.
- Казала, шый з авечых шкураў кажушкі,
а ты ўсё марыў пра грашовыя мяшкі…
Ты сам з мядзведзем, бачу, налізаўся…
Як дурнем быў, так дурнем і застаўся.
Ваўчыца перарэзала вяроўку й воўк
упаў, пабіўшы, аб падлогу бок.

*17.01.2024 г.*

## Бурнос і тэлевізар

Аднойчы незадумлівы Бурнос
дадому новы тэлевік прынёс.
Сядзіць у мяккім крэсле, нібы пан,
і цэлы дзень глядзіць ён на экран.
Абрыдла тэлевізару трываць -
і ён пачаў Бурноса папракаць:
- Ну што ты пяліш зрэнкі на экран,
як на вароты новыя баран.
Ты ж бачыш, я кручу біліберду:
як есці даць сабаку ці кату,
як смажаць рыбу, блінчыкі пякуць,
як дровы сукаватыя сякуць.
Няўжо табе такое па душы?
Ці без мяне ўжо ты не ў стане жыць?
Мо даў бы мне хоць трошкі адпачыць?
Прашу цябе, шаноўны, адключы.
Бурнос прыкінуўся, што спіць,
прыжмурыў вочы і маўчыць.
Пасля як схамянецца, закрычыць:
- От, не дуры мне галавы, экран!
Я сабе - і парабак, і пан,
і што хачу, дык тое і раблю.
А будзеш балбатаць - другі куплю,
на кухні прымацую да сцяны,
што не пакажа ён - мне хоць бы хны.
- Ну ты і "ўсяядны" тып, Бурнос.
Табе хоць жабу пакладзі пад нос.

*20.01.2024 г.*

## Кот-зомбі

Сівенькі дзед ў вёсцы жыў з катом,
дзяліліся яны сырком і малаком,
хадзілі разам у каморку ды і ў хлеў,

дзе кот лавіць мышэй выдатна ўмеў.
Да іх дваіх не лезла ў твар бяда.
Сябрамі сталі - не разлі вада.
Ды ўбачыў неяк у каморцы дзед:
грызуць мышакі бульбу на абед.
Нікольki не баяцца ўжо ката,
нібыта ён ім - родненькі братан.
Пасля яны гулялі ў чахарду,
скакалі ўжо на галаву кату.
Глядзіць ў поўным недаўменні дзед:
хто тут наладзіў ім кардыбалет?
- Баюн! - аклікнуў ён ката. -
Скажы мне праўду: што за ерунда?
Чаму не нападаеш на мышэй?
Ці ты не бачыш іх? Ці слых уцёк з вушэй?
- Я - зомбі, дзед, і не магу хоць што зрабіць,
каб гэтых грызуноў пералавіць.
- А хто ж цябе паспеў зачараваць?
- Ды пацукі, калі ты ўлёгся спаць.
І я цяпер пад дудку іх скачу,
дзе трэба мяўкаць, я, дзядок, маўчу…

*07.02.2024 г.*

## Грак і рак

- Ну, як жывеш ты, паважаны рак? -
спытаў з алешыны цікаўны грак.
- От, варушуся ў вадзе сяк-так,
як той на хутары стары дзівак.
Я ўжо на пенсіі даўно сяджу
і часта знізу на цябе гляджу.
Табе зайдрошчу я, шаноўны грак:
ты воблакам і дрэвам, як сваяк.
А я сяджу тут ціха пад карчом
і з шыцікаў рыхтую суп "харчо".
- Ці чуў, што ва Украіне йдзе вайна?

Мо ведаеш, калі закончыцца яна?
- Чуць-чуў, але канца ёй не магу ўгадаць …
Табе ж з-пад неба, можа, лепш відаць?
Ты лётаеш туды-сюды, як дрон.
А ў мяне ў вушах ад ціску звон,
і зрок сягае толькі да цябе
і да вароны той, што на вярбе.
Так што, як прыйдзе той вайне канец,
паведамі мне, чорненькі мудрэц.
- А ў цябе мабільнік ёсць там, пад вадой?
- А як жа, я нашу яго заўжды з сабой.
Грак каркнуў і ўзяў кірунак на Херсон.
Яго там збілі: прынялі за дрон.
*22.02.2024 г.*

## Яўхім, сабака і блохі

Яўхім бадзячага сабаку прыручыў
і на канапе спаць яму дазволіў -
і той багата блохаў напусціў,
якія далучыліся да молі.
Яўхім любіў славуты лідскі квас:
пры Жэўжыку хлябаў яго без меры -
і блохі перакінуліся ўраз
на памяркоўнага гаспадара кватэры.
Калі Яўхім піхаў скарынку ў рот
і нешта смачнае трымаў у жмені,
яны на карк скакалі, на жывот,
і на худыя вострыя калені.
Перадушыць іх гаспадар не мог:
яны хаваліся ў адзенне, пад канапу -
і развялося гэтых самых блох
больш, чым смярдзючай поўсці на сабаку.
А ноччу пад дзвярыма лаз знайшлі,
прабраліся на лесвіцу адважна
і, бы паротна ў наступленне йшлі,

кідаліся на сціплых і на важных.
Такімі хутка-спрытнымі былі,
што казыталі ўжо дзяўчатам пяты,
і неўзабаве даскакаць змаглі
ад першага паверха аж на пяты.
Сусед Яўхіму выказаў папрок:
- Чаму ты дыхлавосам блох не морыш?
Яны ўжо мне на рукі - скок ды скок…
- От, не пляткар, Захар, у калідоры.

*14.03.2024 г.*

## Лешч і клешч

Паганы крывапійца-клешч
глядзеў, як плавае прыгожа лешч,
і, вусы растапырыўшы, спытаў:
- Што ты ясі, рачная бедната?
- Усё запар. Не галадаю я.
- А я дык упіваюся ў каня,
у чалавека, соннага лася,
у тлустую свінню і парася.
Ты п'еш вадзіцу там, на дне,
а я чужую кроў. Я, ляшчучок, такі.
- Знайшоў хваліцца чым… Ты паразіт!
Ты людзям і жывёлам так адбрыд,
што кожны рад цябе пераўтварыць у прах
на сенажаці, у лесе, у дварах.
- Мяне не проста, ляшчучок, злавіць:
я навучыўся непрыкметна жыць.
Я поўзаю пад лісцем, пад травой.
Як той казаў, я хлопец з галавой.
Дык бег аднекуль гонкі конь-скакун
і скінуў капытом кляшча ў раку.
А лешч шукаў яду, плыў наташчак -
і тут жа ўхапіў упаўшага кляшча.

*22.03.2024 г.*

## Сцяпан і баян

Не малады, дапытлівы Сцяпан
купіў стары, падношаны баян.
На ім пачаў вучыцца ён іграць
і пальцамі стаў гузікі кранаць.
Але мелодыю не знаў, як падабраць.
На гузікі націсне ён наўгад,
а ў баяне тым бяспровідны разлад.
- Ды што ты, Сцёпа, - зарыпеў баян, -
не ўводзь сябе ды і мяне ў зман,
бо слуху ў цябе зусім няма -
такога я і не прысніў дзярма.
А Сцёпа гне па-грубаму сваё:
- Няўжо такі я невук, ё-маё?
А можа ты няўмека, хлус-баян?
Ты хоць бляі, як той рагач-баран.
А то: то па-дурному зарыпіш,
то засапеш, альбо зусім маўчыш…
З цябе не выціснеш мелодыі ніяк,
ты як разбіты на кавалкі гляк.
Ну як такіх сварлівых прымірыць,
калі ўнутры ў іх усё хрыпіць?

*07.04.2024 г.*



# *Ганна Гайдукевіч*

*Ганна Іванаўна Гайдукевіч нарадзілася ў вёсцы Дакудава ў сям'і работнікаў калгаса. Пасля заканчэння Дакудаўскай сярэдняй школы вучылася ў Гарадзенскім музычна-педагагічным вучылішчы, а затым у Гарадзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы (філалагічны факультэт, беларуская і руская мовы). Працавала ў школах Лідчыны, дваццаць гадоў - у Лідскім педагагічным вучылішчы (цяпер Лідскі каледж) выкладчыкам музыкі, беларускай мовы і літаратуры. Зараз на заслужаным адпачынку.*

*Вершы Ганна Гайдукевіч спрабавала пісаць яшчэ ў школьныя гады, але тыя першыя спробы лічыць няўдачнымі. Вельмі доўгі час вершаў не пісала: шмат часу і сіл трэба было аддаваць працы і сям'і, да таго ж каля трыццаці гадоў спявала ў ансамблі песні і танца "Лідчанка", рэпетыцыі таксама патрабавалі сіл і часу.*

*І толькі ў пачатку 2020 года Ганна Іванаўна прысвяціла сябе паэзіі. Можна сказаць, паэтычная муза прыйшла да яе ў сталым узросце. А падахвоціла яе да напісання вершаў сяброўка і зямлячка Ірына Маркевіч, актыўная ўдзельніца літаб'яднання "Суквецце". "Калі сачыненні ў свой час пісала добра, чаму б не паспрабаваць сябе ў вершах?" - вырашыла Ганна Іванаўна і таксама ўлілася ў калектыў літаб'яднання.*

*Асноўныя тэмы яе вершаў - вёска, вясковае жыццё, родныя людзі, сябры і знаёмыя, спрабуе сябе таксама ў напісанні гумарыстычных вершаў, баек.*

*Ганна Іванаўна друкавалася ў "Лідскай газеце", альманаху "Ад лідскіх муроў", а яе верш "Сіні-сіні" быў надрукаваны ў газеце творчай інтэлігенцыі Беларусі "Літаратура і Мастацтва".*

*У 2023 годзе ў Менску выйшла першая кніга аўтара "З душой і жартам".*

## Родны бераг

Мой родны кут -
Сівога Нёмна
Прыбярэжжа…
Бацькоўскі дом,
Вакол - садок…
Паўзбоч -
Палёў, гаёў
Пяючае бязмежжа,
І росціл лугу
Па той бок…

…Блакіт вясновы
Над падворкам…
Там басанож
Калісь хадзіла.
На сэрцы -
Радасна, і горка:
А ні вазоў,
А ні людзей…
А ўва мне голас
Мамін мілы:
"Дамоў,
Дачушка,
Едзь хутчэй!".

Даўно ў Дакудава
Не клічуць…
Ад ліпаў, што за хатай, -
Пні…
І сад, падобна,
Час свой лічыць -
Дакалатаў бы
Да вясны…

А сцежку,
Што вяла к парому,
Нат днём з агнём
Не адшукаць.
Прыбой дзяцінства!..
Невядома,
У сне якім
Цяпер спаткаць?

Бывала, як
Нядзелька прыйдзе -
Ні чалавечка
Каля дома.
Ніхто не томіцца
На прызбе -
Дыхтоўна
Танчаць
На пароме.

Абцас юначы
Рытм трымаў.
Танцоры макам
Рассыпалі.
У лад
Старэнькія
Пляскалі,
Паром па Нёмне
Хвалі гнаў.

Ускрыляла
Музыка баяна -
Пяюна
Дзядзькі Ігнася!
Прыпеўкі нават
Дзеці зналі -
Іх чула,

На веру здайся,
Уся Зямля…

…Гадоў мінула…
Хваль у Нёмане
Сплыло
Не менш.
Мой кут! Мой родны…
Хачу дадому -
А да каго?..
Хоць плач, хоць енч…

**Маё Дакудава**

Маё Дакудава
над Нёмнам…
Куточак любай Беларусі,
У былым з паслугаю
паромнай…
Табою, вёска, ганаруся!

К табе лячу ў душы
з уздымам,
Як госця ў дом маіх бацькоў,
Дзе бульба ў печы
пахне дымам,
Падворак - поўны парсюкоў.

У вайну была ты
партызанкай,
Фашыст караў цябе агнём…
А сёння - вольная сялянка,
З буслiным клёкатным
гняздом.

Віруе ў Нёмане вадзіца
У промнях сонца
крышталём.
І радасць у прасцяг бруіцца -
Я… з журавінавым кастром.

Куды тут толькі ні блукала,
Галышкай па рацэ плыла,
А з ганка мамачка гукала:
- Даіць Красуню ўжо пара!..

Наш сад і зараз -
быццам райскі,
Крамяны яблык у руцэ…
Адам - не побач…
"Укусіць не дайся!" -
Блісне слязінка па шчацэ…

А Банева!.. Грыбны куточак.
Лісічкі, маслякі…
Заскочаць самі -
Настаў кошык,
Што ў суп,
Што ў сушку на шнуркі…

…Маё Дакудава!..
Тут сэрцу мілы
І луг - прыбрэжжа да ракі,
І пчолкі, што звіняць гулліва,
Мялісу нюхаюць з рукі…

Куточак любай Беларусі,
Старонка - Спадчына імя.
З усіх дарог к табе імкнуся,
Мая радзімая зямля!..

## Сіні-сіні

Пакуль лісток шуршыць асенні,
А холад злы не астудзіў,
Хаджу ад лёну ў захапленні,
Што водар дзіўны падарыў…

…Блакіту розліў на палетку.
Яго, бы мора, дол гайдае…
Лялеюць лён жанкі, падлеткі,
І песня - працы гімн - лунае …

А мы, малеча, - каля мам.
Замінка ім, ды не бяды…
Здаецца, полецца лён сам,
Па ім плывуць людзей рады…

І я ўдзячна свайму лёсу -
З маленства шмат чаму вучыў:
Садзіць, палоць, зграбаць пракосы,
І - сіні лён мне шчасцем быў…

## Вечарынка

Нядзелька. У вёсцы шарая гадзіна.
Ля клуба - аж гіжыць народ.
Уважыць маладых - то не навіна,
Гармонік кліча ў залу, у карагод.

Дзяўчаты - гурбамі, уздыхаюць,
Снуюць па-заліхвацку юнакі,
А шчыра - дык усе ж яны жадаюць
Патанчыць, прагуляцца ля ракі.

Сусед Пятрусь - увішны наш музыка,
Шыкоўна, гожа, гойна можа граць.

А сілаю гармоніка вялікай:
Нат сэрцы навучыўся ён злучаць.

Заводзіць ўсіх пявучая тальянка,
Даюць так дыхту-жару стар і млад.
У пары ўсе - і рыжык, і смуглянка:
Патанчыць з прыгажуняй кожны рад.

І захапіла ўсіх, як падняволле,
Уздым настрою, радасці палёт…
Вірліва закружылася танцполе,
Прытупваюць і польку, і факстрот.

Зардзелася ад шчасцейка Марына:
Лявон з суседняй вёскі ўсё ж знайшоў.
Хлапец - хоць не паэт,
Ды пышная ж чубрына!
На вуха шэпча шмат узнёслых слоў.

І расхрабрылася пад полечку дзяўчына,
Трохрадцы стала ўголас падцінаць.
Нібы крылом над галавой
Узмахнуў хлапчына,
Абцасам кутым - рытмы выбіваць…

…Напэўна, шчасцем поўняцца іх сэрцы,
Забыліся на ўсё, а вось сябры…
Заўважылі: у Марыніным дамку
Няма святла ў акенцы,
Улюбёныя - ля рэчкі да зары…

### Восенню

Паначапляла пацеркаў рабіна,
З бярозкі "медзякі" плывуць на дол,

Туманам-малаком убелены даліны…
Паўсюль - барвяна-жоўты арэол…

А мне аднекуль ветрык заблукалы
Наманіць слоў з даўнішніх дзён -
З тых восеняў, калі кахала…
Ды…гэта быў, няйначай, сон.

У лета кане гэта восень,
І дворнік прыгажосць змяце,
Але… Запомніць памяць просінь,
Што шэпча:
- Пакахай яшчэ!..

## Той жнівень…

Адляцела ў вырай весняя зара:
На ўсё ў прыроды свая воля…
З памяці не сыйдзе жніўная пара -
Хвіліна паркалёвай маёй долі.

…Наляцеў, заплакаў горка лівень,
Учула:
 - Любая, адзіная на свеце!..

Потым - восень.
Вецер з жаўталісцем з сэрца вымеў
Запаветы-словы, прагудзелі ў вецці…

Сумна восень мне падаравала
Думкі злыя, слоў калючых скразнякі…
З-за аблокаў воля
Ў нікуды не параслала
Незабыўны той мой жнівень ля ракі.

## Летняя ноч

Месяц-серпік, нібы нож,
Кроіць змрочны купал неба,
Пасыпае зорны дождж…
Над палеткам пахне хлебам.

Пышна вішня расцвіла,
Яблынька зардзела сцюжна,
Хмарка месяц аплыла,
Светлячкі мігцяцца дружна.

Зіхацяць начныя краскі -
Цень з святлом гуляюць хвацкі.
Верыць у дабро салоўка,
На мышэй палюе соўка…

## Па ягады

На галаве - квяцістая хусцінка,
І лёгкаважкі кошык - у руцэ.
Віхлястая сярод травы сцяжынка
У Балотны лес, у ягады вядзе.

Вітальна падбадзёрыла бярозка,
Здалёку - сонны голас каршуна.
А водар верасовы мёдна-борздка
Згладзіў горкі подых багуна.

Вось чырванню зайгралі журавіны,
Зіхцяць і клічуць:
- Ты мяне бяры!
Нібы каралі на грудзях дзяўчыны,
Гараць… Ну, што агеньчык у кастры.

Якая радасць! Гэта ж дар балотны…
Ён так багаты вітамінам "Цэ".
Бяру, бяру яго з травы халоднай,
А чай сцякае потам па шчацэ.

**Дружок**

Дружок ледзь-ледзь ланцуг валочыць,
Гадкоў яго і не злічыць,
Глядзіць у вочы, есці просіць -
Старэнькі пёс, ды хоча жыць.

Служыў ён доўга, чэсць па чэсці,
Усю шыю ланцугом садраў,
Кароўку пасвіў і сваё знаў месца,
А вартаўнік - ну, ідэал.

І вось дзянёк настаў пасмурны,
Не знаў Дружок - прышла пара:
Бяднягу знешне хоць культурна,
Але… прагналі са двара.

Брыдзе бядак, куды - не знае,
А сэрца раздзірае боль.
Завошта так жыццё карае?
Скажы, мой лёс, знаць мне дазволь.

Гады ж сваё бяруць, дарэшты:
У пажылых - тужлівы век…
Стары Дружок не надта брэша…
Будзь Чалавекам, чалавек!

**Анамалія**

Санлівы нівы з-за бясснежжа,
Рыхтуе сані… Новы год.

Чакае ўсё - вось-вось заснежыць,
На рэчках забрыльянціць лёд.

Сумуе рунь па коўдры-снезе,
Замшэлы сцята дуб маўчыць.
Азябшы, сонца на бярозе
Якуюсь хвілю пасядзіць…

Ды ветрагон, відаць, забыўся,
Што - зімняе ў пары імя,
Гудзе галлём, дажджом разліўся…
Ды не іскрыцца белізна.

Прырода, людзі - у чаканні:
У небе дзеецца ж "таржок"…
На зорцы ў цішы перадранняй,
Зямля агорнецца ў сняжок!..

## Няўрымслівая козачка

Штодзень казіная сям'я
Пасецца на лужку зрання.
Усе козачкі, як на падбор,
А сярод іх - казёл Мажор.

Ды іншы раз усё ж нямірна
Набэчыцца каза Макрына -
Нібы яна за ўсіх мілей,
І малачко яе смачней.

Адводзіць ад усіх Мажора,
Бляе яму пра сіне мора.
Хоць ён казёл, а розум мае
І на Макрыну не зважае.

- Чаму, і што
не надта гладка? -
О, гэта - цяжкая загадка…
Разумніца мазгі напнула,
Як быць далей?
Кажысь, адчула

І пацягнулася да рэчкі,
Скубуць дзе траўку
дзве авечкі.
"Рассядуся на беражок -
У мяне ж салодкі галасок.
Суседзі звернуць можа ўвагу,
Акажуць мне сваю павагу".

Падбегла да авечак смела,
Зірнула вочкамі ўмела,
Давай і мэкаць, і бляяць,
Бо трэба ж спрыт
свой паказаць.

- Суседка-кумачка, прабач, -
Сказаў казе Баран-рагач, -
Авечкі - прыгажэй за ўсіх,
Не трэба іншых нам, такіх.

Ды ты, Макрына, не гаруй,
Сабе за выхадкі даруй,
Хоць ты, каза, і зухавата,
Сакрэт - гадкоў табе багата…

## Вясною

Росны золак лашчыць землю,
Серабром зіхціць рака.
Сонца ранку дае волю,
Шэпча казку асака.

Ранне шчэбетам ўзбадрыла,
Мыла шоўк лужка расой.
Птушак спеў сваволіць міла,
Лес кудлачыцца красой.

Расфарсілася рабінка,
Белым цветам аплыла,
Прыгажуня! Ну, дзяўчынка!
Мёдны водар узняла.

Раздурэўся дзень вясновы,
Цеплынёю адарыў,
Сад апранак справіў новы,
Шпак жытло сваё абжыў…

## Неспадзяванка

Сяльчанін дзядзечка Панас
Працуе шчыра, проста клас.
Такі ж ён здатны да ўсяго,
За гэта любіць люд яго.

Панас з гарэлкай не сябруе,
А дабрабыт сям'і мацуе.
І вынік добры заслужыў,
Ды матацыкл новы набыў.

Вось і збылася яго мара -
Шчаслівы ён, жонка Тамара.
І цешча едзе паглядзець.
У краму трэба падаспець.

Абнова - добрая нагода,
Аб гэтым шэпча і прырода.
Заглянуць і сябры-суседзі,
А цешчу - пачастую брэндзі.

Так думаў зяць, імчаў з трывогай
Ды любаваўся ён дарогай,
Якую вось-вось дабудуюць,
Чым лёс сялянскі падмацуюць.

Яны ў краме ўсё купілі,
Дамоў шчаслівыя кацілі.
Ды толькі вось неспадзяванка -
З-за гравію - свіння-паганка…

А хуткасць - ну як у ракеты,
Нібы спяшала на катлеты.
Раз'елася ж мадам свіная!
Ну, а мазгоў амаль не мае.

Панас зусім не спадзяваўся -
На выхадкі рабой нарваўся.
Цяпер не цяжка ўявіць:
Усе на баку, свіння вішчыць,

А з сумкі выцякае віскі,
І побач - з горада сасіскі.
А матацыкл - дык не пабіўся,
Бо ў кучу з гравіем зваліўся.

А аблавухая дурніца!..
Паклыпала сваім хваліцца.

Жанчына мужу спачувае,
Слаўцом прыемным суцяшае:
- Усё смачнае у хаце ёсць,
Ацэніць гэта, знаю, госць.

***

Жыве сумленна чалавек,
Шчыруе ў працы цэлы век.
А пастку лёс ужо рыхтуе,
Каб падлажыць "свінню рабую".

**Дапамагла**

Пчальнік вітае месяц май,
Тут працы - толькі паспявай,
Пра адпачынак і не мар,
Шчыруй удала, дзед Макар!

Так з дня ў дзень працуе ён.
Ды толькі трэбала ў раён.
Пчаляр да жонкі: "Папрацуй,
Бо выйдзе рой, а ты пільнуй!

Да ўсяго ж ты вельмі здатна,
Спрацуеш, веру, на выдатна.
А каб хутчэй - прасі суседку,
Ды не забудзь жа і пра сетку".

Паехаў муж, ну а жанчына
Пайшла да пчол
так смела, чынна.
- Прыйшоў і мой час
адпачыць,
Не ўсё ж ля печы
той хадзіць…

Сядзіць на лавачцы кабета,
Пакуль што сетка не адзета.
Тут побач венік і вада,
Як выйдзе рой - то не бяда.

Ды ў вуллі раптам загудзела,
Тут пчолка-матка паляцела,
Ну, а за ёй - малады рой.
Пчалярка страціла спакой.

Крычыць яна, заве суседку:
- Нясі мне, Маня, табурэтку!
Мне трэба пчол
сваіх спыніць
Ды ў райніцу іх закрыць.

Тут Зося сетку начапіла,
Так спрытна венік ухапіла,
На рой той -
пырскаць і махаць,
Далей за сад свой
не пускаць.

А яблынька галлё раскрыла
І пчолак шчыра прытуліла.
- Маня, бяры хутчэй дымар,
Хай будзе ўсё ў нас без ахвяр.

Кабеты радасна шчыруюць
І рой з ахвотай атакуюць:
Ужо Зося пчолак абтрасае,
Дымарыць Маня пачынае.

Ды раптам штось
не так пайшло,
На злосць крылатых панясло.
Ізноў яны ўсе падняліся,
Пякучай справай заняліся.

- Трываць больш нельга,
Маня, вер,
Пруць за пазуху, каўнер,
Яны звіняць і ўсё пякуць,
Ды моцна па нагах сякуць.

А Маня ўнізе не гультуе,
Так лоўка дымаром кіруе:
- Ратуй, суседачка, дымі
І пад спадніцу болей дзьмі!

Ой, так знясілела кабета!..
Зляцела Зося ўніз ракетай,
Усё - прэч і праз бар'ер,
Бы непатрэбны куль папер,

Бягом да рэчкі: так бліжэй -
Жыццё ж без болю даражэй.
А справу трэба добра знаць,
Каб печ на пчолак памяняць!

## Мо, гэта склероз?

- Мае гады - маё багацце! -
Сказалі мудрыя мужы.
Напэўна, старасць - гэта шчасце,
Што гэта так - вось дакажы.

Так завязалася размова
Сярод вяскоўцаў-землякоў.
Успамінаць - не так і нова,
Ну і канешне ж - пра любоў.

Любоў да жонкі і да дзетак,
Да сельскай працы, каб пражыць,

Каб жылося без таблетак,
Усё трэба помніць, даражыць.

Прайшлі гады, прайшлі турботы -
Хоць цэлы дзень, мужык, ляжы.
Як жыць цяпер нам без работы?
Сусед Лявон, усім скажы.

Лявон знаходлівы на слова,
Любога мог развесяліць,
Ды расказаў ізноў, нанова,
Як можна ў старасці забыць.

- Дзень пенсіі, была аплата,
Чагось забрыў я да Фамы,
Бо я забыў, дзе мая хата,
А пасля чаркі - да кумы.

А кумка спрытная такая…
Прынесла сала да бліноў.
Аж бач - ідзе мая старая,
Я зразумеў - бяжы дамоў.

Браткі мае, што там чаўплося…
Не здольны вам я расказаць.
Аж шкло у вокнах затраслося,
Ад тумакоў бакі баляць.

А цела ныла, проста жах.
Я бег так шпарка, без маны,
Забыў пра ўсё, быў такі страх,
Ледзь не згубіў свае штаны.

Так пёр дадому ва ўвесь дух,
Праз гэту позняю любоў
Забыў пра боты і кажух…
І мог застацца без зубоў.

Я хоць стары, а як зіма,
Калі трашчыць яшчэ мароз,
Чамусьці сніцца мне кума…
Мо гэта мой такі склероз?

### Прыткі кот

Жыве ў двары калматы кот,
Штодзень здзіўляе ён народ:
Ці точыць кіпці на вярбе,
Ці дабывае харч сябе.

Такі спрытняга гэты кот,
А лепш за ўсё ён любіць спорт,
На корт вядзе яшчэ сяброўку,
Распачынае трэніроўку.

Вось крос узяў старт на траве,
Далей паўзком і на спіне.
Гулялі доўга, так стаміліся,
Ля клёна-волата спыніліся.

Тут наш смяльчак
Зноў скок ды скок,
Залез на саменькі вяршок,
Яна ж за сябрам назірае,
Сядзіць пад дрэвам, пазяхае.

Прысеў каток і косіць вока,
Відаць, плануе. Белабока
Пырхнула ўверх, а ты, зладзей,
Не задавайся, будзь цішэй,
Спускайся ўніз - лаві мышэй!

Кот з дрэва скок - і хвост трубою,
Сяброўку мяўкнуў за сабою,

Не змог здабыткам падзяліцца…
Бягом на сметнік пажывіцца.

***

Сярод людзей бывае так,
Хоць справу робіць абы-як,
А думае, што ён мастак.

## Госць прыехаў…

У аўчарні, каля рэчкі,
Жыве Баран, а з ім авечкі.
З мазгамі ён не вельмі дружыць,
А па сяброўках часам тужыць.

Найлепшы спосаб весяліцца -
З братамі лоб у лоб пабіцца.
Беспрычынна, для весялосці,
Каб трашчалі барановы косці.

Звычайна ўсё было ў нядзелю,
Калі ў застоллі пасядзелі,
Ён сам, ягоны дзеці, жонка,
Было шмат сена, самагонка.

Але аднойчы было так:
Прыехаў пагасціць зямляк -
Прыгожы Бяша, вельмі сыты,
Відаць, ніколі не быў біты.

Бо быў вялікі ён начальнік,
А не якісь вясковы "чайнік".
Сабраў усіх, стаў дакараць.
- Чаму беднота, нашто гразь?

Каб добра жыць - прасі дазвол,
А калі не - у пратакол!
Бляяць авечкі сталі ўсе,
Выказваць думкі пакрысе:

- Дык мы ж твае аднахлявоўцы,
Скажы нам радаснае слоўца.
Ты ж падарункі нам не вёз…
Стаміліся мы ад пагроз.

Прыезджы слова яшчэ ўзяў,
Наперад выйшаў і сказаў
Сурова, вычурна, ды злосна:
- Кіруй, Баран, ты больш сур'ёзна!

А калі трэба - пакарай,
Сваёй уладзе волю дай!
Баран прамовіў у адказ:
- Ты прыязджаеш кожны раз

Да нас сюды адпачываць -
Павінны ўсіх тут паважаць!
Бо нарадзіўся, з намі рос
Ля гэтай рэчкі і бяроз,

А нас выхоўваць - не дарос!
Кірую так, ну як магу,
Сваіх авечак сцерагу.
Мяне ты знаешь, я - Баран.

Пайшоў ты прэч, а нас не рань!
Ты зразумей, нарэшце, Бяша,
Найпрыгажэй аўчарня наша.
Малой Радзімы не цурайся,
А з землякамі хоць вітайся…



# *Міхась Мельнік*

*Міхась Іванавіч Мельнік нарадзіўся 7 лістапада 1949 года на Магілёўшчыне (вёска Майсеевічы Асіповіцкага раёна), але вось ужо 45 гадоў яго жыццё, працоўная і грамадская дзейнасць, літаратурная творчасць цесна звязаны з Лідчынай. Скончыў філалагічны факультэт Гарадзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы, працаваў у школах, прафтэхвучылішчы, гістарычна-мастацкім музеі, шмат гадоў выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Лідскім каледжы. Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Выдаў зборнікі вершаў "Скрыжаванне", "Лодка жыцця", "З табою".*

**Надзея**

Далёкі месяц -
Бы чаўнок зялёны -
Павіснуў
Над рыпучымі снягамі.
Мой праўнучак -
Наіўны і ўтрапёны -
Падскоквае -
Яго б дастаць рукамі.
А я гляджу,
Дзівак,
Не разумею,
Што ручкі цягнуцца
Да вышыні
Сусвету…
Не згаснуць мары ў свеце
І надзеі,
І не звядуцца
На зямлі паэты.

***

Па днях,
Як па пнях,
Іду да сябе на споведзь -
Са сваёй душой,
Са сваёй слязой,
Са сваім сумненнем,
Сумленнем,
Бы са збавеннем
Ад дум недарэчных,
Трывог штодзённых,
Ды са сцвярджэннем
Ісціны спрадвечнай,
Што я -
Беларус!

***

Заўжды хай цешаць песні
Пра прынямонскі край…
Няхай жа вецер весні
Абудзіць мройны гай.

Хай мір на свеце белым
Сярод людзей жыве
І ветразем надзеі
Удалячынь плыве…

Красу зямлі любімай
Нам захаваць дано,
Бо сонца над Радзімай
Для нас усіх адно.

**Выратаванне**

Часамі бывае мне цяжка,
Бы птушцы,
падбітай у лёце…
Туга, як зялёная раска,
Засмоктвае
ў тлумным балоце.

А я выбіраюся, рвуся,
Як з пекла да вечнага раю, -
Адвагай сваёй ганаруся
І сілу жыцця набіраю…

На зоркі гляджу і дзіўлюся,
Іх тайнаму лёсу зайздрошчу:
Яны над маёй Беларуссю
Гараць нават цёмнаю ноччу!

***

Памыляўся, не раз памыляўся
Ды рабіў не ўсё так, як трэба…
Толькі верным заўжды заставаўся
Богу, Маці і Роднаму Небу.

Я жыву сёння сціпла і ціха,
Пэўна, старасць мяне асядлала.
Але ж сэрца маё б'ецца ліха,
Каб да скону дажыць удала.

Прабачэння прашу, каго крыўдзіў
Ці каго абышоў увагай…
Хай ад нас дабрыня не адыдзе,
Каб была між людзьмі павага.

## **Перасцярога**

Нехта суседу дзвярэй не адчыніць,
Нясе паспяховаму пагрозу
Ды на калегу паклёпы чыніць,
Бо ён ад зайздрасці страчвае розум.

Хтосьці на бліжніх кулак падымае,
Нават здараецца братазабойства…
Гэтакі нелюдзь сэрца не мае,
Гэткі злачынец з ліку ўродстваў…

Каб не згубіць чалавечую годнасць
І каб не страціць прыстойнасць людскую,
Трэба нам еднасць і памяркоўнасць,
Трэба мець чуласць і душу жывую…

Ніколі забываць мы не павінны,
Што нам жыццё даецца адзін раз.
Давайце ж кожныя жыццёвыя хвіліны
У радасці адзначым сярод нас!



*Кацярына Гоман (Сымановіч) - нарадзілася ў 1988 годзе ў горадзе Лідзе.*

*Скончыла БДУКМ у 2014 годзе па спецыяльнасці "мастацтва эстрады, інструментальная музыка". Настаўніца па фартэпіяна, канцэртмайстар. Спявачка, фіналістка розных тэлепраектаў, дыпламантка і лаўрэатка мноства конкурсаў, вакальных фестываляў, дзейная салістка яўрэйскага ансамбля "Шалом" г. Ліды. Захапляецца паэзіяй. Друкавалася ў "Лідскай газеце". Жыве ў Менску.*

# *Кацярына Гоман*

## Вандроўнік-Чараўнік
## (песня)

Адчыніць дзверы, вокны, сэрца,
Закрочыць у пошуках жыцця,
Ён чараўнік, які, здаецца,
Шукае шлях да небыцця.

Малюе ў марах краявіды,
Ляціць да будучыні дзён,
Каханнем, шчырасцю спавіты,
Натхняе мой забыты сон.

*Прыпеў:*

Вазьмі з сабой, вандроўнік,
У чароўны, дзіўны свет,
Імгненнямі напоўні
Пажоўклых дзён букет.

Ярчэе колер фарбаў,
Іх бляск яшчэ не знік,
Я бачу мноства скарбаў,
Вандроўнік-Чараўнік!

Загадкай маніць да прастораў,
Прыжмурыць вочы, шалапут,
З душой дзіцяці, без прытвораў,
Ён, сапраўды, пакажа цуд.

Краіну мар, паляну казак,
Сакрэты зораў-таямніц,
На ўсе пытанні дасць адказы,
Ён - жыццядаўца ўсіх крыніц.

*Прыпеў:*

Вазьмі з сабой, вандроўнік,
У чароўны, дзіўны свет,
Імгненнямі напоўні
Пажоўклых дзён букет.

Ярчэе колер фарбаў,
Іх бляск яшчэ не знік,
Я бачу мноства скарбаў,
Вандроўнік-Чараўнік!

*(Проігрыш)*

*(На іншы матыў)*

Учора дзень быў, як застылы,
Але вандроўнік даў мне крылы!
Я стаў рамантык-летуценнік,
Свавольнік у задавальненні!

*Прыпеў:*

***

Няўмелае, асірацелае,
Ад болю прыціснута.
Нястрымнае, зарабавелае,
Крывёю апрыснута.

Цярплівае, незразумелае,
Самотай ахутана.
Пакутліва злямантаванае,
Пустэчай апутана.

Самлелае, жалю счакалася,
Знямоглае стукае.
Пакрыўджана так і зацялася,
Зрабілася лютае.

Трапечацца, горка галосячы,
Знікае, маленькае.
Нявечна, жыцця яшчэ просячы,
Сціхае, старэнькае.

Змагалася, моцна трымалася,
Урэшце стамілася.
Збялелае заўсміхалася,
У шчасці - спынілася...

Сэрца...

## Памяці Васіля Быкава

Быкаў Васіль - пісьменнік народны -
Жыў сціпла ў вёсцы: прыгожай і роднай.
Любімая ежа - клёцачкі з печы,
Запалам было - маляванне, дарэчы.

А потым - вайна, гучны выбух гарматы.
Дарога дадому - сям'я, слова "тата"...
Меў Быкаў вялікую бібліятэку,
Быў шчырым і добрым заўсёды, спрадвеку...

Вялікі пісьменнік і гонар матулі...
"Рашучасць і чуласць", - казаў Барадулін.
Для нас, чытачоў, Быкаў - літаратура
Зямлі беларускай, пясняр і фігура,

Якая, як зорка, узышла ў небасхіле...
Ён быў з тых людзей, хто працівіцца сіле.
Ваеннай аповесці майстар чароўны,
Ён талент меў бачыць наскрозь усіх цудоўна.

Яго прызывалі нясхібным, сумленнем...
І творчасць яго - у памяці пакаленняў.
Ён - Быкаў Васіль - імя на скрыжалі,
Што ведалі добра і паважалі.
2024 г.

## Твой час

Толькі сыдзе зморак ночы,
Дзень расплюшчыць сонцу вочы.
Цёплы промень сціщыць вецер,
Час згадаць аб хуткім леце.

Неба чыста, высь без хмараў,
Раіць лёс узлятаць да мараў,
Крок рабіць, здзяйсняць надзеі,
Час шукаць у жыцці падзеі!

Выпаў шанц - бяры з падзякай,
Смехам, радасцю прыцягвай!
Смелым кінься ў рух, імклівым!
Час кахаць і быць шчаслівым!

**Балада пра сына**

(Песня)

(Уступ)

1.

Люльку з дзіцём у маленечкай хаце,
Ціха калыша знямоглая маці.
Долю шчаслівую кліча з нябёс,
Просіць палегчыць пакутны іх лёс.

Час не стаіць, і сынок ужо ў ботах,
Стрэльбу ўзняўшы ідзе па балотах,
Вораг Радзіму крывёю заліў,
Мары ў попел няшчадна спаліў!

*Прыпеў:*

"Сынку! Мой родны!
Сэрцу гаротна!
Дзе ты, анёлак?
Жывы?

Ціха ў хаце,
Думкі аб страце,
Не! Адганю іх!
Жывы…

(Пройгрыш)

2.

Бой праграмеў і так мірна над полем,
Сонца на небе, ды знікла нядоля,
Маці - зямелька паўстала з калень,
Вось і настаў светлы час перамен!

Толькі ніколі не сцішацца раны,
Слёзы па тых, хто быў Богам забраны,

Горыч нястрымная ў сэрцах матуль,
Тых, чые дзецi памерлi ад куль…

(Пройгрыш)

*Прыпеў:*

"Сынку! Мой родны!
Сэрцу гаротна!
Дзе ты, анёлак?
Жывы?

Вочы… Пазнала…
Лёгка як стала…
Як жа ты доўга…
Жывы…"

(Кода)



# *Сяргей Герасімовіч*

*Нарадзіўся ў 1962 годзе. У 1985 годзе скончыў Менскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (перакладчыцкі факультэт), перакладчык з іспанскай і англійскай.*

*Стажыраваўся ў Гаванскім універсітэце (г. Гавана, Куба) і ва ўніверсітэце Пампею Фабра (г. Барселона, Іспанія). Вайсковы перакладчык у 1987-1989 гадах (Народная Рэспубліка Мазамбік, правінцыя Іньямбане).*

*Уваходзіў у склад клуба аўтарскай песні "Ветразь" (г. Менск) з 1981 па 1985 год.*

*Аўтар песенных альбомаў "Паўднёвы крыж", "Гэта ўвогуле, жыццё..." і зборніка паэзіі "У кальцы Сатурна" (2024 г.).*

*З 1991 года працуе ў ЗАТ "Каскад" г. Ліды. Курыруе праекты па рэстаўрацыі і ўзнаўленні свяцілень XVII-XIX стагоддзяў на аб'ектах-помніках архітэктуры.*

## Прысвячэнне Лідзе

Мне цудаў заморскіх ніякіх не трэба.
Ёсць Беларусь, і народ мой не згінуў.
Мне тут даравана блакітнае неба,
Лясы і зямля, якой не пакіну.

***Ref.***
Дзяўчаты прыгожыя, моцныя хлопцы -
Нашчадкі зямлі Гедыміна.
Ззяе над вежамі нашае сонца.
І Ліда - наша Айчына.

У нашай крыві - свабода і гонар.
Мы ведаем, як працаваць і кахаць.
У Лідзе найлепшыя піва і бровар,
А зоркі насамрэч ярчэй зіхацяць

Два нашы ключы леў спрадвеку бароніць.
Адзін ключ - на Захад, другі - на Усход.
І Ліду ніхто і ніколі не зломіць.
Было так і будзе на тысячу год.

***Ref.***
Дзяўчаты прыгожыя, моцныя хлопцы -
Нашчадкі зямлі Гедыміна.
Ззяе над вежамі нашае сонца.
І Ліда - наша Айчына.

## Шынту

Калі нас няшчасце руйнуе,
магчыма ўратавацца
адным успамінам імгнення
пра холад вады са студні,
ды смакам яблыка з саду,
тварам, звяртаннем да мары,
першым суквеццем язміну,
бясконцым компаса колам,
згінуўшай некалі кнізе,
гекзаметра пульсам дакладным,
ключом ад дзвярэй знаёмых,
ды водарам бібліятэкі
нешта нашкалт сандалу.

Назвы ранейшых вуліц,
цікавыя колеры мапы,
панура прыемная роўнасць,
мінулая гадавіна,

раптоўная боль знянацку,
дванаццаць званоў цьмяных.

Увасабленні Шынты
блукаюць па ўсіх дарогах.
Сціплыя боствы імкнуцца
неяк спадволь дакрануцца,
а потым пра нас забыцца.

*Jorge Luis Borges.*
*Shinto. La Cifra. 1981*
*(Пераклад з іспанскай.)*

**Memento**

Калі я згіну,
пахавайце мяне з гітарай
у жвіры ракі імклівай.

Калі я згіну,
паміж кветак Гранады
і яе апельсінаў.

Калі я згіну,
флюгер зрабіце
маёй дамавінай.

Але толькі,
            калі я згіну!

*Federico Garcia Lorca.*
*Memento. Vinetas flamencas. 1921-1922.*
*(Пераклад з іспанскай.)*



*Ала Вадзімаўна Юшко нарадзілася 19 траўня 1955 года ў вёсцы Кузьмічы Ваўкавыскага раёна. У Гародні вучылася на тынкоўшчыка-маляра. Жыве ў Лідзе з 1971 года. Працавала па прафесіі ў БМУ-175, ААТ "Ліданафтапрадукт". Вершы піша з 48-гадовага ўзросту. Друкавалася на старонках "Лідскай газеты", у часопісе "Ад лідскіх муроў" і ў іншых выданннях. Аўтар кніг "Лепестки судьбы"(2019) і "Ларчик с секретом"(2024).*

# *Ала Юшко*

## **Памяць**

Загінула вёска, заціхла,
Памяць сцёрлі з зямлі.
Зарасла хмызняком, бур'янамі,
І галосяць там злыя вятры.

На пагосце крыжы пачарнелі
І прабіўся да сонца палын.
Сіратліваю, горкай слязою
Ён над прахам забытым застыў.

Дзе падзеліся дзецi, унукі?
Прадаўжальнікі роду свайго.
За мяжою шукаючы шчасця,
Не знайсці вам радзімы парог.

## Вершык

Каб вершык добра напісаць,
Патрэбна нам чытаць, чытаць.
Я з гэтым згодна, вам скажу,
Бо часам слоў як не хапае,
Дык гэта будзе і не верш -
Яго пародыя крывая.

Свае тут думкі, пачуцці,
Надзеі ўсе і спачуванні
У верш кароткі ты ўлажы,
Ды так, каб душу не параніў.
А калі што і прачытаў,
Глядзі,
каб плагіятарам не стаў.

## Купалле

У летнюю цёплую ночку,
Як зоркі на небе зіхцяць,
Трэба ў лесе ў поўнач,
Папараць кветку шукаць.

Мае цудоўную сілу,
Дорыць надзею каханым.
Той, хто яе адшукае,
Кажуць, шчаслівым ён стане.

Цяжка ўбачыць-знайсці,
У год толькі раз зацвітае,
У рукі даецца таму,
Хто верыць у чары кахання.

## Пакуты

У ганенні, патугах, пакутах
Ішла душа да іканастаса,
І як ступаць, і што казаць,
Яна гаротная не знала.

Гарэла свечка на ветры,
І воск каціўся, як сляза.
За тым дымком,
што віўся ўгору,
З душы знікала чарната.

І ёй адкрыўся Лік святы
Маці Усецарыца абняла
І як маленькае дзіцятка
Да Бога сына павяла.

## Брусніцы

Казку чула, ці то быль,
Хто цяпер тут разбярэцца.
Як старая бабка ў лес
У брусніцы хадзіла.

Тая ягада ў траве,
А старая ўжо не бачыць.
Дык дзве пары акуляраў
Нос упрыгожылі яе.

Пад нагамі мох і багна,
Што казаць - балота тут.
Быццам чэрці тую бабку
Па вадзе і купінах вядуць.

Усю акругу аблятае,
Назбірае ягад, не падняць
Прычытае: галададала,
Унукам буду памагаць.

Рот той ягады не бачыў,
Грошы вочы аднялі,
І пагост бур'ян "украсіў" -
Вось і вывады рабі.

**Зіма-завея**

Чакаюць усе зіму-завею,
У ёй таямніца ёсць свая,
Яна не церпіць тугу і смутак,
Ёй вір патрэбен для жыцця.

Румянец шчок, і бляск вачэй,
І бег трусцою па сняжку,
Забавы ўсе не пералічыш,
Што ты з сабой нясла ў мяшку.

Куды пайшла і дзе прапала?
Каму нявіннасць аддала?
Цнатліва-чыстае ўбранне
Ў якія далі панясла?

З табою мы прывыклі жыць,
Ты гнала ў нашых жылах кроў.
Няўжо цяпер у гэтым веку
Для нас ты станеш
дзіўным сном?

**Ліда**

На плошчы ў бронзе застыў Гедымін,
Ягонаю спадчынай Ліда багата.
У замку, што гораду ён падарыў,
І сёння яго дух вітае.

Абноўлены сцены і вежы стаяць,
Жыццё поўным ходам віруе.
А князь на кані, з даўніны сівой,
Гасцей да сябе запрашае.

Вярнуўся да нас ужо назаўжды,
Яму тут усё даспадобы.
І горад не знікне любы з зямлі,
Як памяць жыве у народзе.

## Свечкі

Выкінуў свечкі каштан кучаравы,
Ліп шэраг у квецені жоўтай стаіць.
Ціха, павольна, у цені схаваўшыся,
Рэчка Лідзейка ў далеч бяжыць.

Горад мой любы, утульны, прыгожы,
Вуліцы вабяць сваёй чысцінёй.
Семсот красе яго дзявочай,
Не дарам Лідай наракли яго.

Шчасця ў жыцці табе, Ліда!
Мірнага неба і чыстай вады!
Ляцяць над табою стагоддзі,
Дораць табе незабыўныя дні.

## Конь

Запрэглі каня ў плуг,
Сталі пугай паганяць.
За другіх табе рабіць,
Лёс такі рашылі даць.
Так нагрузяць воз з вярхом,
Што дваім не пацягнуць.
Шкура потам аблілася,
А яго яшчэ і б'юць.
Здзекі тыя над жывёлай
Рэжуць вочы, сэрца рвуць.
Гаварыць ён не ўмее,
Ды часамі рэшты дасць.
Так агрэе капытом,
Што забудзеш, як завуць.
Лепш трымайся за аглоблі
І сядзі, пакуль вязуць.
Бывае казус і ў людзей:
Адзін робіць, сем глядзіць.
А як сонца прыпячэ,
Дык і гэты ўцячэ.



# Валера Мацулевіч

*Валера Мацулевіч нарадзіўся 4 жніўня 1983 года ў Лідзе. Скончыў Навагградскі гандлёва-эканамічны тэхнікум па спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік і аўдыт". Працаваў на прадпрыемствах ААТ "Лакафарба", ААТ "Лідскі завод электравырабаў". Пасля - у школе № 8. Вершы пачаў пісаць з 19 гадоў. Друкаваўся ў газетах "Лідская газета", "Прынёманскія весткі", "Гродзенская праўда", літаратурна-мастацкіх часопісах "Ад лідскіх муроў", "Нёман", "Маладосць". Аўтар зборнікаў "Струны душы" (2011) і "Чалавек са свечкай" (2014). Песні на яго словы напісаны лідскім кампазітарам Віктарам Хобаравым, а таксама выконваюцца бардамі Міхаілам Карнілавым і Сержуком Чарняком. Жыве ў Лідзе. Піша вершы на беларускай і рускай мовах.*

## Прысвячэнне "Лідскай газеце"

*Да 85-годдзя выдання*

Калі на сэрцы - смутак, у вокнах - дождж
І адзінота падмяніла лета,
За сябрука надзейнага не горш
Вам дапаможа "Лідская газета".

Калі яе разгорнеш на стале,
То ўсвядоміш: ты больш не самотны,
Як быццам хтосьці за плячо кране
І дзесьці побач цэлы горад родны.

З табою Ліда гутарку пачне,
Славутае мінулае прыпомніць
І, бы ў прыгожым каляровым сне,
З сучаснасцю цікавай пазнаёміць.

Радкі дадуць душэўны супакой,
З дзіцячай казкі, як вада жывая,
І ўпэўнена падымуць твой настрой,
Нібы байцу лістоўка баявая.

Слата і смутак не турбуюць больш,
Калі ў руках любімая газета,
І верыш, што ён пройдзе, гэты дождж,
І заўтра будзе сонейкам сагрэта.

## Дарога ў Ерусалім

*Нашы продкі называлі Млечны Шлях*
*Дарогай у Ерусалім*

Дарога-кілім…
Дарога ў Ерусалім…
Шлях да зорнае мэты,
Па якім закаханыя
альбо паэты,
Ці святы па жыцці
Толькі змогуць прайсці,
Зазірнуць у Сусвет,
З карагодам планет
Танчыць для Пана Бога,
Там, дзе ўсё і нічога,
Дзе хор ясачак-ангелаў
Кліча ў Рай дыфірамбамі…

Дарога-кілім…
Дарога ў Ерусалім…

***

За акном завеі
Снежныя гудуць,
З велічным Сусветам
Гутарку вядуць.

Зоркі, не сняжынкі
На зямлі ў гасцях.
Праз мае сцяжынкі -
Снежны Млечны Шлях.

## Першы снег

З пустэчы неба
ў мае далоні
Нясмелым сумам
снег падаў першы.
Баяўся, пэўна,
яго пагоняць,
Ды ён застаўся
ў гэтым вершы.

Ляцеў з нябёсаў,
крыштальна-крохкі,
Безабаронны
прад гэтым светам,
Журботна слухаў
людскія крокі,
Шукаў цяпла,
што мінула з летам.

І я ахутаў
душы пяшчотай
Яго маркоту,
яго маўклівасць,
Каб развітаўся
ён з адзінотай,
Не траціў веру
ў добразычлівасць.

Снег упрыгожыў
прыроды ўлонне,
Вясёлы самы
і самы першы,
А мне здалося:
я грэў сягоння
Чыёсьці сэрца
ў далонях верша.

## Сланечнікі

*(Напісана пад уражаннем
ад карцін мастака
Ван Гога)*

Сонца промні сеяла
Шчодра і заўзята,
І ўзышлі сланечнікі -
Сонца маўляняты.

Вось стаяць, гайдаюцца
Хваляй залатою,
Быццам забаўляюцца
Ў гульні між сабою.

І прырода весела
Іх пацалавала,
Якасць найкаштоўную
Ім падаравала:

Хай у светлай радасці,
І ў бядзе-пачвары,
Цягнуцца да сонейка
І душой, і тварам…

Як мне доля выпадзе
Адысці са свету,
Я хачу сланечнікам
Расцвітаць улетку.

Каб хвілінай радаснай
І ў бядзе-пачвары
Да Святла павернутым
Быць душой і тварам.



# *Ганна Рэлікоўская*

*Рэлікоўская Ганна Леанардаўна нарадзілася 8 ліпеня 1964 года ў вёсцы Кянці Лідскага раёна Гарадзенскай вобласці. У 1979 годзе скончыла Кенцеўскую васьмігадовую школу і паступіла ў Ваўкавыскае педвучылішча, бо з дзяцінства марыла аб настаўніцкай працы. У 1983 годзе пачала працаваць настаўніцай пачатковых класаў у СШ № 8 г. Ліды. Дыплом гістарычнага факультэта БДУ, атрыманы ў 1991 годзе, дазволіў ёй перайсці на выкладанне гісторыі ў старэйшых класах спачатку у той жа СШ № 8, затым у СШ № 17. На працягу 1999-2000 навучальнага года з'яўлялася старшынёй прафкама навучэнцаў Лідскага індустрыяльнага тэхнікума. З 2005 па 2017 год працавала намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 11 г. Ліды. Затым зноў вярнулася у СШ № 17, дзе і завяршыла педагагічную дзейнасць у 2022 годзе. Зараз на пенсіі. З юнацтва захапляецца вершамі, лічыць, што менавіта праз рыфму, праз асаблівы рытм, спалучэнне гукаў можна найбольш дакладна перадаць свае пачуцці, свой погляд на навакольны свет. Друкавалася са студэнцкіх гадоў у мясцовых раённых газетах, некалькі вершаў трапілі на старонкі "Настаўніцкай газеты", выбраныя творы ўвайшлі ў зборнікі паэзіі, выдадзеныя у Лідскім раёне і за яго межамі. Тэмы вершаў самыя разнастайныя: прызнанне ў пачуццях да Радзімы, да беларускай мовы, да настаўніцкай працы, да дзяцей, да матулі.*

## Лідзе

Ліда! Сэрца маё замірае
Ад пяшчоты глыбокіх пачуццяў.
Любы горад! Цябе ўсхваляю
І хачу быць табою пачутай.

Сем стагоддзяў ты цешыш вочы
Прыгажосцю сваіх краявідаў.
Тут буслы ўвесну клякочуць,
Каб хутчэй апраналася Ліда

Пасля белай коўдры зімовай
У накід з сонечных дзьмухаўцоў,
І каб дзеці смяяліся зноўку
На пацеху сваіх бацькоў.

Летнім днём у цяжкую спякоту
Каля возера сцежку знайду,
Вып'ю лідскага квасу ў ахвоту,
Да Кургана свой шлях пракладу,

Пастаю, пачытаю шыльды,
Памяну герояў вайны.
Ёсць табе ганарыцца кім, Ліда!
За цябе йшлі на подзвіг сыны,

Каб узімку, і ўвесну, і ўлетку
Ты давала нам сілы ў жыцці,
Каб цвілі аж да восені кветкі,
Каб навокал маглі расці

Школы новыя і заводы,
Гмахі крамаў, зелень садоў,
Каб стаяў горад мой тут заўсёды,
Як стаіць ужо 700 гадоў!

## Бескарыснасць

Ёсць нейкія мэты вышэйшыя,
Каштоўнасці без даляраў.
Ёсць людзі найдаражэйшыя,
За іх - хоць жыццё ў ахвяру.
Ёсць месцы для сэрца мілыя
Нават без статуй Свабоды,
Нельга ніякай сілаю
Пакінуць іх назаўсёды.
Ёсць прага да працы бясконцая,
Неўтаймаванасць сэрца.
І ёсць вялікае сонца,
Якое дае ўсім сагрэцца.

## "Новым" беларусам

Пра што мне з вамі размаўляць, прабачце?
Аб еўра альбо доларавых пачках?
А я хачу пра кнігі, тэлебачанне,
А я хачу аб дочкіных задачках.
Над чым мне плакаць з вамі? Над кілбасамі?
Ці над некупленаю новаю дублёнкаю?
А я хачу паплакацца над казкаю,
Над новаю прачытаннай старонкаю.
Аб чым мне марыць з вамі? Аб ласосях?
Ці як разбагацець хутчэй другога?
А я хачу, каб зазірнулі госці,
І каб лілася шчырая размова.

## Прададзеная хата

Што прададзена хата - не веру.
Трэба вывезці ўсё непатрэбнае.
Ланцугі. Матычкі. Шпалеры.
Абразы. І дзяружку зрэбную.

На сцяне кажухі і ватоўкі.
У прыскрынках абрусы і шалі.
У альбоме старыя паштоўкі.
На пліце чыгункі пазбіралі.
Коўдры. Крэслы (у іх ножкі хістаюцца).
Вёдры, венік, з паперы букеты.
Гаспадар навачэсны ўглядаецца.
А навошта яму ўсё гэта?
На палічцы валяецца графка.
Не вітае гадзіннік боем.
На стале шклом міргае карафка*.
І такое мне ўсё дарагое!
Шафа кніг. Незатрабавальны
Цэлы куфар сурвэтак, адзення.
Ціха ў крэдансе посуд крыштальны
Плача з намі ад гэтай падзеі.

* *Карафка - шкляны посуд для напояў, графін.*

**Яшчэ адна вясна**

*(Матулі да 90-годдзя)*

Матуля! Дажылі! І слава Богу!
Матулечка! Хутчэй страчай вясну.
Зноў сонейка сабе праб'е дарогу,
Каб дзьмухаўцы расчухаць ада сну.

Паглянь, за вокнамі снягі ж ужо раставалі,
І свежай глебай дыхае зямля.
Ты ў мяне, як-нібыта са сталі,
Старэнькая матулечка мая!

Прыслухайся, як жаўрукі спяваюць,
Агулам далучаюцца шпакі.
Яшчэ адна вясна ў жыцці мінае.
Трымайся, мама, і сто год жыві!

## Першы снег

Ад такой прыгажосці вершы,
Быццам той узор за акном,
Выліваюцца з сэрца, паверыш,
І кладуцца ў радок за радком.
І настрой да аблокаў узлятае,
Як дымок, што ўецца слупом.
З надыходам зімы ўсіх вітаю
І з цудоўным марозным дзяньком.

## Не пішацца

Не пішацца… Зусім не пішацца.
І слоў не знойдзена. І рыфма крышыцца.
І верш ляціць у тар-тарары.
Я памаўчу да той пары,
Пакуль адновяцца пачуцці
І ў вершы зможаце пачуць вы
Усю мілагучнасць, прыгажосць.
Я не хачу пісаць пра злосць,
Пра боль, пра фобіі, пра жахі.
Чакаю веснавыя пахі,
Каб стаў настрой хоць крыху лепш.
Тады народзіцца мой верш!

## Флюіды

Хто сказаў, што няма флюідаў?
Дык чаму ж я іх адчуваю
Кожны раз, як прыеду ў Ліду?
Ад' язджаю - і іх не хапае.
Калі ў вёсачку родную траплю
І пабачу яе краявіды,
Мне ў сэрца адразу па кроплі
Пранікаюць імкліва флюіды.

Аднадумцаў-паэтаў, бывала,
Не наведаю, выпушчу з віду,
Дык адразу ж душа застывала
Ад нястачы тых самых флюідаў.
Я бягу на спатканне з каханым.
Усё мацней і мацней з прыбліжэннем
Шэсце гэтых флюідаў жаданых,
Незямное іх прыцяжэнне.
Захіснуся ад злосці і гневу,
Ад няпраўды і ад агіды.
І застогнуць напружана нервы.
Гэта што, як не тыя флюіды?
Як без іх чалавекам застацца?
Хіба жыць без пачуццяў, як гніды?
Усім жадаю, каб з вамі ў працы
І ў жыцці былі побач флюіды.

### Чаромхавы пах

Як чароўна чаромха цвіце!
Пах казыча і нос, і жаданне.
Успамінаю, як у цемнаце
Прастаялі з табой да рання.
І такі ж чаромхавы пах
Галаву маю задурманіў.
Ты насіў мяне на руках
І даваў мне шмат абяцанняў.
Добра ведаю я цяпер
Чорных ягад смак звар'яцелы.
Абяцанні твае за каўнер,
Як пялёсткі чаромхі, ляцелі.
Толькі зноў надыходзіць май.
Ад чаромх навакол белым-бела.
Больш, каханы, мяне не шукай.
Я з другім гэту весну сустрэла.

## Аднакласнік

Ён на пасадзе вельмі важнай,
І мае выгляд эпатажны.
А я, кабета ў капялюшы,
Кахаць мяне яго прымушу.
Мы з ім вучыліся ў школе,
Ды не страчаліся ніколі.
Ён быў малы і рыжаваты,
Над ім смяяліся дзяўчаты.
Гультай, лайдака, абармот.
І раптам - бац! - такі ўзлёт!
Цяпер ён там, на самым версе,
На чорным ездзіць "Мерсэдэсе".
О, каб вярнуць маё юнацтва!
Хацеў жа ён са мной абняцца.
Дай, Божа, мне цяпер той момант!
Было б усё ў нас па-другому.
Падмажу бровы, вочы, губы.
Куды ты дзенешся, мой любы!
Пяшчотны позірк услед, у спіну,
Хамут на шыю ўраз накіну.
Мы будзем парай падхадзяшчай,
Абы не здрадзіла мне ўдача.
З табой нам усміхнецца шчасце.
Дык да сустрэчы, аднакласнік!

## Легенда-быль

*У 301 годзе хрысціянства ўпершыню ў свеце стала дзяржаўнай рэлігіяй. І адбылося гэта ў Арменіі.*

На высокай-высокай гары,
Дзе страчаюцца сонца прамені,
У старажытным манастары
Адбылося цуда ў Арменіі.

І не толькі ў Арменіі! У свеце!
Добра ведаюць гэта ўсе:
І дарослыя, і нават дзеці.
Дух святы гэту вестку нясе.

Быў раней манастыр - Айрыванк,
У пячоры ўздымаліся сцены.
Ен прытулкам служыў для армян,
Калі брындалі ворагаў цені.

Там бруіла крыніца святая,
Ратавала ад смагі лютай.
Адступала варожая зграя,
Пакідаючы боль і пакуты.

Многім сілам маліліся людзі,
Бо язычніцкай вера была.
І стагналі душы ў брудзе.
Ды сцяжынка сюды прывяла,

Каб ачысціць, каб зменшыць гора,
Каб на праўду адкрыць ім вочы,
Пілігрыма - Святога Рыгора,
Што здалёк у Арменію крочыў.

У руках яго дзіда вострая.
Ёю рымскі сотнік валодаў.
На крыжы Ісуса Хрыстоса
Гэтай дзідай калоў з асалодай.

Той крыві кроплі шчэ не высахлі
(Беражліва манах нёс святыню).
А народ на ўзгорак высыпаў,
І цар Трдат на яго позірк кінуў,

Загадаў хутка ў яму манаха
Апусціць без вады, без хлеба,

Толькі сам нацярпеўся страху
І звярнуў свой позірк у неба.

Сілы нейкія падказалі,
Каб Рыгора вызваліў ён.
З той турмы манаха дасталі,
Прывялі да цара на паклон.

Запрасіў Трдат Рыгора ў пакоі,
Доўга слухаў святыя размовы.
Упершыню сэрца цар супакоіў,
Ён паверыў у асветніка словы.

І замест шматлікіх багоў
Сталі людзі маліцца Ісусу.
Чыстай стала армянская кроў,
Адышлі ад іх беды, спакусы.

У манастыр тую дзіду змясцілі
Ад нядобрых людскіх пачвар
І Гегардам яго ахрысцілі,
Збудавалі нямала хачкар.

З той пары ў многіх краінах
Перасталі ганяць хрысціян.
Зразумелі цары, што павінны
Прыклад браць з церпялівых армян.

Землятрусы, арабы з халіфам,
Разбуралі Гегард, палілі.
Ды армяне спраўляліся з ліхам,
Манастыр яшчэ лепш аднавілі.

Авазан, Жаматун, Катогіка
Прыгажосць сваю захавалі.
Праўда дзіду Лонгіна, сотніка,
У сабор Эчміадзін забралі.

***

Да армян мы з вялікай павагай.
Галаву схіляем у пашане
Перад самаю першай дзяржавай,
Дзе ўсе людзі былі хрысціяне.

***Айрыванк*** - *манастыр у пячоры.*
***Рыгор*** - *па адной з версій асветнік, які прынёс у Арменію "Дзіду Лёсу", якой быў праткнуты Ісус Хрыстос.*
***Трдат III*** - *цар армян у IV ст. нашай эры, які першы ў свеце зрабіў хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй.*
***Гегард (Гегардаванк)*** - *манастыр дзіды.*
***Хачкар*** - *стэлы з крыжамі.*
***Авазан*** - *першая царква ў пячоры.*
***Жаматун*** - *пакой у скале.*
***Катогіка*** - *галоўная царква.*
***Лонгін*** - *рымскі сотнік, які дзідай калоў Ісуса распятага на крыжы.*
***Эчміадзін*** - *манастыр, сімвал Арменіі, месцазнаходжанне пасада Вярхоўнага Патрыярха Каталікоса Усіх Армян.*



# *Ірына Маркевіч*

*Маркевіч Ірына Уладзіміраўна нарадзілася ў 1954 г. Вырасла ў вёсцы Ельня Дакудаўскага (цяпер Трацякоўскага) сельсавета Лідскага раёна Гарадзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучылася ў Біскупскай васьмігадовай школе (1961 - 1969 гг.), Дакудаўскай сярэдняй школе (1969 - 1971 гг.), Гарадзенскім сельскагаспадарчым інстытуце па спецыяльнасці агранамія (1972 - 1977 гг. ), Беларускім дзяржаўным універсітэце па спецыяльнасці выкладчык біялогіі і хіміі (1992 - 1996 гг.). Працавала ў калгасах Лідскага раёна спачатку палядводам, а пасля заканчэння ГСГІ - аграномам, загадчыкам участка, галоўным аграномам, сакратаром партыйнай арганізацыі калгаса "Іскра", старшынёй Дакудаўскага сельсавета і настаўніцай біялогіі і хіміі Дакудаўскай сярэдняй школы. Зараз на заслужанным адпачынку, пенсіянерка.*

*Вершы пачала пісаць у 1999 годзе. Друкавалася ў "Лідскай газеце", літаратурным электронным інтэрнэт-часопісе "Русская Балтика" ў Літве, часопісе "Ад лідскіх муроў" № 8, 9, 10 прымала ўдзел у другім і трэцім літаратурных конкурсах імя Веры Навіцкай "Дарослыя - дзецям", якія праводзіліся Лідскай раённай бібліятэкай імя Янкі Купалы, лаўрэат шостага конкурсу імя Веры Навіцкай "Дарослыя - дзецям" (2024 г.). Выступала з вершамі па Лідскім радыё, на розных мерапрыемствах у палацы культуры г. Ліды, школах г. Ліды, пагранатрадзе г. Ліды і інш. У 2022 годзе выдала кнігу вершаў "Даверлівы дыялог".*

*Прысвячаецца памяці*
*Аляксандра Іосіфавіча Мацулевіча*

Цяжка, калі адыходзяць сябры,
Добрыя, шчырыя, светлыя людзі.
Талент пайшоў не ў свой час, без пары.
Вельмі шкада: яго больш не будзе.

Помнім: збіраў і шукаў ён паэтаў,
Часта званіў, віншаваў вельмі шчыра,
Раіўся, ведаў, сяброў меў з паўсвету...
Сумна нам стала: няма камандзіра.

Помніць "Суквецце". Заўсёды так будзе.
Цяжкае гора. Скрушная замяць.
Гэткім, як Саша, правільным людзям.
Раю на небе... І вечная памяць.
*04.01.2024 г.*

## Маліся Богу

Букецік кветак на магілку пакладзі.
На помніку на здымак паглядзі.
Малітву прашапчы за супакой душы.
Даўно ў даміне хто ляжыць ў цішы?

Яго пахавалі ў ціхі светлы дзень.
Адразу лёсу хвалі зніклі недзе ў цень.
Вялікі смутак быў ва ўсёй радні...
Не ліце слёзы болей вы, ні-ні.

Ніхто не адзавецца, не ўстане з зямлі,
Не скажа ні слова... Помніце, жылі,
Страчаліся, кахалі, вучыліся быць
Ласкавымі і добрымі, ды з людзьмі дружыць.

Успамінаў мноства хай будзе і вам...
Ніхто не ўстане. Душа рвецца ў Храм,
Спакою ў малітвах у Бога папрасіць,
Застацца ў нябёсах, а не ў смале быць.

У Божым Храме свечка ціха хай згарыць.
Маліся Маці Божай, каб шчасліва жыць.
Таму на магілку ты часцей хадзі,
Праведай ды кветкі ціха пакладзі.

**Ельня**

Ельня - малая Радзіма завецца.
Мроіць думка мая і заўсёды імкнецца
Вёску наведаць ля шумнай дарогі,
Дзе вырасла я, не мела трывогі.

Так разляцеліся яе жыхары:
Хто ў горад паехаў, хто хварэў да пары,
Хто век свой аджыў, пайшоў у нябыт...
Вёска ж стаіць і шануе свой быт.

Кожнае лета шчыруюць бацькі.
Дзеці прыедуць, пагрэюць бакі.
Бегаюць, скачуць, турбуюць унукі...
Гэтак ва ўсіх, не трэба прынукі.

З раніцы кава. Вечарам чай.
Байкі цікавыя, сястрычка, страчай.
Еду ў Ельню песні спяваць,
Сустрэцца, пагутарыць, пасумаваць.

Цешаць вясною нас журавлі,
Ластаўкі летам, буслы, салаўі.
Восенню будзем збіраць ураджай.
Вёска сумуе: не ад'язджай.

Зімою ласі і казулі гуляюць,
Што засталося - усё паз'ядаюць,
Нават кару на дубку абгрызуць,
Гуляюць, сваволяць, спаць не даюць.

Ноччу зайцы, дзікі заглядаюць,
Мабыць, паесці штосьці шукаюць.
Можа, ваўкоў тут меней бывае...
Вёска затоіць, сагрэе, схавае.

Так пажывае Ельня мая:
Слухае песні шпакоў, салаўя,
Кліча зімою звяроў да сябе,
Мірна, спакойна чакае мяне.

Песні ў лесе зязюля кукуе,
Лічыць гады. Няхай нам пашанцуе
Доўга і добра на свеце пажыць,
Каву ды чай смачна вёскаю піць.
*14.05.2023 г.*

## Бяссонніцы

Ціха гадзіннік час адбівае.
Горад заснуў. Адпачывае.
Толькі Бяссонніца сумна блукае,
Спаць не дае, штосьці шукае.

Ты не сяброўка. Ты не каханка.
Дзе ж твая казка ці калыханка?
Мне дай спакою і раскажы
Як тут заснуць. Дапамажы.

Толькі ў адным я згодна з табою:
Штосьці ўсё рупіць, мала спакою.
Думаю. Думаю. Вось і не сплю.
Кідай мяне. Сціпла сцярплю.

З ветрам за вокнамі хутка зляці.
Зоркамі яснымі ўсё асвяці.
Месяцам блісні на небе без хмар...
Сон мне нясі. Хай засне ўвесь абшар.
*03.01.2024 г.*

## Жураўлі

Ля маёй вёскі жураўлі
Шлюбны баль свой пачалі,
Па-над полем кружаць,
кружаць,
Між сабою нібы дружаць.

Робяць круг яны шырока.
Аж прываблівае вока,
Як танцуюць журавы,
Не шкадуючы травы.

Ногі іх ідуць у скокі,
Б'юць крыламі ва ўсе бокі,
Узлятаюць аж пад хмары,
Аглядаючы абшары.

Плаўна робяць нова кола,
Льецца іх "курлы" наўкола -
Ціха кружыць пачуццё...
Будзе шлюб на ўсё жыццё.

Рэдкасную з'яву бачу,
Я знямела, ледзь не плачу
Ад прыроднай прыгажосці,
Слоў няма, прапалі штосьці.

Дзякую вам, жураўлі,
Шчасце, мір мне прынясլі.
Хай заўжды такое будзе...
Беларусь вас не забудзе.
*03.05.2023 г.*

## Гаючыя ўспаміны

Мы даўно пайшлі з дзяцінства:
Хто ранней, а хто пазней,
З успамінаў дзьме дзівацтвам,
Што нас робіць весялей.

Часта ў хованкі гулялі,
Пігру, штандара вялі,
Лялькі з хустак выраблялі...
Што шукалі? Што маглі?

Сад. Груша. Радочкам вуллі.
Пільнаваць пчол, бавіць час
Тата з мамай і бабуляй
Прымушалі нас не раз.

Мы на посцілках ляжалі,
Слухалі гудзенне пчол
І за ўсім так назіралі,
Грушкі бралі ў прыпол.

Вельмі смачна пад грушою
Есці сала з часнычком,
У цянёчку ды з душою
Слухаць, баяць са шпачком.

Як зязюля закукуе,
Мы пачнём гады лічыць.
Побач жаўручок спявае,
Не дае нам адпачыць.

На званочках у садзе нашым
Шмат чмялёў,
каровак божых.
Водар сена, выгляд пашы,
Памяць
усё жыццё трывожыць.

***

Шмат гадочкаў праляцела...
Помнім мы дзяцінства дні.
Брат, сястра, я пасталелі.
Вёска, ты на нас зірні,

Калышы ціха ўспаміны,
Закранай думкі і мроі...
Дзе ні еду - позірк кіну,
У марах раюся з табою.

Думкі гоняць да калыскі,
Што бясконца ўсіх хвалюе,
Дзе дзяцінства нас люляе,
Гоіць сэрца шчасцем блізкім.
*11.06.2023 г.*

## Пра мяне, вецер і птушак

Полем, вёскаю ды лесам
Вецер гойсае зімою.
Думкі мкнуць за ім з нябёсаў,
Развітаўшыся са мною.

Прылятаюць, адлятаюць
Птушкі нашы кожны год.
- Вы скажыце, - я спытаю, -
Дзець куды мільён турбот?

Вы на крылах аднясіце
Ад усіх людзей бяду
Ды мяне з сабой вазьміце,
Бо ў турботах прападу.

Птушкі весела махалі
Тысячамі пёраў, крылаў
Быццам нешта абяцалі...
Восень. Паляцелі ў вырай.

Толькі ж я стаю на ганку,
І ўслухоўваюся чутка
Ды іду на працу ранкам.
Не, не веру болей чуткам.

Хай дзяцей буслы прыносяць
Нам у хаты ды кватэры
І вясну па кветках водзяць...
Вось тады і дам я веры.
*2024 г.*

## Пра Ліду...

Пра Ліду пісаць я буду.
Пра горад пісаць я хачу.
Я яе хараства не забуду,
Ад прыгажосці маўчу.

Тут усё мне добра і звыкла:
Ціхія вуліцы, ліпы і клёны...
Назаўжды да цябе я прывыкла,
Горад мой любы, зялёны.

Ты прыгожы любою парою:
Кветак розных шырокая плынь...
Восенню, летам, вясною
Краскі гэтыя вокам акінь.

Людзі добрыя, ветліва-шчырыя,
Нас паўсюдна тут сустракаюць.
Справы, жаданні іх мірныя
Горад наш і раён аздабляюць.
*2024г.*

## Гады ляцелі…

Гады ляцелі, як адно імгненне...
Куды ж яны? Дзе летуценні?
Чаму мяне вы так пакінулі
Калі ўсе мары зніклі, згінулі.
Чаму сплылі яны далёка...
Дзе ж ты цяпер, мая палёгка?
Навошта вецер гоніць хмары,
Кідае іх, мінуў абшары.
Жыццё бяжыць, часам віруе:
Каго паб'е, каго цалуе.
Не ўсё ідзе, як я хачу -
Таму цярплю, малюся, не крычу.

Не трэба клікаць дапамогу...
Іду я ў храм, прашу я Бога
- Змілуйся , ды хоць крыху памажы,
Дарогу шчасця мне адкрый і пакажы...
*17.02.2023 г.*

## Пойдзем на спатканні

Сакавік... Сакавік!
Ты даўно да нас прывык,
Гурбы снегу растапіў,
Кветкі сонцам прабудзіў.

Птушак з выраю ты клікаў:
Чаплю, жораў закурлыкаў,
А вось бусел, той чакае,
Красавік ён заклікае.

Салавей у траўні будзе.
Ён каханне нам абудзіць...
Пойдзем, пойдзем на спатканні
З маладосцю і каханнем.
*08.03.2023 г.*

## Як забыць?

Ты з мяне смяяцца будзеш,
Што кахаю аднабока,
Потым спынішся, забудзеш...
Ад цябе я так далёка.

Можна ўсё даўно забыць.
Толькі ж як я буду жыць
Без кахання і сустрэч?
Сумна, цёмна насамрэч.

Я скажу: "Цябе кахаю
І нікога больш не маю.
Гэта тайна. Пачуццё
Са мной цэлае жыццё."

Рвуць вятры мае дарогі,
Сыплюць попел заміж жвіру.
Хоць няма нідзе падмогі,
Я прыйду. Кахаю шчыра.
*2023 г.*



*Алесь Сымановіч нарадзіўся ў 1960 годзе ў горадзе Лідзе. Па нацыянальнасці беларус. На працягу пятнаццаці гадоў служыў музыкантам штатнага ваеннага аркестра ў Лідскай в/ч № 34154. Працаваў музыкантам, дырыжорам, інструментоўшчыкам, аранжыроўшчыкам у розных установах культуры і адукацыі, рэдактарам шахматнай рубрыкі ў "Лідскай газеце". Кандыдат у майстры спорту па шахматнай кампазіцыі. Захапляецца паэзіяй. Мае паўнагадовых сына і дачку. Жыве ў Лідзе.*

# *Алесь Сымановіч*

### Ліда - мой горад
(Песня)

Горад мой замкам славуты высокім,
Што размясціўся пад небам шырокім.
Ціха журчыць і віляе Лідзея…
Ліда - мой гонар і сімвал надзеі!

Я ганаруся, мой горад, табой,
Ярка грыміць салют!
Распавяду таямніцу сваю:
Ліда - мой родны кут.

Помнік ля замка стаіць Гедыміну,
Лідскіх гасцей сустракае Скарына…
Бібліятэкі, басейны, музеі,
Школы, лякарні, кавярні, алеі!

Я ганаруся, мой горад, табой,
Славу табе пяю!
Людзі хай слухаюць споведзь маю,
Як я цябе люблю!

Цепліць агонь на зялёным Кургане -
Памяць герояў адвечна ў пашане!
Моцна сябруюць і спорт, і культура:
Музыка, танцы і літаратура.

Горад любімы, рабіся мацней,
Гукамі шчасця грай!
Мірная Ліда, на радасць дзяцей
Слаўся, квітней, мой край!

Ордэн на сцягу блішчыць "Знак Пашаны":
Фарбай гісторыі размаляваны!
Фабрык, заводаў у Лідзе так многа -
Якасць прадукцыі здзівіць любога.

Ліда - стваральніца новых ідэй,
Слаўлю твой герб і сцяг!
Дбае пра долю старых і дзяцей
Продкаў маіх зямля!

Горад да шчасця свой шлях пракладае,
Праз сем стагоддзяў маладым выглядае.
Сэрца трымціць ад любові да Ліды,
Радуюць вока яе краявіды!

Слаўся, мой горад, квітней і расці,
Ты для мяне - сям'я!
Песня мая над краінай ляці,
Ліда - любоў мая!



*Аляксей Сымановіч нарадзіўся ў Лідзе ў 1985 годзе. Настаўнік рускай мовы і літаратуры, мастацтва. Настаўнік-метадыст. Магістр філалагічных навук. Лаўрэат юбілейнага X Міжнароднага Пушкінскага конкурсу (г. Масква). Лаўрэат II абласнога фестывалю "Паэзія - душы рух". Аўтар зборнікаў вершаў "12 ісцін", "25 крокаў да Дэкадансу", "Методыка 25-га кадра". Жыве ў Лідзе, гадуе траіх дачок.*

# *Аляксей Сымановіч*

## Дрыкгант

*Гэта былі сапраўдныя палескія дрыкганты,*
*парода, ад якой зараз нічога не засталося...*
*У. Караткевіч. "Дзікае паляванне караля Стаха".*

Дрыкганта вочы агністасцю поўняцца,
Быццам хаваецца полымя ў іх.

Стаха ляціць агалцелая конніца -
Скачкі Мінулага, думак маіх.

Інахадзь дзіўная, дзесьці - машыстая.
Дрыкгант чубары, дзе шлях твой ляжыць?

Плямамі дробнымі, нібы іскрыстымі,
Увесь пакрыты, да зорак бяжыць...

## Таполі

Гамоняць таполі,
Лапочуць: "Даволі!
Пужліва дрыжаць
У маркотным чаканні.
Ляціце да зор
У сіні прастор!
Там будзе жыццё,
Там будуць спатканні.
У срэбным тумане
Халодных галактык
Шукайце ўсё тое,
Што тут не знайшлі.
Не трэба баяцца,
Сыны, адрывацца
Ад маці гаротнай - Зямлі!"
На досвітку недзе
Ў нудзе без патолі
Аб чымсьці гамоняць
Старыя таполі.

І вельмі шкада:
Іх людзі не чуюць.
У іх іншая справа:
паперкі малююць.
У іх іншая справа:
сядзяць у Інтэрнэце.
У іх іншая справа:
сто грам у буфеце.

І мы разумеем:
што ёсць - тое будзе.
Бо мы не таполі,
а простыя людзі.
*2017 г.*

## Дзяцінства

Я жыву на самым краі
Цудадзейных светлых мар.
І ляцяць нягодаў зграі
З асалодай мне на твар.

Я - рамантык-летуценнік,
Што лунае ў вышыні
У журботным задуменні
Пра дзяцінства тыя дні,

Калі марыў я пра неба,
Шчасце, ласкавыя ўсмешкі,
Калі зведаў водар хлеба
Ды прагледзеў тыя сцежкі,

Што вялі да маці-сонца.
І свабоды подых часам
Заглядаў у маё аконца
Разам з казачным Пегасам.

Час нястрымны, апастылы…
На душы маёй гаротна,
Што жыццё зламала крылы;
Так балюча, так самотна…

Час дзяцінства - на хвіліны;
Захавайце ў сэрцах людзі
Назаўсёды ўспаміны,
Покуль сонца тое будзе.

## Да 50-годдзя заснавання "Суквецця"

Паважанае спадарства, наша слаўнае "Суквецце" -
Гэта россып вершаў-кветак: тут дарослыя і дзеці.

Загляніце ж, калі ласка, на чарговае спатканне -
І пачуеце пра Ліду, пра краіну разважанні,

Пра натхненне і надвор'е, пра жывых і пра забітых,
Пра цікавыя прыгоды, пра рабочых працавітых.

Вы, панове, зразумейце: у мяккім слове "аб'яднанне"
Ёсць сапраўднае сяброўства тых, хто верыць у Каханне!

## Вечнасць не дае адказу
(трыялет)

Вечнасць не дае адказу.
Сэрца верыць у каханне.
Што змяняецца для нас?
Вечнасць не дае адказу.
Не забыць сустрэчы час…
Для чаго ж тады растанне?
Вечнасць не дае адказу.
Сэрца верыць у каханне.



*Завала Марыя Юр'еўна нарадзілася 5 лістапада 2013 года ў Лідзе. Вучыцца ў 5 "А" класе СШ № 4 г. Ліды. Пачала складаць невялікія вершы ў другім класе. Цяпер амаль кожная падзея, звязаная з моцнымі эмоцыямі, ператвараецца ў верш. Займаецца вакалам, з'яўляецца удзельніцай узорнага хору "Аніма".*

# *Марыя Завала*

## Мая Беларусь

Мой край - Беларусь, а я - беларуска,
Жыву сярод добрых і чулых людзей.
Мы - мірныя людзі, я тым ганаруся.
Працуем з душой, ідзём у заўтра смялей.
Казаў мне дзядуля аб тым, як жылося
Задоўга да нас, у дзяцінстве яго.
І колькі падзей з той пары адбылося,
А памяць жыве, быць інакш не магло.
Мы прадзедам нашым паклонімся нізка
За шчасце і мір, што ў баях здабылі.
Край родны для нас, як дзіцяці калыска.
Яго зберажом, яго продкі далі.
Паклонімся ў ногі і "дзякуй" мы скажам
За веру, якую пасеялі нам,
За кветкі надзей, мы ў вяночак іх звяжам,
За дом, які ворагу я не аддам.

## Боль Хатыні

Як успаміны пра вайну
Шмат помнікаў стварылі людзі.
Хатынь жа - помнік пра бяду,
Пра вёску, больш якой не будзе.
Няма дамоў, няма людзей,
Згарэлі ў полымі гарачым.
І толькі рэхам тых падзей
Звіняць званы, як быццам плачуць.
А слёзы капаюць бом, бом…
Цяжкія, горкія, скупыя…
І стэлы быўшых каміноў
Стаяць наўкол, як вартавыя.
Няма дамоў, няма людзей,
І дзетвара тут не гуляе.
Халодны вецер, як зладзей
Між каміноў лісты ганяе.
Не трэба слёз, вайны не трэба,
У згодзе ўсе павінны жыць.
Што нам дзяліць? Аблокі з неба?
Ці, можа, сонца падзяліць?
Дабром дзяліцца трэба, смехам,
Любоўю, дружбай, дабрынёй
І шчасцем з кожным чалавекам,
Каб мір заўжды быў і спакой!

## Любімы горад

Прыйшла вясна, прачнуўся горад,
І сонца свеціць весялей.
І наша Ліда, зняўшы холад,
Вясну сустрэла. Жыць далей!
Іду па вуліцы і бачу,
Што вочы добрыя ў людзей.

Бо мы, лідзяне, я адзначу,
Глядзім у заўтра ўсё смялей!
Наш горад мілы, вельмі файны,
Прыгожы, цёплы, як мой дом.
Бо кожны - гаспадар тут дбайны,
Сям'ёю дружнай мы жывём.
У гэты год стварэння, міру
І дабрыні, каб без мяжы!
Жадаю ўсім, каб не згубілі
Усё, што продкі нам далі!

**Замак**

Велічны, непрыступны
Замак у Лідзе стаіць.
Князь Гедымін з пастамента
Пільна ўдалеч глядзіць.
Кожная цэгла і камень
Подых даўніны нясе.
Ведаюць, як будаваўся
Горад у гордай красе.
Як падымаўся з руінаў,
Дні ліхалецця цярпеў.
Лідчыны помнік, краіны
Выстаяў і ўзмацнеў.

***

Адзін лісток на дрэве сохне,
І кветка ў полі не цвіце,
І птушка цёплаю вясною
Сама сабе гнязда не ўе.
Бо без сяброў, без мамы, таты
Ну, проста немагчыма жыць!
Бягу са школы я дахаты,
Каб іх да сэрца прытуліць.

## Бывай, лета!

Думала, лета не скончыцца,
Плаваць у возеры хочацца.
Але зноўку восень прыйшла
І дожджык з сабой прынясла.
Хмары гуляюць па небе,
Хаваецца сонейка недзе.
Канікулы, лета…
Вярнуць бы жаданае. Дзе ты?

Восень фарбы размясціла,
Як мастак пазалаціла
Дрэваў кожненькі лісток,
Тут штрышок, тут завіток.
Чараўніца, што сказаць!
Трэба парасонік браць.

## Зімні дзень

Марозны сонечны дзянёк,
З нябёсаў сыплецца сняжок.
Прыгожа, як у казцы!
Накрылася зямля пярынай,
Прыбраліся яліны ў іней.
Утульна, пэўна, ім.
Сядзіць снягір, сінічка скача,
Лядзяшка на страсе не плача.
Зямлю пакрыў кілім.
А сонца свеціць, снег іскрыцца,
Замерзла ў возеры вадзіца.
Нават аблок няма.
Як удалеч кінеш вокам,
Прастора белая навокал.
Цудоўная зіма!

## Зіма

У горад прыйшла зіма,
Дарогі ўсе замяла.
Бялюткае ўсё кругом,
У казцы быццам жывём.
На дрэвах футры і шапкі,
Кусты, як маленькія хаткі.
Павешу ля дома кармушкі:
Частуйцеся, мілыя птушкі!

## Дамавёнак

У мяне ў кватэры цуд!
Нехта пасяліўся тут.
Ён не злосны і не шумны,
І, заецца мне, разумны.
Любіць есці ён цукеркі,
Падкрадае іх з талеркі.
І пячэнькі, і зефір.
Фанцік вылізаў да дзір.
Можа Фімка стаў сласцёнай?
З'еў цукеркі ночкай цёмнай.
Не, цукеркі з'еў Кузьма,
Дамавёнку дам імя!

## Мой край

Мой край беларускі,
Радзіма мая!
Цудоўны, прыгожы!
Люблю цябе я!
Рачулку і лес,
Птушак спеў у гаі.
Хачу, каб заўсёды
Мы ў міры жылі!



# *Кастусь Якубчык*

*Канстанцін Іосіфавіч Якубчык нарадзіўся ў 1983 годзе, працуе ў лакаматыўным дэпо Ліда слесарам па рамонце рухомага састава. Вершы спрабаваў пісаць і ў дзяцінстве, і ў юнацтве. Затым у яго творчасці быў 15-гадовы перапынак. І толькі з лета 2020 года ён зноў піша вершы, галоўным чынам вершы для дзяцей.*

*Успаміны з дзяцінства, яго жаданні і мары ў той бесклапотны час леглі ў аснову многіх яго вершаў. Штосьці для іх чэрпае і з назіранняў за сваёй дачкой Жэняй.*

*Акрамя дачкі, адным з першых ацэншчыкаў творчасці Канстанціна Якубчыка з'яўляецца яго сястра Іна. А суседка Людміла Усюкевіч, настаўніца рускай мовы і літаратуры, праглядае вершы, дае слушныя парады па іх удасканаленні. Калега па рабоце ў дэпо Алег дапамагае ў стварэнні друкаваных варыянтаў рукапісных тэкстаў. Усім ім аўтар вершаў вельмі ўдзячны.*

*Канстанцін марыць аб выданні ў будучым уласнага паэтычнага зборніка менавіта для дзяцей.*

*Творы паэта змяшчаюцца ў "Лідскай газеце", ёсць яны і ў 10-м літаратурна-мастацкім зборніку "Ад лідскіх муроў". Яго верш "Вучоны кот" быў надрукаваны ў дзіцячым часопісе "Вясёлка".*

*Канец 2022 года прынёс Канстанціну Якубчыку дзве перамогі - у 5-м адкрытым рэгіянальным конкурсе імя Веры Навіцкай "Дарослыя - дзецям" і ў прафсаюзным фестывалі-конкурсе Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі "Созвездие талантов" (у намінацыі "Сердцу милая сторона"). На яго верш "Письмо лету" лідская паэтка і кампазітар Людміла Краснадубская напісала музыку, песня на гэты верш была развучана ў сярэдняй школе № 10, дзе вучыцца дачка Канстанціна Іосіфавіча.*

## Снег

Як прыгожа і павольна
Снег кладзецца на зямлю,
Дорыць срэбра наваколлю,
Я ў далонь яго лаўлю.

Прыгляжуся і пабачу
На карункаў прыгажосць.
Чараўніцтва - не іначай
У сняжынках гэтых ёсць.

Можа, гэта млын з нябёсаў
Сыпле, нібы як муку.
І ляціць, ляціць бялёсы
Снег павольна мне ў руку.

## Зноўку зімка завітала

Зноўку зімка завітала,
Сцеле коўдры па палях.
Поле, сцежкі замятае -
Пракладае новы шлях.

А наўскрай дарог бярозы,
Нахіліўшыся, стаяць.
Ціснуць першыя марозы -
Аж галіначкі трашчаць.

Завітала гаспадынька,
Ходзіць, бачыць, што ды як.
Завірухі хоча - уздыме.
Размалюе, як мастак.

А як ужо заморыцца,
Дык ляжа адпачыць.
І вецер супакоіцца,
Павольна снег ляціць.

## Зіма вясну прасіла…

Зіма вясну прасіла:
- Хвілінку пачакай,
Не ўвесь я снег струсіла
На поле ды на гай.

Не ўсе я зацягнула
Лужочкі крышталём.
Ды штосьці абмінула,
А час ўжо прайшоў.

- Ты, зіма, спяшайся, -
Гаворыць ёй вясна, -
Ды хутчэй збірайся! -
Падказвае яна.

- Я па кожнай сцежцы
Прабегчыся хачу.
Сыпану пралескі.
Бярозам сок пушчу.

Здыму я коўдру з поля,
Хай жыта прадыхне.
І гай пацешу ўволю,
Жаўрук няхай пяе.

- Ты мяне паслухай:
Яшчэ цяпла няма.
Прайду - дык з завірухай,
Хай помніцца зіма!

**Вясновы ранак**

Люблю цябе, вясновы ранак.
Птушыны грай у цішыні.
Вітаю сонца абаранак,
Яго святло і прамяні.

"Добры дзень! -
кажу я птушкам, -
Дзякуй вам за вашы спевы!".
Нібы шэпчаце на вушка:
- "Падпявай вясны прыпевы".

**Люблю я восень залатую…**

Люблю я восень залатую,
Не люблю даждлівую.
Бо з дажджамі я сумую,
З сонейкам - шчаслівы я.

Люблю я восень залатую,
Не люблю маркотную.
Бо з маркотнай я сумую -
Мне мілей пяшчотная.

Люблю я восень залатую,
Не люблю няшчодрую.
Бо з няшчодрай я сумую -
Мне каб лісце коўдраю.

Люблю я восень залатую,
Не люблю вятрыстую.
Бо з вятрамі я сумую -
Мне мілей агністая.

Люблю я восень залатую,
Не люблю даждлівую.
Бо з даджамі я сумую,
З сонейкам шчаслівы я.

**Восень - колер залаты**

Восень - колер залаты.
Быў наш клён зялёны -
Зараз жоўтыя лісты
Ападаюць з клёна.

Болей рэха не блукае
Па густых галінках.
Лета бабіна чапляе
Вецер павуцінкай.

Пад нагамі зараз коўдра -
Лётай без абутку.
Клён насыпаў лісце шчодра -
Сам стаіць галюткі.

Ды галюткі ненадоўга:
Апране ў кажух зіма.
Пашкадуе, як старога,
Бачыш: хутка і вясна…

**Лідзе**

Шмат гарадоў на Зямлі:
Вялікіх, прыгожых, знаёмых.
Сцежкі жыцця куды б не вялі,
А сэрца аддам я аднаму.

Любы мой горад дзяцінства,
Знаёмы, адкуль не ідзеш:

Ад вуліц, утульных і чыстых,
Да кургана ды замкавых веж.

Ты бачыў сваімі вачыма
Вайну, што забрала сыноў.
Хачу, каб ніколі Айчына
Такога не зведала зноў.

Сем вякоў ты стаіш
над Лідзейкай!
Сем вякоў, а ўсё ж малады!
Такога не бачыў нідзе я,
Хоць прыгожыя ёсць гарады.

Узяць у рукі ды панюхаць
Сенца з траўкі сакавітай!

Дзе праз жыта бачна трошкі:
Пра між срэбра каласоў
Гуляе ў хованкі валошка.
Я шукаў яе, - знайшоў.

Як не любіць свае мясціны!
Да сэрца цягнецца рука:
Не шкада мне той гадзіны,
Што слухаў спевы жаўрука.

## Усё мне міла ў родным краі

Усё мне міла ў родным краі,
Усё, што побач ля мяне.
Я ўсё з ўсмешкаю вітаю -
Нішто мой погляд не міне.

Як не любіць свае мясціны!
Той лес, што бачу я здалёк,
І вас, нізенькія хаціны,
І вас, рамонкі ля дарог.

І цябе, жаўрук над полем,
Дзе спевы звонкія гучаць.
Іх слухаць любіць наваколле,
Аж сэрцу хочацца спяваць.

А прыемна як паслухаць
Гул тых пчолак працавітых!

## Арэлі захварэлі

Нашыя арэлі,
Мабыць, захварэлі:
Крышку зыржавелі
Ды гучна заскрыпелі.

Пачалі чырыкаць -
Трэба тату клікаць.
Няўжо, як чалавеку,
Арэлям трэба лекі?

- Не турбуйся, - тата кажа, -
Зараз мы алеем змажам.
Ім алей і будзе лекі -
Для арэляў няма лепей.

Арэлі болей не скрыпяць,
Мяне клічуць пакатаць.
Часцей змазвайце арэлі,
Каб ніколі не хварэлі.

## Чарапаха і Слімак

Слімак, сустрэўшы Чарапаху,
Акінуў позіркам яе,
І ад здзіўлення аж да жаху:
- Ты так падобна на мяне!

Таксама носіш хатку
З сабой заўсёды на спіне,
У небяспецы ці ў нападку,
Як я, хаваешся ў яе.

Цябе магу лічыць сястрою,
І мне здаецца: мы радня,
Бо так падобныя з табою,
Свой панцыр носячы штодня.

А Чарапаха - Слімаку:
- Хай будзе так, я не крыўдую,
Шмат год жыву я на вяку,
А ўпершыню такое чую.

Хоць я неспешны маю рух,
І панцыр мой - мне абарона,
То чым адрозніць пчол ад мух?
Магла б арлом сябе лічыць Варона!

Прабач, табе сястра не я,
Ты прыглядзіся да мяне:
Мы толькі тым падобныя,
Што носім хаткі на спіне.

## Хутка заўтра не прыходзіць

Хутка заўтра не прыходзіць,
Калі сесці і чакаць.

Заўтра хутка надыходзіць,
Калі ў ложак бегчы спаць.

Я ж ужо заплюшчыў вочы,
Толькі каб не адчыніць.
Каб хутчэй заснуць да ночы,
Буду я да ста лічыць.

Адзін, два, тры, чатыры, пяць -
Вочкам, вочкам трэба спаць.
Шэсць, сем, восем, дзевяць, дзесяць -
Ручкі коўдру месяць, месяць.

А далей лічыць не буду:
Не паможа гэта сну.
Мне патрэбна, мабыць, цуда
Вось тады я і засну.

Думаў, лік - мой ратунак:
Зноў і зноў лічыў, сябры.
Толькі маці пацалунак
Лепей чым адзін, два, тры…

**Вартаўнік**

Каля брамкі вартаўнік
Наш сцярог падворак.
Толькі бачыў - раптам знік.
Клікаў разоў сорак.

Ён яшчэ малы наогул,
А ўсё ж слухае мяне.
На падворак - ані кога
Без увагі не міне.

Нешта я яго не бачу,
Мо, схаваўся небарака,
Ці вартуе? Не іначай!
Хоць шчаня, але ж сабака.

Падыду яшчэ за хату,
Клічу, клічу - не ляціць.
- Цішай,- мне тут кажа тата,-
Вартавы змарыўся. Спіць.



*Янчэўская Кацярына Валянцінаўна, паэт, мастацтвазнаўца, філосаф. Нарадзілася 27 чэрвеня 1981 года ў Лідзе. Навуковыя і творчыя зацікаўленні: філасофская антрапалогія і фенаменалогія, этычныя праблемы сучаснага чалавека, выяўленчае мастацтва Беларусі і Францыі, эстэтыка. Вершы друкаваліся ў зборніку "Ад лідскіх муроў", газеце "Літаратура і мастацтва", "Лідская газета", часопісах "Маладосць", "Дзеяслоў", "Тэрмапілы". Аўтар кнігі паэзіі "Белае шматкроп'е" (2021).*

# *Кацярына Янчэўская*

### Вяршыні і падводныя камяні

Зеляніна дыханнем ліпеня
Малюе ўзвышша думак
На Лідскай раўніне,
Няўрымслівы вецер гуляецца
З рытмам ягадных гронак;
Адораны фарбамі сад
Сыпле ў кошык
Летніх эцюдаў абрысы.

Пад кронамі ліпеня
У няроўным дыханні лістоты,
Бы "горлінка ў горнай цясніне"*,
Паэзія...
Над Лідскай раўнінай -
Вецер, малюнкі… І вершы -
Пладоў сакавітых вяршыні...

** "горлінка ў горнай цясніне" з "Найвышэйшай песні Саламонавай".*

## Духмянасць

Вось запаветны водар
разгортвае далоні:
высакародныя літары лета
складаюць псалмы...
Ноч, раніца, дзень, вечар -
Так ветла таемны промень
Стварае летапіс пяшчоты,
рытм сэрца агучвае веды:
Ты ёсць у лагоднай малітве,
Ты ёсць у жыцці...

## Сон

Чалавек спяшаецца:
Справы паглынаюць дні
Справы патрабуюць яснасці;
Чалавек у палоне рэальнасці
Ці рэальнасць у палоне мітусні?
Хуткаплынны час!
Асцярожна: дзверы зачыняюцца!
Наступны прыпынак:
Сон.
…Расплывістая невядомасць туману

Утрымлівае ад падзення
Ў плынь безнадзейнага...
Па іншы бок бачнага штосьці ствараецца зноў -
Народжаная з мігцення сутнасці
Vita Nova?

## Літургічны выток сусвету

Калі здаецца, што побач нікога,
Нікога,
Нікога
Ў жыццевым віры
Адзіноты:
Толькі пакуты
Вартуюць твой кут
Сярод неабсяжнай пустэльні…
Раптоўна
Скрозь драпіны на небасхіле,
Скрозь вастрыню адзіноты
Адкрывае сябе
Літургічны выток сусвету.
Раскрытае неба ў маленькай пячоры
Чалавечага лёсу;
Разгорнутая кніга жыцця.
Раптоўна
Гушчар адзіноты і гучныя словы-раны
Залечвае маўчанне квітнеючых ружаў ля храма...

***

Наўкола:
цёплае
узвышанае
паветра,
паўнюткае

думкамі
схілаў
і ўмацаванняў.
З вышыні:
так лёгка боль коціцца ў Нёман,
а немач адпускае на волю надзею...
У хвіліны мірнага суіснавання сэнсаў
так істотна паспець прытуліцца
да лета жыцця.

## Узаемаадносіны

Жнівень - час збіраць ажыны
І маляваць ягаднымі фарбамі
Сілуэты пяшчоты
На паверхні поўні...
Кароткія летнія ночы:
У гушчары адценняў
Ці цяжка разгледзець адно аднаго?
Кароткія сны:
Дзесьці на шматаблічнай мяжы
У бясхмарным небе
Балансуюць водсветы belle epoque.
Кароткія прасвятленні.
У глыбіні рэальнасці,
Вывучаючы перашкоды,
Неабходна паспець дамаляваць
Сілуэты пяшчоты
На яшчэ не застылай планеце.
А да твару працягваюць рукі шыпы,
Пытаннямі здабываючы мяккасць рухаў.
У жнівеньскіх ведах - ажынавае жыццё.

…На шматаблічнай мяжы цемрадзі і святла
Хто здолее не змарнаваць час?

***

Прарастае святло
Вінаградней лазы
У раскрылены лёс
Любові...

***

Сонца скрозь туман.
Зноў крокі да лекавых кветак.
Зноў крокі як ноты суцяшэння.
Летняя календула -
мост паміж маўклівасцю і гучнай размовай,
мост паміж самотнымі стратамі
і праяўленнем новага.
Драматургія пераходу ад таго,
што адбылося і ніколі не вернецца,
да таго, што нараджаецца скрозь начную нябачнасць
і ранішнюю імпрэсіяністычнасць ліпеньскага туману…

***

Вясковая вышыня:
думкі трымаюцца за далягляды лістоты,
пад парасонам святла
на імгненне
міласэрна здаецца,
што цемра забыла свой шлях
да чалавечага сэрца...

## Ластаўкі

Калі пайшлі доўгачаканыя летнія дажджы,
востра адчуваеш, як высахла ўласнае сэрца
ад абставін і перажыванняў,

што балюча змяняюць
conditio humana.
У гісторыі чакання дажджу,
у гісторыі трывання і разбурэння
заплаканыя думкі
і заплаканыя кветкі
з надзеяй глядзяць
на жывы ластаўчын лад
(там ніводнага фальшывага дзеяння).
У такой невясёлай гісторыі,
як знайсці сілы,
каб залатаць гаркавы сэнс?

***

Світальнае Ольжава побач:
Сэрца бачыць
Абіцель прападобнага Паісія Святагорца.
Побач:
Жытнёвага поля жыццёвыя сэнсы
І гаючае дыханне лесу.
Вестка нябесных зярнятаў
І таямніца чалавечнасці...
Спасціжэння таго, што знікае, каб вярнуцца зноў.
Каб вярнуць нас да саміх сябе, створаных нанова.

**Парэчкі**

Лета
не мімалётны давер
пральецца
парэчкамі
ў сонечныя разважанні.
Расчулена ягадныя радкі
збіраюць усмешкі роднага неба
і крокі на роднай зямлі.

Цёпла.
Ласкава.
Рупліва.
Расчырванелы ліпеньскі клопат
трымаецца за небакрай
спрадвечных пытанняў.
Гасцінна парэчкі зорныя сны зберагаюць...

***

Увасабленне пачатку:
сунічнымі прадчуваннямі
ўсцешаны сцежкі роднага саду.
Летуценна і лёгка
вецер гартае старонкі
жыватворна-зялёных уражанняў.
Вінаградная лаза ахінае Слова.
Птушыныя спевы
ўдасканальваюць васільковыя разважанні.
Радасная яснасць прысутнасці.
Свята нараджэння:
пяшчотны дотык нябеснага вітання...
Удзячнасці сад атуляе святлом.



# Людміла Краснадубская

*Людміла Краснадубская нарадзілася ў в. Вішнёўка, Менскага раёна, Менскай вобласці.*

*Скончыла там дзесяцігодку, адвучылася ў ордэна "Знак Пашаны" Мар'інагорскім саўгастэхнікуме па прафесіі - аграном. Працавала, выйшла замуж, нарадзіла трох дзетак, мае восем унукаў. Пішa вершы са школы, друкуюся ў раённых і рэспубліканскіх выданнях, шматлікіх зборніках.*

*Выйшлі ў свет чатыры кнігі, мае шмат матэрыялаў для некалькіх наступных.*

*Акрамя вершаў піша песні, бо сама любіць спяваць. Выступае дзе толькі просяць - у санаторыях, школах, вайсковых частках, ЦДК г. Ліды і інш…*

*Была ўдзельніцай 12 і 13 Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у г. Гародні, свята Беларускай кнігі ў Гародні, маю шмат дыпломаў і грамат.*

*З'яўляецца ўдзельніцай літаратурнага аб'яднання "Суквецце" г. Ліды, салістка хора ветэранаў "Майскія зоры", кіраўнік вакальна-тэатральнай студыі "Натхненне" пры клубе "Даўгалецце", любіць вандраваць.*

*Кожнае лета едзе ў вандроўку па прыгожых месцах нашай цудоўнай, любай краіны, нашай роднай Беларусі!*

# ЗНАРОК НЕ ПРЫДУМАЕШ

*Байкі*

## Прагрэс

Ішла бабуля на аўтобусны прыпынак,
Спяшалася, што было сіл.
Аж бачыць, праз дарогу йдзе хлапчына,
Ідзе адзін і не адзін.
Ўтаропіўся ў тэлефон ён,
А што наўкол - не бачыць, аніяк.
На светафоры ўжо гарыць чырвоны,
Як быццам кажа: “Эй хутчэй бядак!”
У бабулькі зашчыміла сэрца:
Бяда, ой, зараз пад машыну пападзе!
На дапамогу да яго яна імчыцца.
Хапае за рукаў, вядзе.
А той як раптам зарагоча,
Бо нешта смешнае ў тэлефоне ён знайшоў.
Бабулька вылупіла вочы: “Бяда, падумала,
Вось і яе канец прыйшоў”.
Хлапец навушнікі дастаў з кішэні
І быццам сам з сабой пачаў ён размаўляць.
Бабуля ў дзве рукі перахрысцілася,
Малітву пачала шаптаць.
Ды што тут робіцца такое,
Мо, засяліўся ў хлопца бес?
Ды не, тэхнічнае тут слова,
Хлапцу затлуміў галаву прагрэс!

Мараль:
Жыццё ніколі не стаіць на месцы.
Тэхнічнага прагрэсу не спыніць.
І каб старэйшых да інфакту не давесці,
Дзяцей з маленства трэба навучыць.
Разумны робат пачытае напач казку.

Разумны робат прыбірае чыста дом.
Кафтан пашые, адпрасуе,
Але тады навошта мы жывём?!

## Разумны вяпрук

Свіней бабуля гадавала.
Быў у яе не адзін вепручок.
Із іх рабы, быў самы разумнейшы,
Нібыта той сабака быў.
Як разам з грамадой, то ён цішэйшы
Ці то ў траве, ці то ў гразі ляжыць.
Але як толькі гаспадыня захінецца,
Ён першы да яе бяжыць.
Вухам паківае і спіной патрэцца,
Ды ляжа хрукнуўшы ля ног.
Усё лепшае яму, вядома, дастаецца,
І абхітрыць яго ніхто не мог.
Але прыйшла пара, хто мог падумаць,
Рабога лепей пачалі карміць.
Вяровачка не доўгая вілася -
Кубелец з салам поўненькі стаіць.
Вось так з людзьмі бывае лёс жартуе,
Як лезе іншы па галовах уверх.
Жыццё лагодна так напамінае:
Адумайся і не бяры на душу грэх.
Усё ў жыцці паверне бумерангам.
Хай грошай шмат, ля дома лімузін.
Але сяброў не будзе з табой побач.
Любімы сам сабой, застанешся адзін.

## Пляткаркі

На лавачцы сядзелі дзве кабеты.
Лускалі семкі, размаўлялі пра жыццё.
Ім з дня на дзень сябе заняць няма чым,
У соты раз лічылі ў суседзяў набыццё.

Глядзі, паласы новыя прыдбалі,
А вунь паркет на сметнік павязлі.
А колькі ж за рамонт аддалі?
Ды грошай столькі дзе ўзялі.?
На лаўцы языком папляскаць
Лепш, чым пайсці і штось зрабіць.
Дапамагчы нявестцы дзетак няньчыць,
Ды посуд дома перамыць.
Прыгатаваць абед для маці прастарэлай,
То гэта для кабецін пусты гук.
Вось хто жыве з кім, хто не ладзіць
Яны, пляткаркі, тут як тут.

**Што цяпера збярэш, тое зімою спажывеш**

Пра грыбы суседкі размаўлялі,
Як ікру із іх рабіць - дэлікатэс.
Як сушыць, варыць, як смачна есці.
Толькі як на чым патрапіць у той лес?
Сашка мне казаў: на электрычцы
Можам мы даехать хоць куды.
На прыстанку выйсці ў Касавішчы.
Там касой касі грыбы.
Мне Пятрусь казаў, другая кажа,
На аўтобусе шпарчэй.
У Ваверцы грыбоў завала,
Такога ты не знойдзеш анідзе.
Лета адцвіло, ужо восені змярканне,
Зноў гаворка завялася пра грыбы.
Усе іх завязуць, абы жаданне,
Ды не выбраліся так і нікуды.
Ля падъезда семкі што палушчыць,
Лепей, чым па лесе пахадзіць.
Гнуцца трэба там ды прыгінацца,
Ды кляшча шчэ можна падчапіць.
Рыхтаваць што трэба на зіму запасы?
Ха, схадзіў у краму - ды купіў.

У цяпле, на лавачцы, пры хатцы,
Вось глядзіш, і зноўку год адцвіў.

## Адпачынак

Там рукзак, тут клунак вёрткі, хто спяшае на прыпынак?
Едуць дачнікі на соткі, каб пачаць свой адпачынак.
З гачкай хто, а хто з лапатай, дзесьці чутны мотаблок.
Завіхаюцца заўзята Манька, Ванька ды Змітрок.
Бокам, ракам на каленцах, хто як можа, так капаюць.
Потым полюць тыя грады, што казаць - адпачываюць!
Спазаранку ледзь прачнуся, каб паслухаць птушак спеў,
Чую зноў - не разагнуся, ногі не ідуць, павер.
Родныя мае вы людцы, гэта ж дача, не вайна,
Адрабілі дарагія з маладосці вы спаўна.
Але вось прыйшла субота, хто спяшае на прыпынак?
Едуць дачнікі на соткі, каб прадоўжыць АДПАЧЫНАК.

## Склероз

Выправіла бабка дзеда ў магазін:
Ты ж купі там солі, не забудзь, глядзі
Дзед у магазіне ўсё купіў, як трэба:
Зельцу, і кілбасаў, і буханку хлеба.
Бабцы ад склерозу ўзяў кавалак сала,
Каб не забывалася і смачна гатавала.
Рады, ідзе да дому, усяго даволі.
Дома баба кажа: Ну, купіў ты солі?
Зноўку выпраўляе яна дзеда з хаты:
Без солі не вяртайся, дурань барадаты.
Дзедка з магазіна ногі ледзь валоча,
Сустракае баба і з яго рагоча:
Ну, ёсць соль у торбе, дурань барадаты?
Мусіць мне самой ўжо выпраўляцца з хаты.
У магазін схадзіла, цукру накупіла,
А пра соль бабуля і сама забыла.

Так яны па соль увесь дзянёк хадзілі.
А ці то купілі, а ці не купілі,
Гісторыя пра гэта нам маўчыць, не кажа,
Можа, і сягодня ў іх без солі каша.

**Капуста ў копах**

На базары, у нядзельку бабуля бойка гандлявала
Ды за расаду памідораў ані рубля не саступала.
Збоку іншая кабета, капусту бойка прадавала.
Капустка ранняя і позняя, надбаўку добрую давала
І не трымалася так за капейку, замест 10 дасць 15.
Прыйшоў дзядок, купіў рассаду,
жанчына тут тавар прыдбала.
У натоўпе хлопец малады, гандлярка да сябе яго зазвала:
Купі капу, ой, спажывеш, не будзеш ведаць, дзе падзеці.
А той ў адказ: "Каня няма, а сена сам што буду есці?"
Кабета ў рогат: "Ты глядзі, жывеш што першы год на свеце?
Капусту ў Лідзе ў копах прадаюць,
расады каліў 60 у тым букеце.
А паўкапы, то 35, скупому ў гандлярах не месца.
Купляй, садзі і будзеш спажываць, усю зіму капустку есці".
Хлапец збянтэжыўся, пачырванеў,
рвануў, аж пяты заблішчалі.
Але запомніць пэўна назаўжды,
капусту ў Лідзе ў копах прадавалі.
У копы сена ставілі заўжды, у копы збожжа некалі стаўлялі,
А што расада ў копах каб была,
З часоў аж ВКЛ мы звычай захавалі..

***

Дзяўчыначка - былiначка, а столькі валачэ.
Сумка ў руках і на плячы.
Не дружыць, пэўна, з галавою -
Павінен быць мужчына пад рукою.

А вунь мужчына, ён прывычна
З пакецікам і выглядае фантастычна.
Уходжаны, прыгожы, ідзе па тратуары,
Відно што жонку добрую ён мае.

Даглежаны, абмыты, накормлены спаўна,
А на вячэру вып'е і фужэр віна.
І адпачыць ён заслужыў, бо ён мужчына,
А жонка што, а што жанчына?

Жанчын шмат болей на зямлі.
Адкуль? Мужчыны той падлік вялі.
Чаго ж тады жанчын тых шанаваць?
Мужчын жа меней! Трэба зберагаць!

**Лісіца**

Вёў Заяц нарыхтоўку харчу на зіму.
Знянацку пад карчом сустрэў Лісу-куму.
Худая, абадраная, забыта Богам
Змарнелая Ліса ляжала там аблогам.
Пашкадаваў Касы Лісіцу-прахадзімку.
Прытулак даў, адзеў, нібы карцінку.
Ад'елася Ліса і ўся размаляваная
Ды ў Касога ўжо не закаханая.
Навошта мне ў нары якойсці жыць?
У палацы жыць хачу. Царыцай быць!
Ды шусь за дзверы і давай лятаць
Прыстойнага сабе шукаць.
Той - без машыны, гэты - не багаты,
Ідзе Ліса, сама сабе дае парады.
Аж бачыць - чыйсці дом прыгожы.
Відаць, што мае гаспадар і чын, і грошы.
На ганак выйшаў Леў. Лісіца да яго:
- О, мой ты ўладар, - і лізь у пятку раз, другі, -
Ты за сябе мяне вазьмі, не зведаеш са мной тугі!

Льву спадабаўся той расклад,
Ліса шыкоўная, прыгожая - ён рад:
- А што з сям'ёю мне сваёй рабіць?
Усё ж эйфарыю Леў рашыў перапыніць.
Ліса заёрзала, хвастом тут закруціла,
І так далей яна загаварыла:
- Навошта жонка старая, сям'я і дзеці?
Цябе буду кахаць адзінага на свеце.
Згубіў Леў галаву, паверыў абяцанку,
Кахаць што будзе вечна, з вечара да ранку.
Лета прайшло, і надыходзіць восень
Але Ліса ўжо не просіць,
Не ліжа ногі Льву, завяла свае парадкі.
Даюць аб сабе знаць Лісіцыны павадкі:
- Курэй і качак сам ты з'еш,
А мне калбаскі з'ездзіш, прывязеш!
Чаго не зробіш ты дзеля каханай?
І за мяжу паехаў Леў, але вярнуўся рана.
А дома бруд, парадку ніякога.
Ідзе ў пакоі ён і бачыць там... другога!
Не быў бы Леў царом звяроў.
Страшэнна, на ўвесь лес зароў:
Прыкідвалася беднаю, абражанай,
Такою мілай, добранькай, уважлівай!
Згроб лапамі і выкінуў Лісіцу вон.

Ліса і ёсць Ліса - брунетка ці бландынка,
Ці рыжая, ці з сівізной - Ірына ды Марынка,
Жывуць яны дзеля сябе, каханай
Наташа, Вольга ці Святлана.
Як толькі грошы дзе пачуе прахадзімка,
Так і кідаецца мужчыну ў абдымкі.

Мараль:
Каб зберагчы сям'ю і гонар свой,
Парайся не з хвастом, а з галавой!

## Каб не згубіўся

Дзесь ехала бабулька не адна,
У аўтобус села на прыпынку.
Адной рукой яна дзядка ўвяла,
У другой трымала торбу і хусцінку.
Дзядулю пасадзіла як далей,
Заціснула амаль што ў куток.
Ля краю прымасцілася сама,
А каб жа не згубіўся той дзядок.
Дарога бегла шпарка ўздоўж палёў.
І як тут быць, дзядок засумаваў,
Памкнуўся месца памяняць сваё,
Бабулі грозны крык яму не даў:
- Ты сіднем сядзь, чаго ўстаеш?
Ды ўціснула далей яго ў куток.
Аўтобус колькі вунь жанчын вязе.
А каб жа не згубіўся той дзядок.
Так ехала, бубніла без канца.
Пераканаць яе ніхто не мог.
Якая рэўнасць у такіх гадах,
Не дзенецца нідзе яе дзядок.
Ніхто не мог дапяць, а што рабіць?
Каханне, нехта вымавіў знарок.
Дзядулю хутка стукне сто гадкоў,
Ну, дзе ён дзенецца, яе дзядок?!

## Размова па душах

- Цябе ў жыцці ніколі не кахала, -
Казала жонка мужу.
- А што ж пайшла ты за мяне?
- Ды, татачка прымусіў.
- А дзеўкай я краса была!
- Ага, паціху муж смяецца,
Бо нават воўк у лесе каб спаткаў,
Не ведаў бы куды падзецца!

Дзве валасіны замест кос на галаве,
А зубы, дык няма чаго казаць, страшыла.
Каб цесць не ўліў у рот мне
Самагонкі пляшкі дзве,
Ніякай сілай бы мяне к сабе не прысушыла!

## Сэнс жыцця

Сядзяць мужчына і жанчына на прыстанку,
Чакаюць свой аўтобус мабыць тут.
Сядзяць даўно, аж спазаранку,
Ды ўглядаюцца чамусьці ў зямлю.

Калі бліжэй я падышла і паглядзела,
Убачыла, што дужа п'яныя яны.
Жанчына тая, абы як адзета,
Мужык надзеў навыварат штаны.

Марнуецца жыццё ўвачавідку.
Абодвум толькі б жыць ды жыць.
Ды ўцягнула п'янка ў звычку
Піць і курыць, курыць і піць.

Прыйшлі ў жыццё з рукамі і нагамі,
Ды інваліды на душу і галаву.
А мо яшчэ калі задумаюцца самі:
Чаго жыву і як жыву?!

## Што дзе падзелася?

Калі былі мы маладыя,
Былі здаровыя і ўдалыя.
Але прыйшла пара і вось,
Сядзіць на лавачцы Антось.
У драных портках, сіні нос,
Глядзіць, каб чарку хто паднёс.
Яшчэ і не стары, але такі нямоглы.

Хоць мае жонку ён і догляд добры.
Прычына ўсяму - вядома ж п'янка.
З рання да вечара - гулянка.
Мараль якая з таго будзе?
Як нарадзіўся чалавекам - будзь ім!
Жыві ты так, каб не смяшыць людзей.
І ў сорам не ўганяць сваіх дзяцей!

**Танцы**

Скача, скача маладзіца да мужчыны, як тыгрыца:
- Ты ў мой бок чаго не глянеш,
Іншых мо там абдымаеш?
Стаў мужчына, захіліўся,
Ад кіпцюраў затуліўся:
- Што ты маеш да мяне, мілая жанчына?
Сягодня я прыйшоў на танцы,
Вольны я мужчына.
Жонкі ўжо даўно няма,
Дом мне стаў мой, як турма.
Вось сябры пашкадавалі і сюды мяне зазвалі.
Кажуць: знойдзеш сабе жонку
І ў жыцці новая старонка.
Сапраўды жанчын прыгожых
На танцульках стрэціць можна.
У сукенках, у спадніцах скачуць файна маладзіцы.
Палажыў вока на кралю,
А цяпер занятак маю,
Толькі з ёй мне танцаваць, па баках не пазіраць.
Божа мілы, што рабіць?
Лепш на танцы не хадзіць.
Але і дома немагчыма адзінокаму мужчыне.
Людцы родныя парайце,
У бядзе не пакідайце.
Можа, спортам я займуся,
З трэнажорам параднюся
Хоць цяжкі ён і з жалеза, ды не давядзе да стрэсу!

## Малая радзіма

Я нарадзілася зімою на Міколу,
Калі ваўкі ў Піліпаўку блукалі,
Хацела маці, каб была я людзям мілай
Таму імя Людміла мне і далі.

Дзяцінства ўспаміны наплываюць,
Як неслі нас з гары там санкі, лыжы.
Хоць старасці ўжо чутны подых,
Ды ўспамін дзяцінства сэрцу бліжай.

…тут возера заўжды кішэла рыбай,
Мятровых карпаў рыбакі цягалі.
Вадзілася ж не толькі рыба хіба:
Андатры, нутрыі так блізка праплывалі…

А кветкі... колькі іх было наўкола:
Званочкі і рамонкі, васілёчкі.
Збіралі ў букеты, ставілі ў хаце,
А на Купалле з іх плялі вяночкі.

А потым па вадзе пускалі -
Глядзелі, да каго які прыб'еццца.
Было павер'е, як вяночкі разам,
Дзяўчына з хлопцам шлюбам пабярэцца.

Куточак родны. Любы назаўсёды.
Даруй, прашу, што рэдка прыязджаю.
Вандрую па жыцці - сям'я, турботы.
Ды ўсё часцей Вішнёўку ўспамінаю!



# *Станіслава Белагаловая*

*Станіслава Іванаўна Белагаловая (Круповіч) нарадзілася 25 жніўня 1959 года ў вёсцы Крамушаўка Наваградскага раёна Гарадзенскай вобласці. Скончыла Налібоцкую сярэднюю школу, вучылася ў Гарадзенскім гандлёвым вучылішчы. Пасля заканчэння вучылішча засталася жыць і працаваць у Гародні. У 1977 годзе выйшла замуж. Разам з мужам у 1978 годзе пераехала жыць у Ліду. Мае дваіх дзяцей (сына Валерыя і дачку Наталлю), чатырох унукаў. Амаль уся працоўная дзейнасць прайшла ў Лідскім гархарчпрамгандлі (у цяперашні час - ААТ "ГПФ "Ліда"). З 2014 года на заслужаным адпачынку. Ветэран працы.*

*Пісаць вершы спрабавала ў юнацтве, але тады не прыдала гэтаму значэння. І толькі на пенсіі сур'ёзна занялася творчасцю. У 2018 годзе выйшаў першы зборнік вершаў "Наедине с душой". Рыхтуецца да друку другі зборнік. Некаторыя вершы пакладзены на музыку. Песні "Доченька", "Мой сын" прысвечаны дзецям. Яны гучаць на Лідскім радыё.*

*Актыўная ўдзельніца лідскага літаратурнага аб'яднання "Суквецце". Прымае актыўны ўдзел у адкрытым рэгіянальным літаратурным конкурсе імя Веры Навіцкай. Друкуюцца вершы ў "Лідскай газеце". Друкавалася ў літаратурна-мастацкіх зборніках "Ад лідскіх муроў" 2016-2019, 2020-2021 гг. Таксама яе твор быў змешчаны у кнізе А. Карлюкевіча "Літаратурнае гняздо Беларусі".*

*"Станіслава Белагаловая - разнапланавая аўтарка. Яна скіроўвае свой позірк на людзей, якія побач, на Ліду, у якой жыве. Яе хвалюе лёс чалавека, лёс краіны. У вершах утрымліваецца сапраўдны сур'ёзны роздум пра жыццё.*

*Ёсць заклік да самаўдасканалення." (Уладзімір Васько).*

## Будуць зноў красавацца палеткі

Няўжо памерла вёсачка мая?
Хаткі, як сіротачкі, стаяць,
У некаторых з дзіркамі страха -
Голуб прымасціўся буркаваць.

Трывожыцца карміцелька-зямля
Жаўцее ўмомант сенажаць,
А колькі там засохлага галля,
Немагчыма без слёз пераказаць.

Паціхеньку рэчка высыхае,
Непрыкметны сталі берагі,
Той дзіўнай рыбкі не хапае,
Сэрца замірае ад тугі.

Нас радуюць добрыя весткі -
Мноства ёсць прапаноў і ідэй,
Будуць зноў красавацца палеткі
Працавітых, сумленных людзей.
*20.05.22 г.*

## Вайны нам не трэба

Як жа хочацца мірнага неба,
Ясных зорак у цёмнай начы.
Злой, праклятай вайны нам не трэба!
Нам патрэбны спакой на душы.

Каб квітнелі лугі і палеткі,
Белы бусел на дрэвах гняздзіўся,
Гаманілі ў дварах нашы дзеткі -
Сон салодкі ўначы ім прысніўся.

Каб хадзіць па траве басанож,
Прыгажосцю зямлі захапляцца,

А не браць у рукі зброю ці нож -
За жыццё сваё мужна змагацца.

Як пакінуць тугу? Немагчыма...
Як пазбегнуць ад гэтай бяды?
Будзем Богу маліцца мы шчыра,
Каб адвёу нас ад чорнай вайны.
*23.03.22 г..*

## Восень нас чаруе зноў і зноў

Як прыемна восеньскім дзяньком
Сонечным надвор'ем захапляцца,
Назіраць за жоўтым матыльком,
Прыляцеўшым з намі развітацца.

Мяккай, залацістаю пушынкай
Вусны мае лёгенька кранае,
Да чаго ж чуллівая хвілінка.
Маё сэрца быццам замірае.

Забаўляльны цёплы вецярок
З пяшчотаю развейвае хусцінку.
А паветра свежага глыток
Ахвотна замяняе вітамінку.

Срэбранай, бліскучай павуцінкай
Восень нас чаруе зноў і зноў.
Усланаю лісточкамі сцяжынкай
Шчаслівая вяртаюся дамоў.
*03.10.21 г.*

## Дарэмныя намаганні

Зіма-свавольніца вярнулася.
Адкрыта, напрасткі ідзе,

Дажджом халодным асвяжылася,
Сняжком цярушыць дзе-нідзе.

Так асцярожна аглядзелася -
Мо, зноў дарогу замясці?
Куды ж, завея, ты падзелася?
Шкада - сяброўкі не знайсці.

На дапамогу імчыць ахвотна
Слабы, няўпэўнены мароз.
У зімы на сэрцы так турботна.
Да болю, не хапае слёз.

Аднак, дарэмна намаганне
Застацца тут і панаваць,
Ужо чуецца вясны дыханне,
І птушачкі дамоў ляцяць.
*22 02.23 г.*

## Жыццё, як рэчачка…

Жыццё,як рэчачка бяжыць
Наўгад у нязведанныя далі,
Весяліцца і шумна бурліць,
Або сумуе разам з намі.

Сцяжынку кожны выбірае -
Падчас жаданне загадаць,
Ці роўная,ці чуць крывая,
Наперад цяжка прадказаць.

Чамусьці мучыць нас сумненне,
А ці ж мы правільна жывём?
Магутны Бог дае цярпенне,
Па сцежцы ўпэўнена ідзём.

Жыццё падносіць нам урок,
Гады ў пазыку не дае.
Неспадзяваны прагучыць званок,
І ў іншы свет нас забярэ.
*14.04.21 г.*

## З 700-годдзем цябе, мая Ліда!

Мірны, сонечны наш гарадок.
Не знайсці прагажэйшай мясціны.
Самы лепшы на свеце куток,
Носіш імя прыгожай дзяўчыны.

З чым змагу я цябе параўнаць?
Хіба ж з кветачкай ранняй вясновай,
Цяжка слоў мне такіх адшукаць
Каб зліліся ў адно з роднай мовай.

Утульны, адноўлены Замак
Нас у госці з цяплом запрашае,
Турыстаў надзейны прыстанак
Пра мінулае зноў нагадае.

Цішыня ля Кургана Бяссмерця,
Спяць у магіле Радзімы сыны,
Замірае душа, стыне сэрца
Ад бязлітаснай, чорнай вайны.

Колькі гора ты змог перажыць,
Не зламалі разруха і голад,
Успамінамі будзем мы жыць,
Непакораны, мірны наш горад.

Дзіўнай ружай квітней з году ў год,
Каб яснелі твае краявіды.
З 700-годдзем цябе, любы горад!
З 700-годдзем цябе, мая Ліда!
*24.04.23 г.*

## Кніга будзе ў пашане

На стэлажах, у чытальнай зале
Ў радочак кніжачкі стаялі.
Пра лёс, пра родную мову
Паміж сабой вялі размову.
- Вельмі крыўдна, хоць ты плач,
- Куды ж падзеўся наш чытач?
- Усё далей ад нас культура,
- Няўжо памрэ літаратура?
- Усім вядома - не сакрэт
- Сёння ў модзе інтэрнэт.
- Зусім забыліся пра нас,
- У пашане словы "фэйк" і "клас"..
- Мы ўпэўненыя, надыдзе час
- З павагай звернуцца да нас.
- Усё зменіцца, на месца стане,
- Зноў кніга будзе ў пашане!
*18.09.21 г.*

## Край мой родны

Як жа лёгка ў роднай старонцы!
Тут інакш дуе ветрык ласкавы.
Пагрэцца пад промнямі сонца,
І не думаць праз іншыя справы.

Пад бацькоўскім радзімым вакном
Вабіць ружа і бэз белы-белы.
У цішы пасядзець вечарком -
Сэрца радуюць птушачак спевы.

У радочак таполі стаяць -
Белы бусел у гняздо завітае.
Як прыемна за ўсім назіраць,
І душа, нібы ў вырай узлятае.

Сэрцу любы мне кожны дзянёк,
Захад сонейка тут прыгажэйшы.
Край мой родны, бацькоўскі куток,
З кожным годам мне ўсё даражэйшы!
*16.06.23 г.*

## Падарунак нябесны

Пад матуліным светлым акенцам
Яркім полымем ружа цвіце,
Зачароўвае, радуе сэрца,
Не знайсці мне такую нідзе.

Кожную кветачку ветрык шануе,
На вушка ёй песні пяе,
Ранкам сонейка песціць, цалуе,
Цёплы дождж падвячоркам палье.

Не нацешуся дзіўнай красуняй,
Прыцягвае водар чароўны.
Адпачыць там мне з любай матуляй,
Сапраўды - падарунак нябёсны.
*27.08.22 г.*

## Чулыя сны

У добрых снах я бачу сваю рэчку -
Дзяцінства і юнацтва асалоду,
Жую салодка-кіслую парэчку,
Прывабны пах яе чуваць быў з броду.

Частуюся з ахвотаю калінай,
Увагі не звяртаючы на горыч,
А з лепшаю сяброўкаю рабінай
Шкадуем, што не можам быць мы побач.

Спыніўшыся, прысеўшы на хвілінку
Душою, сэрцам я адпачываю.
Зноў прыгадаю сціплую дзяўчынку,
Што зычыць добры лёс для свайго краю.

****

Прадвесныя, чулыя, добрыя сны -
Іскрынкі магічныя ў сэрцы.
Кожны міг, кожны крок мяне грэюць яны,
Расчынілі ў душы насцеж дзверцы.
*06.09.22 г.*

## Хай жа спраўдзіцца гэтае жаданне

Закружыўся бялюткі сняжок,
Нібы зорачка яскрава ззяе,
Быццам сціплы лясны матылёк
Мае вусны пяшчотна кранае.

Цёплай коўдрай накрыўшы зямлю,
Усё шчыльней і шчыльней прыціскае.
Як матуля дачушку сваю,
Так ласкава з душой абдымае.

Як жа хочацца марыць, тварыць,
За хвілінку адправіць пасланне -
Каб спакойна і мірна нам жыць,
Хай жа спраўдіцца гэта жаданне.
*16.01.24 г.*

## Не будзем сумаваць...

Зіма хвалюецца, злуецца,
Падчас бурчыць у сне,
Уразумець ёй давядзецца -
Перадаць ключы вясне.

Надвор'е радуе, спрыяе,
Лагодны, сонечны дзянёк,
Воблачка, нібы гуляе,
Лашчыць яго вецярок.

Рэчка здалёку шуміць,
Напаўняе свае берагі,
Лёд пачарнелы трашчыць,
У момант знікаюць кругі.

Напэўна, статная вярбінка
Надзене новае ўбранне.
Нібы, сціплая дзяўчынка.
Чакае першае спатканне.

Настрой вясны квітучай
Спрабуем разам прадказаць.
Водар кветачак пахучых
Нам не дазволіць сумаваць.
*01.03.21 г.*



# *Ларыса Лайкевіч*

*Ларыса Іванаўна Лайкевіч працуе настаўнікам пачатковых класаў у СШ № 12 горада Ліды. У свой час скончыла Лідскае педагагічнае вучылішча, Берасцейскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Пушкіна (гістарычны факультэт). Скончыла магістратуру. Зараз паступіла ў аспірантуру.*

*Свой першы верш напісала ў дзесяцігадовым узросце, у час вучобы ў школе ў пасёлку Забалаць Воранаўскага раёна. На напісанне таго верша Ларысу натхніў аповед настаўніка аб Беларусі на ўроку беларускай літаратуры.*

*Асноўныя тэмы вершаў Ларысы Лайкевіч: Радзіма, бацькі, работа настаўніка, адносіны людзей паміж сабой, каханне, філасофскія разважанні.*

*- Вершы ў мяне нараджаюцца самі сабой, - прызнаецца паэтка. - Я іх не вымучваю, не прымушаю сябе пісаць. Пішу ў асноўным па начах. Напрыклад, верш "Настаўнік" я склала за дзве ночы. А бывае, верш ствараецца за лічаныя хвіліны. Я лічу, што паэтычны талент - гэта дар з нябёс. Паэты - людзі крыху "не ад гэтага свету", яны знаходзяцца на сваёй хвалі і ўмеюць заўважаць у акаляючым тое, што чалавек нелірычнага складу душы не заўважае.*

## Мова родная

Мова родная, мова пяшчотная!
Асалодай людской пранікнёная.
Ты - матуліна і бабуліна,
Светла-шчырая, вельмі чулая.

Ты Францішкава, мова Коласа,
Недасягнутая і прыгожая,
Мілагучнасцю скрозь надзелена
І суцэльная, нераздзельная.

Мова прашчураў, мірна-звонкая.
Ты - славянская, ты - цудоўная!
Беларуская, дабрачынная.
Ды блакітная, ды айчынная!

Мова родная, слова вернае,
Не забытае, а надзейнае!
Пакланюся я слову роднаму,
Чарадзейнаму, непакорнаму!

## Зорны вечар

Зорны вечар над зямлёю ўсходзіць,
Закрывае месяц небакрай.
І дрыжыць таполя на марозе.
Пакрывае шэранню ўжо гай.

Падбіраецца зіма да нас знянацку.
Прытаілася над лесам і гудзе.
Завывае песняй, ну нібыта цацкай,
Завірухай весела мяце!

Што ж зіма, табе ўжо гаспадарыць!
І зямля кладзецца на спакой…
У гэтай прыгажосці, як у казцы…
Ціхі сон накрые ўсё сабой.

## Вярнуся

Калісьці вельмі змораны вярнуся
Я на бацькоўскі, ужо немалады парог,

Прад абразом сваім перахрышчуся
Я стомлены з чужых, былых дарог!

Так зухавата вее цеплынёю
І белым караваем са стала.
Я адпачну змарнелаю душою
І супакой пачую ў клёкаце бусла.

Калісьці вельмі зморана вярнуся.
Вярнуся, каб ужо не йсці назад.
Матулі ў пояс нізка пакланюся,
І як малы засну ў яе руках.

## Беларус

Дабрачыннасць беларусаў лечыць.
Талерантнасць прыдае ім сіл.
Беларус спрадвеку шчыра верыць
У святло і велічнасць душы.

Міласэрнасць беларуса грэе…
Цеплыня - нібы святло ў акне.
Беларус заўжды, заўжды сумее
Падтрымаць і падмагчы ў бядзе.

А гуманнасць беларус не страціць.
І не прамяняе ні на што.
"Беларус!" - гучыць так горда, браце.
Беларус спакон вякоў - вякоў спакой.

## Нябёсы, дзякуй вам за падарунак!

Нябёсы, дзякуй вам за падарунак -
Жыць на зямлі і радавацца дню,
Што называюся спрадвеку беларусам,
Што ў міры і спагадзе я жыву!

Нябёсы, дзякуй вам за падарунак
Мне - любавацца гаю прыгажосцю,
Блакітам неба, лесу і рачулак!
Мне могуць толькі шчыра пазайздросціць!

Нябёсы, дзякуй вам за падарунак -
За дабрачыннасць ветлівых людзей,
Якія тут жывуць, у Беларусі,
Такіх не знойдзеш болей анідзе!

Нябёсы, дзякуй вам за падарунак -
За светлую і чулую зямлю!
Я ганаруся краем беларускім
І прызнаюся, як яго люблю!

## У маёй Айчыны - слаўны лёс!

У маёй Айчыны - слаўны лёс!
Веліччу адсыпана дарога,
Напраскі, ушыркі і наскрозь,
Ёй спявае песні Перамога.

Над маёй зямлёй ірдзее сцяг
Мужнасці і вернасці адданай.
У вачах дзяцей яе працяг,
У памяці былога ціхай ранай.

Прад маёй зямлёй - шчаслівы шлях,
Палымнець у садзе, зорным небе,
Пад крылом імклівага бусла,
З караваем аржанога хлеба.

## Прыродзе адданы

Агульны дом - нябёсаў краявіды!
Абшар лясоў, лугоў, сваёй зямлі.

Прыродзе буду я адданым, верным сынам,
Там, дзе заходзяцца ад песняў салаўі.

Дзе пад блакітам палымнеюць ружы
І гай шуміць зялёнаю ліствой,
Дзе кожнай кветцы ў пояс пакланюся,
Травіначцы я ўдзячны ўсёй душой.

Я па дарожцы весела імчуся,
Бяроз пачую шэпт і дзіўны смак,
Суніц лясных далонямі крануся,
Адчую бег павольны ручайка.

Агульны дом - нябёсаў краявіды
Павінны берагчы штодзень мы і штоміг.
Прырода бацькаўшчыны сэрцам не забыта.
Яе нікому не адняць! Яе ніколі не забыць!

**О, Беларусь!**

О, Беларусь - мая Айчына!
Чароўны край, прытулак мой.
Табой любуюся адзінай,
Цябе люблю я ўсёй душой.

Я не магу без хвалявання
На прыгажосць глядзець тваю.
Разлівы рэк, лясоў хістанне
Так грэюць душаньку маю!

О, Беларусь, цябе пакінуць
Ніколі, пэўна, не змагу.
Мне лепей будзе ўжо загінуць,
Бо без цябе не пражыву!



*Вольга Ашмяна-Бічэль нарадзілася ў 1973 годзе ў горадзе Лідзе. Скончыла Лідскае педвучылішча ў 1992 годзе, пасля вучылася ў ГрГУ імя Я. Купалы. Працавала ў Дакудаўскай сярэдняй школе настаўніцай пачатковых класаў. У Дакудаве знайшла свае каханне (мужа Бічэля Андрэя) і паэтычнае натхненне. Мама траіх дзяцей і паэтэса ў душы.*

# *Вольга Ашмяна-Бічэль*

## Дождж

Дождж імжыць ці пачынае ліцца.
На акне - празрыстыя сцяжынкі,
Парасона мокрая спадніца.
Цяжкі шоўк змакрэлай павуцінкі.

Чыстая, прамытая лістота.
Ліпкія, халодныя арэлі.
Цёплае нутро гумовых ботаў.
Грукат навальнічных артылерый.

Манатонна-надакучны стукат.
Хмараў незалатанае сіта.
Па люстэрках лужын босы тупат.
Хараство нябеснага блакіту.

Нечаканасць вадзяной лавіны.
Адсырэлы пах падсохлых зёлак.
Веер пырскаў з-пад калёс машыны.
Неспасціжнасць мастака вясёлак.

## Немагчыма пражыць без памылак

Не трывожце мяне ўспаміны,
Не кранайцеся струнаў душы.
Не спрабуйце дастаць да глыбіняў,
Дайце крыху пабыць у цішы.

Немагчыма пражыць без памылак
І жыццё нельга перапісаць.
Колькі лёсу агідных ухмылак
Усім нам давялося спазнаць.

Шлях, спачатку, здаецца вясёлы
І спакусамі вабіць, знарок,
Ды нялёгка даюцца высновы.
Першы вопыт - як цяжкі ўрок.

Кожны крок у жыцці, як аснова,
То марудная плынь, то скачок.
Не мяняюцца ўчынкі і словы,
Сыпле час, як праз пальцы пясок.

Як паспець за імклівым патокам?
І пачуццяў людскіх не губляць.
Не забыць сваіх родных вытокаў,
Каб душы сваёй не сапсаваць.

Трэба ўперад глядзець - не пад ногі,
І як хочаш, то сам выбірай.
Што расце паабапал дарогі?
Моху цвіль ці бярозавы гай.

## Поўня

Поўны месяц ільецца праз шкло
Па празрыстаму шоўку фіранак,
На падлозе адчыніць акно
У загадкавы свет спадзяванняў.

Намалюе пейзаж на сцяне
У адной ім вядомай манеры,
Адлюструе выявы ўва сне
І прымусіць у казку паверыць.

Усталюе спакой у душы
І настроіць мелодыю сэрца,
Зазвініць срэбным звонам уначы
І салодкім натхненнем уварвецца.

Завіхурацца думкі хутчэй
Легкакрылымі марамі зданняў,
З поўным месяцам ўліцца лягчэй
У загадкавы свет спадзяванняў.

***

Налі мне келіх даўкага віна,
Падкінь пален у жарало пячуркі,
Мы прасядзім з табою да відна
У хатачцы ля ціхае рачулкі.

Вугольчыкі зацягвае смугой,
А мы з табой паклічам успаміны.
І хай яны прасякнуты тугой,
Нам іншых лёс дарэмна не падкіне.

Наш смутак - як празрыстая вада
І наталіцца ёю нам не досыць,
Мільгае светлых мрояў чарада -
Найлепшых дзён адплыўшай маладосці.

Усе нашы дні мы помнім нездарма,
У іх пяшчота, што ішла ад сэрца к сэрцу,
Прасякнутыя промнямі цяпла,
Не толькі нам - другім далі сагрэцца.

З аднога келіха ўдваіх мы п'ем віно
І на дваіх адно жыццё ільецца.
Дарэмна не пражытае яно -
Заўсёды келіх поўным застаецца.

**Жанчынам элегантнага ўзросту**

Па вуліцы, нібыта па памосце
(У вачах усмешка хітрыкамі грае),
Жанчына элегантнага ўзросту
Павольна крочыць, нібы маладая.

На ёй сукенка, туфлі на абцасах
Зусім маленечкіх (узрост не дазваляе).
"Чырвоная Масква" знаёмым пахам
У паветры растае і адлятае.

Куды б ні йшла яна - да ўнукаў ці сяброўак -
З маленечкаю сумачкай пад пахай,
Заўсёды яе выгляд бездакорны
Прымусіць азірнуцца раззявякаў.

І так заўжды, у хаце і на працы,
Да ўсіх вакол павага і прыязнасць.
Сабе не дазваляла расслабляцца,
Нібыта за ўвесь свет нясла адказнасць.

І хоць ужо пасерабрыла скроні
І новая маршчынка далягае,
У жанчыны элегантнага ўзросту
Ў вачах хітрынка - значыць маладая!

## **Дзіўны выпадак**

Байка

Бывае, зранку як не пашанцуе,
Дык потым цэлы дзень - пад хвост сабаку.
Праблема сёння Казіка хвалюе:
Ізноў ступіў на граблі, небарака.

Але не тыя граблі альбо вілы,
Што ў куце хлява стаяць у парадку, -
Каханне, што звядзе яго ў магілу.
Забыўся ў сваёй суседкі шапку.

І вось здарэнне як у анекдоце:
Каханкі муж вярнуўся нечакана.
Душа - у пятах, сам у халодным поце...
А раптам страшны доказ не схаваны?

Сядзіць у жаху, сэрца ў журбоце...
У акно зірнуў - а там сусед з бярданкай.
Прыйдзецца смерць прыняць не па ахвоце...
Ужо, відаць, расправіўся з каханкай.

З апошніх сіл, наколькі дух трымаўся,
Рвануў дубэльт, каб праз акенца збегчы.
Нагою ўжо на прызбе аказаўся.
Тут раптам нешта разанула ў плечы...

І ён застыў у нязграбнай той паставе,
Як заяц напалоханы ў жыце,
І зразумеў, што гэта, неўзабаве,
Спіну скавала ў радыкуліце.

Сусед зайшоў, ружжо прыткнуў у ганку,
Убачыў Казіка, які застыў у раме.
"Ого, цябе скруціла абаранкам,
А я ішоў гукнуць на паляванне".



# *Станіслаў Суднік*

*Станіслаў Суднік нарадзіўся 21 верасня 1954 года ў в. Сейлавічы Нясвіжскага раёна. У Лідзе жыве з 1994 года.*

*Друкаваўся ў літаратурных часопісах "Полымя", "Маладосць", "Верасень", "Новы замак".*

*Аўтар кніг паэзіі "Пагоня за мову", "Мой Грунвальд", "Лідскія скрыжалі", "Літва", "Пілігрымка дадому".*

*Рэдактар літаратурных альманахаў "Ад лідскіх муроў", "Стольны град" (Навагрaдак), "Нясвіжскі ўток", "Родныя пагоркі" (Капыль).*

*Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2001 па 2021 г.*

## Яцвягі

Мой род прайшоў дарогай цяжкай
І ў той дарозе ўсё згубіў,
Згубіў ён мову, песні, казкі
І імя сам сваё забыў.

Ды выжыў нейк і зноўку ўстаў,
І зноў над ім штандары славы,
І станавым хрыбтом ён стаў
Свабоднай новае дзяржавы.

Нас адмянілі ўсіх гісторый знаўцы,
А мы жывыя, мы вось тут,
Спяваюць песні зноў дайнаўцы,
Судавы родны праслаўляюць кут.

# Год 1920

або

## 2-я песня пра Літоўска-Беларускія дывізіі

*__Мы доўга моўчкі адступалі…__*
*М. Лермантаў.*

### I

Жаўнер на пасту, карабін пры назе,
Час чарапахай маруднай паўзе.
Спакойна вакол, і вакол неспакой,
Дыхае прышласць чарговай вайной.

Ліпень пячэ, не шкадуючы жару,
Ноччу ярчэй палымнеюць Стажары.
Жаўнер на пасту пра Сусвет той не дбае,
Жаўнер на пасту толькі змену чакае.
Паглядвае ён з неахвотай на ўсход,
Дзе з яго сваякоў робяць іншы народ.

Жаўнер дывізіі Літоўска-Беларускай,
Ён тут пад Лепелем па-над далінай вузкай
Мяжу пільнуе паміж Польшчай і Расіяй,
Кладзе здароўе тут сваё і сілы.

А думкі ізноў за голаў бяруць:
"А дзе ж Літва яго? Яго дзе Беларусь?
Хто лепшы для яго зямелькі,
Хто дабрадзей, хто кат з-пад пелькі?
Калі Бог здобрыцца над намі,
Мы станем самі тут гаспадарамі?
Калі ўжо плуг направіць можна глыбей,
Каб адвярнуць зямлі зляжалай глыбы,

Прайсці па іх жалезнай бараною,
І шчодра поўнаю рукою
Зярняты сыпануць з сявенькі,
Няспешна, рупна, памаленьку
Ўсю гаспадарачку да ладу
Падняць нарэшце з заняпаду…"

## II

Паціху зоркі патухаюць
І неба сонцу саступаюць.
Яго яшчэ і не відно,
Ды адчуваецца яно
Па тым, як ціхенька-паціху
Ўсё прачынаецца пакрыху.
Ды раптам бліснулі зарніцы
Паўсюль, уздоўж усёй граніцы.
Жаўнер пальнуў, падаў трывогу,
Падняў дывізію на ногі,
Хай не дывізію, хай полк ці роту,
Ды прахапілася пяхота,
Бягуць разлікі кулямётаў.
Артылерысты з цесных хатаў
Бягом пабеглі да гарматаў,
А недзе ў лугавым сутонні
Заржалі спуджаныя коні.

Не, не спрасоння падалося,
Усё напраўду пачалося

## III

Масква рашыла рэвалюцыю
Палякам несці на штыках
І, падмахнуўшы рэзалюцыю,
Распачала крывавы шлях.

На ўсёй мяжы савецка-польскай
Чырвонай Арміі сабрала моц,
І рухам сілы той геройскай
Спакойную парвала ноч.

Рванула конніца ўдалая
Пайшла ў няспынны той набег,
Па Беларусі корпус Гая
Уздоўж дарог, лясоў і рэк

Прарваў палякаў абарону,
На захад пёр далей і больш,
А дзе здаралася заслона,
Яе абходзіў і: "Даёш!"

Пра моц Літоўска-Беларускіх
Палкоў чырвоныя ўжо знал
І па праломах фронту вузкіх
Іх злева - справа абцякалі.

Каб не застацца ў акружэнні
І каб адбіць ліхі напад,
Быў дадзены на адступленне
Начальствам фронту ім загад.

Пайшлі на Менск, каб абарону
Якую-кольвеч там заняць,
І пад тым Менскам, хоць да скону
Быў Менскі полк гатоў стаяць.

Ды як стаяць? Бо злева-справа
Чырвоных конніца ляціць,
І лозунг іх: "Даёш Варшаву!" -
Ужо ў вушах усіх звініць.

Менск здадзены без бою, і на захад
Далей дывізія ідзе,

І, адбіваючы атакі,
Не прыпыняецца нідзе.

А нам тут трэба прыпыніцца,
Каб аглянуцца чуць назад,
Дывізій нашых дыспазіцыю
Па фронце вызначыў загад.

Першая дывізія з палкамі
Віленскім, Менскім,
Наваградскім і Гарадзенскім
Мусіла ўздоўж Нёмна адступаць,
А другая зноў з палкамі
Лідскім, Слуцкім,
Ковенскім і Беластоцкім
Мяжу з Літвою мусіла трымаць.

Што першая дывізія найлепей
Была узброена - не дзіва,
Бо з населеных паветаў
Яна жаўнераў прытуліла.

Віленскі, Менскі, Гарадзенскі -
Палкі старэйшымі былі.
Наваградскі быў маладзейшы,
Бо быў з занёманскай зямлі.

Наваградскі ішоў у ар'егардзе
І вёў няспынныя баі.
Ля Морына ў ліхім нападзе
Чырвоныя полк гэты адсяклі.

І ўсё, бяда і акружэнне,
І літасці ніякай не чакай,
І будзе поўнае знішчэнне,
І мог схапіць той полк адчай.

Ды, Морына, яно ж пры краі
Самой Наваградскай зямлі,
Наваградзец тут Нёман знае,
Брады без цяжкасці знайшлі.

І як чырвоныя, што сілы,
Зноў цісканулі да відна,
Знайшлі адно, што дол пахілы,
Ні чалавека, ні каня.

Полк перайшоў на левы бераг лоўка,
Праз Пудзіна і Васілевічы далей,
Выйшаў пад Сялец і зноўку
Перабраўся да дывізіі сваей.

Ідуць палкі… Пісакі напісалі,
Што ўпаў іх баявы жаўнерскі дух,
А што наваградцы з-пад Морына не паўцякалі
І не разбегліся, то гэта быццам марны гук.

Ідуць палкі.. А тут загад іх даганяе,
Пад Лідай абарону каб заняць,
Ад Крупава і да Сяльца з іх вымагае,
Каб фронту лінію трымаць.

Загад прыйшоў, ды толькі незадача -
Палкі пад Шчучынам даўно,
Вярнуць пад Ліду іх на ўдачу
Ні сіл, ні сэнсу не відно.

**IV**

Дывізія другая пад Вільняю была,
Баі з чырвонай кавалерыяй вяла.
Ад летувісаў фланг трымала,
Нямала цяжкасцяў спазнала.

І пасля баёў цяжкіх
Згубіла цэлых два палкі.

Таму і здарылася так,
Што пад Гародняй шмат атак
Адбілі Лідскі з Ковенскім палкі,
Сябе пакрыўшы славай на вякі.
Слуцкі полк на поўдзень адышоў
І да сябе за Нёманам прыйшоў.

На мяжы з варожай Летувой
Беластоцкі полк трымаў за боем бой.
Пайсці наперад летувісам не даваў
І многа нашых тэрыторый зберагаў

А вораг пёр, і пёр, і пёр,
"Даёш Варшаву!", - горла дзёр.

**V**

Пазначыўся ў палякаў нейкі лад,
І першая дывізія атрымвае загад:
"Нёман утрымаць любой цаной,
За кожны метр вясці смяртэльны бой.
Трымаць Масты, дарогі тут трымаць,
Чыгунку і шашу каб ні за што не здаць".

Дзве арміі чырвоных
Наступ тут вядуць,
Тысячы, ідэяй акрылёных,
У атаку тут ідуць.

Там іх дывізіі па дзесяць аж палкоў
Таранам пруцца зноў і зноў.
Першая дывізія з цямна тут да цямна,
Б’ецца, ні сілаў, ні ратунку тут няма.

Загад патрабуе: "Ні кроку назад!".
Баі за Сцяпанішкі другі дзень падрад.
Камдыў вырашае за Нёман сысці,
На той бераг ракі ўсе палкі адвясці.

І хоць не мае на тое загаду,
Ён сам абарону даводзіць да ладу.
Наваградскі полк іх адход прыкрывае,
Як плацдармы трымаць, добра ён знае.

Ён забяспечыць адход тут сумее,
І сам адарвацца і знікнуць здалее.
І новая лінія ў іх абароны,
І на іхнім баку сам бацька Нёман.

Зноў загад вымагае на смерць ім стаяць
І пераправы праз Нёман трымаць.
Фронт утварыўся па Нёмне і Шчары,
Аж да Ваўкавыска пылаюць пажары.

Польская першая армія - дух не скароны,
Насупраць трох цэлых армій чырвоных.
Дух баявы іх бязмежна высокі,
Зрок у Еўропу сягае далёка.

Нёман прайсці - і адкрыты абшар,
Можна горда нясці свой чырвоны штандар.
Ды дывізія тут вось на іхняй дарозе
Мары сцішае аб перамозе,

І адступаць аніколькі не хоча,
Агнём палымнеюць хлапечыя вочы.
Чырвоныя брод неўзабаве знайшлі
І ў лабавую атаку пайшлі.

Два палкі пачалі пераправу,
Каб здабыць перамогу і славу.

Да сярэдзіны рэчкі іх падпусцілі
І з кулямётаў без жалю скасілі.

З двух палкоў, можа, полк загайдаўся на хвалях
І па Нёмну паплыў у Балтыйскія далі.
Гэта потым пісакі напішуць расказы,
Што тут беларусы панеслі паразу,

А покуль атака рашуча адбіта,
Дывізія з роднай зямелькаю зліта.
Ды толькі на Шчары не так выглядае,
Там абарона прыкметна слабая.

Там інжынеры акопы толькі пазначыць паспелі,
Больш жа нічога зрабіць не сумелі.
І вось Ваўкавыск у пажары дыміцца,
Збіты палякі на Шчары з пазіцый,
Зноў адступілі ды золкавым ранкам
Заняць абарону змаглі над Зяльвянкай.

**VI**

А над Нёмнам смерцю вее,
Ціск чырвоных не слабее.
І недзе, мо ў гадзіну часу
Пайшлі ў атаку цэлай масай.

Такая сіла паваліла,
Што тут здранцвенне наступіла.
Замоўклі раптам кулямёты,
Знямелі ад здзіўлення роты.

Такога быць жа не павінна,
Людская сунецца лавіна.
І невядома, як трымаць тут бой
З той неадольнаю сцяной.

Ды, дзякуй Богу, што на флангах роты
Не бачылі карціны той,
Загаварылі куляметы
І сыпанулі куляў рой.

Іх і было ўсяго пятнаццаць,
Тых ЦКМ-аў баявых,
На іх адно і спадзявацца,
І верыць трэба толькі ў іх.

Максімаў восем, сем англійскіх
Разлікі вынеслі на бераг
І скрыжавалі агонь блізкі,
І зашумеў крывавы нерат.

Кладуцца першыя шарэнгі
І па вадзе сплываюць,
А новыя з нязвычным пэндам
Ужо на мёртвых напіраюць.

Трашчаць пятнаццаць ЦКМ-аў,
Кладуцца мёртвыя шыхты,
І стогн плыве над Нёмнам немы,
Знямелі дрэвы і кусты.

Ну і злажылі тую масу,
Легенда потым тут жыла,
Што пад Мастамі гэтым разам
Калмыцкая дывізія лягла.

Стаіць там помнік невялікі,
Не ўсе і знаюць яму цэну,
А гэта памяць пра разлікі
Тых пераможных ЦКМ-аў.

А фронт загнуўся на Зяльвянку,
А вораг спераду і збоку,

Так і чакай неспадзяванкі
І прарыў у тыл глыбокі.

Узята Рось, і Воўпа ўзята,
Пераразаюцца дарогі.
І Слуцкі полк праз бой зацяты
Ідзе сваім на дапамогу.

Адкуль ён толькі тут узяўся
Ды сіл дывізіі дадаў,
Адчайна, мужна адбіваўся
І правы фланг ёй прыкрываў.

Ды злева тут прарыў адбыўся,
І вораг Нёман перайшоў,
Кацёл, як ёсць для іх стварыўся,
Загад на адступленне не прыйшоў.

Прыйшоў загад стаяць на месцы
І пераправу бараніць,
А вораг далей хай нясецца.
І што камдыву тут рабіць?

Чырвоныя наўрад ці знালі,
Што ўся дывізія ў катле,
Таму нямоцна насядалі,
На захад рваліся далей.

Няма ўжо фронту там, выходзіць,
І супраціву больш няма,
Бо хто ўцякае, хто адходзіць,
Каб адарвацца да цямна.

І камандзіры вышніх рангаў
Спісаць дывізію паспелі,
Калі ні вечарам, ні ранкам
Больш звестак пра яе не мелі.

А тыя, пра каго пісалі,
Што зусім апалі сілай,
І што духам падупалі,
І што стаялі над магілай,

Паходным шыхтам на змярканні
Рванулі з клятага катла,
Адзінства сіла і яднання
Ў той час ім добра памагла.

Наперад пушчаны таранам
Ішоў адборны самы звяз,
Рашучы, дзёрзкі, нестрыманы,
Ён не спыніўся, не заграз.

Іраваў чужую абарону,
Рабіў дывізіі праход,
Граміў раз'езды і заслоны
І не сцішаў на хвілю ход.

І між чырвонымі тыламі,
І між чырвонымі палкамі,
Як паміж пальцамі пясок,
Прайшла дывізія начамі
Ў аж надсвіслацкі лясок,
Дзе на здзіўленне камандзіраў,
Што пахавалі ўжо яе,
Пры карабінах і ў мундзірах,
Як грозны прывід паўстае.

Усе палкі яе стаялі
І хто прыбіўся да яе,
Яны той бітвы не прайгралі,
Як дзе гісторык нам пяе.

Яны з пазіцый адступілі,
Каб зноўку новыя заняць,

Яны не беглі, а насілу
Змаглі штаб арміі дагнаць.

Зноў шчыльны фронт, зноў абарону
Заняў на новым рубяжы.
Жаўнер ізранены, стамлёны
І просіць Бога: "Памажы!"

**VII**

Пакуль выходзілі з самога пекла,
Каб зачапіцца за Свіслач хаця,
Конніца ворага перла і перла,
І быў кожны дзень цяжкай бітвы працяг.

Як з бяссілля Гародню без бою здалі,
Тут патрэбны не спеў, тут трэба плач,
Бо жаўнеры зноў нашыя там паляглі,
Каб назад каралеўскі той горад забраць.

Літоўска-Беларуская другая,
Пабітая з-пад Вільні адышла,
Ды поле бою ўсё не пакідае,
Для барацьбы шчэ сілачкаў знайшла.

Ковенскі і Лідскі тут былі палкі,
З мясцовай шляхты ўсе ўкамплектаваны,
І генерал Макрэцкі на вякі
Ў шэрагах яе занатаваны.

І як здалі Гародню, так здалі наступны,
Усёй тут логіцы канец,
Здалі амаль што непрыступны,
Магутны, слынны Асавец.

Мог Асавец пакрыцца славай,
Мог стацца цэнтрам абароны,

Мог стацца гонарам дзяржавы
І быць ніколі не скароным.

А на яго забыліся па-просту,
Зусім не сталі бараніць,
І тут ужо не пра геройства,
Пра здраду трэба гаманіць.

І паляцелі зноў загады
Той Асавец назад забраць.
Яго забраць, канешне, рады,
Ды толькі сілаў дзе ж узяць?

## VIII

Што ні крок, то бой зацяты,
Паўсюль палякі адступалі,
Камандуючы арміяй быў зняты,
Бо вінаватых і тады шукалі.

І Ендрыеўскі - камандзір Літоўска-Беларускай
Армію тады ўзначаліў,
А Жандкоўскага, таксама службы рускай,
Камандаваць дывізіяй паставіў.

І стаў у першай арміі парадак,
Бо афіцэры рускай службы ўсе былі,
І разумелі ўсе аднолькава загады,
І бой аднолькава вялі.

А ў Літоўска-Беларускай першай
Афіцэры ўсе красовыя былі,
Жаўнеры там былі з найлепшых -
Пасланцы Беларускае зямлі.

Дабраахвотнікі аснову там складалі
З самых беларускіх гоняў і бароў,

Якія праз вякі вякоў давалі
Найлепшых у тым краі ваяроў.

І армія змагла сабрацца
І абароны лінію заняць,
І здолела на фронце тым трымацца
І колькі дзён не адступаць.

Чарговым рубяжом той абароны
Сталі рэчкі Нараў, Буг,
І толькі тут палкам стамлёным
Нейк удалося перавесці дух.

Паўночны фланг дзясятая трымала,
Дывізія, адважная ў баях.
Калісьці аж з Каўказа пракладала
Яна да Польшчы гераічны шлях.

Пры ёй сабраны многа частак блізкіх,
І дваццатая брыгада тут была
Палкі два: Ковенскі і Лідскі
Дывізія другая зберагла.

Іх тут было пяцьсот і пяцьдзясят,
Баявых багнетаў у шыхтах,
А выйдзе з бою сто і пяцьдзясят,
Ды выйдуць пры штандарах і сцягах.

Каб зберагчы дывізію для дальшых справаў,
Іх усіх на транспарт пасадзілі
І аж за Віслу, за Варшаву
Для папаўнення снарадзілі.

А першая Літоўска-Беларуская
Трымала фланг паўднёвы.
І хоць абсаджаны не густа,
Да бою фланг той быў гатовы.

І тут прыйшла навіна нечакана,
Бярэсце пала - моцная фартэца,
Наперад гоніць вораг апантана
І таксама на Варшаву рвецца.

І польскай арміі чацвёртай
Даводзіцца без ладу адступаць,
І нашай абароне цвёрдай
Фланг правы пачынаюць агаляць.

А ў цэнтр, у стык двух згрупаванняў
Рашуча выцяў Тухачэўскі,
І Ломжу ўзяў без намаганняў,
Ад абароны паляцелі трэскі.

Адважны маршал, як казалі,
Савецкі быў Напалеон,
І сярод тых, што адступалі,
Асноўныя шукаў палякаў сілы ён.

І вось, сустрэўшы моцны супраціў,
Рашыў, нарэшце, што знайшоў,
У наступ сілы ўсе пусціў
І да Ломжы ўраз дайшоў.

Рэзервы Ломжу пробуюць адбіць,
Ды ім удача не спрыяе....
Камандаванне фронту то не спіць
І новую там лінію стварае.

І ўжо пад самым Радзымінам
Акопы свежымі дывізьямі заняты,
А першая з дзясятай мужна, чынна
Выйшлі ўсё ж і з тых баёў праклятых.

І першую дывізію пад Прагу
Ў армейскія рэзервы адвялі,

Дзе, аценіўшы іхнюю адвагу,
Дух перавесці ім далі.

Ды адпачынак быў нядоўгі,
Трываў, мо, некалькі гадзін,
Ляціць ганец, зламаўшы ногі,
- Чырвоныя занялі Радзымін.

І з тых пагоркаў Радзыміна
Варшава ўжо ў біноклі ім відна,
Адна-другая шчэ гадзіна -
І будзе скончана вайна.

* * *

Іх Радзымін, і нападнік святкуе,
І не імкнецца заняць абарону,
А рашуча наперад прастуе,
На прасторы палёў і загонаў.

Ад Радзыміна да Варшавы пуста,
Каб хоць акопчык там які...
Аж, глянь, Літоўска-Беларускай
Як здані вынiклі палкі...

Была атака страшнай сілы,
Ад крыўды моцнай і адчаю,
І тое поле заступілі
Яны ад краю і да краю.

І так магутны быў напор,
І так імклівая лавіна,
На іх багнетах ззяннем зор
Уся адсвечвала краіна.

Удар у багнеты, маўклівы і знаны,
Без гуку, без крыку, без стрэлу,

Быў трапны нікім не чаканы,
І мала ўцякло ацалелых.

Атакай адною ўзялі Радзымін,
І выбіты вораг імкліва,
Чырвоных аддзел ні адзін
Не змог аказаць супраціву

**Радзымін - беларускае Барадзіно**

І вось Радзымін - іх апошні рубеж,
Апошняя ў жыцці застава,
Ты спакусай сябе больш не цеш,
Далей не адступіш, бо ззаду Варшава.

Як некалі ў Празе Ясінскі стаяў
І біўся за кожную пядзю,
Як ад куляў варожых упаў
На тым, на апошнім парадзе.

Як Корсак затым бараніў пражскі мост,
Мост падпаліў, і на пядзі зямлі
Трымалі ліцвіны апошні свой пост
І шыхтам адзіным на неба пайшлі.

А кола гісторыі круціцца зноў
І накруціла ім той Радзымін,
І накруціла пакуту і кроў,
І зноўку бароніць Варшаву ліцвін.

Заняты пазіцыі ў спешцы сяк-так,
І часу няма аглянуцца,
Бо вораг ачомаўся ўжо, і атак
Бясспынныя хвалі пачнуцца.

У цэнтры Віленскі, за ім Менскі полк,
І нашыя злева і справа,

Ды ведае вораг у бітве ўжо толк,
Відна ўжо ў біноклі Варшава.

Ён гасіць па цэнтры з усіх кулямётаў,
Грымяць навальніцай гарматы,
Лятаюць над полем платы і вароты,
Пылаюць стадолы і хаты.

І так пры пякельнай той працы
Месца жывое, мо, дзе ці пакінуў,
І вось пры чарговай атацы
Полк Віленскі паказвае спіну.

Ды тут падымаецца грознай сцяной
Менскі полк і атакай, што страху не знае,
Можа толькі адной штыкавой,
Зноўку тое мястэчка рашуча займае.

Зноў кананада, зноў масаю валяць,
Менскі полк Радзымін пакідае.
Нядоўгай чырвоным была з таго радасць,
Полк Гарадзенскі камдыў падымае.

І зноўку атака, і зноў адступленне,
Здалі Радзымін пяты раз,
Ды вядомае ўжо ўсім камдыва рашэнне,
І чакаюць палкі на свой час.

І час наступіў нечакана, знянацку,
Злева ў атаку пайшоў Жалігоўскі,
Наш генерал, і ваяка ён хвацкі,
Дзясятую кінуў наперад геройскі.

Выйшаў у тыл ён таму Радзыміну,
Вэрхал падняўся, нязнаны даўно,
І чатыры палкі проста ў тую хвіліну
Выцялі разам, усе заадно.

Іх подзвіг адзначыць прыпала нагода
І Віленскі полк, што вось тут паміраў,
Паўстанцкі штандар шэйсят трэцяга года
За храбрасць без краю тады атрымаў.

І свята палка там тады абвясцілі
Ў верасень месяц пятнаццаты дзень,
Каб у стагоддзях пра іх не забылі,
Каб не крануў хоць які-небудзь цень

* * *

Дзе ты, лернік з сівой барадою,
Дзе пясняр Беларускай зямлі?
Хто спяе, хто напіша пра тое,
Як ліцвіны ўміралі, ды перамаглі.

Нас у школе пра многае вельмі навучаць,
Пра бой Кулікоўскі, пра Барадзіно,
Ды Радзыміна ў тых песняў сугуччы
Яшчэ не чутно і яшчэ не відно.

Ніхто нам не спеў пра атакі ліхія,
Ніхто не згадаў, як блішчалі штыкі,
Ніхто сказаў пра імгненні святыя,
Як з малітвай ішлі пад нябёсы палкі.

Гарадзенскі, Віленскі, Наваградскі, Менскі,
Песень пра вас тут ніхто не пяе,
А вы на жыцця тым кароткім адрэзку
З гонарам неслі імёны свае.

Гарадзенскі, Віленскі, Наваградскі, Менскі,
Бой на шляху вашым быў не адзін,
І хай іх гісторыі хвалі ўжо знеслі,
Скалой непарушнай стаіць Радзымін.

І родзіцца колісь на нашых прасторах,
Пясняр, што спяе пра ваш велічны чын,
І падпяе наш народ тады хорам
Спеў пра забыты ў гадах Радзымін.

І колісь адгорне настаўніца ў школе
Старонку, дзе будзе абзац хоць адзін,
І ціха, рашуча, адважна прамовіць:
- Паслухайце, дзеці, пра наш Радзымін.

**IX**

А што другая, мо адпачывала
І папаўняла шэрагі свае,
Дзён некалькі ў запасе прастаяла,
Ды вораг жа спакою не дае.

На поўначы прарваўся цераз Віслу,
Як дзевяноста год назад было,
І небяспека з захаду навісла,
І ўсё, што жыва, тут у рух прыйшло.

Палкі і Ковенскі, і Лідскі
На поўнач кінуты былі
І праз марш зусім няблізкі
Пад Плоцкам аж у бой іх увялі.

І цяжка зноў ім давялося,
Ды толькі раптам грымнуў гром,
З-пад Вепжа наступленне пачалося,
І ўсё ў чырвоных рухнула на злом.

Пілсудскі выцяў моцнай сілай,
Якую здолелі таемна назбіраць
Тылы варшаўскае групоўкі разграмілі
І пачалі на ўсход іх гнаць.

І ахапіла паніка чырвоных,
Ніхто такога з іх бо не чакаў,
І засвяціла смерцю і палонам,
І хто, як мог, цяперака ўцякаў.

На поўначы ўвесь слаўны корпус Гая
Загналі за нямецкую мяжу.
Іх там нібы інтэрнавалі,
Ну, а па-праўдзе, далі адбегчы на Літву.

**X**

Свежыя палкі вялі змаганне
І гналі ворага з зямлі.
Прайшло і ў нас перагрупаванне,
Першую дывізію ў армію другую аддалі.

І з першаю дывізьяй легіёнаў
Быў створаны магутнейшы кулак.
І зноў чакаў іх бацька Нёман,
І быў на небе светлы знак.

Задача ў іх была, дай Бог,
На Ліду выйсці і дарогі перакрыць,
Бо хто б яшчэ задачу тую здзейсніць мог,
І хто б такое мог зрабіць?

А вораг зноў сабраўся з сілай
І пад Гародняй цвёрда стаў.
Сюды чырвоных многа адступіла,
І Тухачэўскі новы наступ рыхтаваў.

З паўдня нарэшце вырушыў Будзённы.
Чаго так доўга ён чакаў?
Ніхто не ведае па сёння,
Чаму раней не наступаў.

І быў разбіты, і пагналі
Яго адважныя палкі
І ўсім рашуча паказалі,
Хто быў які і стаў які

**XI**

Другая армія на левым фланзе наступала,
Шырокі занімаючы абшар,
І разам з гэтым рыхтавала
Магутны, дзёрзкі свой удар.

І дзве найлепшыя дывізы
Тут у гатоўнасці былі,
І патронаў, і правізы
З сабою на тры дні ўзялі.

А пад Гародняй бой грукоча,
Ніхто там горад не збіраецца здаваць,
Бо Тухачэўскі жа не хоча
Сваю паразу прызнаваць.

Рыхтуе зноўку наступленне,
І на Варшаву зноў паход,
Сюды падходзіць папаўненні,
І невядомы шчэ зыход.

І вось тады насуперак тэорыі
Дывізіі штандары паднялі
І па літоўскай тэрыторыі
У рэйд глыбокі свой пайшлі.

Перш кавалерыя рванулася імкліва
І ў Друскеніках узялі мост,
Літоўцам толькі прыгразілі,
І тыя паказалі хвост.

Услед ішлі легіянеры,
Ляжаў для іх маршрут такі:
Парэчча, Радунь, і з намерам,
Каб выйсці на Дуброўню, Шайбакі.

Літоўска-Беларуская ішла правей,
І ім цяжэйшы выпаў шлях,
Праціўнік там стаяў гусцей
І быў дасведчаны ў баях.

Палкі Наваградскі і Гарадзенскі
Адразу выйшлі на Азёры,
Ну а палкі Віленскі, Менскі -
На Васілішкі маршам скорым.

Адтуль на Скрыбаўцы, Паперню
Шашу адрэзаць і чыгункі каляю,
І іх з маршруту не адвернеш,
Прыйшлі на землю, на сваю.

Дывізіі яшчэ як наступалі,
Як свой выконывалі план,
Магчыма, толкам і не зналі,
Што атакуюць правы фланг

Вялізнай трэцяй арміі чырвоных,
Дзе Лазарэвіч камандарм,
І што трымала той хвалёны
Панаднёманскі плацдарм.

Пад Азёрамі палкі з баямі
Выходзілі самой Гародні ў тыл
І крок за крокам выбівалі
З чырвоных наступальны пыл.

І вось Гародня ўжо свабодна,
На ўсход чырвоных маса павалíла,

І два палкі з адвагай годнай
Ім тут дарогу заступілі.

Чаму паўсотні тысяч тых чырвоных
Ад меншых польскіх сілаў адступала?
Было снарадаў мала і патронаў,
Галоўнае, што духам падупалі.

“Даёш Варшаву!” - больш не актуальна,
Не бударажыць болей кроў,
Галодныя, раздзетыя, павальна
Імкнуліся, каб вырвацца дамоў.

Напішуць потым: “Вінаваты камісары,
Што выйшаў з войск рэвалюцыйны дух,
Што пра захоп Еўропы мары
Разлецеліся ў пыл і пух”.

**XII**

**“Крывавы бор”**

Палкі выходзяць пад Паперню,
Мажэйкава і Лебяду заняць,
Яны чырвоных тут адвернуць,
Каб шлях на Ліду пераняць.

Ды вось з палкоў тых толькі Менскі,
Што ў авангардзе тут ідзе.
І першы батальён з віленскіх
З падтрымкай іх не падвядзе.

Другі віленскі трохі ззаду,
А трэці ў Васілішках стаў,
Бо камандзір тады нападу
Па ўсёй той лініі чакаў.

І бой з абеду распачаўся,
Чырвоных многа тут было.
Масіў з Гародні прарываўся,
Дывізій некалькі ішло.

А Менскаму палку задача -
Іх каля Скрыбаўцаў спыніць
І, колькі будзе той удачы,
Пабіць, рассеяць, паланіць.

Ім адысці не даць на Ліду,
Сабрацца з сілай ім не даць,
Па гонях і лугах раскідаць,
Бязладна змусіць уцякаць.

У фланг адходзячым калонам
Тут з маршу выцяў Менскі полк,
Пайшлі ў атаку батальёны,
І быў з атакі значны толк.

Была дарога перакрыта,
Ды вораг масаю ішоў,
Полк Менскі быў з дарогі збіты,
Віленскі батальён прыйшоў.

Ізноў атака - зноў удача,
Ды наплывае новы вал.
І затрымаць іх - вось задача
Амаль нязможная, ды шал

Атак цяжкіх не заціхае,
Ідзе тут бой за кожны куст.
А вораг прэ і насядае,
І засцілае поле тут.

Жаўнеры зноў за пералескам
Ствараюць зладжаны ланцуг,

Ізноў атака, і на ўзлеску
Адно ўдаецца перавесці дух.

Другі віленскі падыходзіць,
Тут батальёнаў цэлых пяць,
А сонца плаўненька заходзіць,
І вельмі мала што відаць.

Страляць зусім не выпадае.
Халера ведае, куды.
А вораг зноўку насядае,
І выхад быў адзін тады.

Пайшлі ў багнеты батальёны,
Ну і прыклад пры сраве тут,
І толькі лаянка, праклёны
Суправаджаюць іх маршрут.

Ноч, як смала, вакол густая.
І б'ецца люта з ценем цень,
Хто перамог, ніхто не ўзнае.
Пакуль ізноў не прыйдзе дзень.

Бой той заціх адно пад ранне.
Затух, нібыта той касцёр,
Хто быў забіты, хто ад ранаў
На гэтым полі сам памёр.

Хто заблудзіўся ў бліжняй кнеі
І ўпаў ад стомы да відна,
І покуль зноў не развіднее,
Тут не адновіцца вайна.

І будзе мірна тут і ціха
Жывы ля мёртвага ляжаць,
Яшчэ хоць чуць, яшчэ хоць крыху.
Бо так не хочацца ўставаць.

Ды сонца неба асвятляе,
Прамень праслізнуў па зямлі.
І яснасць ціха наступае:
А мы ж, аднак, перамаглі.

Узніклі з цемры камандзіры,
А поле - зрок не адарваць.
І гімнасцёркі, і мундзіры
Суцэльнай масаю ляжаць.

Сям-там дзесь нехта варухнецца,
Дзесь знак паранены падасць,
Вось з лесу нехта валачэцца -
Свой ці чужы, дык не пазнаць.

І вось паціху ўваскрасае
Неперсаможны Менскі полк,
Хоць многіх-многіх не хапае,
Хоць жыцця спеў для многіх змоўк.

* * *

Палякі ўсё пасля перапісалі,
Паўстанак Скрыбаўцы ў радок не ўлез.
"Крывавым борам" бо назвалі.
Той сапраўды крывавы лес.

Чатыры сотні нашых засталося,
Чырвоных яшчэ болей там было,
Магілаў многа там капаць прыйшлося.
І пылам часу іх патрохі занясло.

Праз дзесяць год з магіл падаставалі
Сваіх-чужых, каго знайшлі,
І ў Феліксаве ўсіх іх пахавалі,
І зноў гады над імі паплылі.

Яшчэ праз шэсць дзясяткаў год,
Калі ўжо Беларусь паўстала,
Паставіў помнік тут народ,
Каб памяць зноўку не прапала.

А яшчэ гадоў праз трыццаць
Прыехала аж з Менска дура,
На тэлебачанні ў сталіцы
Нібыта важная фігура,

І над касцямі менскіх тых стральцоў
Скандал наладзіла, каб помнік знесці,
Не ведае ні яцяў, ні азоў,
А хоча пад начальства ўлезці.

Ды, Слава Богу, ёсць на Лідчыне народ,
Са свістам вылецела штучка,
Ні плён не атрымала, ні ўмалот
Паганая, нікчэмная мянчучка.

Стаіць пад Феліксавам помнік,
Ён на зямлі і ў памяці стаіць,
І покуль мы стральцоў тых помнім,
Датуль і Беларусі быць.

## XIII

Пакуль дывізія пасля цяжкіх баёў
Палкі па фронце субірала,
Тут Ліда - цэнтр усіх шляхоў,
Сама арэнай бітвы стала.

Прайшла па поўначы дывізья легіёнаў,
Дуброўню лёгка заняла
І сіламі імклівых батальёнаў
Аж з поўдня Ліду абышла.

Без намаганняў і баёў
Узяты Ёдкі, Шайбакі,
І ўжо каторы раз ізноў
Сам горад занялі палкі.

Заняць то занялі, ды не надоўга
Спакой і мір тут наступіў.
З Гародні ажыла дарога,
І вораг масай паваліў.

Не ўсіх прыняў Крывавы бор,
Прарвацца многія змаглі,
Сабралі з розных частак збор,
На Ліду проста ў лоб пайшлі.

Ды ўжо заняў тут абарону
Той польскі сорак першы полк,
Што ўдачай лёгкай акрылёны
Праз Ліду адчаканіў крок.

Што гэта полк стральцоў сувальскіх,
Пасля вядома будзе ўсім,
Ды трэба тут, хоць мала-мальскі
Нам праўду расказаць аб ім.

Бо быў той полк зусім не польскі,
Літоўска-беларускі быў.
Дзявяты, што ў баях геройскіх
Павагу да сябе здабыў.

Да Першае дывізьі легіёнаў
Ён быў далучаны ў баях,
І так вось выйшлася, што сёння
Яму праз Ліду пралажылі шлях.

Бой разгарэўся ля кашараў,
Агонь пайшоў па Слабадзе,

Запалымнелі ў ноч абшары,
І не схаваешся нідзе.

Пяцьдзясят шостая дывізія чырвоных,
І іншых частак шмат пры ёй,
Што ўноч праніклі праз заслоны,
Каб увязацца ў гэты бой.

Бой зацягнуўся аж да рання
І разгарэўся зноў удзень,
Зусім няроўнае змаганне
Сувальскі полк адзін вядзе.

І крок за крокам адступае,
І ўжо чыгунка за спіной,
І ўжо вакзал наледзь трымае,
Лёс чуе незайздросны свой.

Ды тут камдыў своечасова
Падмогу моцную паслаў.
Падняўся полк і сілай новай
За горад ворага пагнаў.

І ўсё, і трэцяй арміі чырвоных
Не стала больш, як не было,
Па паплавах, лясах і гонях
Няшмат тады іх уцякло.

Сувальскі полк на ўсход падаўся
Паход вызвольны прадаўжаць.
А Менскі, што ізноў сабраўся,
Застаўся Ліду прыкрываць.

А каб не сцёрся чын змагарскі,
І каб дагэтуль памяталі
У гонар тых стральцоў сувальскіх
У Лідзе вуліцу назвалі.

Ну а цяпер вось па Савецкай
Ідзе бадзёранькі мінак
І тым далёкім ліхалеццем
Не пераймаецца ніяк.

Нашто яму той полк Сувальскі.
Нашто дзядоў адважны чын?
Ён іншае зусім закваскі,
І ён даўно ўжо - не ліцвін.

**Паход на Вільню**

**XIV**

Палкі дывізіі Літоўска-Беларускай
Пад Лідаю сышліся ўрэшце ўсе.
На ўсходзе мір палоскай вузкай
Ледзь-ледзь, здаецца, праяснеў.

Ды што той мір, калі захапаў
Усю Віленшчыну чужак
І са зладзейскіх, прагных лапаў
Не хоча выпусціць ніяк.

Вось тут стаіць той полк Віленскі,
Паўстанчы што нясе штандар.
А там мяжа, і ходзіць нейкі
Зусім нязнаны гаспадар.

Ніхто не ведаў тут жмудзіна,
Хіба, мо, парабкам калі,
Аж, толькі вось прыйшла гадзіна -
На нашай панам стаў зямлі.

І залівала сэрцы крыўда,
І закіпаў у душах гнеў,

З ніякай іхняю Тарыбай,
Ніхто тут знацца не хацеў.

І не хацелі чуць казанняў,
Ніякіх не прымалі слоў,
Сам маршал нават пры жаданні
Не мог наведацца дамоў.

## XV

Дзясятая дывізья з Радзыміна
На поўдзень кінута была,
Ажно да самай Украіны
З баямі цяжкімі дайшла.

Камандаваў быў ёю Жалігоўскі,
Наш з-пад Ашмянаў генерал,
Яшчэ з Каўказа шлях геройскі
Ён з той дывізіяй пачаў.

І вось Будзёнаму насустрач
Палкі адважныя пайшлі
І моцнай сілаю рашучай
Саму конармію зняслі.

І гналі ўжо па Украіне,
Калі загад дастаўлен быў,
Камдыў дывізію каб кінуў
І ў стаўку тут жа каб прыбыў.

Размова ў стаўцы ў іх вялася
На роднай мове, на адной.
На новы ўзровень паднялася
Тут тэма роднай Вільні той.

Што аказалася ва ўладзе
Чужых, замурзаных паноў

І нікне ў цяжкім заняпадзе,
Дадому хоча зноў і зноў.

Сказаў Пілсудскі прама, проста:
- Я не магу вам загадаць,
Я звязаны дамоваў мноствам,
Я Вільню не магу чапаць.

Мне панавязвалі граніцы,
Якіх не можна перайсці,
І з гэтым мушу я мірыцца,
А трэба выйсце мне знайсці.

Пад Лідаю дывізія стаіць,
Літоўска-Беларуская на фармаванні,
Яна павінна аб'явіць
Пра выхад з падпарадкавання.

Яе адну ты павядзеш
Супроць аж цэлае дзяржавы,
Дай Бог, вам справіцца, сумець,
Ліцвінскую падвысіць славу.

А штаб дывізіі ўжо ў Воранаве быў,
І ў Эйшышках конны эскадрон.
Палкі дарожны атрасалі пыл,
І скрып гарматаў быў чуцён.

Пастаўлена задача Жалігоўскім,
І надта цяжкая яна,
Стамілася ў паходах войска,
І нібы скончана вайна.

Чарговы раз ісці ў паход.
Ісці насуперак ураду,
Але ж чакае іх народ,
Ну, а Варшава шые здраду.

Хіснуліся палякі зразу,
Статут не хочуць парушаць,
І якога тут адказу
Ад Жалігоўскага чакаць.

Адказ быў просты і рашучы:
- Усіх палякаў зняць з пасад.
І польскі конны полк адлучыць
І адправадзіць дзесь назад.

І трапіў тут камдыў Жандкоўскі,
Які адстояў Радзымін,
І быў адважны і геройскі,
Ды не здалеў законаў тын.

- Бо не ліцвін. - І Жалігоўскі
Камдыва тут жа адаслаў,
Бо для пачаткаў тых геройскіх
Ліцвінскі, цвёрды трэба сплаў.

Чатыры ўсе палкі паспелі.
І Касцялкоўскі ўланаў вёў,
І батарэю пушак мелі,
Старых, аж царскіх шчэ часоў.

Не меў пан Люцыян тут камісараў,
І слаўных агітатараў не меў,
А меў адну святую мару,
Бо адрадзіць Літву хацеў.

І час настаў, калі аўтарытэтам
Ён мусіў зрушыць тут усіх
І да адзінай слаўнай мэты
Павесці рыцараў сваіх.

Адной дывізіяй, адзінай
Вайну ён мусіў тут пачаць

І з еўрапейскаю краінай
У адзіночку ваяваць.

За Летувою ўся Антанта
І з Лігі Нацыяў чыны,
Ды толькі гэта акупанты,
Бо не ліцвіны ўсе яны.

Напаў на цэлую дзяржаву,
З адной дывізіяй напаў,
Пераступіў закон і права,
Бо за Айчыну ваяваў.

**XVI**

Мо, бачылі, як з пушчы дзе-калі
Зубры выходзяць на паляну,
Галовы ўгнуўшы да зямлі,
Пагляд кіпуча-палымяны.

Вось, як зубры ў свой бой апошні,
Пайшлі ліцвіны ў той паход,
Трымцелі пад нагамі пожні,
Дрыжаў над рэчкамі чарот.

Яны ішлі, і іх чакалі,
Як сёння, мо, чакаюць нас,
Яны ішлі, бо не праспалі,
Не прапусцілі слаўны час.

**"Маці Божая Вастрабрамская,**
**Дабраславі намеры нашы!"**

Дывізія пайшла на Яшуны,
А Касцялкоўскі на Сорак Татараў,
Амаль што без бою ўзяты яны,
Збываюцца светлыя мары.

І без бою ўзяты быў Рудамін,
І на Вільню дарога адкрыта.
І на родных палетках ліцвін
Бачыць рунь векавечнага жыта.

Чакалі, што будзе там бой не адзін
І Вільня нам дорага стане,
Ды толькі некалькі соцень жмудзін
Раззброілі самі вільняне.

І бою заміж тут прыём трыумфальны
Чакаў іх пад Востраю брамай,
Быў такі здзейснены чын эпахальны,
У нашай гісторыі самы-найсамы.

Віленскі полк горад свой пільнаваў.
Тры астатнія далей пайшлі,
Наезнік імкліва паўсюль уцякаў
З нашай адвечнай зямлі.

А фронт расшыраўся і цяжка было
Паўсюдна яго ўжо трымаць,
І тут вось нарэшце рашэнне прыйшло
Ў Вільню падмогу паслаць.

Ад бітва Варшаўскай засталіся там
Пабітыя моцна палкі -
Лідскі і Ковенскі - пэўна Бог сам
Накрэсліў ім лёс менавіта такі.

У Модліне тыя палкі ўжо стаялі,
Папоўніўшы збітыя роты свае,
Ды толькі нядоўга яны спачывалі.
Зноўку іх час баявы настае.

Каманда. Цягнік. І рашучы кідок
На Вільню. На ўзмогу сваім,

І чуе ўжо Вільня іх зладжаны крок.
І кветкі кідае пад ногі ўжо ім.

Адразу на фронт. Левы фланг занялі,
Наперад, далей наступаць,
Да Жмудзі самой упрытык падышлі
І меліся Коўню заняць.

* * *

А ў Вільні чужынцы ўсялякіх масцей,
Атланты пасланцы, Тарыбы шматкі,
І ў Жалігоўскага кожны хацеў
Спытацца: "А хто ты такі?

Як ты адважыўся проста адзін
Супраць аж цэлай Еўропы пайсці?"
- Я дадому прыйшоў, бо я ёсць ліцвін,
І іншых прычынаў тут вам не знайсці!

І выгнаў ён з Вільні замежных паслоў,
І з Лігі народаў чынушаў далоў.
Ён не з вайною, ён з мірам прыйшоў
У родны свой край. Досыць слоў.

Жалігоўскі хацеў той вялікай Літвы,
Што калісьці ў стагоддзях была,
Ад якой тут народ у жыцці ўжо адвык,
Ды якая яшчэ ва ўспамінах жыла.

Аж толькі жмудзіны не хочуць таго,
Супраць Антанта. Палякам няўцям,
Што выйдзецца з гэтага вось усяго,
І тады вырашае ён сам.

Ён абвясціў незалежнасць сваёй,
Хоць невялікай дзяржавы,

І законы сваe ён паставіў у ёй,
І стала тут людскае права.

І беларуская мова свая
На роўных паўсюль загучала,
І грудзі расправіла раптам зямля,
І вольныя песні ізноў заспявала.

І Тарашкевіч у момант вось той
Добры павеў улавіў,
І школ беларускіх тры сотні з ліхвой
Ён быў тут адразу адкрыў.

Фронт прыпыніўся і стаўся мяжой
Між Летувой і Сярэдняй Літвой.
Там Рыжскі мір зноў па волі чужой,
А тут краю куточак, ды свой.

І войска ён тут жа прыводзіць у лад,
З трох дывізій корпус фармуецца свой,
Конніцы трохі, і трохі гармат,
І ўсякай службы яшчэ тылавой.

А ў Варшаве ізноў нарастае скандал,
Як такое ліцвіны пасмелі ўчыніць,
Еўропай усёй паднялі гнеўны шал,
Каб гэты слаўны паход адмяніць.

І ціск на Пілсудскага страшны пайшоў
З боку прадажных да дна крыкуноў,
Ды маршал адказ ім рашучы знайшоў,
І быў гэткі змест яго слоў:

- Мне гэткая Польшча зусім без патрэбы,
І я тут за ўладу трымацца не стану,
Вось вам зямля, вось вам неба,
А я к Жалігоўскаму заўтра прыстану.

Мы будзем удвух родны край бараніць,
А тут няхай немец кіруе,
Бо добрае нельга для Польшчы рабіць,
Яна табе гэта павек не даруе.

І сцішыўся шум, і пра права забылі,
І як бы так трэба было,
Віленшчыну ў Польшчу ахвотна ўключылі,
І нейк усё далей пайшло.

А Польшча, як Польшча, там ладу няма,
Бо вельмі разумных зашмат там галоў,
Яе не чапай, дык яна і сама
Праз годзік-другі ўся разваліцца зноў.

Ды ёсць недзе ў нетрах яе
Дзевяць тых беларускіх палкоў.
І вось крызіс у Польшчы ізноў настае,
І пра іх там успомняць ізноў.

Ковенскі, Віленкі, Менскі
Слуцкі, Наваградскі і Беластоцкі,
Сувальскі, Лідскі і Гарадзенскі
Былі адзінай сілай моцнай.

Ім Бог паслаў чарговы чын
Змяніць гісторыі ўсёй ход.
Між лёсу гразкіх каляін
Вырульваў дваццаць шосты год...

## Эпілог

Жаўнер на пасту, карабін пры назе,
Час чарапахай маруднай паўзе
Адгрымелі баі, праляцелі гады,
А думкі ў яго, як даўней, як тады:

“Вось скончыцца служба - ён прыйдзе дамоў
У вёску сваю аж на сотню дымоў,
Аж на сотню старых і закураных хат,
Са стрэхаў тырчаць рэбры голыя лат.
Дзе маці старая, што кожнай вясной
На шчаўе чакае ў халупе сырой.
Зямелькі кавалак, а трэба нейк жыць,
Нават д'ябла не стала, каб душу залажыць....
Ён стаіць спамінае іх грозны паход,
Раз на раз наплывае той дваццаты іх год.
Што маглі, што змаглі для Айчыны яны,
Як усё захапілі чужыя чыны.
Ты бяспраўны, як быў, толькі нібы ўжо пан,
Толькі што не злажыў галаву на дзірван.
Зноўку мову тваю топчуць ботамі ў гразь
А ты ціха маўчы, не дай Бог, не вылазь.
Бо, як добранька ў косці табе надаюць,
Сам уцяміш тады, дзе твая Беларусь...

Жаўнер на пасту, карабін прыназе
Ды толькі сумненне яго не грызе,
Ён ведае цвёрда, што правільна жыў,
Што шчыра, аддана Радзіме служыў.
Нягодам ніякім яго не сагнуць
І не забраць у яго Беларусь.
Хай ходзяць панамі чужыя чыны,
Нічоганькі з намі не зробяць яны.
Хай цёмныя хмары з наўколля плывуць,
Грэе сэрца Літва, а душу Беларусь.

Жаўнер на пасту, ён адзін там за нас,
А тут пралятае віхураю час,
І мушу закончыць я песню сваю,
А людзі няхай неяк так падпяюць:

*"Бусел над палямі*
*Плаўненька крыліць,*

*Песня над палкамі*
*Гучная ляціць.*

*- Гэй, гэй, ліцвіны,*
*Гэй жа беларусы!*
*Блішчуць карабіны*
*Над палёў абрусам.*
*Блішчуць карабіны.*
*І шумяць штандары,*
*Здзейснім для краіны*
*Мы пра волю мары.*

*Бусел над палямі*
*Робіць разварот,*
*Дык, спявай жа з намі,*
*Слаўны наш народ.*

*- Гэй, гэй, ліцвіны,*
*Гэй жа беларусы!*
*Блішчуць карабіны*
*Над палёў абрусам.*
*Блішчуць карабіны.*
*І шумяць штандары,*
*Здзейснім для краіны*
*Мы пра волю мары".*

*Вільня - Ліда.*
*Лістапад 2024 г. - люты 2025 г.*



# Сяргей Чыгрын

*Нарадзіўся 24 верасня 1958 года на Слонімшчыне. Скончыў тэатральнае аддзяленне Магілёўскага культасветвучылішча і філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта.*

*Працаваў настаўнікам, журналістам, загадчыкам літаратурна-драматычнай часткі ДУК "Слонімскі драматычны тэатр". Жыве ў Слоніме.*

*Напісаў і выдаў больш за 100 гістарычна-краязнаўчых і літаратуразнаўчых кніг, зборнікаў вершаў і п'ес. Падрыхтаваў літаратурную спадчыну Янука Дарашкевіча, Тодара Лебяды, Анатоля Іверса, Самсона Пярловіча, Алеся Сучка, Кандрата Лейкі і многіх іншых літаратараў XX стагоддзя. Аўтар шматлікіх паштовак, буклетаў, плакатаў, прысвечаных гісторыі Беларусі.*

*Узнагароджаны ганаровым знакам Беларускага фонду культуры "Руплівцу. Стваральніку" (2023 г.). Лаўрэат Лідскай літаратурнай прэміі імя Веры Навіцкай (2022, 2024 гады)*

## Літаратурныя пародыі на паэтаў Лідчыны

### Вершы ад робата

*Будзе робат калісьці нам вершы пісаць…*
***Станіслаў Суднік.***

Такой сустрэчы не забуду -
Сам робат завітаў у Ліду,
Вязанку вершаў ён прынёс
Пра сена, вёску і авёс.
Ён напісаў нам пра калгас,
Як добра тут жывецца ў нас,

І напісаў ён пра чабор,
Пра Лідскі замак, холад зор,
Пра што ён толькі не пісаў,
А як пісаў - не расказаў.
І не прысеў да нас на лаву,
Аддаў радкі ён Станіславу,
Для Лідскіх ён аддаў муроў:
Друкуй радкі - і будзь здароў!

### Яйкі ад сялянкі

*Ізноў сялянку сцапалі гвардзейцы,*
*Ішла ў мястэчка яйкі прадаваць…*
***Станіслаў Суднік.***

Што трэба хлопцам ад сялянкі?
Вядома ж, трэба толькі яйкі.
Насмажаць хлопцы на патэльні -
І еш з блінамі, хоць ты трэсні.
І водар будзе на ўсю Ліду -
Сялянскіх яек не забуду.
Ды і сялянку прыгадаю,
Калі сваіх яек не маю.

### Калі ласка

*Кажыце менш чаго дурнога -*
*Часцей кажыце: "Калі ласка".*
***Кастусь Якубчык.***

Часцей кажыце: "Калі ласка!"
А менш "пажалуйста" кажыце,
Тады жыццё цудоўнай казкай -
Валошкай закрасуе ў жыце.
Тады дурноты знікне хваля,
Дурных паменее на свеце:

Паразумнеюць нашы Валі,
А разам з імі - Васі, Пеці…
Пяшчотай вас і мілай ласкай
Каханнем шчырым зачарую…
Часцей кажыце: "Калі ласка!",
А я вам вершы падарую.

## Коні ў жыце

*А конь чорны топча жыта…*
***Валера Мацулевіч.***

Конь чорны забег у жыта,
Сівенькі конь залез у ячмень.
Чырвоны конь - грымяць капыты -
У авёс зайшоў на цэлы дзень.
Пасуцца коні, бы на волі,
А волі коням не відаць…
Я крыкнуў ім: "А ну, даволі,
Людское збожжа вам таптаць!"
Ды коні слоў маіх не чуюць,
Ад крыку я ўжо занямог…
Усё паелі, патапталі,
А мне пакінулі гарох.

## Вершаваная аўтаручка

*Узлятаю з ложка, чысты ліст хапаю*
*І аўтаручкай верш вяжу, вяжу…*
***Уладзімір Васько.***

Вяжу я вершы аўтаручкай,
Алоўкам тку радкі свае,
І не чапае мяне ўнучка,
І ўнук мяне не пазнае.

Я вышываю ціха рыфмы,
Вяжу паэмы і санеты.
І не губляю нават рытмы,
І на хаду я ем катлеты…
Бо аўтаручка, як іголка, -
Калю, калю свае радкі.
І выбягаюць яны лоўка,
Нібы на кроснах ручнікі.
І навязаў я аўтаручкай
На ўсё жыццё сваіх радкоў.
Яны прыліплі, як ліпучка,
Таму вязаць яшчэ гатоў!

## Мурашнік

*Зямля - мурашнік.*
*Мы ўсе - мурашы…*
***Уладзімір Васько.***

Я стаў мурашкай,
Паўзу ў мурашнік.
Жывецца цяжка,
Дзе мой "калашнік"?
Стральну ў мурашнік -
Ой, не грашы!

Працую цяжка -
А дзе ж грашы?
Ратуй, мурашнік,
Я твой - мураш…
Наемся кашкі -
І ў сон-трэнаж.

## Галалёд

*Бяссонніца прыцягвае, як галалёд…*
***Кацярына Янчэўская.***

Мая бяссонніца - мой галалёд,
Паверце, людцы, не першы год.
Не першы год - адзін галалёд,
Хачу адлігі, каб спаць, як кот.

Няма адлігі, няма снягоў,
Мая бяссонніца без берагоў.
Мая бяссонніца - мой галалёд,
Туды іду - куды народ…
Настане, веру, крыгагод -
І буду спаць я цэлы год!

## Чарачка за чарачкай

*Раней куляў я чарак дзесяць,*
*А сёння выпіў дзве ўсяго…*
***Антон Піліпчык.***

Хачу сябры я вам прызнацца
Раней куляў я чарак дваццаць.
Каўбас для закусі купляў,
Было, што сорак я куляў.
І біў у грудзі я і кляўся,
І больш не піў, не напіваўся,
Калі аднойчы ажаніўся -
На дзесяці ўсяго спыніўся.
А сёння выпіў толькі дзве…
І паплыло ўсё ў галаве.

## Нёман і Гаўя

*Гады набрынялі, як цмокі…*
*Плавае цыклоп аднавокі…*
*З-пад карчоў павылазілі д'яблы…*
*Цяпер зусім невядома -*
*Дзе рэчанька Гаўя, дзе Нёман…*
***Данута Бічэль.***

Хацелі б мы ці не хацелі -
Маладыя гады праляцелі,

Як цмокі, цыклопы і д'яблы.
І час наступіў сасмяглы.
І рэдка пішуцца вершы,
І Нёман самотным стаў,
І хочацца выпіць хершы,
Ды п'ю валідол і фестал.
І сняцца цыклопы і цмокі,
Якія вяртаюцца зноў,
А час маладосці далёкі -
Вярнуць не хапае слоў.
І рух тады быў, і гоман,
І ў танцах кружылася я…
Была я нядаўна, як Нёман,
А стала сёння - Гаўя.

## Снягурка Станіслава

*Адкрый нам тайну, Дзед Мароз,*
*Дзе ж ты так доўга прападаў?*
*Ці гэта жарт або ўсур'ёз?*
*Сваю снягурку ты прадаў?*
***Станіслава Белагаловая.***

Прадаў Снягурку Дзед Мароз,
І ў пушчы Белавежскай знік.
Прадаў Снягурачку усур'ёз, -
На гэта меў ён свой разлік.
Навошта дзеду шчэ Снягурка,
Карміць, паіць яе штодня,
Ён сам не супраць пачастункаў,
Ласункаў просіць і радня.
Шчаслівы дзед на санях едзе,
Чырвоны нос здалёк відзён.
Яго вітаюць ў Лідзе дзеці,
А дзед таемны як шпіён.
- А дзе ж твая Снягурка, дзеду? -

Здалёк пытаюць яго ўсе.
- Яшчэ да вас, сябры, прыеду…
І барадою сам трасе:
- Прадаў Снягурку вельмі танна,
Ды і навошта яна вам?
У нас Снягурка - Станіслава -
Яе нікому не аддам.

## Тахтамыш і Гірэй

*Таптал́і яе Тахтамыш і Гірэй…*
***Ірэна Сліўко.***

Заехаў спачатку адзін Тахтамыш,
А потым за ім завітаў і Гірэй.
А я сядзела ў замку, як мыш,
Схаваўшы ў скляпеннях свіней і курэй.
Блукалі па замку Тахтамыш і Гірэй:
- Куды вы прапалі - вылазце хутчэй…
І свінні прыціхлі, і куры маўчаць,
Ніхто не жадае чужынцаў страчаць.
А сэрца ўсё б'ецца мацней і мацней,
Шкада мне стала курэй і свіней.
Я веру, не здрадзяць мне храма муры:
- Стары Тахтамыш, ты мяне забяры,
І ты забірай мяне, злосны Гірэй,
Прашу не чапай толькі кур і свіней.

## Нічыя

*Ты нічый, і я нічыя…*
***Ірына Багдановіч.***

Я зусім цяпер нічыя,
Бо і ты зусім нічый,

Я спыталася ў ручая:
- Ці патрэбна табе нічыя?

Адказаў мне вясёлы ручай:
- Нічыя - гэта толькі адчай…
Ну, і ты без мяне нічый,
Ну, і я без цябе нічыя.
Ах, як добра, што гэта я -
Не твая, не твая, нічыя.

Я спытала ў салаўя:
- Ці патрэбна табе нічыя?
Ад здзіўлення мой салавей
Паляцеў далей ад людзей…
І чаму я цяпер нічыя
Заблудзілася ў цёмных гаях?..

## Мой Квазімода

*І на тваім плячы сустрэць зару,*
*Мой Квазімода.*
***Ірына Багдановіч.***

Старэю з табой год за годам,
Са мною старэеш і ты.
О, мой дарагі Квазімода!
Ты мае не збярог гады.
Была я прыгожай і мілай,
Сядзела з табою ў кафэ.
А ты выпіваў "чарніла",
Хадзіў у старым галіфэ.
Я ружай квітнела заўсёды,
І самай шчаслівай была.

О, мой дарагі Квазімода,
Так добра калісьці жыла.
Зару сустракала з табою,
Ляжала ў цябе на плячы…
А сёння я стала старою,
І болей мы толькі маўчым.
Узяла ў палон адзінота,
І нейкая горыч штодня…
О, мой дарагі Квазімода!
О, твая дарагая я!

## Вусны-вуголле

*Да тваіх грудзей прыпала я.*
*Апаліў ты вусны пацалункам.*
*Быццам бы здалёк і спакваля,*
*У мяне шукаў ты паратунку.*
***Людміла Краснадубская.***

Не шукаю болей паратунку -
Апаліў ты вусны пацалункам.
І яны гарэлі, як вуголле,
Ды было прыемна, як ніколі.

Мне з табою проста асалода,
Ты палі так вусны мне заўсёды,
Ноччу іх палі і ціхім ранкам -
Я твая, каханы мой, каханка,
Каб гарэлі вусны, як вуголле,
Не тушы, прашу цябе, ніколі.

## Натхненне

*А муза нешта не пяе*
*І не стаіць натхненне ззаду…*
*Жыццё сваё дарэмна траціш*
*У чаканні новых панядзелкаў…*
***Вольга Ашмяна-Бічэль.***

Няма натхнення ззаду
І спераду няма.
Хачу пісаць баладу,
А на душы - зіма.
Паддай нахнення ззаду
І спераду паддай…

Тады я буду рада,
І траплю ў творчы рай.
І муза салавейкам
Парадуе штодня.
Пісаць па панядзелках
Заўсёды буду я.

# П Е Р А К Л А Д Ы



# *Алена Несцерава*

*Алена Мікалаеўна Несцерава нарадзілася 20 кастрычніка 1957 года ў горадзе Севераморску Мурманскай вобласці. Дзяцінства і школьныя гады прайшлі ў горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці. У 1981 годзе закончыла Ленінградскі інстытут дакладнай механікі і оптыкі, і была накіравана на працу на завод "Оптык" у беларускі горад Ліда Гараодзенскай вобласці, дзе працавала да 2014 года.*

*Вершы піша з красавіка 2023 года. Удзельнічала ў двух міжнародных паэтычных конкурсах: "О, сколько силы в русской речи" да дня нараджэння А.С. Пушкіна і "Мемориал Терехова-2023" (Ніжні Ноўгарад).*

*Вершы друкаваліся ў часопісах "Метамарфозы" і "Свет жывёл" (г. Гомель), у "Лідскай газеце", а таксама гучалі ў эфіры міжнароднага радыё "Краіна талентаў" у аўтарскай праграме Зоі Кулік "Вас вітае Беларусь" (г. Нясвіж).*

*З'яўляецца сябрам літаратурных аб'яднанняў горада Ліды.*

*Жыве ў горадзе Лідзе.*

*У 2024 годзе выйшла першая кніга аўтара "Особое изделие - стихи".*

## **Сем вякоў**

Сем вякоў над Лідай дождж ідзе,
Сем вякоў тут дні змяняюць ночы,
Гром грыміць, маланка слепіць вочы,
Сем вякоў тут сонейка ўстае.

Сем стагоддзяў праплылі, як сон.
Гарадскія жыхары другія.

На дарогах - скрозь аўтамабілі,
А ў руках - мабільны тэлефон.

І, забыўшы князя Казіміра,
Тых часоў піцейныя дамы,
На банкет нас запрашае шчыра
Рэстаран пад назвай "Гедымін".

Слабаду пабачыш, скажаш: "Ах!".
Паглынае горад вёскі ціха.
Княжы замак сцёр адбіткі ліха.
Каля рынку вырас храма гмах.

Ля касцёла помнік ёсць Скарыну.
Там - Курган, пілоны ў вышыні,
А ля замка ў гонар Гедыміна -
Вартавы ў даспехах на кані.

Дзесьці за аблокамі-дымкамі
Горада гісторыя бяжыць.
За сямю замкамі, за вякамі,
Слаўны лідскі летапіс ляжыць.

Ды гадоў заслону прыўздымаючы,
Мы пабачым ў чарадзе вякоў,
Як устояў, беды адбіваючы,
Адзін са слынных старажытных гарадоў.

*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*

## Князь і мужык

Дзень народзінаў мае свой горад.
Ён - выток, а стагоддзі - рака.
Я пра Ліду пачну свой аповед,
З беднай хаты, з жытла мужыка.

Па ўспамінах, былі тут балоты,
Рэчка ў край заліла берагі.
Тут сяліцца не вельмі ахвота,
Але ж вораг не знойдзе ліхі.

І калі ўжо мужык паабжыўся
Сярод Богам забытых мясцін,
На кані князь у латах з'явіўся,
Загадаў на нараду прыйсці.

"Ты збудуеш тут замка палаты,
Роў, дзве вежы, цвярдыню муроў.
Як заведзена ў княжацкай шляхты,
Для банкетаў і для ваяроў".

Жыў народ у часіны-віхуры,
Хто ў хацінцы, хто ў замку абвык,
Залажылі ў стагоддзі падмурак
Князь і той безадмоўны мужык.

Горад рос і квітнеў не адразу.
Замак - мост, а стагоддзі - рака.
Мы аддзячылі помнікам князю
І не ўспомнілі пра мужыка.

Горад свой беражэм, абнаўляем.
Лёс яго незайздросны ў вяках.
У гонар князя бульвар называем,
А як звалі таго мужыка?

*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*

## Беларускаму паэту

Падпішыце мне кнігу, прашу!
Пра яе я нядаўна пачула.
Мець аўтограф рашуча хачу
Я ад паэта, што гоіць душу.

Напішыце сваё мне зычэнне,
Каб я, з лёгкае вашай рукі,
Палюбіла чытаць з захапленнем
Беларускіх паэтаў радкі.

Пажадайце пачуць мілагучнасць
Мовы той, што кранае душу,
Слоў гармонію, рыфмы сугучнасць.
Падпішыце мне кнігу, прашу!
*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*

**...Гімн жыццю ўнутры сябе насіць!**

Быццам не пішу, а ўспамінаю,
Быццам бы жывуць радкі ўнутры…
Дзе яны гняздзяцца, дзе лунаюць,
Тояцца глыбока да пары?

З'явіцца непрошаны радочак,
Словы загучаць наперабой,
А затым пакоціцца "клубочак",
Нібы запрашае за сабой.

Следам пабягу я, на здзіўленне,
(Тут натхненне з музай не пры чым),
Каб пабачыць новых слоў зіхценне
І чароўны свет адкрыць у ім.

З радасцю шыбую, без затрымак,
Нібы ўся - напятая струна,
Каб знайсці напрамак слоў-сцяжынак,
Наталіцца рыфмамі спаўна.

Вобразы ў хвалюючым палёце
Каб змагчы, убачыўшы, ўзнавіць.
З асалодай на высокай ноце
Гімн жыццю ўнутры сябе насіць!
*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*

## Гарадскія ластаўкі

Пакрылі неба аблачынкі ўранні
І, ля зямлі здзяйсняючы палёт,
Лунаюць ластаўкі крутымі віражамі,
Мільгае чорных крылаў вастрыё.

У рухах сэнс таемны і узнёслы,
Калі імчаць стрыжамі стрымгалоў.
Іх гнёзды не пад стрэхамі на вёсцы,
А ў лоджыях вялізазных дамоў.

Не кліча іх прастор палёў, палянаў
І без патрэбы водаў бляск рачных.
Паветра плыні між муроў цагляных
Ілюзіяй свабоды вабяць іх.

Стоп-кадр не затрымае вокамгненне -
Іх "вензель" бы прыдумаў чараўнік.
І белы веер хваставога апярэння
Нібы з краіны казачнай узнік.

Ды назірае клён за імі ў задуменні.
Як ноты п'ес яны сядзяць на правадах.
Прыносяць ластаўкі шчаслівыя імгненні
Падчас палёту ў гарадскіх дварах.

*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*

## Гайда сябраваць радкамі!

Гайда сябраваць радкамі
І рыфмы ад сэрца дарыць!
Тады прамільгне, праляціць паміж намі
Прызнання нябачная ніць.

Паэту паэт усміхнецца,
І рэўнасць патухне, павер!
Вось-вось прыадчыніць, як вязень у клетцы,
Нябачныя дзверцы давер!

Галубка страфы красамоўнай
Спагаду з сабой прынясе.
І радасцю кожнае сэрца напоўніць
Нябачны палёт пакрысе.

*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*

## Рыбка залатая

Пушкінская рыбка сярод хваляў
Плаўнікам махнула залатым.
Валадарка паплыла марская
Вырашаць, што будзе са старым.

У глыбі марской, марской краіне,
З вогненнай луской яна жыве.
Ведае: няшчаснаму "дурніле"
Скарбаў не патрэбна для сябе.

І не вельмі ясна для старога,
Што прад шчодрай рыбкай б'е чалом:
Атрымай бабуля перамогу -
То не будзе месца для яго.

Слепа любіць дзед сваю кабету,
Хоць паспеў з ёй ліха паспытаць.
Зноў прыйшлі к разбітаму карыту -
Рыбка знала, як уратаваць!

*(Пераклад Валеры Мацулевіча.)*



# Смарагд Сліўко

*Смарагд Фёдаравіч Сліўко нарадзіўся ў 1931 г. у г. Яраслаўлі, у сям'і акцёра і паэта. З 1946 г. жыў у Беларусі. Пасля заканчэння Гарадзенскага педагагічнага інстытута з 1961 па 1966 г. працаваў настаўнікам гісторыі, рускай мовы і літаратуры ў Астравецкай СШ, куды прыехаў па запрашэнні другога сакратара Астравецкага РК КПБ С. Ц. Кабяка. Затым лёс звязаў яго з Лідчынай.*

*З 23 гадоў займаўся рэжысурай, канцэртнай дзейнасцю - са школьных гадоў. Пісаў сцэнарыі і музыку. Вершы пачаў пісаць з 7 гадоў. Друкаваўся ў многіх часопісах, газетах. Член літаратурнага аб'яднання "Суквецце" з 1969 г. Аўтар чатырох зборнікаў паэзіі, прозы і гумару. Памёр у 2006 годзе.*

*Ужо некалькі гадоў яго творы друкуюцца ў электронным літаратурным часопісе "Русская Балтика" ў Літве.*

**Не трэба нам межаў!**

З Украіны ў свой край Беларусі
Хоць як, але ўсё ж дабяруся.
Там мае сёстры, іх дзеці і брат.
Патрэбны цяпер нам памежны мандат!

Я - беларуска, мой мілы - хахол.
Але ў Беларусі мяне ён знайшоў.
Любімую жонку і з цягам гадоў
Унукаў сваіх і верных сяброў.

Атрымалася ў нас вялікая сям'я.
Дзе будзе мой муж, там з ім буду я.
І ўсе нашы дзеці, сваты, іх радня,
І ў дружнай сям'і ўдоваль цяпла.

А дзеці і ўнукі, як мама і тата.
Гляджу я бясконца і нават заўзята.
Хоць п'ем мы ваду з крыніцы адзінай,
Ды мытня-мяжа раптам нас раздзяліла.

Стаю ля шлагбаўма, плачу, гляджу,
Дзяцей ад бацькоў, а таксама радню.
Чаму аддзялілі, зрабілі нам ласку?
У гэтай падзеі бачу я пастку.

Падумайце, людзі, прыкіньце вачыма!
Мяжою любоў раздзяліць немагчыма.
Бязмежна любоў, яна як вясна.
І радуе ўсіх без разбора яна.
*2006 г.* *Пераклад І. Сліўко.*

**Пагавары са мной**

Пагавары са мною з ласкай,
Сягоння забудзь пра другіх.
Я чуткі і добры, як казка.
Нямнога ты знойдзеш такіх.

Я жартам цябе ўзвесялю,
Скажу, як цябе я люблю.
Хмурны дзень я зраблю табе радасным
Пацалункам твой сум праганю.

Пабудзь са мной ласкава-ласкавай -
Ціхі ветрык так лашчыць траву.
Я добры, пяшчотны, як казка,
Не ў казцы, а наяву.

*Пераклад І. Сліўко.*

## Звіняць званы

Ідуць у дол сябры.
Ідуць паадзіночцы.
Адзін я да пары
Яшчэ не ў той сарочцы.

Звіняць, звіняць званы
І то адно ў нядзелю.
Каму пяюць яны?
І дзе маё вяселле?

Цалую свежы крыж
Над новаю магілай.
Ты ўжо навечна спіш,
А мне шчэ трэба сілы.

Хоць цяжка паміраць,
А жыць цяжэй жывому.
І дзе Айчыну ўзяць,
Калі не маеш дому…

Нясу я свой паклон
Паўз змроку берагі.
І з болем бачу сон
Пра тых, хто дарагі.

*Пераклад С. Судніка.*

## Гумарынкі

***

Ля дома дуб стаіць, як слуп.
У яго ўрэзаўся мой зуб.
Стаю і думаю без зуба:
- Зламаў, напэўна, сук у дуба.

***

У двары раслі два дубы
Каля доміка, ля клуба.
І ад культработы клуба
Абодва дубы далі дуба.

***

Ёй Бог на памяць падарыў
Талію і губы.
Але ён зусім забыўся,
Што за губамі зубы.

***

Выбіў я апошні зуб.
І віноўны ў гэтым дуб.

***

Паэт, настаўнік і артыст
Адбыў ад нас, як з лазні ліст.

***

Не ўсё сказаў ваш сябр-
паэт,
Але ў жыцці пакінуў след.

***

Ён адной рукою гладзіць,
А другой у кішэні лазіць.

***

Хочаш дацягнуць да пенсіі -
Жыві, мой мілы,
без прэтэнзіі.

***

Даруйце, што сёння
гавару вам "Вы",
Бо ўчора быў без галавы.

***

З усякіх розных прэпаратаў
Усяго важнейшы
"Мазгулятар"

***

Я вас любіў,
а вы не даглядзелі,
І я ляжу… у другой пасцелі.

***

Сёння дзеду памагаў:
Я глядзеў - ён маляваў.

***

Цану дарогі
Ведаюць ногі.

***

Я заўсёды спяшаўся
да цябе,
Як шампанскае ў крышталі.

***

Я вас любіў і добраю, і злою.
Цяпер Гасподзь пазнае,
што такое.

***

Як пачне піць, да зор ляціць.
А як напіўся,
дзе прызямліўся?

***

Мне напляваць, які там "ізм".
Мне вельмі добры быў
і камунізм.

*Пераклад І. Сліўко.*



# *Алесь Хітрун*

*Алесь Часлававіч Хітрун нарадзіўся 17 жніўня 1982 года ў вёсцы Крупава Лідскага раёна. Скончыў Крупаўскую сярэднюю школу (9 класаў), скончыў Лідскае ПТВ-196 (майстар сельгаспрадпрыемства), музычную школу (клас баяна), завочна - філалагічны факультэт Гарадзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (выкладчык беларускай мовы і літаратуры). Працуе ў Лідскім гістарычна-мастацкім музеі навуковым супрацоўнікам літаратурнага аддзела. З'яўляўся кіраўніком літаратурнага аб'яднання "Суквецце" пры рэдакцыі "Лідскай газеты" (са студзеня 2012 па люты 2019). Друкаваўся ў розных перыядычных выданнях*

*Піша вершы, апавяданні, гумар, перакладае вершы на беларускую мову, займаецца краязнаўствам, даследуе фальклор.*

## Вершы ў вольным перакладзе з рускай мовы

## *Пераклады вершаў лідскіх паэтаў*

***Віктар Бачароў***

### Сябрам

Дзякуй вам, што вы прыйшлі,
Сябры, сяброўкі!
Прысядзьце тут, у святой цішы,
Ды ў свае конаўкі
Наліце кожны грам па сто,
Заешце хлебам.

Узгорак магільны - не стол
Пад куплам неба.
Але ж прыйшлі... Я рады вам, -
Вас дзень чакае.
А мой партрэт, што сярод брам
Тут пазірае.
Не я адзін ужо такі,
Мінулым вее:
Адзін партрэт, за ім другі,
Як галерэя.
А вы прыйшлі. Я рады вам,
Мае сябры,
Бо пару год назад я сам
Стаяў тады.
І іншых так жа памінаў,
І ўсё я каяўся...
Цяпер і сам яе спазнаў.
Вас дачакаюся…
*30.01.2005 г.*

## Гады ты помніш...

*Міхасю Мельніку*

Гады ты помніш залатыя?
Яны шумелі, як прыбой...
Што зваць іх будуць ўжо "застоем"
Мы шчэ не ведалі з табой.

Ды яны і не стаялі,
Яны круцілі ў віхры нас,
Каханнем сэрцы напаўнялі,
Душу цягнулі на Парнас.

І сіл хапала, і памкненняў;
Было нам ўсё тады з рукі,

Бо кожны верыў, што ён геній,
Што моцныя яго радкі,

Што і пад зоркай будзе вечна,
Што будзе маладым і мілым...
Прайшлі гады ўжо. Мой паплечнік,
Лічыць іх не хапае сілы.

Усе гады мы да знямогі
Нага ў нагу ішлі з табой.
Бо ты і я - мы педагогі.
І гэта - пастаянны бой...

Хоць змены ў лёсе йдуць не блага,
Будуюць дзеці ўжо масты,
Але не знікла ў жыцці смага,
Заўжды ў адказе - я і ты...

А новы час нам ні шыша
Зноў не прынёс, ці ў першы раз?
Ды, як раней, вядзе душа
На паэтычны наш Парнас.
*26.06.2001 г.*

## Я раўную цябе...

Я раўную цябе толькі к смерці:
Тая возьме, назад не аддасць...
А мне хочацца вельмі, павер, ты,
Горыч каб не даткнулася нас...
Каб адчулася сонца ў далоні,
Я тваю паціскаю далонь.
Як змагчы хоць бы кропельку болі
Ад цябе мне забраць у свой боль?...
*07.05.2001 г.*

## Стары горад

Стары горад дрымотны,
Толькі мы не адны:
Вецер гоніць лістоту,
Затушыў ліхтары.

Ноч ідзе па заплеччы,
І ў нямой цішыні
Дзесьці плача малеча,
Нешта хлопча сасніў.

Вось прабег чорны кот
І бядоту забраў.
Дожджык грае без нот
На вяршынях дубраў.

Начны свет бліскануў
І прапаў у аблоках.
Стары горад заснуў, -
Не міргнем і мы вокам...
*05.05.2001 г.*

## На мушку смерць...

На мушку смерць мяне ўзяла,
Стуліўшы на курку свой палец.
Нібыта ў дрэва лісцік адняла
І да зямлі трымае танец.
Колькі танцу доўжыцца, не знаю,
І калі зямліца прыгарне?
А ўсё ж лістком я крыху палятаю,
Вецер, мне здаецца, за мяне...
*22.09.2005 г.*

## Я пакуль не ліст…

Я пакуль не ліст сарваны,
Шлях яму - ляцець, стамляцца.
Гляджу на ўсход - я так загнаны,
Дзе сонцу падымацца…
Наперадзе яшчэ ёсць вёсны,
Лунаюць буслы ў высі,
Крылом з травы збіваюць росы,
Дзе сонца ў паднябессі…
Яшчэ кахаць я там змагу,
Змагу там спадабацца,

Чуццё я гэта зберагу,
Дзе сонцу падымацца.
Жыцця драбніцы там збяру,
Ні ў чым не буду каяцца,
Калі навекі я замру,
Дзе сонца падымаецца.
*23.09.2005 г.*

### На сустрэчу к Богу...

На сустрэчу к Богу не спяшаюцца,
Час у час прыходзяць да яго.
Толькі тэрмін тых сустрэч вагаецца,
Як памеры рэк між берагоў.

Адзін бераг той - жыццёвы бераг,
А другі, дзе век адпачываць.
І няхай нястача сілы ў нервах -
На другі не думай ты ступаць.

Тут яшчэ пачуеш ты дыханне
Той, чый любы воку кожны крок,
Парасткаў вясенніх набуханне,
Раніцай народжаны радок.

Можа здарыцца, што і ты спаткнешся
На нялёгкім бегу па жыцці...
Добра тое, што яшчэ прачнешся,
Покуль на той бераг не пачаў плысці...
*20.07.2003 г.*

### Кропкі над "і"

Прыйшоў той час над "і" паставіць кропкі.
Ты ўсё бяжыш, ды можаш шчэ прыбавіць кроку,

Гэты забег, дарэчы, стаў не мой,
Як я ні біўся, адзін толькі боль.
Кажуць, пражыць - не прайсці цераз поле,
У кожнага ёсць і сцяжынка, і доля.
Нашы сцяжыны нас не злучылі,
Не доўга мы разам тут і пражылі.
Над "і" кропкі паставіць час падышоў,
Думкі ўсё гінуць ізноў ды ізноў.
Не хачу я жадаць ні грама бяды.
Шкада, што каханне ўносяць гады.
Няхай холад душу тваю не студзіць,
Хай нас з табою люд ужо не судзіць,
Дай Бог, каб шчасце цябе адшукала,
Жыццё каб не біла, а толькі люляла.
Кропкі над "і", кропкі над "і"...
Побач з табою мы быць не змаглі.
І кожны разрыўны радок у жыцці,
Як наш лёс шматкропны. Кропкі над "і"...
*20.07.2003 г.*

## У зале рад жыццёвы...

У зале рад жыццёвы выбраў я не лепшы:
З месцам дрэнь. Сябры - удвая...
Хтосьці да мяне квіток узяў быў першым:
У цэнтры цяпер ён, а збоку - я.

Ён фартуну ўтаймаваў наскокам,
Не ўсе ў каханні б так змаглі.
Што наракаць, бо я ўжо збоку,
Як у кастры патухлыя вуглі.

Ён у паэзіі ўзляцеў высока,
Кожнага хацеўшы пераймаць.
Што наракаць, бо я ўжо збоку,
Мне - рыфмаваць, жанчыне - нараджаць...

У жыццё нырнуў ён з берага глыбока,
Пасярод магіл пашанна касцьмі злёг.
Што наракаць, бо я ўжо збоку,
Туліцца зямля і да маіх ног...

Так жыццё праходзіць аднабока
Без яскравых нейкіх перамен.
Што наракаць, бо я ўжо збоку.
З цэнтрам не прадбачыцца абмен.
*24.09.2005 г.*

***Смарагд Сліўко***

**Да чытачоў**

У час вяселля ці маркоціцы,
Ці пад сардэчны гармідар
Раптоўна мо каму захочацца
Спазнаць мой вершаваны дар.

Хоць не дрыгва і не крыніца -
Звычайны, просты ручаёк…
Мо хто захоча наталіцца
Назваць гаючым той глыток.
*09.03.2007 г.*

**У абарону сябе любімага**

Ізноў, люстэрка, кажаш: "Горш!"
Ну, дзе ты ўбачыла маршчыны?
Усё гэта мне жыццёвы нож
Збаранаваў мае раўніны.

Я не сівы, а золкім прамянём
Пабелены, бярозавай карой.
Не мыліца, а праўда пад плячом, -
Дарэмна каб не клыпаць мне парой.

Ты глянь: такіх, як я, павер мне,
Ты і не бачыла раней.
Пяшчота я, тварэц таемны,
Уздых я мары, дабрыня надзей.

Ува мне аркестр з радасці і слёз,
Я - дырыжор, каб ім лепш кіравацца.
Ува мне Бізэ, Чайкоўскі, Берліёз,
Каб у Смарагдзе рэхам аддавацца.

Люстэрка, хлусіш ты, дурнота!
Я ж - Апалон! І моцай з Геркулеса.
Я - сонца, дождж, віхор, спякота
І незакончаная п'еса.
*09. 03.2007 г.*

## Калі ласка, дай!

Ну, дай мне хоць пару глыткоў
Паветра-крынічнай плыні -
Я стану адным з багоў,
Каб дыхаць табой без спыну.

І неба няхай ужо з пагрозамі,
Навальніца маланкаю блішча.
Там, дзе пахне цыбуля мімозамі,
Падыму я цябе на гарышча.

Ты толькі скажы, паглядзі
У мае закаханыя вочы!
Са мной ты адзін на адзін
Усім мы астатнім не збочым.

Дай паху мне пару глыткоў
Ад цела твайго прамяністага -
Замест сваіх вершаў гатоў
Чытаць яго, Дзева Прачыстая.

Глянь на пейзаж… і ўверх:
Няма тут ні кропелькі лішняга!
Узняліся на самы паверх,
Бліжэй да яго, Усявышняга.

Толькі дай, калі ласка, мне дай
Хоць імгненне схавана марозамі.
Я сагрэю… Ну хіба не рай
Там, дзе пахне цыбуля мімозамі?
*09. 03. 2007 г.*

## Бывайце

Мілыя, бывайце,
Не пацалую вас.
Я адлятаю чайкай.
Куды? У іконастас.

А можа быць, наверх,
Туды, дзе побач Бог.
Дзе з-пад нябесных стрэх
Спазнаю, што не змог.

І буду спадзявацца
Што хтосьці за мяне
Пачне так увіхацца
Як выпадала й мне.

Любімыя, жывіце.
Душа ў вас толькі рвецца
Для радасных адкрыццяў,
А для сябе - у сэрцы.

Я воблакі ў нябессі
Паварушу ўрачыста.
Заўсёды з вамі, уверсе
Я з сонцам прамяністым.
*09. 03. 2007 г.*

***Іаган Вальфгант Гётэ***
*(нямецкі паэт эпохі Адраджэння,*
*пераклад з рускай мовы)*

## Спатканне і ростань

Душа ў агні, адныя болі,
У сядло б - і на прасцяг!

Пяшчотна вечар плыў над полем,
Ды ноч трымалася ў гарах.

Стаяў адзеты ў чорнай чары,
Вялізны дуб: ён нас сустрэў;
А цемра, легшы на абшары,
Вачмі зірнула нібы ў гнеў.

І месяц вобразна павісшы,
Святло маркотна ў хмарах ліў;
Крылаты вецер смутна свішча,
Са злосным шоргатам паплыў.

Натоўп пачвар з вачыма ночы,
Гучаў спеў сэрца, нёсся конь,
Жыццё маё кудысьці хоча,
Ува мне палаў цуда-агонь!

У марах ты маіх кружыла,
Гарэў твой позірк, як зара,
Што ўся душа к табе імкліва,
Уздых, ляцела, як страла.

І вось канец тут падарожжу,
І ты, прыбрана па-вясне.
Ізноў са мной! Са мной! О, Божа!
На райскай, я тут, на зямлі!

Але ўсё ж, з пачаткам ранку,
Патухлі рысы, погляд твой.
Мая любоў ты, цалаванка,
А як глядзела ты з журбой!

Душа мая: ёй зноў крычаць,
І ты адна цяпер, як ранне…
А шчасце - гэта ўсё ж, кахаць!
А асалода - быць каханым!
*25.01.2009 г.*

## *Пераклады вершаў класікаў рускай літаратуры*

***Іван Крылоў***

### Воўк і ягня

У моцнага заўжды слабы віноўны.
Аб гэтым у народзе часта чуем,
Яшчэ архіў такіх гісторый поўны
Ды ўсё ж аб гэтым не друкуем.
А вось, як тут, у байках кажуць.
Ягня ў цёплы дзень прыйшло ў ручай напіцца,
І трэба ж так было бядзе зрабіцца,
Што каля тых мясцін галодны шнырыў Воўк.
Ахвяру бачыць той і да Ягняці мкнецца,
Ды справе трэба ж даць законны від і толк.
Крычыць:
- Як змог, нахабнік, бруднай мордай
Ты чыстае муціць пітво маё
З пяском і з глеем, брудам?
Не быць жа грубасці такой,
Быць галаве тваёй далоў.
- Калі, Святлейшы Воўк, прабачыць,
Асмелюся я данясці, што ўніз па ручаю
Ад Светласці яго, я крокаў на сто п'ю.
І гнеў ягоны тут дарэмны, значыць:
Пітва муціць яму ніяк я не магу.
- Па-твойму, кажаш, я маню!
Нягоднік! Такая грубасць ці чутна са светам!
Так, памятаю, ты яшчэ тым летам
Мне тут жа неяк нагрубіў.
Я гэтага, сябрук мой, не забыў.
- Ты пашкадуй, не маю я і года, -
Ягня яму.
- Дык гэта быў твой брат. -
- Няма братоў у мяне.
- Дык гэта кум, ці сват,

І словам, хтосьці з вашага жа роду.
Вы самі, вашы псіны, вашы пастухі,
Ды ўсе, наогул, мне бяды жадаеце,
І па мажлівасці ўсім аб гэтым раіце.
Табой за іх я разлічу грахі.
- Правінны чым?
- Маўчы! Стаміўся слухаць
У вольны час, перабіраць віны твае, шчаня.
Віновен ты і тым, што есці хачу я.
Сказаў і ў глухі лес ён павалок Ягня.
*15.03.2000 г.*

### Лебедзь, Рак і Шчупак

Калі таварышы не ў згодзе,
На лад іх справа ўжо не пойдзе.
А выйдзе ўжо не справа - нешта так.
Аднойчы Лебедзь, Рак, а з ім Шчупак
Вязці з паклажай воз узяліся
І разам трое ўсе ўпрагліся;
Са шкуры лезуць прэч, а воз дык без хады!
Паклажа бы для іх здавалася і лёгкай:
Ды Лебедзь рвецца пад аблокі,
Рак паўзе назад, а Шчупак - у глыб вады.
Вінны хто з іх, а хто не, - судзіць не нам,
Ды толькі воз і сёння там.
*21.06.2001 г.*

### Чыж і Голуб

Чыжа заціснула зладзюга-пастка;
Нябога ў ёй і рваўся і кідаўся,
А Голуб малады над ім жа пацяшаўся.
- Не сорамна? Ты сярод дня ўжо трапіў хвацка!
Не ашукалі бы мяне:
За гэта я ручаюсь смела.
Ды глянь, і сам

Патрапіў у сачок.
І справа!
Уперад чужой бядзе не смейся, галубок!
*22.06.2001 г.*

## Варона і Лісіца

… Вароне дзесьці Бог паслаў кавалак сыру;
Яна на елку паднялася,
Паснедаць быццам бы ўзялася,
Ды прызадумалася, а сыр трымала ў роце.
Як на бяду, Ліса прыперла ў госці;
І раптам сырны дух Лісіцу прыпыніў:
Рыжуха бачыць сыр, яе сыр паланіў.
Махлярка к дрэву ціхенька падходзіць,
Пакручвае хвастом, вачэй з яго не зводзіць.
Вароне кажа ласкава Ліса:
- Галубка, прыгажунечка, краса!
Ну што за шыйка, вочкі - любасць!
Язык не можа сказаць грубасць!
Якое апярэнне! Што за дзюба!
І галасок, напэўна, слухаць люба!
Спявай, ты сонейка, не бойся!
Бо калі б, табе, мая ты душка,
Скарыць нас спевам удалося,
Была б ты тут у нас жар-птушка!!
Закружылася з пахвал вястунні голаў,
Ад радасці ў валляк дыханне спёрла, -
І на прыязныя Лісіныя словы
Варона каркнула на ўсё яе вароны горла.
Сыр выпаў - і Лісіцы тут, як не было!
*22.06.2001 г.*

## Страказа і Мурашка

Паскакушка-страказа
Лета слаўна праспявала

Не паглядвала назад,
Дзе зіма ўжо падступала.
Абмярцвела чыста поле:
Няма дзён тых цёплых болей,
Як пад кожным ёй лістком
Быў гатовы стол і дом.
Усё прайшло: з зімой халоднай
Галеча, голад настае:
Страказа ўжо не спяе:
Бо каму ж у розум пойдзе
На страўнік ноту браць галодным!
Са спіной зусім пахілай
Да Мурашкі йдзе яна:
- Не пакінь мяне, кума!
Дай ты мне набрацца сілы,
Да вясенніх толькі дзён,
Пракармі і будзе плён.
- Кумка. Мне ўсё дзіўна гэта:
Ці рупілася ты летам? -
Страказе сказала тая.
- Не да таго ў мяне было.
У мягкіх муравах у нас
Песні, жвавасць усякі раз,
Так што галаву звяло.
Кожны дзень я да начы
Лета цэлае спявала...
- Усё спявала? Тога мала…
То пайдзі і паскачы!
*23.06.2001 г.*

***Аляксандр Пушкін***

**Зіма**

Вось сівер хмары наганяе,
Дыхнуў, завыў - і зноў сама
Ідзе чароўная зіма.

Прыйшла расхрыстана, пасмамі
Павісла на галлі дубоў,
Лягла хваліста дыванамі
Сярод узгоркаў ды палёў,
А бераг рэчкі сапаю
Зраўняла пухлай капаю;
Блiснуў мароз. І рады мы
Свавольствам матухны-зімы…
*20.06.2001 г.*

## Зімовая дарога

Скрозь хвалістыя туманы
Ціха ўжо праходзіць месяц,
Ды на шэрыя паляны
Ён панура ледзь-ледзь свеціць.
Па дарозе зімняй, сумнай
Тройка конная бяжыць
І званочак аднастайным
Гукам зморана грыміць.
Штосьці родненькае чутна
Ў доўгай песні фурмана:
То раздоллю ўторыць смутна,
То гучыць тугой яна…
Ні агню, ні чорнай хаты,
Глуш і снег… Абшар сляпы...
Толькі вёрстаў паласатых
Мне трапляюцца слупы…
*24.06.2001 г.*

## Маркотная пара

Маркотная пара! Вачэй зачараванне!
Прывабна прыгажосць тваёй красы!
Люблю я пышнае прыроды завяданне
І ў чырвань, золата адзетыя лясы,

Лагодны ветра шум, і свежае дыханне,
Імглой хвалістаю пакрыты спрэс нябёсы,
І рэдкі сонечны прамень, і рэчкі астыванне,
І хуткія сівой зімы пагрозы!
*08.05.2001 г.*

***Міхаіл Лермантаў***

**Хмары**

Хмары нябесныя, вечна няспынныя
Стэпам блакітным, пярлінным звяном
Імчыцеся вы, бы камусьці павінныя
З любай вам поўначы ў паднёвы наш бок.
Хто вас тут гоніць: лёс ці рашэнне?
Зайздрасць ці тайная, злосць ці адкрытая,
Сяброў бы тут можа паклёпы атрутныя…
Не, вам надакучылі нівы бясплотныя…
Далёкія жахі і пакаянні;
Вечна халодныя і вечна вы вольныя,
Няма ў вас радзімы, няма ў вас выгнання.
*14.03.2000 г.*

**Кліф**

Начавала хмарка залатая
На грудзях у кліфа-велікана.
Раніцою ў шлях далася рана:
Па блакіту радасна гуляе…
Ды застаўся росны след, маршчынны,
У старога кліфа. Адзінока
Ён стаіць, задумаўся глыбока
І ціхенька плача над пустыняй.
*14.03.2000 г.*

## На поўначы дзікай…

На поўначы дзікай стаіць адзінока
На голай вяршыні сасна
І сонная дрэмле пад снегам глыбокім,
Адзета бы рызай яна.
Ёй сніцца адно, што ў пустыні далёкай,
У краі, у тым, аж дзе сонца ўстае,
Самотна сумуе на кліфе высокім
Цудоўная пальма - сястрыца яе.
*14.03.2000 г.*

***Сяргей Ясенін***

## Гляну ў поле…

Гляну ў поле, гляну ў неба -
І ў палях, і ў небе - рай.
Зноўку тоне ў копах хлеба
Незагораты мой край.
Зноў на полі не стаптанным,
Небывалы статак ходзіць…
Струмні па гарах зялёных
Залатым цячэннем сходзяць.
Веру-ведаю, за мукі,
Што як гнёт над мужыком -
Нехта ласкавыя рукі
Аблівае малаком.
*06.05.2001 г.*

## Сыпле чаромха

Сыпле чаромуха снегам,
Зелень у кветках, расе.
У полі, нагнуўшыся, следам
Ходзяць шпакі ў паласе.

Шаўковыя хіляцца травы,
Пахне смалістай сасной.
Ой, вы, лугі і дубравы, -
Я ахмялелы вясной.
Радуюць тайныя весці,
Свецяцца ў душу маю.
Думаю я аб нявесце,
Толькі аб ёй я спяю.
Сып жа, чаромуха, снегам,
Спявайце вы, птахі, у лясах.
Па полі я радасным бегам
Ўсю квецень пушчу на размах.
*07.05.2001 г.*

## Пяе зіма, гукае…

Пяе зіма, гукае,
Касматы лес люляе
Стазвонам сасняікі.
Наўкол з тугой глыбокаю
Ў краі плывуць далёкія
Аблочныя палкі.
А на дварэ завея
Дыван шаўковы сцеле,
Злуецца ўшчэнт зіма…
А вераб'і разгульныя,
Як дзеткі безпрытульныя
Прыціхлі ля вакна.
*24.06.2001 г.*

***Адам Міцкевіч***

## Расквітнелі дрэвы зноў
*(З рускамоўнага перакладу Мікалая Асеева)*

Расквітнелі дрэвы зноў,
Пахне водар ноччу.

Жаўрукі звіняць з дуброў,
Саранча стракоча.
Што ж, абдумаўшы глыбока,
Я стаю, стуліўшы плечы.
Сэрца ные адзінока, -
З кім пайду вясне настрэчу?
Перад хатай, у ночы ззянні,
Музыканта цень трывожыць,
Чутна песня, звоніць гранне,
Расчыніў вакно і плачу.
Гэта ўсхліпы менестрэля -
У знак каханай - серанада;
А душа мая не рада:
- Песню з кім яна падзеліць?
Столькі гора перажыў я…
Не прыйсці цяпер дадому,
Не раскрыць жа дум нікому,
Толькі той нямой магіле…
Сядзем ціха рукі сцяўшы
Перад свечкай адзінокай:
Ці то песню ў думках склаўшы,
Ці пяру даручым словы.
Думы - дзеці, думы - крылы!
Што ж, спакойна вы пяеце?
Ты, душа - бы дом пахілы,
З дзецьмі быць - заўжды на мэце.
Пройдуць вёсны, пройдуць зімы,
Снежны пласт ад спёкі схлыне…
Смутак - толькі ён адзіны
Валацугу не пакіне.
*26.05.1999 г.*

***Афанасій Фет***

**Восень**

Ластаўкі прапалі,
А ўчора зарой

Усё гракі лята́лі,
Ды так шмат мільгаталі
Вунь над тою гарой.
Дзень на край хінецца,
На дварэ цямней.
Ліст сухі кладзецца,
Вецер жа злуецца,
Ды грукае ў вакне…
*18.06.2001 г.*

***Міхаіл Ісакоўскі***

**Вішня**

Ясны стаяў поўдзень, лета - на зыходзе.
Палявой дарогай дзед сабе ішоў,
Маладую вішню ўбачыў, бы па модзе,
Далікатна вырваў і панёс дамоў.
Паглядаў шчасліва, светлымі вачыма
На палі-сцяжыны, дальнюю мяжу.
Неўзнарок падумаў: "Калі я, магчыма,
Тут, каля дарогі, вішню пасаджу.
Вырасце высока, стане найвялікай,
Пойдзе ўшыр яна і ў вышыню,
І ў дарогу нашу будзе народ клікаць,
У квецені купацца, быццам бы ў раю.
Мінакі ў цянёчку ля ствала прылягуць,
Адпачнуць у цішы, у водар-халадку,
Пакаштуюць сочных, самых спелых ягад,
Мо, мяне згадаюць ту жа на вяку".

***Іван Нікіцін***

**Вясна набліжаецца**

Палюбуйся: вясна набліжаецца,
Жураўлі чарадою ляцяць,

У яркім золаце дзень купаецца,
Ручаі па канавах шумяць.
Хутка госці да вас пазбягуцца,
Колькі гнёздаў павісне ўгары!
Што за гукі, за песні пальюцца
Цэлы дзень ад зары да зары!
*22.06.2001 г.*

***Аляксей Пляшчэеў***

**Вясна**

Сыходзіць снег, бяжыць ручэй,
У вакно павеяла вясной…
Засвішча хутка салавей
Ды зменіць лес зялёны строй!
Чыста-нябесны ўжо блакіт.
Цяплей. І ясным сонца стала.
Пара завей сышла ў нябыт
І зноў надоўга мінавала.
*22.06.2001 г.*

# ЗМЕСТ

**Што наша моц змагла...** 3

**СПАДЧЫНА** 5
Тэадор Остык Нарбут 6
Каміла Юрэвіч з Нарбутаў 17

**ПАЭЗІЯ** 67
Ірына Багдановіч 68
Уладзімір Васько 79
Ганна Гайдукевіч 104
Міхась Мельнік 121
Кацярына Гоман 124
Сяргей Герасімовіч 130
Ала Юшко 133
Валера Мацулевіч 137
Ганна Рэлікоўская 140
Ірына Маркевіч 150
Алесь Сымановіч 158
Аляксей Сымановіч 160
Марыя Завала 163
Кастусь Якубчык 168
Кацярына Янчэўская 174
Людміла Краснадубская 181
Станіслава Белагаловая 193
Ларыса Лайкевіч 202
Вольга Ашмяна-Бічэль 207
Станіслаў Суднік 212
Сяргей Чыгрын 254

**ПЕРАКЛАДЫ** 263
Алена Несцерава 264
Смарагд Сліўко 270
Алесь Хітрун 274

**Ад лідскіх муроў**. Літаратурна - мастацкі зборнік № 11.
Кніга 1. 2022-2025 гг. На беларускай мове.
Фармат А-5. Папера офісная. Друк кампутарны.
Гарнітура Таймс. 296 с. Наклад: 120 асобнікаў.
Друкарня ПУП “Літары”, г. Гародня.